А. Каляда

# СЛОЎНІК АКЦЁРА І РЭЖЫСЁРА

А. Каляда

# СЛОЎНІК АКЦЁРА І РЭЖЫСЁРА

Мінск
,,Вышэйшая школа''
1995

ББК 85.33я2
К 17
УДК 792 (038)

Рэкамендаваны секцыяй грамадазнаўчай тэрміналогіі Рэспубліканскай тэрміналагічнай камісіі пры АН Беларусі, Навукова-метадычнай радай Беларускай акадэміі мастацтваў і Навукова-метадычным цэнтрам вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь

**Каляда А.**

К 17 Слоўнік акцёра і рэжысёра. — Мн.: Выш. шк., 1995. — 210 с.

ISBN 5-339-01041-4.

Уключаны прафесіяналізмы мовы акцёра і рэжысёра, а таксама частка агульнаўжывальных слоў і слоў гутарковага стылю, якія характарызуюць чалавека, раскрываюць яго эмацыянальны стан (больш за 4500 слоў).

Для студэнтаў і навучэнцаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў культуры і мастацтва, практычных працаўнікоў тэатра, а таксама для ўсіх аматараў тэатральнага мастацтва.

К $\frac{7920000000-070}{М304(03)-95}$ БЗ 36 — 94

ББК 85.33я2

ISBN 5-339-01041-4

© А. А. Каляда, 1995

## *ПРАДМОВА*

Прапануемы чытачу Слоўнік з'яўляецца першай спробай стварэння на Беларусі дапаможніка, у якім сабраны прафесіяналізмы і непрафесіяналізмы мовы акцёра і рэжысёра. За асноўную задачу Слоўніка вызначана садзейнічаць засваенню чытачамі слоў і словазлучэнняў роднай мовы, звязаных пераважна з прафесійнай дзейнасцю акцёра і рэжысёра драматычнага тэатра. З мэтай узбагачэння іх вуснай мовы, павелічэння слоўнікавага запасу ў Слоўнік уключана таксама частка агульнаўжывальных слоў і слоў гутарковага стылю, якія пэўным чынам характарызуюць чалавека, раскрываюць яго эмацыянальны стан, выяўляюць яго псіхіку, некаторыя ўстарэлыя і абласныя словы, што сустракаюцца ў тэкстах сучасных п'ес і іншых мастацкіх творах.

Слоўнік складаецца з рознатыповых артыкулаў, у якіх загаловачныя словы размешчаны ў алфавітным парадку. Кожны слоўнікавы артыкул уключае: загаловачнае слова; граматычную, акцэнтуацыйную і сэнсавую характарыстыку слова. Загаловачныя словы прыводзяцца па традыцыі ў пачатковай форме: назоўнікі — у назоўным склоне адзіночнага ліку; прыметнікі і дзеепрыметнікі — у назоўным склоне адзіночнага ліку мужчынскага роду; дзеясловы — у неазначальнай форме (абавязковымі формамі дзеяслова з'яўляюцца формы 1-й, 2-й і 3-й асобы адзіночнага ліку). Калі слова мнагазначнае, то прыводзяцца толькі тыя значэнні, якія маюць дачыненне да прадмета апісання.

Для зручнасці карыстання Слоўнікам падаецца руска-беларускі індэкс слоў у алфавітным парадку.

Пры ўкладанні Слоўніка выкарыстаны наступныя крыніцы: Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Мн., 1977 — 1984, т. 1 — 5; Русско-белорусский словарь. 2-е изд. Мн., 1982, т. 1 — 2; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1984 — 1987, т. 1 — 5; Театральная энциклопедия. М., 1961 — 1967, т. 1 — 5; *Арашонкава Г. У., Лемцюгова В. П.* Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы. Мн., 1986; Слоўнік беларускай мовы. Мн., 1987; *Пави Патрис.* Словарь театра. М., 1991; *Сыромятникова И.* История причёски. 2-е изд. М., 1989; *Базанов В.* Техника и технология сцены. Л., 1976; *Базанов В. В.* Сцена XX века. Л., 1990; *Кириева Е. В.* История костюма. М., 1967;

*Кирсанова Р. М.* Розовая ксандрейка и драдематовый платок: Костюм — вещь и образ в русской литературе 19 в. М., 1989; *Ключников Д. А., Снежницкий Л. Д.* Театральные драпировки. 2-е изд. М., 1971; Литературный энциклопедический словарь. М., 1987; *Школьников С. П.* Основы сценического грима. Мн., 1976; *Даль В.* Толковый словарь живого великорусского языка: В 4 т. Спб.; М., 1880 — 1882; Философский словарь. 5-е изд. М., 1987; Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989.

Заўвагі і пажаданні просьба дасылаць на адрас: 220012, Мінск, праспект Францыска Скарыны, 81. Беларуская акадэмія мастацтваў.

*А. Каляда*

# А

**АБАГУЛЬНЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. 1. Знаходзіць агульнае ў розных думках, фактах, выказваннях і на падставе гэтага рабіць вывад. 2. Назіраючы за пэўнай катэгорыяй людзей, знаходзіць характэрнае і на падставе гэтага ствараць мастацкі вобраз. 3. Тыпізаваць; аб'ядноўваць, злучаць у нешта адзінае.

**АБАМЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які страціў прытомнасць; анямелы, здранцвелы.

**АБАМЛЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Страціць прытомнасць; анямець, збянтэжыцца ад страху, нечаканага здзіўлення і пад.

**АБА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Асцярожны, разважлівы.

**АБАЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які мае абаяльнасць; прывабны, чароўны.

**АБАЯ́ННЕ**, -я. Прыцягальная сіла каго-, чаго-н.

**АББЭ́РСАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Неахайна абвязаць што-н., аблытаць вяроўкай, шпагацінай і пад.

**АБВІНАВА́ЧВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Папракаць, асуджаць за што-н.

**АБВІНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Абгарнуць, ахінуць, абкруціць.

**АБВО́СТРАНЫ**, -ая, -ае. 1. Больш востры, чым звычайна; павышаны, узмоцнены (пра пачуцці, адносіны, успрыманні і пад.). 2. Жорсткі, напружаны (аб якіх-н. адносінах, супярэчнасцях).

**АБВЫ́КЛЫ**, -ая, -ае. Такі, да якога прывыклі, які стаў звычайным, заўсёдным.

**АБГАВАРЫ́ЦЬ**, -гавару́, -гаво́рыш, -гаво́рыць. 1. Усебакова разгледзець, абмеркаваць, дзелячыся сваімі думкамі. 2. Нядобразычліва выказацца пра каго-н., зганіць, абылгаць.

**АБГРУНТАВА́ННЕ**, -я. Тое, чым што-н. абгрунтоўваецца; довад, доказ.

**АБГРУНТАВА́НЫ**, -ая, -ае. Падмацаваны пераканальнымі доказамі.

**АБГРУНТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Пацвердзіць фактамі, прывесці пераканальныя доказы на карысць каго-, чаго-н.

**АБДЫ́МКІ**, -аў. Ахопліванне рукамі каго-н. (выказваючы пачуцці радасці, замілавання і пад.).

**АБ'Е́КТ**, -а. З'ява, падзея, прадмет, асоба, якія падпадаюць пад уздзеянне каго-, чаго-н. (аб'ект увагі артыста, выканаўцы; аб'ект назірання).

**АБЕРАГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Засцерагаць, ахоўваць ад чаго-н. шкоднага, небяспечнага; вартаваць, пільнаваць.

**АБЕРАЖЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Поўны адчування небяспекі; засцярожлівы.

**АБЕ́РУЧ**. Абедзвюма рукамі (абхапіць, узяць што-н.).

**АБІБО́К**, -а. Лежабок, гультай.

**АБЛА́ШЧЫЦЬ**, -шчу, -шчыш, -шчыць. Ласкава абысціся з кім-н., выказаць увагу, спагаду да каго-н., пашкадаваць.

**АБЛА́ЯЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Абазваць грубымі словамі, зняважыць.

**АБЛІ́ЧЧА**, -а. Твар; рысы, выраз твару; вонкавы выгляд каго-н.

**АБМО́ВІЦЦА**, -мо́ўлюся, -мо́вішся, -мо́віцца. Памыліцца пры размове, сказаць не тое, што трэба; нечакана прыгадаць што-н.

**АБНАДЗЕ́ІЦЬ**, -дзе́ю, -дзе́іш, -дзе́іць. Паабяцаўшы што-н., запэўніўшы ў чым-н., абудзіць надзею.

**АБРА́ЗА**, -ы. Тое, што можа абразіць каго-н.; зняважлівы ўчынак, зняважлівае слова і пад.

**АБРА́ЗІЦЬ**, -ра́жу, -ра́зіш, -ра́зіць. Пакрыўдзіць каго-н. зняважлівым словам або дзеяннем.

**АБРЫ́ДЗЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее; абры́дзеў, -дзела і абры́д, -ла. Надакучыць, апрыкраць; прыесціся.

**АБСТАЛЯВА́ННЕ СЦЭ́НЫ** (м е х а н і ч н а е). Сучасны тэатр складаецца з 2 асноўных частак — сцэны і глядзельнай залы, якія аддзелены адна ад другой капітальнай партальнай сцяною са спецыяльным праёмам — партальнай аркаю, верхняя частка якой пакрываецца рамай — «арлекінам», за якім знаходзіцца спецыяльная супрацьпажарная «сцяна» — заслона. Апушчаная ўніз, яна герметычна падзяляе глядзельную залу і сцэну. Адным з найбольш важных механізмаў абсталявання партальнай аркі з'яўляецца антрактавая заслона. За супрацьпажарнай заслонаю знаходзіцца пад'ёмна-апускная заслона. Для змены памераў люстра сцэны па вертыкалі служыць партальная падуга, за якой, з правага і левага бакоў сцэны, прымацаваны партальныя кулісы, якія могуць мяняць люстра сцэны па гарызанталі. А. с. зманціравана ў розных кутках і частках сцэны (ад каласнікоў да ніжняга трума). На кожным плане сцэны паралельна партальнай арцы замацаваны сафіты, што служаць для асвятлення дэкарацый кожнага плана. Планшэт сучаснай сцэны драматычнага тэатра абсталяваны рознымі механізмамі, найбольш распаўсюджаным з якіх з'яўляецца паваротны круг. У оперна-балетным тэатры вялікае значэнне мае пад'ёмна-апускны планшэт з асобнымі пляцоўкамі, у якіх умайстраваны люкі правалу. На сцэнах, дзе ёсць вялікія бакавыя запаснікі, знайшла шырокае прымяненне сістэма фурак (невысокіх пляцовак на калёсах, на якіх загадзя манціруюцца дэкарацыі трох бліжэйшых карцін).

**АБУДЗІ́ЦЦА**, абуджу́ся, абу́дзішся, абу́дзіцца. 1. Перастаць спаць, прачнуцца. 2. Перастаць быць спакойным, напоўніцца чым-н.; вярнуцца да жыцця, дзейнасці. 3. Узнікнуць, выявіцца (пра пачуцці, уласцівасці, якасці і пад.).

**АБУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Стаць абураным; разгневацца.

**АБУРЭ́ННЕ**, -я. Вельмі моцнае незадавальненне, гнеў.

**АБХО́ДЖВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Паддобрываючыся да каго-н., імкнуцца перакanaць у чым-н., схіліць да чаго-н. (на што-н.).

**АБЦЯРПЕ́ЦЦА**, -цярплюся, -церпішся, -це́рпіцца. Звыкнуцца з чым-н. непрыемным, з якімі-н. непаладкамі, цяжкасцямі і пад.

**АБЫХО́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Ветлівы, далікатны ў абыходжанні.

**АБЫ-ХТО́**, абы-каго́. Хто-н., любы, хто папала, кожны.

**АБЫ-ШТО́**, абы-чаго́. 1. Што-н., што папала. 2. Непатрэбшчына, глупства.

**АБЫ-Я́К**. Неахайна; нядбала.

**АБЫЯ́КАВАСЦЬ**, -і. Адсутнасць цікавасці да каго-, чаго-н.; раўнадушнасць да навакольнага наогул.

**АБЯЦА́ННЕ**, -я. Дабравольнае абавязацельства зрабіць што-н.

**АБЯЦА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Даваць абяцанне што-н. зрабіць; даваць абяцанне каму-н. аддаць, перадаць што-н. 2. Выклікаць якія-н. спадзяванні, падаваць надзеі на што-н.

**АВАНЗА́ЛА**, -ы. Памяшканне перад галоўнай залай; вестыбюль перад партэрам глядзельнай залы.

**АВАНЛО́ЖА**, -ы. Невялікае памяшканне перад уваходам у тэатральную ложу.

**АВАНСЦЭ́НА**, -ы. Высунутая ў глядзельную залу адкрытая пляцоўка ад заслоны да пярэдняга краю тэатральнай сцэны.

**АВА́ЦЫЯ**, -і. Калектыўнае выказванне гледачоў працяглымі воплескамі, раднымі воклічамі «брава», «біс» на тэатральных пастаноўках, канцэртах адабрэння, захаплення.

**АДВО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Нічым не абмежаваны, вольны. 2. Непераканальны, бяздоказны, які не выклікаецца неабходнасцю, беспадстаўны. 3. Які праводзіцца самавольна.

**АДЗЕ́ННЕ СЦЭ́НЫ**. Кулісы, падугі, заднік, заслона.

**АДЗІ́НСТВА ЧА́СУ, МЕ́СЦА, ДЗЕ́ЯННЯ.** Адзін з асноўных прынцыпаў нарматыўнай эстэтыкі класіцызму, які абавязваў драматурга канцэнтраваць сцэнічнае дзеянне вакол аднаго сюжэтнага цэнтра, абмежаванага месцам яго развіцця і часам (не болей як 24 гадзіны).

**АДМЕ́ТНЫ**, -ая, -ае. Не падобны на іншых; своеасаблівы, непаўторны, характэрны.

**АДМЫСЛО́ВЫ**, -ая, -ае. Цудоўны, выдатны, надзвычайны.

**АДНАЎЛЕ́ННЕ СПЕКТА́КЛЯ.** Рэстаўрацыя дэкарацый, касцюмаў, увод новых выканаўцаў у стары спектакль.

**АДУКА́ЦЫЯ ТЭАТРА́ЛЬНАЯ.** 1. Сукупнасць ведаў, прафесійных уменняў і навыкаў у галіне тэатральнага мастацтва. 2. Навучанне майстэрству акцёра, рэжысёра.

**АКРАБА́ТЫКА**, -і. Від гімнастыкі, які выкарыстоўваецца ў тэатральных школах для развіцця пластыкі цела будучых артыстаў.

**АКРАБАТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае эцюд, кампазіцыя, дзеянне. Складаецца з шэрага практыкаванняў, у якіх выканаўцы дэманструюць мускульную сілу і пластыку цела.

**АКРАВЕ́РШ**, -а. Верш, у якім пачатковыя літары радкоў складаюць якое-н. імя, слова або фразу.

**АКСЕСУА́Р**, -а. 1. Прыналежнасць чаго-н. 2. *звычайна мн.* (**аксесуа́ры**, **-аў**). Прадметы бутафорыі, рэквізіту, дэкарацый.

**АКТ**, -а. Закончаная частка драматургічнага твора або тэатральнага спектакля, прадстаўлення.

**АКТА́ВА**, -ы. Васьмірадковая страфа, у якой першыя шэсць радкоў аб'яднаны дзвюма перакрыжаванымі рыфмамі, а два апошнія — сумежнай рыфмай.

**АКТЭ́Т**, -а. Страфа з 8 вершаваных радкоў; тое ж, што і васьмірадкоўе.

**АКЦЁР**, -а. Выканаўца мужчынскіх роляў у драматычных, оперных, балетных, аперэтачных спектаклях, эстрадных і цыркавых прадстаўленнях, кіна- і тэлефільмах.

**АКЦЁРКА**, -і. Выканаўца жаночых роляў.

**АКЦЁРСКАЕ МАСТА́ЦТВА.** Від выканальніцкай творчасці акцёраў.

**АКЦЁРСКІ**, -ая. Стасуецца да акцёраў і іх дзейнасці (акцёрскі касцюм, голас, грым і пад.; акцёрская знешнасць, пастава і пад.).

**АКЦЁРСТВА**, -а. Прафесія, занятак.

**АКЦЭ́НТ**, -у. Своеасаблівае вымаўленне, уласцівае тым, хто гаворыць на чужой мове; адметнасць вымаўлення ў той ці іншай мясцовай гаворцы або мове. У тэатры А. выкарыстоўваецца для індывідуальнай характарыстыкі мовы персанажаў.

**АКЦЭНТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. 1. Выдзеліць (выдзяляць), падкрэсліць (падкрэсліваць) тое, што ўяўляецца найбольш істотным, важным, неабходным; засяродзіцца на кім-, чым-н. 2. Звярнуць увагу на каго-, што-н.

**АКЦЭ́НТНЫ ВЕРШ.** Від танічнага верша. Рытм яго заснаваны на аднолькавай (або прыблізна аднолькавай) колькасці акцэнтаў (апорных рытмічных націскаў) у вершаваных радках. Колькасць міжнаціскных складоў неаднолькавая (ад 0 да 8).

**АЛАГІ́ЗМ**, -у. Што-н. нелагічнае, несумяшчальнае з законамі і правіламі логікі; стылістычны прыём парушэння лагічных сувязей у мове, дзеяннях, учынках з мэтай стварэння эфекту камізму, іроніі і да т. п.; бяссэнсіца.

**АЛАГІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Нелагічны, несумяшчальны з законамі і правіламі логікі; бяссэнсны.

**АЛЕГО́РЫЯ**, -і. У літаратуры і мастацтве — выражэнне адцягненага паняцця пры дапамозе канкрэтнага мастацкага вобраза; іншасказальнасць.

**АЛІТЭРА́ЦЫЯ**, -і. Паўтарэнне аднолькавых або падобных зычных гукаў у вершы, што надае паэтычнай мове асаблівую гукавую выразнасць.

**АМАГРАФІ́ЧНАЯ РЫ́ФМА.** Рыфма, утвораная спалучэннем слоў, якія пішуцца аднолькава, але гучаць па-рознаму.

**АМАНІМІ́ЧНАЯ РЫ́ФМА.** Рыфма, у якой спалучаюцца аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні словы.

**АМАФО́ННАЯ РЫ́ФМА**. Рыфма, у якой спалучаюцца словы з аднолькавым (ці амаль аднолькавым) гучаннем, але розным напісаннем і сэнсам. Характарам і выяўленчай сутнасцю А. р. блізкая да аманімічнай і каламбурнай.

**АМПЛУА́**. Умоўны падзел роляў і акцёраў на своеасаблівыя характарныя групы. А. былі ўжо ў антычным тэатры, дзе меў месца дакладны падзел выканаўцаў у адпаведнасці са значнасцю ролі (1-ы акцёр — пратаганіст, 2-і — дэўтэраганіст, 3-і — трытаганіст) і жанрам твора (трагедыя, камедыя). У сярэдневяковым тэатры — камічныя, асобныя алегарычныя персанажы ў маралітэ, містэрыях. Замацавалася А. у італьянскай камедыі масак, дзе патрабавалася спецыялізацыя акцёра як выканаўцы пэўнай маскі (Арлекін, Панталоне і інш.). Строгі падзел на А. у адпаведнасці з сацыяльнай прыналежнасцю героя існаваў у класіцыстычным тэатры (кароль, тыран, палюбоўнік, наперснік і інш.). У Расіі А. уведзены на ўзор французскіх у 1766 г. Найбольш пашыраныя А. у рускіх драматычных тэатрах: мужчынскія — герой, комік, 1-ы палюбоўнік, 2-і палюбоўнік, прастак, рэзанёр, фат, неўрастэнік (з пачатку 19 ст. новае А.), жаночыя — гераіня, субрэтка, інжэню, травесці, камічная старая, грандам і інш. Акцёрскае мастацтва беларускага тэатра, якое развівалася ў плыні сцэнічных прынцыпаў МХАТ, з самага пачатку адмовілася ад А. у класічным разуменні гэтага слова. Такая тэндэнцыя наглядаецца і ў сучасным беларускім тэатры.

**АМФІБРА́ХІЙ**, -я. Антычная трохскладовая стапа. Гэта стапа мела і іншую назву — брахіхарэй, г. зн. стапа, якая складаецца з кароткага склада і харэя. У сілаба-танічнай сістэме вершаскладання А. — трохскладовая стапа з націскам на сярэднім складзе.

**АМФІТЭА́ТР**, -а. Глядзельная зала (або яе частка), якая мае ступеньчатую сістэму размяшчэння месцаў для гледачоў. А. выкарыстоўваецца ў кінатэатрах, тэатральных, цыркавых, спартыўных будынках. Па форме А. падзяляюць на круглыя, веерныя, сектаральныя. У Старажытнай Грэцыі і Рыме — манументальнае збудаванне для масавых публічных відовішчаў: баёў гладыятараў, цкавання дзікіх звяроў, тэатралізаваных прадстаўленняў. Канструкцыйную аснову А. складала сістэма арак і слупоў, паміж якімі знаходзіліся галерэі і лесвіцы. Рады для гледачоў спускаліся ўніз і ішлі паўкругам або кругам вакол арэны.

**АНАГРА́МА**, -ы. Перастаноўка літар у слове, пры якой атрымліваецца новае слова (нос — сон, кот — ток, ліпа — піла).

**АНАГРА́МНАЯ РЫ́ФМА**. Рыфма, у якой асобныя склады ці гукі ў рыфмаваных словах ідуць не ў аднолькавай паслядоўнасці, а як бы мяняюцца месцамі.

**АНАКРЭАНТЫ́ЧНАЯ ПАЭ́ЗІЯ**. Від лірычнай паэзіі, што ўслаўляе хараство і радасці жыцця, паэзіі мілагучнай і жыццярадаснай. Назва паходзіць ад імя старажытнагрэчаскага паэта Анакрэона (Анакрэонта, 570? — 478 да н. э.), асноўнымі тэмамі песень якога былі віно, каханне, бестурботная весялосць.

**АНА́ЛІЗ ВЫКАНА́ЛЬНІЦКІ**. Разбор мастацкага твора з мэтай падрыхтоўкі да сцэнічнага выканання яго.

**АНА́ЛІЗ ЛІТАРАТУ́РНАГА ТВО́РА**. Раздзяленне літаратурнага твора на састаўныя часткі з мэтай больш глыбокага вывучэння іх і ўсёй мастацка-вобразнай сістэмы, раскрыцця аўтарскай задумы і яе ўвасаблення.

**АНАНСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Рабіць (зрабіць) анонс, папярэдне аб'явіць (аб'яўляць) аб чым-н.

**АНА́ПЕСТ**, -а. Антычная чатырохдольная стапа з трох складоў: два кароткія і адзін доўгі. У сілаба-танічнай сістэме вершаскладання — трохскладовая стапа з рытмічным націскам на апошнім складзе.

**АНАТА́ЦЫЯ**, -і. Сціслы змест і ацэнка п'есы, спектакля, лібрэта, канцэрта, тэатралізаванага прадстаўлення, кнігі, артыкула і інш.

**АНА́ФАРА**, -ы. Паўтарэнне ў вершах адных і тых жа гукаў, гукаспалучэнняў, слоў ці выразаў на пачатку сумежных рытмічных радкоў або суседніх строф. Пашырана ў вуснай народнай

творчасці і пісьмовай літаратуры. Бывае гукавая, лексічная і сінтаксічная А.

**АНГАЖЭМЕ́НТ**, -а. 1. Запросіны артыста, групы артыстаў або калектыву для ўдзелу ў спектаклях ці канцэртах на пэўны тэрмін па дагаворы. 2. Дакумент, у якім акрэслены ўмовы запросін артыста ці тэатральнай трупы для выступленняў на пэўны тэрмін у спектаклях, канцэртах ці са спектаклямі, канцэртамі.

**АНГАЖЫ́РАВАЦЬ**. 1. Запрасіць (запрашаць) асобных артыстаў або цэлы калектыў на працу на пэўны тэрмін па дамове. 2. Запрасіць (запрашаць) даму на танец.

**АНО́НС**, -а. Папярэдняя аб'ява аб выступленні артыста, тэатральнай трупы, ансамбля і інш. або папярэдняя, без падрабязных звестак афіша, у якой паведамляецца аб спектаклі, выступленні «зорак» эстрады, майстроў мастацкага слова і да т. п. У 17 — 18 ст., пераважна ў французскім тэатры, А. уяўляў сабою кароткі зварот са сцэны да публікі перад пачаткам спектакля (і асобных яго актаў) з паведамленнем пра пастаноўку, пра дзейных асоб, выканаўцаў, па заканчэнні спектакля — аб значэнні развязкі і інш. Адначасова рэкламаваліся будучыя спектаклі тэатра. А. з'яўляўся арганічным элементам спектакля і выконваўся лепшымі акцёрамі трупы. Выканаўцы А. ("анансёры") выступалі ў своеасаблівых касцюмах, пры выхадзе на сцэну выконвалі т. зв. кампліменты (тры паклоны — прама, налева і направа). Анансаванне грунтавалася звычайна на імправізацыі, суправаджалася дасціпнымі жартамі і інш. Пазней А. набыў характар звычайнай інфармацыі і прамаўляўся інспектарам сцэны, памочнікам рэжысёра або дзяжурным адміністратарам.

**АНСА́МБЛЬ**, -я. 1. Мастацкая зладжанасць, стройнасць выканання драматычнага, опернага, балетнага спектакля, твора. 2. Група артыстаў, якія выступаюць разам і складаюць адзіны мастацкі калектыў.

**АНТРА́КТ**, -у. 1. Перапынак паміж актамі спектакля ці аддзяленнямі канцэрта, цыркавога паказу. Служыць для адпачынку выканаўцаў і гледачоў, змены дэкарацый. 2. Музычны твор, які з'яўляецца ўступам да якога-н. акта (акрамя першага), карціны опернага, балетнага або драматычнага спектакля.

**АНТРЭ́**. 1. Парадны ўваход тэатра. 2. У балеце — уступная частка некаторых танцавальных формаў. Танцавальны выхад на сцэну аднаго або некалькіх выканаўцаў. 3. У цырку — сюжэтная размоўная ці пантамімічная сцэнка, якую выконваюць клоуны.

**АНТРЭПРЫ́ЗА**, -ы. Прыватнае відовішчнае прадпрыемства, створанае і ўзначаленае антрэпрэнёрам. А. спыніла сваё існаванне ў Расіі ў 1919 г. пасля выдання дэкрэта аб нацыяналізацыі тэатраў.

**АНТРЭПРЭНЁР**, -а. Прадпрымальнік, уладальнік, утрымальнік прыватнага відовішчнага прадпрыемства (тэатра, цырка і інш.). У Англіі называецца менеджэрам, у Італіі — імпрэсарыо, у Амерыцы — прадзюсэрам. А. існуюць з часоў узнікнення прафесійных труп (да 16 ст.), у Расіі з'явіліся ў 18 ст., на Беларусі — у апошняй чвэрці 18 — пачатку 19 ст.

**АНТЫГЕРО́Й**, -я. Тып персанажа ў літаратуры 19 — 20 ст., які ў той ці іншай ступені процістаіць традыцыйнаму вобразу героя сваім характарам і выступае носьбітам пэўных грамадскіх і эстэтычных з'яў. Упершыню слова А. увёў у літаратуру Ф. Дастаеўскі ў «Запісках з падполля» (1864). Духоўныя папярэднікі А. у літаратуры пачатку 19 ст. — «выключная асоба» (героі Бальзака, Стэндаля), «лішні чалавек» (героі Пушкіна, Лермантава).

**АНТЫПО́Д**, -а. Людзі, групы людзей і пад., якім уласцівы процілеглыя погляды, якасці, густы, звычкі.

**АНТЫТЭ́ЗА**, -ы. Супрацьпастаўленне або проціпастаўленне кантрастных з'яў, паняццяў, вобразаў і г. д., якое ўтварае адзінае лагічнае цэлае.

**АНТЫТЭ́ЗІС**, -а. Суджэнне, якое проціпастаўляецца тэзісу.

**АНТЫФРА́ЗІС**, -а. Выкарыстанне слова ці выразу ў процілеглым, звычайна іранічным значэнні. Часта сустракаецца

ў беларускай народнай паэтычнай творчасці.

**АНТЫ́ЧНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́НЕ**. Сістэма вершаскладання, заснаваная на ўпарадкаваным чаргаванні ў вершаваных радках доўгіх і кароткіх складоў. Узнікла ў 8 ст. да н. э. у Старажытнай Грэцыі, у 3 ст. да н. э. перайшло ў Рым, шырокае развіццё атрымала ў антычнай літаратуры. Яго называюць таксама метрычным вершаскладаннем.

**АНТЫ́ЧНАЯ ДРАМАТУРГІ́Я**. Драматургія Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, узнікненне якой адносіцца да 6 ст. да н. э. Найбольш плённыя часы А. д. супадаюць з перыядам росквіту грэчаскай трагедыі і старажытнай антычнай камедыі (5 ст. да н. э.), а таксама бытавой камедыі, спачатку ў Грэцыі (4 — 3 ст. да н. э.), затым у Рыме (3 — 2 ст. да н. э.). А. д. з'явілася першым у Еўропе драматургічным родам літаратуры, у якім склаліся яго асноўныя віды — трагедыя і камедыя, дала дасканалыя ўзоры паэтычнай творчасці (паэма, ода, гімн, сатыра, эпіграма, пародыя, ідылія, пасланне, эпітафія).

**АНТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР**. Паняцце, якое аб'ядноўвае старажытнагрэчаскі і старажытнарымскі тэатр, а таксама тэатр некаторых краін Бліжняга Усходу. У часы развіцця А. т. (6 ст. да н. э. — 4 — 5 ст. н. э.) у Еўропе з'явіліся першыя пастаянныя тэатральныя збудаванні, узоры тэатральных машын і дэкарацыйнага афармлення спектакля.

**АНТЫ́ЧНЫЯ СТРО́ФЫ**. Строфы старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай паэзіі, у аснове якіх ляжала чаргаванне вершаваных радкоў рознага метра. У антычным вершаскладанні рыфмаў не было, таму 2-радковыя ці 4-радковыя строфы ўтвараліся галоўным чынам раўнамерным паўтарэннем у пэўных пазіцыях радкоў пэўных памераў.

**АНШЛА́Г**, -а. Аб'ява ў тэатры, кіно, цырку, філармоніі аб тым, што ўсе білеты прададзены — «поўны збор».

**АПАВЯДА́ЛЬНІК і РАСПАВЯДА́ЛЬНІК**, -а. Той, хто апавядае (распавядае) услых што-н., аб чым-н.

**АПАВЯДА́ННЕ**, -я. Невялікі мастацкі празаічны твор.

**АПАВЯДА́ННЕ ВЕРШАВА́НАЕ**. Апавяданне вершам; невялікі сюжэтны твор, напісаны вершам; адзін з жанраў паэтычнага эпасу. У беларускай літаратуры развілося з гутаркі. Разнавіднасцю яго з'яўляецца быліца — адносна кароткае апавяданне пра незвычайныя здарэнні ў жыцці персанажаў (сустрэчы з чарцямі, дамавікамі, лесунамі і да т. п.).

**АПАНТА́НЫ**, -ая, -ае. Ахоплены моцным душэўным узрушэннем, якое бурна выяўляецца ў паводзінах чалавека.

**АПАРА́Т АКЦЁРСКІ**. Сукупнасць органаў і псіхафізічных уласцівасцей арганізма акцёра.

**АПА́РТ**, -а. Рэпліка, маналог, прамоўленыя ўбок і адрасаваныя гледачам, а не партнёру.

**АПАФЕО́З**, -у. 1. У Старажытнай Грэцыі і Рыме — абрад абагаўлення героя, імператара і інш. 2. Услаўленне, ушанаванне якой-н. асобы, падзеі, з'явы і інш. 3. Заключная, урачыстая масавая сцэна спектакля ці канцэртнай праграмы, у якой услаўляюцца народ, герой, выдатная гістарычная ці грамадская падзея.

**АПЕРЭ́ТА**, -ы. 1. Музычна-вакальны твор камедыйнага характару з элементамі размовы. 2. Тэатр, у якім ставяцца музычна-вакальныя творы камедыйнага характару, які займае прамежкавае становішча паміж операй і драмай; музычна-сцэнічны паказ, у якім музычна-вакальныя і музычна-харэаграфічныя нумары чаргуюцца з размоўнымі сцэнамі, а аснову музычнай драматургіі складае масава-бытавая і эстрадная музыка (галоўным чынам куплетная песня і танец). Выкарыстоўваюцца ў А. і спецыфічна оперныя формы: арыя, ансамбль, хор, уверцюра, але яны больш простыя паводле будовы, што разам з агульнадаступным характарам музыкі адрознівае А. ад камічнай оперы з размоўнымі дыялогамі. Беларускі музычнакамедыйны тэатр бярэ пачатак у сінтэтычных формах народнага мастацтва (калядныя і вясельныя абрады, карагодныя гульні), у скамаростве, у інтэрмедыях

батлейкі, школьнага тэатра, у народнай драме. 3. Трупа тэатра аперэты.

**АПЛАДЫСМЕ́НТЫ**, -аў. Плясканне ў далоні ў знак ухвалы або прывітання; воплескі.

**АПО́ВЕСЦЬ**, -і. Мастацкі твор апавядальнага характару, які займае прамежкавае месца паміж раманам і апавяданнем.

**АПО́КРЫФЫ**, -аў. Мастацкія аповесці ў сярэдневяковых літаратурах, сюжэтна звязаныя з Біблія́й, жыціямі святых, легендамі аб раі, пекле, канцы свету. Забараняліся царквой як неканані́чныя. У дахрысціянскія і раннехрысціянскія часы тэрмін А. ужываўся ў дачыненні да кніг вялікай мудрасці, чый глыбокі, патаемны сэнс быў даступны не кожнаму.

**АПО́РНАЯ РЫ́ФМА**. Каранёвая рыфма, якая грунтуецца на сугуччы толькі націскных (апорных) складоў.

**АРАБІ́ЗМЫ**, -аў. Словы, запазычаныя з дыялектаў арабскіх народаў Заходняй Азіі і Паўднёвай Афрыкі і з адзінай для ўсіх арабаў літаратурнай арабскай мовы. Невялікі пласт А. быў вядомы старабеларускай мове 16 — 17 ст., куды яны трапілі галоўным чынам праз пасрэдніцтва цюркскіх моў у выніку ваенных і эканамічных зносін славян з цюркамі: атлас (шаўковая тканіна), мула (у форме молла), кайданы, каран, султан і інш. Некаторыя А. ўвайшлі ў мовы многіх народаў свету: алкаголь, іслам, мумія, халіф і інш.

**АРА́ТАР**, -а. Асоба, якая выступае з прамовай публічна; той, хто валодае красамоўствам, майстэрствам вуснай мовы.

**АРА́ТАРСКАЕ МАСТА́ЦТВА**. Красамоўства; вуснае, па-мастацку апрацаванае маўленне, мэта якога — пераканаць у нечым слухачоў, схіліць іх да пэўных дзеянняў, учынкаў, рашэнняў. Лепшым узорам А. м. уласціва зліццё жыццёва важнай ідэі, актуальнага зместу з адточанай кампазіцыяй і моўнай формай. На Беларусі здаўна атрымалі пашырэнне многія роды і віды А. м. Як аратар праславіўся Кірыла Тураўскі, «словы» якога сведчаць пра высокую культуру А. м. у Старажытнай Русі 12 ст., пра сувязь з візантыйскімі і антычнымі традыцыямі.

**АРА́ТАРСКАЯ ПРО́ЗА**. Помнікі красамоўства, а таксама літаратурныя творы, напісаныя ў прамоўніцкім стылі. Асноўныя віды і назвы твораў А. п., што бытавалі ў мінулым на Беларусі: слова, прамова, казанне, пропаведзь, арацыя. Найбольшага росквіту дасягнула ў Старажытнай Грэцыі і Рыме, дзе выпрацавана тэорыя красамоўства — рыторыка.

**АРА́ЦЫЯ**, -і. Празаічны жанр у літаратуры Беларусі 17 — 18 ст. З А. выступалі школяры ў час розных свят (каляды, вялікдзень) і ў сувязі з заканчэннем навучальнага года, каб прадэманстраваць свае веды па рыторыцы, уменне прыгожа і лагічна гаварыць. А. выкарыстоўваліся таксама на пасяджэннях соймікаў, сямейных урачыстасцях (віншавальныя прамовы свата). Некаторыя з А., дзе інсцэніраваліся пасяджэнні суда, набліжаліся па жанры да драматургічных твораў.

**АР'ЕРСЦЭ́НА**, -ы. Задняя частка сцэны. З'яўляецца працягам асноўнай яе часткі, служыць як памяшканне для размяшчэння накатных пляцовак для ўстаноўкі дэкарацый, якія ствараюць ілюзію вялікай глыбіні. А. з'явілася адначасова з глыбіннай сцэнай — карабком.

**А́РКА ПАРТА́ЛЬНАЯ** (п а р т а л ь н а е л ю с т р а). Асноўная частка канструкцыйнага афармлення сучаснай сцэны. А. п. складаецца з: а) архітэктурнай аркі — праёму ў капітальнай сцяне, што аддзяляе сцэну ад глядзельнай залы і звычайна мае пастаяннае мастацкае афармленне і пастаянную велічыню раскрыцця; б) ігравой А. п., раскрыццё і афармленне якой мяняюцца ў залежнасці ад паказваемага на сцэне месца дзеяння. Па сваіх памерах ігравая А. п. звычайна меншая за архітэктурную і складаецца з партальных куліс і падугі або з рухомых партальных «вежаў» і мастка. Усе асноўныя памеры сцэны і глядзельнай залы разлічваюцца ў адпаведнасці з памерамі А. п.

**АРЛЕКІ́Н**, -а. 1. Традыцыйны персанаж італьянскай камедыі дэль артэ (камедыі масак). Створаны акцёрам А. Га-

наса ў 2-й палове 16 ст. А. займаў у трупе становішча 2-га Дзані — прастака, які заблытваў сваімі бязглуздымі выхадкамі інтрыгу камедыі. Насіў касцюм, на які былі панашываны шматлікія рознакаляровыя латкі, што абазначала беднасць і скупасць яго ўладальніка. У сярэдзіне 17 ст. у Францыі акцёр Д. Б'янкалелі змяніў характар і касцюм А. У яго выкананні А. ператварыўся ў 1-га Дзані — хітрага, дасціпнага, злаязыкага інтрыгана, які актыўна ўдзельнічае ў развіцці дзеяння. Латкі на касцюме А. прынялі форму трохкутнікаў чырвонага, жоўтага і зялёнага кслераў. У 18 ст. акцёр Т. Візанціні ўнёс у трактоўку ролі А. патэтычны элемент, прымусіўшы гледачоў парыжскіх кірмашовых тэатраў аднначасова смяяцца і плакаць. 2. Частка дэкарацыйнага афармлення сцэны: першая, з боку глядзельнай залы, паласа тканіны, нерухома замацаваная ў верхняй частцы, якая не расчыняецца, партальнай аркі. Прызначэнне А. — схаваць ад гледачоў канструкцыі і механізмы верхняй сцэны. Разам з пярэдняй заслонай, завяршэннем якой ён з'яўляецца, А. уваходзіць у архітэктурны інтэр'ер глядзельнай залы. Узнікненне гэтага тэрміна звязана з персанажам італьянскай камедыі масак — Арлекінам, які, з'яўляючыся перад заслонай, драпіраваўся ў яе складках.

**АРЛЕКІНА́ДА**, -ы. Невялікая п'еса (сцэнка), у якой галоўнай дзейнай асобай з'яўляецца Арлекін і інш. персанажы італьянскай камедыі дэль артэ. А. была папулярным жанрам французскіх кірмашовых тэатраў 18 ст.; у маленькіх, часцей за ўсё аднаактовых п'есах-А. пераважалі элементы пантамімы, спеваў, танцаў. Жанр А. нарадзіўся ў сярэдзіне 17 ст. пад уплывам тэатра італьянскіх камедыянтаў. Варыяцыі А. атрымалі распаўсюджанне і ў іншых еўрапейскіх тэатрах. Шырокае развіццё А. атрымалі ў сярэдзіне 19 ст. у рускіх балаганах.

**АРМАТУ́РА АСВЯТЛЯ́ЛЬНАЯ**. Камплект разнастайных прадметаў і прылад для абсталявання электрычнага тэатральнага асвятлення.

**АРТЫКУЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Утвараць артыкуляцыю.

**АРТЫКУЛЯЦЫ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які мае дачыненне да артыкуляцыі.

**АРТЫКУЛЯ́ЦЫЯ**, -і. Работа органаў мовы, якая неабходна для ўтварэння гукаў мовы. Сукупнасць А. складае артыкуляцыйную базу мовы. Беларускай артыкуляцыйнай базе ўласціва перавага А. з высокім становішчам языка, паслабленне дзеяння кончыка языка пры вымаўленні мяккіх зычных, у выніку чаго яны атрымліваюцца мякчэйшымі, чым, напрыклад, адпаведныя рускія гукі. Спецыфічна беларускія асаблівасці — губна-губная А. пры вымаўленні «ў», працяжнае вымаўленне «г», змычна-шчылінная А. пры вымаўленні «дж», «дз» і інш. А. таксама называюць ступень выразнасці вымаўлення, па якой ацэньваецца якасць вымаўлення асобных людзей. Выразная А. неабходная для акцёраў, чытальнікаў, дыктараў радыё і тэлебачання і інш.

**АРТЫ́СТ**, -а. 1. Той, хто займаецца публічным выкананнем твораў сцэнічнага мастацтва (акцёр, спявак, музыкант і інш.). На Беларусі першымі А. былі скамарохі, батлеечнікі-імправізатары. 2. Той, хто валодае вялікім майстэрствам у якой-н. галіне, таленавіта робіць што-н.

**АРТЫСТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да артыста; уласцівы артысту. 2. Які вызначаецца артыстызмам.

**АРТФАЕ́**. Артыстычнае фае, памяшканне для адпачынку артыстаў.

**АРФАГРА́ФІЯ ПАЭТЫ́ЧНАЯ**. Сукупнасць асаблівасцей, якія характарызуюць прымяненне правілаў арфаграфіі ў паэтычных тэкстах. Звычайна гэта адхіленне ад правілаў традыцыйнай арфаграфіі, якое дапускаецца ў паэтычнай мове і выклікана графічнымі асаблівасцямі запісу вершаванага тэксту або патрабаваннямі метрыкі, рытму ці рыфмы.

**АРФАЭ́ПІЯ**, -і. Сукупнасць правілаў вымаўлення, уласцівых літаратурнай мове.

**АРХАІ́ЗМЫ**, -аў. Адна з дзвюх разнавіднасцей устарэлай лексікі. У адрозненне ад гістарызмаў паяўленне А. звязана не са стратай, знікненнем адпаведных рэалій, а з выцясненнем ранейшай назвы новай.

**АРХЕ́СТРА**, -ы. Цэнтральная частка тэатра Старажытнай Грэцыі. У 5 ст. да н. э. А. была месцам выступлення хору і акцёраў. Уяўляла сабой круглую пляцоўку (дыяметрам 20 м і больш) з утрамбаванай земляной падлогай. З канца 5 ст. да н. э. у сувязі з перанясеннем дзеяння п'есы на праскеній значэнне А. павялічваецца. У эліністычным тэатры А. выкарыстоўвалася толькі як месца для выступлення хору. Паколькі ў старажытнай рымскай драме хор адсутнічаў і дзеянне было перанесена на сцэнічную пляцоўку, памеры А. былі зменшаны і яна атрымала форму паўкруга. У Рымскай імперыі А. выкарыстоўваліся для баёў гладыятараў.

**АРХІТЭКТУ́РНАЕ АФАРМЛЕ́ННЕ**. Адзін са спосабаў дэкарацыйнага афармлення спектакля. Пры А. а. дэталі дэкарацый робяцца ў трох вымярэннях (жывапісныя дэкарацыі маюць толькі два вымярэнні), у выніку чаго яны ўспрымаюцца як аб'ёмныя не толькі з глядзельнай залы, але і са сцэны. Вялікае значэнне мае фактура дэталяў і іх вага. Таму ў архітэктурных дэкарацыях шырока выкарыстоўваюцца розныя віды сінтэтычных матэрыялаў і пластмас (вініпласт, пенапласт і інш.), а таксама пустацелыя рэльефныя і аб'ёмныя бутафорскія дэталі.

**АСАНА́НС**, -у. Паўтарэнне ў вершы аднолькавых або падобных галосных гукаў; недакладная рыфма, у якой супадаюць толькі націскныя гукі. А., як і алітэрацыя, з якой ён звычайна спалучаецца, надае паэтычнаму твору мілагучнасць і сэнсава-эмацыянальную выразнасць.

**АСАЦЫЯ́ЦЫЯ**, -і. Заснаваная на нервова-псіхічных працэсах сувязь паміж асобнымі ўяўленнямі, думкамі, пачуццямі, пры якой адно выклікае другое.

**АСВЯТЛЕ́ННЕ**, -я. 1. Святло ад якой-н. крыніцы. 2. Сукупнасць прылад і прыбораў святла ў тэатры. 3. Растлумачэнне, дэталёвы разгляд, разбор чаго-н.

**АСВЯТЛІ́ЦЬ**, асвятлю, асве́тліш, асве́тліць. 1. Зрабіць светлай якую-н. прастору, прадмет, акцёра; напоўніць святлом сцэну, залу, фае. 2. Забяспечыць асвятляльнымі прыборамі, прыстасаваннямі, устаноўкамі неабходную колькасць святла на сцэне.

**АСВЯТЛЯ́ЛЬНІК**, -а. Асоба, службовым абавязкам якой з'яўляецца асвятленне сцэны, стварэнне светлавых эфектаў і інш.

**АСВЯТЛЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які прызначаны для штучнага асвятлення.

**АСІ́ПЛЫ**, -ая, -ае. Які страціў чысціню і гучнасць голасу; сіпаты.

**АСІ́ПНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Страціць чысціню і гучнасць голасу; стаць сіпатым.

**АСО́БА**, -ы. 1. Сукупнасць уласцівасцей пэўнага чалавека, якія складаюць яго індывідуальнасць; чалавек з пункту погляду яго характару, паводзін, становішча. 2. Індывідуум.

**АСТРАФІ́ЧНЫ ВЕ́РШ**. Вершаваная форма, у якой не захоўваецца падзел на строфы (аднолькавыя ці розныя), а звязанасць радкоў дасягаецца сінтаксічнымі спалучэннямі, перыядамі, пераносамі і інш. У А. в. можна вылучыць аб'яднаныя рыфмамі радковыя пары ці шматрадковыя кавалкі тэксту. А. в. найчасцей пішуцца творы вялікага аб'ёму: паэма, вершаваныя аповесці.

**АСФАЛЕ́Й СІСТЭ́МА**. Сістэма ўладкавання рухомага планшэта сцэны; падзел планшэта сцэны на пад'ёмна-апускныя планы, якія робяць яго рухомым. Кожны план у сваю чаргу можа быць падзелены на некалькі рухомых частак. Планы, замацаваныя на асобных рухомых стрыжнях, могуць не толькі падымацца над узроўнем планшэта сцэны і апускацца ўніз, але і паварочвацца, нахіляцца. Для прывядзення ў дзеянне рухомага планшэта пад падлогай сцэны (у труме) устанаўліваецца гідраўлічная сілавая ўстаноўка. А. с. вынайдзена аўстрыйскім інжынерам Гвінерам у 1833 г.

**АТМАСФЕ́РА СЦЭНІ́ЧНАЯ**. Характар эмацыянальнага жыцця акцёраў ва ўмовах сцэны.

**АТРЫБУ́Т**, -а. 1. Неабходная, істотная, неад'емная ўласцівасць прадмета або з'явы ў адрозненне ад выпадковых, мінучых. 2. Пастаянная прыналежнасць,

характэрная прыкмета. У мастацтве А. — пастаянная вызначальная прыкмета (прадмет) пэўнага героя твора, часцей за ўсё на міфалагічны і біблейскі сюжэты, напрыклад: паліца і львіная скура ў Геркулеса; скіпетр і арол у Зеўса; у Артэміды — лань; у Афіны — эгіда і сава і пад. А. часта з'яўляецца асноўным паказальнікам для вызначэння сюжэта карціны ці характарыстыкі героя твора.

**АТРЫБУ́ЦЫЯ**, -і. Устанаўленне аўтарства непадпісанага або псеўданімнага літаратурнага, навуковага, мастацкага твора, вызначэнне яго прыналежнасці да пэўнага гістарычнага часу. Адна з галоўных і самых старажытных праблем тэксталогіі і мовазнаўства. Цесна звязана з атэтэзай — адмаўленнем прыналежнасці твора пэўнай асобе.

**АЎТАЛО́ГІЯ**, -і. Выкарыстанне ў паэтычным творы слоў і выразаў у іх прамым значэнні. Аўталагічны стыль процістаўляецца вобразнаму, фігуральнаму, т. зв. метафарычнаму стылю. А. асабліва прыдатная для дакладных рэалістычных апісанняў і часта сустракаецца ў паэмах.

**АЎТАНІ́М**, -а. Сапраўднае імя аўтара, які піша пад псеўданімам.

**А́ЎТАР**, -а. Стваральнік мастацкага ці публіцыстычнага твора, навуковага даследавання, праекта, вынаходніцтва і інш.

**А́ЎТАРСКАЯ МО́ВА**. Адзін з элементаў моўнай структуры літаратурнага твора. У залежнасці ад індывідуальных асаблівасцей таленту пісьменніка А. м. займае рознае месца ў літаратурным тэксце. Прыхільнікі лірычнай прозы карыстаюцца А. м. значна часцей, чым эпікі і аўтары драматургічных твораў. А. м. можа быць зведзена да мінімуму і выяўляецца ў рэмарках, апісаннях, лірычных і публіцыстычных адступленнях і інш.

**АФАРМЛЕ́ННЕ СПЕКТА́КЛЯ**. Арганізацыя ўсіх сродкаў сцэнічнай выразнасці, якія надаюць спектаклю пэўную форму. У А. с. уваходзяць: дэкарацыя, касцюм тэатральны, грым, бутафорыя, рэквізіт, святло, шумы, музыка.

**АФАРЫ́ЗМ**, -а. Трапны лаканічны выраз павучальнага характару; сентэнцыя, павучанне, выслоўе.

**АФЕ́КТ**, -у. Праяўленне вялікага нервовага ўзрушэння.

**АФЕКТАВА́НЫ**, -ая, -ае. Штучны, ненатуральна прыўзняты.

**АФЕКТА́ЦЫЯ**, -і. Незвычайная ўзрушанасць, штучнасць у манерах, паводзінах, прыўзнятасць мовы.

**АФІ́ША**, -ы. Аб'ява аб спектаклі, канцэрце, лекцыі і інш., якая вывешваецца на відным і людным месцы.

**АФІШЫ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Выставіць (выстаўляць) напаказ, шырока абвясціць (абвяшчаць).

**АФРЫКА́ТА**, -ы. Складаны зычны гук (у бел. мове — дж, дз, ч, ц).

**АЦЭ́НКА**, -і. Думка, меркаванне пра якасць, годнасць, значэнне каго-, чаго-н.

**АЦЭ́НКА АКЦЁРСКАЯ**. Вызначэнне, успрыманне і асэнсаванне псіхафізічных дзеянняў партнёра (партнёраў) на сцэне.

**АЧУЖЭ́ННЕ**, -я. Мастацкі прыём, прынцып тэорыі эпічнага тэатра Б. Брэхта, адна з формаў разбурэння сцэнічнай ілюзіі: 1) разбурэнне аб'ектыўнай уяўнасці з'явы, традыцыі яе мастацкага ўвасаблення, паказ яе з незнаёмага боку ("рабіць штодзённае незвычайным"); 2) разбурэнне стэрэатыпаў успрымання спектакля гледачом, актывізацыя яго пазіцыі, унушэнне крытычных адносін да адлюстраванай з'явы; 3) асаблівасці акцёрскай ігры, заснаваныя на адмаўленні ад абсалютна адэкватнага пераўвасаблення, ад патрабавання, каб асоба акцёра паядноўвалася з увасобленым вобразам. Часцей А. дасягаецца ў зонгах. А. даволі шырока выкарыстоўваецца ў сучаснай драматургіі і тэатры, асабліва калі дзейная асоба адначасова з'яўляецца і вядучым, які ад імя аўтара каменціруе ход падзей.

**БАГА́ТАЯ РЫ́ФМА.** Від рыфмы, утворанай пашырэннем у клаўзулах вершаваных радкоў не толькі націскных галосных і наступных за імі гукаў, але і гукаў, якія папярэднічаюць націскному галоснаму. Выкарыстоўваецца для ўзмацнення рытмічнага ладу вершаў і іх эўфанічна-інтанацыйнай выразнасці.

**БА́ЕЧНІК**, -а. Той, хто расказвае байкі.

**БАЙ**, ба́я. Міфічная істота дзіцячага фальклору, якая расказвае байкі, казкі.

**БА́ЙКА**, -і. 1. Кароткі літаратурны твор алегарычнага зместу. Як жанр вядома са старажытных часоў; блізкая да прытчы і апалога. Звычайна ў канцы ці ў пачатку твора даецца т. зв. мараль, якая выяўляе яго асноўны сэнс. У Старажытнай Грэцыі Б. стварыў Эзоп (6 ст. да н. э.; па яго імю іншасказальную мову назвалі эзопавай мовай), у Рыме — Федр (1 ст. да н. э.). З байкапісцаў пазнейшага часу найбольш вядомыя Ж. Лафантэн (1621 — 1695) і І. А. Крылоў (1769 — 1844). Высокай дасканаласці беларуская Б. дасягнула ў творчасці К. Крапівы. 2. *часцей мн.* (байкі, баек). Пустыя размовы, выдумкі.

**БАЛАБО́Н**, -а. Балбатун, пустаслоў.

**БАЛАБО́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Балбатаць, малоць лухту.

**БАЛАГА́Н**, -а. Старадаўні народны вандроўны тэатр; тэатральнае відовішча з прымітыўным сцэнічным афармленнем.

**БАЛАГА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Блазнаваць, крыўляцца.

**БАЛА́ДА**, -ы. 1. Вершаваны твор асобай формы на легендарную ці гістарычную тэму. 2. Музычны твор ліра-эпічнага ці эпічна-гістарычнага характару для голасу або інструмента.

**БАЛА́ДНАЯ О́ПЕРА**. Англійская разнавіднасць камічнай оперы; у 18 ст. распаўсюджанне атрымала таксама ў Італіі, Францыі, Германіі, Іспаніі. У Б. о. песні і танцы чаргаваліся з размоўнымі сцэнамі.

**БАЛА́КА**, -і. Вясёлы гаварун, жартаўнік.

**БАЛАМУ́Т**, -а. 1. Чалавек, які ўносіць беспарадак, разлад. 2. Прайдоха, інтрыган, спакуснік.

**БАЛАМУ́ТА**, -ы. Сумятня, неразбярыха, бязладдзе.

**БАЛАМУ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Неспакойны, здатны на розныя штукі. 2. Падманлівы, спакуслівы. 3. Галаваломны, цяжкі.

**БАЛАМУ́ЦІЦЬ**, -му́чу, -му́ціш, -му́ціць. 1. Сеяць неспакой, уносіць разлад, неразбярыху. 2. Зачароўваць, спакушаць.

**БАЛБАТА́ЦЬ**, -бачу́, -бо́чаш, -бо́ча. 1. Шпарка, несупынна гаварыць. 2. Гучна, але невыразна гаварыць. 3. Распускаць чуткі. 4. Весці пустыя размовы.

**БАЛВА́НКА**, -і. Мадэль чалавечай галавы ў натуральную велічыню, служыць для вырабу парыкоў і галаўных убораў.

**БАЛКО́Н**, -а. Месца для гледачоў у сярэдніх і верхніх ярусах тэатра.

**БАМБІЛА́ТКА**, -і. Упрыгожанне галаўных убораў — металічныя ланцужкі, шкляныя шарыкі, бісер, блішчынкі.

**БАНА́ЛЬНАЯ РЫ́ФМА**. Збітая, пазбаўленая арыгінальнасці рыфма, якая ў выніку частага ўжывання рознымі паэтамі страціла сваю навізну і неспадзяванасць. Б. р. — сугуччы ніжэйшага гатунку.

**БАНКЕ́ТКА**, -і. Тып нізкага табурэта з мяккім сядзеннем прамавугольнай або круглай формы.

**БАРАБА́Н ГАРЫЗО́НТА**. Катушка, на якую накручваецца палатно сцэнічнага гарызонта.

**БАРАБА́ННЫ КРУ́Г**. Паваротны круг сцэны з убудаванымі ў яго пад'ёмна-апускнымі пляцоўкамі. Звычайна канструкцыя паваротнага круга мае два-тры паверхі.

**БАРД**, -а. Спявак-паэт старажытных кельцкіх плямёнаў; у вобразным ужыванні — наогул паэт, пясняр.

**БАТЛЕ́ЙКА**, -і. Беларускі народны тэатр лялек. Вядомы з 16 ст. Тэатр батлейкавага тыпу ў розных рэгіёнах Бела-

русі меў назвы: яселка, батляемка, остлейка, жлоб, вяртэп.

**БА́ЧАННЕ**, -я. 1. Разумовае ўсведамленне, успрыманне навакольнага свету. 2. Пачуццёвае адчуванне артыстам унутраных перажыванняў, хваляванняў дзейнай асобы п'есы.

**БАШМА́К**, -á. Своеасаблівы тормаз у выглядзе клінападобнай калодкі, якая падкладаецца пад колы сцэнічнай фуркі. Спецыяльнае прыстасаванне, якім карыстаюцца рабочыя сцэны ў час зборкі павільёна для падтрымкі верхніх частак павільёна, столі і інш. Б. уяўляе сабою жэрдку даўжынёй 3 — 9 м, дыяметрам 2 — 2,5 см, якая мае на верхнім канцы папярэчыну даўжынёй 15 — 20 см.

**БЕ́ДНАЯ РЫ́ФМА**. Від рыфмы, у якой адсутнічае сугучча пераднаціскных апорных зычных гукаў. Яе гісторыя ў беларускім вершаскладанні пачынаецца з твораў Ф. Скарыны — яго прадмоў да кніг «Иов», «Исход».

**БЕ́ЛЫ ВЕРШ**. Нерыфмаваны верш у сілабічным і сілаба-танічным вершаскладанні. У беларускай літаратуры ўпершыню ўжыты С. Полацкім у творах на лацінскай мове. Найчасцей карысталіся і карыстаюцца ім аўтары драматычных паэм.

**БЕЛЬЭТА́Ж**, -а. Першы ярус глядзельнай залы над амфітэатрам, бенуарам у тэатры.

**БЕНЕФІ́С**, -у. Спектакль, збор з якога ідзе на карысць аднаго з удзельнікаў.

**БЕНЕФІ́СНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да бенефісу.

**БЕНЕФІЦЫЯ́НТ**, -а. Артыст, на карысць якога даецца бенефісны спектакль.

**БЕНУА́Р**, -а. Ложы ў тэатры з двух бакоў партэра на ўзроўні сцэны або трохі ніжэй. Упершыню з'явіліся ў французскім тэатры ў 18 ст.

**БЕСКАНФЛІ́КТНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць бесканфліктнага; адсутнасць канфлікту.

**БЕСПАРДО́ННЫ**, -ая,-ае. Бессаромны, нахабны.

**БЕССАРДЭ́ЧНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць бессардэчнага; жорсткасць.

**БЕССАРДЭ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Бяздушны, жорсткі, пазбаўлены сардэчнасці, чуласці.

**БЕССАРО́МНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць сораму; нахабства.

**БЕССАРО́МНІК**, -а. Той, хто не прытрымліваецца правілаў прыстойнасці; нясціплы, бессаромны чалавек.

**БЕССАРО́МНЫ**, -ая, -ае. Які не мае сораму, нахабны.

**БЕСТАКТО́ЎНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць бестактоўнага; адсутнасць такту.

**БЕСТАКТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не прытрымліваецца такту ў абыходжанні з людзьмі; нетактоўны.

**БЕСТАЛКО́ВЫ**, -ая, -ае. Някемлівы, няцямлівы, неразумны, бязладны.

**БЕСТСЕ́ЛЕР**, -а. Ходкая, выдадзеная вялікім тыражом кніга.

**БЕСТУРБО́ТНЫ**, -ая, -ае. Які з лёгкасцю адносіцца да жыццёвых спраў і турбот; бесклапотны.

**БЕСХАРА́КТАРНЫ**, -ая, -ае. Які лёгка паддаецца чужому ўплыву; бязвольны.

**БЕСЦЫРЫМО́ННАСЦЬ**, -і. Уласцівасць бесцырымоннага; развязнасць.

**БЕСЦЫРЫМО́ННЫ**, -ая, -ае. Які не звяртае ўвагі на агульнапрынятыя нормы паводзін; развязны.

**БІБЛІЯГРА́ФІЯ**, -і. 1. Навуковае, сістэматызаванае апісанне кніг і іншых выданняў, зробленае па якой-н. прыкмеце; галіна ведаў аб спосабах такога апісання. 2. Спіс кніг і артыкулаў па якім-н. пытанні, прадмеце. 3. Аддзел у часопісе, дзе змяшчаюцца рэцэнзіі або нататкі пра новыя кнігі.

**БІГУДЗІ́**. Металічныя, пластмасавыя ці гумавыя трубачкі, на якія накручваюць валасы, каб надаць ім хвалістасць.

**БІЖУТЭ́РЫЯ**, -і. Жаночыя ўпрыгожанні, зробленыя з некаштоўных камянёў і металаў, керамікі, скуры, пластмасы, шкла.

**БІЛЕ́Т**, -а т э а т р а л ь н ы. Дакумент, які дае права ўваходу ў тэатр на спектакль, канцэрт.

**БІЛЕЦЁР**, -а. Службовая асоба, якая кантралюе ўваходныя білеты ў тэатры, кіно, цырку, музеі і інш. установах.

**БІЛІНГВІЗМ**, -у. Валоданне і папераменнае карыстанне адной і той жа асобай ці калектывам дзвюма рознымі мовамі або рознымі дыялектамі адной мовы.

**БІС**. Выгук, які выказвае просьбу паўтарыць толькі што выкананы артыстамі нумар.

**БІСЕР**, -у. Дробныя круглыя ці шматгранныя пацеркі з шкла, з адтулінай для нанізвання. Выкарыстоўваюцца для ўпрыгожання галаўных убораў, касцюмаў, аксесуараў.

**БІЯДЫНАМІКА**, -і. Вучэнне аб агульнай жыццядзейнасці арганізма.

**БІЯМЕХАНІКА**, -і. Раздзел біяфізікі, які вывучае развіццё, будову і дзейнасць рухальнага апарату чалавека і жывёл. Тэрмін Б. выкарыстоўваўся У. Меерхольдам для апісання сістэмы фізічнай трэніроўкі акцёра, асноўнай мэтай якой з'яўляецца неадкладнае выкананне заданняў рэжысёра. Біямеханічная тэхніка выканання супрацьлеглая метаду, заснаванаму на натхненні і асацыіраваных эмоцыях акцёра.

**БЛАГА**. 1. Пра дрэнныя, неспрыяльныя абставіны, акалічнасці. 2. Пра цяжкі фізічны або душэўны стан каго-н.

**БЛАГІ**, -ая, -бе. 1. Які не мае станоўчых якасцей, не адпавядае патрабаванням маралі, адмоўна ацэньваецца. 2. Які заслугоўвае асуджэння, дрэнны (пра справы, учынкі, думкі). 3. Непрыемны для іншых (пра манеры, характар і пад.).

**БЛАЗАН** і **БЛАЗЕН**, -зна. 1. Пра непаўналетняга чалавека, хлапчука. 2. Малады чалавек несур'ёзных паводзін. 3. Асоба пры двары манарха ці феадала, якая павінна была весяліць гаспадара і гасцей.

**БЛІСКАЎКІ**, -вак і **БЛІШЧЫНКІ**, -нак. Дробныя слюдзяныя пласцінкі розных памераў, формы і колеру; імі ўпрыгожваюць галаўныя ўборы, касцюмы, аксесуары.

**БЛЮЗНЕРСТВА**, -а. Зневажанне, ганьбаванне Бога, святых; зневажанне чаго-н. вельмі дарагога, паважанага.

**БОТЫ**, -аў. Шыты скураны абутак, вядомы ўсходнім славянам здаўна (згадваецца ў пісьмовых крыніцах 10 — 11 ст.).

**БОЎДЗІЛА**, -а. Пра чалавека разумова адсталага; недарэка.

**БРАВА**. Вокліч, які азначае захапленне, пахвалу, адабрэнне.

**БРАВАДА**, -ы. Паказная легкадумная смеласць.

**БРАВІСІМА**. Тое, што і б р а в а, але ў больш моцнай ступені.

**БРАВУРНЫ**, -ая,-ае. Шумны, бадзёры, прыўзняты (пра музыку).

**БРАВЫ**, -ая, -ае. Мужны з выгляду, маладзецкі; удалы.

**БРАВЭРКА**, -і. Верхняя кароткая мужчынская вопратка звычайна з аўчын, абцягнутых саматканым сукном.

**БРАНЗАЛЕТ**, -а. Упрыгожанне ў выглядзе вялікага кальца з высакародных металаў, слановай косці і пад., якое носяць на руцэ вышэй кісці.

**БРАНХІТ**, -у. Запаленне слізістай абалонкі бронхаў.

**БРАНХІЯЛЬНЫ**, -ая,-ае. Які мае адносіны да бронхаў.

**БРЫГЕЛА**, -ы. 1. Традыцыйны персанаж італьянскай камедыі дэль артэ. 2. Разумны, хітры, вынаходлівы, злы хлапец, які не спыняецца ні перад чым для таго, каб уладзіць свае справы, мець карысць.

**БРЫДА**, -ы. 1. Што-н. непрыемнае, брыдкае, паскуднае; дрэнь, гадасць. 2. Пра каго-н. агіднага, паскуднага.

**БРЫДЖЫ**, -аў. Штаны асобага крою, вузкія ўніз ад калена (першапачаткова прызначаліся для верхавой язды).

**БРЫДКА**. Сорамна, непрыемна, агідна.

**БРЫДКІ**, -ая, -ае. 1. Непрыгожы з выгляду, гадкі. 2. Ганебны, благі, паганы; непрыстойны, брудны, пахабны.

**БРЫДОТА**, -ы. 1. Тое, што выклікае агіду. 2. Непрыстойнасць, паскудства; брыдкі ўчынак.

**БРЫДЫ**, -аў. Завітыя ў кудзеры доўгія валасяныя пасмы, якія прышывалі да манцюра пры вырабе алонжавага парыка.

**БРЫЖЫ**, -аў. Плоены каўнер з моцна накрухмаленай тонкай тканіны.

**БРЫЖЫ**, -оў. Вузкая палоска тканіны, сабраная ў зборачкі, якой аздабляюць адзенне і інш.

**БРЫЛЬЯНЦІ́Н**, -у. Касметычны сродак для валасоў, які надае ім бляск.

**БРЫ́НДА**, -ы. Пра таго, хто без патрэбы ходзіць, сланяецца, нічога не робіць.

**БРЫ́НДАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Хадзіць, совацца без патрэбы; сланяцца, нічога не робячы.

**БРЭ́НЗЛІ**, -яў. Махры ў хустцы, настольніку і пад.

**БУЗАЦЁР**, -а. Задзіра, скандаліст.

**БУ́КЛІ**, -яў. Завітыя кольцамі пасмы валасоў.

**БУКО́ЛІКА**, -і. Жанр антычнай паэзіі, якая паказвала побыт пастухоў, ідэалізавала вясковае жыццё, проціпастаўляючы яго гарадской культуры.

**БУЛЬВА́РНЫ**, -ая, -ае. Разлічаны на абывацельскія, мяшчанскія густы; пошлы.

**БУЛЮЛЮ́**. Вандроўны акцёр у Іспаніі 16 ст. Хадзіў па вёсках і разыгрываў прымітыўныя камедыйныя сцэнкі, у якіх выконваў усе ролі.

**БУРКЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які любіць бурчаць, выказваць незадаволенасць, раздражненне.

**БУРЛЕ́СКА**, -і. У літаратуры — жанр камічнай, парадыйнай паэзіі.

**БУРЫМЕ́**. Верш, напісаны на загадзя вядомыя рыфмы. Узнікла ў Францыі ў 1-й палове 17 ст. як чыста літаратурная забава. З 20 ст. Б. становіцца пераважна эстрадным жанрам: гледачы называюць рыфмы, артыст-вершаскладальнік экспромтам прыдумвае на гэтыя рыфмы вершаваны тэкст. У беларускай народнай паэзіі Б. вядома з даўніх часоў, але тут яно ў адрозненне ад літаратурнага Б. не з'яўлялася вершам-забавай.

**БУТАНЬЕ́РКА**, -і. Кветка або букецік кветак, якія прышпільваюцца да жаночай сукенкі або прасоўваюцца ў пятліцу пінжака ў якасці ўпрыгожання.

**БУТАФО́Р**, -а. Супрацоўнік тэатра, адказны за бутафорыю, а таксама майстар, які яе выраблюе.

**БУТАФО́РЫЯ**, -і. 1. Прадметы абстаноўкі ў спектаклі (мэбля, посуд, зброя і інш.), а таксама штучныя прадметы, выстаўленыя на вітрынах магазінаў замест сапраўдных. 2. Падман, бачнасць, фальш, разлічаныя на знешні эфект.

**БУФ**. 1. Камічны, забаўны. 2. Тэрмін, які прымяняецца для абазначэння акцёраў, якія карыстаюцца прыёмамі буфанады, элементамі скамароства, блазанства або цыркавога прадстаўлення.

**БУФАНА́ДА**, -ы. 1. Манера акцёрскай ігры або сцэнічнае прадстаўленне з перабольшанымі камічнымі сітуацыямі для павелічэння эфекту. 2. Недарэчнае, недасціпнае, грубае штукарства.

**БУФО́Н**, -а. Як і прыдворны блазан, буфон — акцёр другарадны, ён існуе ў большасці камедыйных п'ес. Буфон (блазан) дысаніруе ўсюды, дзе з'яўляецца: ён прасталюдзін пры двары, распуснік сярод дабрамысных паноў, баязлівец сярод салдат, абжора — для эстэтаў, грубіян — для пурытан. Б. нястомны і бессмяротны: нікому яшчэ не ўдалося зрабіць з яго вінаватага, бо яго слова, калісьці слова прыдворнага блазна, з'яўляецца забароненым, але да яго прыслухоўваюцца.

**БУФО́НСТВА**, -а. Штукарства, крыўлянне.

**БУ́ФЫ**, -аў. Пышныя і частыя зборкі ў верхняй частцы рукава; элегантныя ўпрыгожанні з газу, батысту, карункаў да складанай прычоскі-куафюр 18 ст.

**БЫЛІ́НА**, -ы. Народная эпічная песня пра подзвігі герояў, манументальныя вобразы якіх увасабляюць лепшыя рысы народа, яго сілу, працавітасць, вернасць роднай зямлі. Як жанр афармілася з канца 10 да сярэдзіны 13 ст., што супадае з часам росквіту Кіеўскай дзяржавы і пачаткам феадальнай раздробленасці Старажытнай Русі. Назва «быліна» як азначэнне жанру ўжывалася побач з больш пашыранымі назвамі «старына», «старынка».

**БЫЛІ́ННЫ ВЕРШ**. Адна з найбольш старажытных формаў народнага верша, звязаная з традыцыямі інтанацыйна-сказавага вершаскладання.

**БЫЛІ́ЦА**, -ы. Эпічны жанр у беларускай літаратуры 19 ст. У фарміраванні яго важную ролю адыгралі гутарковыя традыцыі фальклорнай былічкі і вуснага народнага апавядання. Блізкая да гавэнды, кампазіцыйнай асаблівасцю якой

з'яўляецца наяўнасць вобраза апавядальніка, чалавека дасведчанага і бывалага. У Б. апавядальнікам звычайна выступае селянін.

**БЫЛІ́ЧКА**, -і. Жанр фальклорнай прозы, кароткае вуснае апавяданне пра незвычайныя падзеі, якія нібы адбыліся ў сапраўднасці: сустрэчы з чортам, лесавіком і інш. фантастычнымі істотамі. Блізкія да казак, легенд і паданняў.

**БЯЗЛІ́ТАСНЫ**, -ая, -ае. Які не мае літасці, жалю, спачування; жорсткі, суровы.

**БЯССЭ́НСІЦА**, -ы. Недарэчнасць, глупства, лухта.

**БЯСТА́КТНЫ**, -ая, -ае. Які не выяўляе такту ў абыходжанні з кім-н.; нетактоўны.

**БЯСЧУ́ЛЫ**, -ая, -ае. **1**. Які не мае здольнасці адчуваць. **2**. Які не праяўляе чуласці, спагадлівасці; раўнадушны.

## В

**ВА́БІЦЬ**, -блю, -біш, -біць. Захапляючы, зачароўваючы сваім выглядам, прыцягваць да сябе; выклікаць цікавасць да сябе, прыхільнасць, сімпатыю.

**ВА́БНЫ**, -ая, -ае. Які вабіць, зачароўвае сваім выглядам, цягне да сябе; прывабны.

**ВА́ГА**, -і. У лялечным тэатры прыстасаванне для кіравання лялькай-марыянеткай.

**ВАГА́НТЫ**, -аў. Сярэдневяковыя вандроўныя спевакі-казачнікі, якія паходзілі з асяроддзя семінарыстаў або былых свяшчэннікаў. В. карысталіся вялікай папулярнасцю ва ўсіх краінах Заходняй Еўропы. У сваіх вальнадумных песнях В. высмейвалі царкоўнікаў, парадыравалі малітвы і літургію, ухвалялі зямныя радасці, каханне, віно, весялосць. З застольных песень В. склаліся шматлікія студэнцкія песні, у тым ліку «Гаудэамус». Падвергнутыя жорсткаму ўціску з боку царквы, у 13 ст. В. спынілі сваю дзейнасць.

**ВАГА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. **1**. Быць у нерашучасці, адчуваць няўпэўненасць; сумнявацца. **2**. Быць няўстойлівым, хісткім, непастаянным.

**ВАДЭВІ́ЛЬ**, -я. Жартоўная п'еса, у якой дыялогі чаргуюцца з песнямі, маналогамі. З 15 ст. у Нармандыі былі распаўсюджаны народныя песенькі-вадэвіры, пазней з'яўляецца жанр камічнай оперы, а ў 19 ст. Скрыб і Лабішператварылі вадэвіль у лёгкую камедыю без прэтэнзій на інтэлектуальнасць.

**ВАКА́ЦЫІ**, -яў. Канікулы.

**ВАЛАПЮ́К**, -а. Створаная штучным шляхам мова, якую імкнуліся ў 19 ст. выкарыстаць у якасці міжнароднай; набор незразумелых слоў; тарабаршчына.

**ВАНДА́Л**, -а. Той, хто разбурае помнікі культуры, мастацтва, варвар; пра некультурнага, грубага, цёмнага чалавека.

**ВА́РВАРСТВА**, -а. Невуцкія, абыякавыя адносіны да культурных каштоўнасцей.

**ВАР'ЕТЭ́**. Від тэатраў, у якіх спалучаюцца розныя жанры: тэатральнага, музычнага, эстраднага і цыркавога мастацтва. Назва ад тэатра «Вар'етэ», заснаванага ў Парыжы ў 1720 г. Тэрмін В. адпавядае і паняццю «эстрада», якое ахоплівае прадстаўленні кабарэ і тэатраў. Спектаклі В. носяць пераважна лёгкі, пацяшальны характар. У праграму В. уваходзяць аднаактовыя п'есы, асобныя сцэнкі, выступленні спевакоў, чытальнікаў, танцораў, музыкантаў, акрабатаў, жанглёраў, фокуснікаў.

**ВАСЬМІРАДКО́ВІК**, -а. Від верша з васьмі радкоў, завершаных па сэнсу і рытмічна-інтанацыйнаму малюнку. Першую частку В. складае вобразна разгорнутая эмацыянальна-лагічная пасылка медытацыйнага характару, другую — вывад, выказаны афарыстычна ў форме

прытчы, антытэзіса, паэтычнага парадокса, іроніі.

**ВАСЬМІРАДКО́ЎЕ**, -я. Страфа з васьмі вершаваных радкоў, для якой характэрна сэнсавая, кампазіцыйная, інтанацыйна-рытмічная закончанасць і ўпарадкаванасць рыфмы.

**ВАЎКАЛА́К**, -а. Паводле паданняў — чалавек (часам мярцвяк), здольны абарочвацца ў воўка; пярэварацень.

**ВЕ́ЖЫ ПАРТА́ЛЬНЫЯ**. Частка іграводй партальнай аркі сцэны; уяўляе сабой металічную або драўляную канструкцыю, якая можа рухацца паралельна архітэктурнаму парталу, калі неабходна скараціць шырыню ігравога партала. На сучасных В. п. манціруецца вялікая колькасць асвятляльнай апаратуры і пульты кіравання памочніка рэжысёра, асвятляльніка, машыніста сцэны. В. п. з боку глядзельнай залы закрываюцца нейтральнымі або спецыяльнымі драпіроўкамі, дэталямі афармлення.

**ВЕ́РА**, -ы. 1. Упэўненасць у чым-н., у здзяйсненні, ажыццяўленні чаго-н. 2. Перакананне ў дадатных якасцях каго-н. 3. Перакананне ў рэальным існаванні звышнатуральных сіл; рэлігійнае вучэнне; веравызнанне.

**ВЕРБА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Вусны.

**ВЕРЛІ́БР**, -а (в о л ь н ы  в е р ш). Верш, які характарызуецца адсутнасцю рыфмы і няпэўнай колькасцю стоп у радку.

**ВЕРСІФІКА́ТАР**, -а. Паэт, які добра валодае тэхнікай вершаскладання; той, хто піша беззмястоўныя ці бяздарныя вершы.

**ВЕРХАВА́Я ЛЯ́ЛЬКА**. У лялечным тэатры — лялька, якая знаходзіцца ў час спектакля над шырмай, вышэй лялькавода, які з ёю працуе і схаваны за шырмай.

**ВЕ́РХНЯЯ СЦЭ́НА**. Частка сцэнічнай прасторы. Знаходзіцца над ігравой пляцоўкай (паміж першай рабочай галерэяй і дахам). Складаецца з 2 частак: а) надкаласніковай прасторы, дзе размешчана пляцоўка верхніх блокаў пад'ёмнага ўстройства і дах з канструкцыяй, якая яго падтрымлівае; б) прасторы ад каласнікоў да першых бакавых рабочых галерэй; гэтая частка В. с. мае сістэму пад'ёмаў з процівагамі (калкашы, грузы) і накіроўваючых (шпунты), а таксама бакавыя рабочыя галерэі, пераходныя масткі, палётныя ўстройствы, механізмы для небасхілаў і панарам.

**ВЕРШ**, -а. Невялікі лірычны або ліра-эпічны твор, напісаны вершаванай мовай. Паэзія выпрацавала цэлую сістэму вершаваных жанраў (ода, эпіграма, сатыра, элегія і інш.). Багаты, разнастайны В. і па форме. Ён карыстаецца рознымі відамі рытму, гукавой арганізацыі, архітэктонікі, паэтычнага сінтаксісу, тропаў, валодае своеасаблівай інтанацыяй, кампазіцыйнымі сродкамі. У беларускай літаратуры В. (творы і сам тэрмін) з'явіліся ў пачатку 16 ст. у творчасці Ф. Скарыны. Спачатку гэтым словам называлі двухрадкоўі, змацаваныя рыфмамі, пасля — усякі твор, напісаны вершаванай мовай.

**ВЕРШ У ПРО́ЗЕ**. Паэтычны твор у празаічнай форме. У ім няма вершаванага рытму, метра, рыфмы, але ёсць многія прыкметы паэтычнага твора.

**ВЕРШАРА́Д**, -у. Вершаваны радок, у якім цалкам змяшчаецца схема вершаванага памеру.

**ВЕЧАРЫ́ АПАВЯДА́ННЯ**. Літаратурна-эстрадны жанр; літаратурныя вечары аднаго чытальніка-выканаўцы. Жанр В. а. створаны ў 1924 г. артыстам-чытальнікам А. Я. Закушняком. Праграмы В. а. складаліся з літаратурных твораў, якія выконваліся чытальнікам у форме жывой, нязмушанай размовы (гутаркі) са слухачамі. У гэтыя праграмы звычайна ўваходзілі як невялікія творы (апавяданні, навелы), так і літаратурныя кампазіцыі па раманах, аповесцях і інш.

**ВІДО́ВІШЧА**, -а. Паказ, прадстаўленне (тэатральнае, цыркавое).

**ВІЗУА́ЛЬНАЕ**, -ага. Адзін з асноўных кампанентаў тэатральнага прадстаўлення: ігра акцёраў, вобразнасць сцэны, сцэнаграфія, сцэнічныя вобразы.

**ВІ́РА**. У мове будаўнікоў, грузчыкаў, рабочых сцэны і інш. — падымай уверх; процілеглае — майна (апускай уніз).

**ВІРТУО́З**, -а. Артыст (звычайна музыкант), які выдатна валодае тэхнікай свайго мастацтва; чалавек, які дасягнуў вышэйшай ступені майстэрства ў сваёй працы.

**ВІСК**, -у. Пранізлівы крык.

**ВІ́СУС**, -а. Свавольнік, гарэза; распуснік.

**ВО́БРАЗ**, -а. 1. Спецыфічная катэгорыя мастацтва — канкрэтна-пачуццёвая форма ўяўлення мастаком рэчаіснасці. 2. Тып, характар, створаны пісьменнікам, мастаком, артыстам. 3. Адлюстраванне ў свядомасці чаго-н.

**ВО́БРАЗ МАСТА́ЦКІ**. Спосаб і форма адлюстравання і стварэння свету ў мастацтве; катэгорыя мастацкай дзейнасці. В. м. не толькі «вобразная ілюстрацыя» жыццёвых прататыпаў ці агульных ідэй, але і пэўная з'ява, кампанент адносін паміж творцамі мастацкіх каштоўнасцей і тымі, хто іх успрымае. Першапачаткова вобраз узнікае ў свядомасці мастака. Пры яго стварэнні важнае значэнне набывае светасузіральная пазіцыя пісьменніка, якая разам з мастацкім вымыслам, інтуіцыяй, мастацкім густам выступае ў якасці кампанента мастацкай творчасці.

**ВО́БРАЗНЫЯ БА́ЧАННІ**. Вынік і форма адлюстравання прадметаў і з'яў у свядомасці чалавека. З'явіўшыся ва ўяўленні артыста, В. б. напаўняюць яго пачуццямі, якімі ён імкнецца захапіць слухачоў. Раскрыць у час расповяду змест, што заключаны ў літаратурным творы, — гэта не толькі стварыць зрокавыя вобразы, але нават пачуць гукі, адчуць пах і ўбачыць фарбы адлюстраванага навакольнага свету.

**ВО́ПЛЕСКІ**, -аў. Тое, што і апладысменты.

**ВУА́ЛЬ**, -і. Тонкае пакрывала з шыфону, мусліну, газу, якое накідвалі на галаву, плечы, а таксама прымацоўвалі да капелюша, галаўнога абруча, чапца.

**ВУЛЬГА́РНАСЦЬ**, -і. Пошласць, грубасць, непрыстойнасць.

**ВУЛЬГА́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Пошлы, непрыстойны, грубы. 2. Спрошчаны да крайнасці, да скажэння сэнсу.

**ВУЛЬГАРЫ́ЗМ**, -а. Грубае, вульгарнае слова ці выраз, ужыты ў літаратурнай мове.

**ВЫ́ГАРАДКА**, -і. Праверка эскіза дэкарацыі новага спектакля шляхам увасаблення яго на сцэне ў выглядзе макета ў натуральную велічыню. Для В. выкарыстоўваюць шырмы або дэкарацыі старых спектакляў. Абстаўленая адпаведнай мэбляю і аксесуарамі і прадумана асветленая, В. дае рэжысёру і мастаку адзіную магчымасць да пачатку вырабу дэкарацыі ўбачыць знешні вобраз будучага спектакля, праверыць ракурсы і лініі бачнасці з розных пунктаў глядзельнай залы, прадумаць і праверыць мізансцэны і інш.

**ВЫДРУКО́ЎКА**, -і. Тэкст кожнай ролі, надрукаваны асобна.

**ВЫ́ДУМКА**, -і. 1. Тое, што прыдумана, вынайдзена; вымысел, фантазія. 2. Тое, што не адпавядае рэчаіснасці; хлусня, плётка.

**ВЫ́ДЫХ**, -у. Разавае выштурхванне паветра з лёгкіх пры выдыханні.

**ВЫ́ДЫХНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Выштурхнуць паветра з лёгкіх пры дыханні.

**ВЫ́КАЗАЦЦА**, -кажуся, -кажашся, -кажацца. Выказаць, выкласці сваю думку, погляды і пад.; выявіць свае адносіны пры абмеркаванні чаго-н.

**ВЫ́КАЗАЦЬ**, -кажу, -кажаш, -кажа. 1. Падаць у звязнай, паслядоўнай форме свае думкі, выявіць пачуцці. 2. Выявіць, выкрыць тое, што павінна было ўтойвацца ад іншых. 3. Перадаць словамі свае адносіны да каго-, чаго-н.

**ВЫКАНА́ЛЬНІЦКАЕ МАСТА́ЦТВА**. Музычнае, тэатральнае, цыркавое і пад. выкананне.

**ВЫКАНА́ЛЬНІЦКІ АНА́ЛІЗ**. Шмат у чым падобны да літаратуразнаўчага. Праводзіцца акцёрам і рэжысёрам з мэтай падрыхтоўкі да выканання (мастацкага расповяду, выканання ролі і пад.).

**ВЫКАНА́ЎЦА**, -ы. 1. Той, хто выконвае, ажыццяўляе што-н. 2. Той, хто выступае з выкананнем мастацкага твора, ролі.

**ВЫ́КАНАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Ажыццявіць, здзейсніць, зрабіць (наказ, заданне, задуму і пад.). 2. Праспяваць, сыграць, станцаваць.

**ВЫКЛАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Вучыць каго-н. чаму-н., перадаючы звесткі з якой-н. галіны ведаў. 2. Займацца педагагічнай практыкай. 3. Выказваць, тлумачыць, даводзіць.

**ВЫ́КЛАСЦІ**, -кладу, -кладзеш, -кладзе. Выказаць, расказаць, паведаміць.

**ВЫКО́НВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Іграць ролю, спяваць песню, танцаваць танец, іграць на музычным інструменце.

**ВЫ́МАВІЦЬ**, -маўлю, -мавіш, -мавіць. Перадаць голасам гукі, словы сваёй ці чужой мовы.

**ВЫ́МАРКА**, -і. Частка тэксту ў п'есе, якую рэжысёр выкідае пры пастаноўцы спектакля; скарачэнне колькасці дзейных асоб.

**ВЫМАЎЛЕ́ННЕ**, -я. Перадача голасам гукаў ці слоў мовы; гукавая сістэма мовы.

**ВЫМАЎЛЕ́НЧЫ АПАРА́Т**. Органы чалавека, якія прымаюць удзел у вымаўленні.

**ВЫ́МЫСЕЛ**, -слу. Тое, што створана фантазіяй, уяўленнем; тое, што супярэчыць рэчаіснасці; выдумка, хлусня.

**ВЫ́ПІСКА ДЛЯ ПАСТАНО́ЎКІ**. Пералік прылад, прыстасаванняў або матэрыялаў (бутафорыі, касцюмаў, рэквізіту і інш.), неабходных для спектакля. В. складаецца памочнікам рэжысёра па ўказаннях рэжысёра-пастаноўшчыка і заяўках акцёраў.

**ВЫ́ПУСК СПЕКТА́КЛЯ**. Апошні этап працы над спектаклем. У перыяд В. с. праводзяцца генеральныя рэпетыцыі, фіксуецца паслядоўнасць правядзення спектакля, правяраецца падрыхтаванасць усіх элементаў афармлення, музычнае і шумавое суправаджэнне, светлавая партытура, сцэнічныя эфекты і пад.

**ВЫ́РАЗ**, -у. 1. Характэрны знешні выгляд, які адлюстроўвае ўнутраны стан чалавека. 2. Слова, моўны зварот.

**ВЫРА́ЗЛІВЫ**, -ая, -ае. Які адлюстроўвае ўнутраныя перажыванні або якасці.

**ВЫРА́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, у якім кожная дэталь, момант яскрава вылучаюцца; яскравы, пераканальны. 2. Дакладна і ясна сфармуляваны.

**ВЫРАКА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Адмаўляцца ад каго-, чаго-н.

**ВЫ́РАЧЫСЯ**, -ракуся, -рачашся, -рачацца; -рачамся, -рачацеся, -ракуцца; вы́ракся, -лася. Адмовіцца, не прызнаць сваім каго-, чаго-н.

**ВЫ́РУБКА СВЯТЛА́**. Адначасовае выключэнне на сцэне ўсяго асвятлення, акрамя дзяжурнага; выкарыстоўваецца пры раскрытай заслоне паміж карцінамі спектакля.

**ВЫСАКАМО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Напышлівы; рытарычны (пра стыль).

**ВЫСОКАМАСТА́ЦКІ**, -ая, -ае. Які вызначаецца высокімі мастацкімі якасцямі.

**ВЫ́ТКНУЦЦА**, -ткнуся, -ткнешся, -ткнецца. 1. Паказацца, вылезці, высунуцца. 2. Недарэчна ўмяшацца ў якую-н. справу.

**ВЫ́ТРЫМКА**, -і. 1. Уменне валодаць сабой; стойкасць, цярплівасць. 2. Невялікі ўрывак з якога-н. тэксту.

**ВЫ́ХАД АКЦЁРА**. З'яўленне акцёра на сцэне для ўдзелу ў дзеянні спектакля. Своечасовы В. а. кантралюе памочнік рэжысёра.

**ВЫХАДНА́Я РО́ЛЯ**. Другараднае амплуа акцёра, патрэбнае ў п'есе для надання большай значнасці галоўным героям. Іграць В. р. — значыць выконваць ролю статыста ў спектаклі.

**ВЫ́ЦЯЦЬ**, вы́тну, вы́тнеш, вы́тне. Нанесці ўдар, стукнуць; пашкодзіць сябе ўдарам.

**ВЫ́ШЧАРЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Засмяяцца, паказаўшы зубы; узлаваўшыся, паказаць, выскаліць зубы; злосна крыкнуць на каго-н.

**ВЫ́ЯВІЦЬ**, -яўлю, -явіш, -явіць. 1. Знайсці, адшукаць; заўважыць; выкрыць што-н. 2. Праявіць, выказаць якую-н. скрытую якасць, уласцівасць; паказаць сябе. 3. Вызначыць па якіх-н. прыкметах; бясспрэчна даказаць што-н., выкрыць.

**ВЯДУ́ЧЫ**, -ая, -ае. Той, хто вядзе канцэртную або тэлевізійную праграму.

**ВЯНО́К САНЕ́ТАЎ**. Твор з пятнаццаці санетаў, звязаных паміж сабой так, што апошні радок аднаго санета паўтараецца ў першым радку наступнага, а пятнаццаты санет складаецца з першых

радкоў усіх папярэдніх чатырнаццаці санетаў.

**ВЯРТЛЯ́ВЫ**, -ая, -ае. Вельмі рухавы.

**ВЯРТУ́Н**, вертуна́. Непаседа, вяртлявы чалавек.

**ВЯРШЭ́НСТВАВАЦЬ**, -ствую, -ствуеш, -ствуе. Быць галоўным дзе-н., у чым-н.; панаваць.

## Г

**ГАВАРКІ́**, -а́я, -о́е. 1. Схільны да размоў, ахвочы пагаварыць; шумны, ажыўлены. 2. Вобразны (пра словы).

**ГАВАРУ́Н**, -а́. Пра чалавека, які любіць пагаварыць; балбатун, пустаслоў.

**ГАВО́РКА**, -і. 1. Дзелавая або сардэчная размова; абмен думкамі. 2. Разнавіднасць мясцовага дыялекту, якая ахоплівае адносна невялікую тэрыторыю (вёску, раён); сукупнасць мясцовых дыялектаў якой-н. мовы, якія маюць агульныя дыялектныя рысы. 3. Мова як сродак зносін паміж людзьмі (звычайна пра вусную гутарковую мову). 4. Асаблівасці мовы, манера гаварыць, вымаўляць асобныя словы, гукі.

**ГАГАТА́ЦЬ**, -гачу́, -го́чаш, -го́ча. Моцна, нястрымна смяяцца; рагатаць.

**ГА́ДКІ**, -ая, -ае. 1. Вельмі непрыемны (з выгляду, на смак і пад.); прыкры, брыдкі. 2. Агідны, подлы, варты пагарды, ганьбавання.

**ГАДЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не можа цярпець, не пераносіць гадкага; грэблівы.

**ГАЙДА́**. Ужываецца як заклік ісці куды-н.

**ГА́ЛАС**, -у. Бязладны шматгалосы крык, шумная размова.

**ГАЛАШЭ́ННЕ**, -я. Жанр сямейна-абрадавай паэзіі. Своеасаблівы від лірыка-драматычнай песенна-рэчытатыўнай імправізацыі, якая выконвалася з прычыны смерці блізкага чалавека або іншых трагічных падзей у сям'і і гаспадарцы.

**ГАЛЕРЭ́Я**, -і. Верхні ярус у тэатры, цырку і пад.

**ГАЛЁКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Гучна крычаць; шумна размаўляць, галасіста спяваць.

**ГАЛЁРКА**, -і. Тое, што і г а л е р э я.

**ГАЛО́СНЫ**. Які ўтвараецца пры свабодным праходжанні паветра праз поласць рота (пра гукі мовы).

**ГАЛО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Самы важны, асноўны, найбольш істотны.

**ГАЛО́ЎНЫ РЭЖЫСЁР**. Рэжысёр, які ўзначальвае мастацкую дзейнасць тэатра, вызначае яго рэпертуар.

**ГАМАНА́**, -ы́. Бязладны шум мноства галасоў; гучная размова; чуткі, пагалоска.

**ГАМАНІ́ЦЬ**, -маню́, -мо́ніш, -мо́ніць. 1. Весці гаворку, размаўляць з кім-н.; гаварыць, расказваць пра што-н. 2. Узнімаць гоман, шумець, гучна перагаворваючыся.

**ГАМЕРЫ́ЧНЫ СМЕХ**. Нястрымны, грамавы рогат.

**ГАМО́НКА**, -і. Тое, што і г а в о р к а (у 1 знач.); гутарка, размова.

**ГАНАРЫ́СТЫ**, -ая, -ае. Які пагардліва ставіцца да людзей, лічыць сябе лепшым за іншых; фанабэрысты, самаўпэўнены.

**ГА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Прызнаваць непрыгодным, дрэнным; даваць нізкую ацэнку; асуджаць, абгаворваць.

**ГА́НЬБА**, -ы. Пра дзеянні, учынкі, якія выклікаюць пагарду, асуджэнне; тое, што знеслаўляе, прыніжае чыю-н. годнасць.

**ГА́НЬБІЦЬ**, -блю, -біш, -біць. Зневажаць чыю-н. годнасць; асуджаць, няславіць.

**ГАРАПА́ШНІК**, -а. Бядняк, гаротнік.

**ГАРА́ЧАЯ ЗАВІ́ЎКА**. Завіўка шчыпцамі, нагрэтымі на плітках, награвальных машынках, спецыяльных грэлках. Шчыпцы маюць розную таўшчыню стрыжня.

**ГАРА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Запальчывы, нястрыманы.

**ГАРА́ЧНАСЦЬ**, -і. Страснасць, палкасць, схільнасць захапляцца чым-н.; паспешлівасць пры выбары рашэння, нястрыманасць, запальчывасць.

**ГАПІ́Т**, -а. Прыстасаванне для кіравання лялькай у лялечным тэатры. Узнікла ў тэатры Інданезіі. Дапамагае руху галавы трысцявой лялькі.

**ГАРЛАПА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Моцна, на ўсё горла крычаць, спяваць; гарланіць.

**ГАРЛА́СТЫ**, -ая, -ае. З гучным крыклівым голасам; галасісты; які любіць пакрычаць, паспрачацца.

**ГАРЛА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Крычаць, гарланіць.

**ГАРСЭ́Т**, -а. 1. Шырокі пругкі пояс, які носяць пад сукенкай для сцягвання таліі і надання стройнасці фігуры. 2. Шнуроўка, кабат, станік, кітлік.

**ГАРЫЗО́НТ**, -а. Дэкарацыя ў тэатры, якая з дапамогай спецыяльнага асвятлення стварае ілюзію небасхілу (плоская задняя завеса, пафарбаваная ў светла-блакітны колер). Узнікла ў 80-я гг. 19 ст. у выніку пошукаў рэалістычнага адлюстравання з'яў прыроды на сцэне. Існуюць розныя канструкцыі Г.: мяккая (з тканіны), цвёрдая (бетон, штукатурка па сетцы рабіц, фанера), напаўцвёрдая (з тканіны на каркасе). Г. бывае нерухомы, убудаваны ў будынак і рухомы, які адкатваецца (падымаецца і скручваецца). Па форме яны бываюць прамыя і купалавыя.

**ГАСТРАЛЁР**, -а. 1. Артыст, які прыехаў на гастролі. 2. Пра чалавека, які часта мяняе месца працы; лятун.

**ГАСТРО́ЛІ**, -яў, *адз.* **гастроль**, -і. Выступленні прыезджага артыста або мастацкага калектыву (трупы тэатра, спевака, хору, аркестра і інш.).

**ГВАЛТ**, -у. 1. Прымяненне фізічнай сілы ў адносінах да каго-н.; здзек. 2. Прымусовае ўздзеянне, уціск. 3. Крык, шум, лямант. 4. Кліч аб паратунку ў выпадку небяспекі.

**ГВА́ЛЦІЦЬ**, -лчу, -лціш, -лціць і **ГВАЛТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. 1. Чыніць гвалт; здзекавацца, прыгнятаць, няволіць. 2. Сілаю прымушаць жанчыну да палавога акта.

**ГЕКЗА́МЕТР**, -а. Вершаваны памер антычнай (метрычнай) сістэмы вершаскладання. Г. шырока карысталіся сярэдневяковыя беларускія паэты-лаціністы.

**ГЕРМЕНЕ́ЎТЫКА**, -і. Метад інтэрпрэтацыі тэксту або спектакля, сутнасць якога ў тым, каб перадаць іх сэнс з улікам разумення і ацэнкі выканаўцы. Метадалогія Г. шмат чым абавязана традыцыі тлумачэння Бібліі, якая шукае схаваны сэнс яе тэкстаў. Гісторыя паходжання метаду ўзыходзіць да 5 ст. н. э., калі грэчаскія рапсоды інтэрпрэтавалі тэкст Гамера, каб зрабіць яго зразумелым для публікі.

**ГЕРО́Й**, -я. 1. Галоўная дзейная асоба п'есы. 2. У 18 — 19 ст. выканаўца цэнтральных роляў у трагедыях. Пазней тэрмін Г. стаў прымяняцца і ў адносінах вядучых акцёраў, якія выступалі ў іншых сцэнічных жанрах (драматычны Г., камедыйны Г.). Атрымалі распаўсюджанне спецыфічныя разнавіднасці тэрміна: Г.-любоўнік, Г.-неўрастэнік, характарны Г., бытавы Г. Былі і ўзроставыя разнавіднасці амплуа Г.: малады Г., пажылы Г. У 20-я гг. існавала амплуа «сацыяльны» Г.

**ГІГІЕ́НА ГО́ЛАСУ**. Правілы захавання голасу; меры папярэджання яго захворванняў, а таксама мерапрыемствы, якія садзейнічаюць гэтаму.

**ГІДА́ЙЮ**, -я. 1. Спявак-распавядальнік у японскім тэатры марыянетак; выканаўца і імправізатар драматычнага рэчытатыву. 2. Музычна-літаратурны жанр.

**ГІНЬЁЛЬ**, -я. 1. Персанаж французскага тэатра лялек. Належыць да т. зв. ручных, або верхавых, лялек. Г. быў галоўным героем камедый, вадэвіляў і фарсаў. Вобраз Г. быў традыцыйным і такім жа папулярным у Францыі, як Пятрушка ў Расіі, Гансвурст і Кашперль у Германіі, Кашпарэк у Чэхіі, Панч у Англіі. 2. Назва п'ес, спектакляў і асобных сцэнічных

прыёмаў, асновай якіх з'яўляецца паказ разнастайных злачынстваў, зладзействаў, здзекаў, пошлых сцэнак і пад.

**ГІПАКРЫ́Т**, -а. Адна з назваў акцёра ў Старажытнай Грэцыі. Першапачатковая функцыя адзінага акцёра старажытнай харавой трагедыі — кантаты была ў тым, каб «адказваць» сваімі маналогамі на пытанні, якія змяшчаліся ў песні хору.

**ГІПЕ́РБАЛА**, -ы. Мастацкі прыём перабольшання, садзейнічае ўзмацненню выразнасці выказвання.

**ГІСТРЫЁН**, -а. 1. Акцёр у Старажытным Рыме. Першапачаткова Г. ігралі без масак, якія былі ўведзены толькі ў 1 ст. да н. э. пад уплывам грэчаскага тэатра. Жаночыя ролі ігралі мужчыны. Г. вербаваліся звычайна з нізоў грамадства, нават з рабоў. 2. Народны вандроўны акцёр часоў ранняга сярэднявечча (9 — 13 ст.). Г. адначасова быў распавядальнікам, музыкантам, танцорам, спеваком, гімнастам, дрэсіроўшчыкам жывёл і інш. У розных краінах Г. атрымлівалі розныя назвы: у Францыі — жанглёры, у Італіі — мімы, у Германіі — шпільманы, у Іспаніі — хугляры, у Польшчы — франкі, у Расіі — скамарохі. Разнавіднасцю Г. былі ваганты.

**ГЛО́ТКА**, -і. Частка стрававальнага апарату — мышачная трубка, якая злучае поласць рота са страваводам, у якой утвараюцца гукі голасу.

**ГЛЯДА́Ч**, гледача́. Той, хто глядзіць спектакль, фільм, канцэрт і інш. віды мастацтва.

**ГО́ДНАСЦЬ**, -і. Неабходныя маральныя якасці чалавека, а таксама ўсведамленне гэтых якасцей.

**ГО́ЛАС**, -у. Голас — фізічная якасць, якая цяжка паддаецца вызначэнню. Вышыня, сіла, тэмбр, афарбоўка голасу — матэрыяльныя фактары, якія дазваляюць імгненна ідэнтыфікаваць персанаж і ў той жа час непасрэдна спосабам прамога і пачуццёвага ўздзеяння ўплываць на ўспрымальнасць гледача. Дзякуючы свайму голасу акцёр уяўляе сабой адначасова чыста фізічную прысутнасць і з'яўляецца носьбітам сістэмы лінгвістычных знакаў. Голас з'яўляецца таксама носьбітам інфармацыі, якая ёсць у інтанацыі, рытме, акцэнтуацыі.

**ГО́ЛАСНА**. Не шэптам, уголас; гучна, моцна.

**ГО́МАН**, -у. Бязладны шум мноства галасоў.

**ГО́НАР**, -у. 1. Грамадская або маральная годнасць, тое, што выклікае ўсеагульную павагу. 2. Павага, слава.

**ГРАБЯНЕ́Ц**, -нца́. Прыстасаванне для расчэсвання валасоў, замацавання валасяных бантоў, петляў, пасмаў, кудзераў; упрыгожанне прычоскі. Бывае рознай формы: авальны, прадаўгаваты, круглы, квадратны. Вырабляецца з косці, рагоў, чарапашынага панцыра, дрэва, пластмасы, металаў.

**ГРАМА́ДСКІ ПРАГЛЯ́Д**. Прагляд спектакля, прадстаўлення, відовішча грамадскасцю.

**ГРАНДА́М**. Тэатральнае амплуа; актрыса на ролі немаладых знатных жанчын.

**ГРАТЭ́СК**, -у. Від мастацкай тыпізацыі, заснаванай на кантрасце, дэфармацыі ці карыкатурным перабольшанні адносін, прадметаў і з'яў рэчаіснасці з мэтай паказу іх глыбіннай сутнасці. Як сродак стварэння мастацкага вобраза характэрны для сатыры, памфлета, карыкатуры, шаржа, буфанады, клаунады, фарса, эксцэнтрыкі і інш.

**ГРЫМ**, -у. Спецыяльныя фарбы, наклейкі, накладкі, з дапамогай якіх надаюць твару акцёра патрэбны выгляд.

**ГРЫМА́СА**, -ы. Наўмыснае або міжвольнае скрыўленне рысаў твару; міна.

**ГРЫМЁР**, -а. Супрацоўнік тэатра, які грыміруе артыстаў.

**ГРЫМЁРСКІ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да грымёра, належыць яму.

**ГРЫМІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Грыміравацца сябе; прымаць выгляд каго-н.

**ГРЫМІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Накладваць грым з мэтай надання акцёру патрэбнага для яго ролі выгляду.

**ГРЭ́БЛІВАСЦЬ**, -і. Агіда, гадлівасць.

**ГРЭ́БЛІВЫ**, -ая, -ае. Які адчувае агіду, гадлівасць да ўсякай неахайнасці і ўсюды яе падазрае.

**ГУ́БКА**, -і. Порыстая мачалка з гумы або іншых матэрыялаў, якая выкарыстоўваецца для накладвання «тону» на твар акцёраў.

**ГУГНЯ́ВЫ**, -ая, -ае. Які гаворыць або спявае ў нос.

**ГУКАВО́БРАЗ**, -а. Падбор гукаў мовы, які стварае ілюзію сэнсавай адпаведнасці гукавой формы слова яго прадметнаму значэнню.

**ГУКАЗА́ПІС**, -у. Запіс спецыяльнымі апаратамі гаворкі або музыкі на плёнку, пласцінку і пад.

**ГУКАПЕРАЙМА́ННЕ**, -я. Перадача голасам або тэхнічнымі сродкамі якога-н. прыроднага або механічнага гучання.

**ГУ́КАПІС**, -у. Падбор гукаў у літаратурных або музычных творах для надання пэўнага мастацкага эфекту.

**ГУКАСПАЛУЧЭ́ННЕ**, -я. Спалучэнне гукаў мовы або музычных гукаў.

**ГУКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. **1.** Аклікаць, зваць. **2.** Гучна гаварыць, крычаць.

**ГУЛЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. **1.** Вясёлы, жартаўлівы. **2.** Ахвочы пагуляць; гарэзлівы, шустры; рухавы, зменлівы.

**ГУ́ЛЬБІШЧА**, -а. Гулянка, гулянне.

**ГУЛЬТА́Й**, -я́. Лянівы чалавек.

**ГУЛЬТАЯВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Ухіляцца ад працы, бяздзейнічаць.

**ГУЛЯ́ННЕ**, -я. Забавы, танцы, звычайна пад адкрытым небам.

**ГУ́МАР**, -у. **1.** Здольнасць заўважыць і паказаць у камічнай, дабрадушна-смешнай форме чые-н. слабасці, недахопы. **2.** Мастацкі прыём у творах мастацтва, а таксама твор, заснаваны на гэтым прыёме.

**ГУМАРЭ́СКА**, -і. Невялікі літаратурна-мастацкі або музычны твор жартоўнага, гумарыстычнага характару.

**ГУМО́ЗА**, -ы. Ліпкі каляровы пластыр, які выкарыстоўваецца для грыму.

**ГУМО́Р**, -у. Душэўны стан, настрой.

**ГУСТ**, -у. Адчуванне, разуменне прыгожага; здольнасць эстэтычна ацэньваць што-н.

## Д

**ДАБРАДЗЕ́Й**, -я. **1.** Той, хто робіць дабро, аказвае дапамогу, паслугу каму-н. **2.** Форма сяброўскага звароту да каго-н., часам з адценнем іроніі.

**ДАБРА́НАЧ**. Пажаданне спакойнай ночы, добрага сну.

**ДАБРАЧЫ́НЕЦ**, -нца. Тое самае, што і д а б р а д з е й (у 1 знач.).

**ДАБРЫ́ДЗЕНЬ**. Прывітанне пры сустрэчы днём.

**ДАБРЫНЯ́**, -і. Спагадлівасць, чуласць у адносінах да людзей.

**ДАВЕ́Р**, -у. Перакананасць у чыёй-н. шчырасці, чэснасці, добрасумленнасці і заснаваныя на іх адносіны да каго-, чаго-н.

**ДАВЕ́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка верыць у шчырасць, праўдзівасць каго-, чаго-н., схільны аказваць давер.

**ДАВЕ́СЦІ**, -вяду́, -вядзе́ш, -вядзе́; -вядзём, -ведзяце́; давёў, -вяла́, -ло́; давядзі́. Даказаць, пацвердзіць правільнасць чаго-н. фактамі, довадамі.

**ДАГАДЗІ́ЦЬ**, -гаджу́, -го́дзіш, -го́дзіць. Задаволіць каго-н., зрабіўшы яму што-н. прыемнае, патрэбнае і пад.

**ДАЗВА́ННЯ**. Зусім, начыста, поўнасцю.

**ДАЗВО́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. **1.** Даць дазвол, згадзіцца на што-н. **2.** Даць магчымасць што-н. зрабіць. **3.** *заг.* **дазво́ль(це)**. Ужываецца як форма ветлівага звароту да прысутных пры пачатку якога-н. дзеяння. **4.** *заг.* **дазво́ль(це)**. Ужываецца як форма пярэчання, нязгоды з чым-н.

**ДАЗНА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Сабраць, атрымаць звесткі; даведацца пра каго-, што-н.

**ДАКО́Р**, -у. Папрок, незадавальненне, выказаныя каму-н. або ў дачыненні да каго-н.

**ДАКРАНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няце́ся. Крануць каго-, што-н., даткнуцца да каго-, чаго-н.

**ДА́КТЫЛЬ**, -я. Трохскладовая стапа з націскам на першым складзе ў сілабатанічным вершаскладанні.

**ДАКУ́КА**, -і. 1. Турбота, клопат. 2. Нуда, маркота. 3. Зайздрасць, злосць.

**ДАКУЧА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Назаляць каму-н. чым-н.

**ДАЛІКА́ТНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Быць залішне далікатным; цырымоніцца.

**ДАЛІКА́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Ветлівы, ласкавы ў абыходжанні з людзьмі; уважлівы, паслужлівы. 2. Які патрабуе асцярожных, тактоўных адносін. 3. Кволы, тонкі; выпеставаны.

**ДАЛО́НЬ**, -і. Унутраны бок кісці рукі.

**ДАЛЯГЛЯ́Д**, -у. Уяўная лінія, мяжа паміж небам і зямной ці воднай паверхняй; гарызонт; частка неба над лініяй гарызонта; небасхіл; прастор, які можна акінуць вокам.

**ДАМАГЧЫ́СЯ**, -магу́ся, -мо́жашся, -мо́жацца; дамо́гся, -магла́ся, -ло́ся; дамажы́ся. Настойлівымі намаганнямі дабіцца пастаўленай мэты, здзяйснення чаго-н.

**ДАМІНА́НТА**, -ы. Асноўная, дамінуючая ідэя; асноўная прымета або састаўная частка чаго-н.

**ДАМІНА́НТНЫ**, -ая, -ае. Які дамінуе; асноўны, пануючы.

**ДАМО́ЎЛЕНАСЦЬ**, -і. Пагадненне, дасягнутае ў выніку перамоў.

**ДАМЫ́СЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Разважыўшы, прыдумаць дадаткова, дадумаць да канца.

**ДАПА́СЦІ**, -паду́, -падзе́ш, -падзе́; -падзём, -падзяце́. З прагнасцю накінуцца на што-н. жаданае; дарвацца.

**ДАПЫ́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. Які імкнецца ўсё зразумець, пазнаць, набыць новыя веды; праніклівы, цікаўны (аб позірку).

**ДАПЯ́ЦЬ**, -пну́, -пне́ш, -пне́; -пнём, -пняце́. 1. Дайсці, дабрацца куды-н. 2. Дамагчыся, дасягнуць чаго-н. 3. Зразумець што-н., разабрацца ў чым-н.

**ДАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. 1. Зняць (знімаць) віну за што-н.; прабачыць (прабачаць). 2. Вызваліць (вызваляць) ад якога-н. абавязацельства. 3. *заг.* **дару́й(це)**. Ужываецца пры звароце да каго-н. для папярэджання аб чым-н. ці для выражэння просьбы прабачыць у чым-н.

**ДАРА́ДЦА**, -ы. Той, хто дае парады.

**ДАРМА́** і **ДА́РМА**. 1. Бескарысна, дарэмна, марна; без дастатковых падстаў, беспрычынна. 2. Бясплатна, за нішто.

**ДАРЭ́ЧЫ**. 1. Да месца, якраз у патрэбны час. 2. Са словамі «кажучы», «сказаць» ужываецца для абазначэння таго, што нешта наступнае гаворыцца ў дадатак да толькі што сказанага.

**ДАРЭ́ШТЫ**. Зусім, канчаткова, поўнасцю.

**ДАСВЕ́ДЧАНАСЦЬ**, -і. Наяўнасць ведаў, звестак пра каго-, што-н.

**ДАСКАНА́ЛЫ**, -ая, -ае. Які характарызуецца найвышэйшай ступенню і паўнатой дадатковых якасцей; узорны, беззаганны, бездакорны.

**ДАСПАДО́БЫ**. Падабаецца, падыходзіць, па густу.

**ДАСЦІ́ПНАСЦЬ**, -і. Уменне сказаць востра, смешна, даць трапнае азначэнне.

**ДАСЦІ́ПНЫ**, -ая, -ае. 1. Поўны дасціпнасці. 2. Цікавы, дапытлівы.

**ДАТКЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які патрабуе асцярожных і тактоўных адносін, далікатны.

**ДАЎМЕ́ЦЦА**, -е́юся, -е́ешся, -е́ецца. Зразумець, дадумацца.

**ДАЎНІНА́**, -ы́. Былыя, даўно мінулыя часы; старадаўнасць.

**ДАХО́ДЛІВАСЦЬ**, -і. Даступнасць для разумення.

**ДАХО́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка ўспрымаецца, даходзіць да свядомасці; зразумелы, даступны.

**ДАЧА́СНЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца ці адбыўся раней вызначанага часу, раней тэрміну.

**ДАЧУ́ЦЦА**, -чу́юся, -чу́ешся, -чу́ецца. Даведацца з чутак; дазнацца.

**ДАШЧЭ́НТУ**. Начыста, датла, ушчэнт; зусім, поўнасцю.

**ДБА́ЙНЫ**, -ая, -ае. Старанны, руплівы.

**ДБАЦЬ**, дба́ю, дба́еш, дба́е. Праяўляць клопаты, турбавацца пра каго-, што-н.

**ДВАІ́СТЫ**, -ая, -ае. 1. Падвойны. 2. Які заключае ў сабе розныя якасці, прыметы; супярэчлівы. 3. Які праяўляецца ў двух відах, формах.

**ДВУХСЭ́НСАВЫ**, -ая, -ае. З двуякім сэнсам; які можна двуяка разумець.

**ДВУХСЭНСО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Тое, што і д в у х с э н с а в ы.

**ДЗЕ́ЙНАСЦЬ**, -і. Праца, занятак у якой-н. галіне.

**ДЗЕ́ЙНАЯ АСО́БА**. Асоба, якая дзейнічае ў п'есе.

**ДЗЕ́ЙНІЧАЦЬ**, -чаю, -чаеш, -чае. 1. Рабіць што-н., займацца чым-н. 2. Выступаць у якасці дзейнай асобы.

**ДЗЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Энергічны, актыўны.

**ДЗЕ́ЙСНЫ**, -ая, -ае. Здольны актыўна ўздзейнічаць на што-н., эфектыўны.

**ДЗЕ́ЙСТВА**, -а. 1. Старажытныя культавыя абрады, якія заключалі ў сабе элементы тэатральнага дзеяння, суправаджаліся танцамі, спевамі, музыкай. 2. Масавыя прадстаўленні на розныя тэмы, якія звычайна праводзіліся пад адкрытым небам.

**ДЗЕ́КАННЕ**, -я. Вымаўленне афрыкаты «дз» на месцы мяккага «д», уласцівае беларускай мове.

**ДЗЕ-НЕ́БУДЗЬ**. У якім-н. месцы.

**ДЗЕ-НІДЗЕ́**. Месцамі, сям-там.

**ДЗЕСЬ** і **ДЗЕ́СЬЦІ**. У нейкім, дакладна не вядомым месцы.

**ДЗЕ́Я**, -і. Закончаная частка драматургічнага твора або тэатральнай пастаноўкі.

**ДЗЕ́ЯННЕ БЕСПРАДМЕ́ТНАЕ**. Дакладнае фізічнае дзеянне не з рэальнымі, а з уяўнымі прадметамі.

**ДЗЕ́ЯННЕ СЛО́ЎНАЕ**. Асноўны сродак уздзеяння артыста на гледача ў спектаклі.

**ДЗЕ́ЯННЕ СЦЭНІ́ЧНАЕ**. Асноўны выразны сродак сцэнічнага мастацтва; паводзіны артыста ва ўмовах спектакля. Д. с. — паслядоўнасць сцэнічных падзей, якія адбываюцца галоўным чынам у залежнасці ад паводзін персанажаў, адначасова гэта ўвасобленая ў канкрэтную форму сукупнасць разнастайных тэатральных працэсаў, якія адбываюцца на сцэне і характарызуюць псіхалагічныя і маральныя змены дзейных асоб.

**ДЗЕ́ЯННЕ ФІЗІ́ЧНАЕ**. Пэўныя рухі цела або яго частак.

**ДО́МЫСЕЛ**, -у. Здагадка, заснаваная на меркаваннях, дапушчэннях; мастацкі вымысел, выдумка.

**ДО́ПІС**, -у. Пісьмовае паведамленне пра што-н.

**ДО́ТЫК**, -у. Адно з пяці пачуццяў — успрыманне адчуванняў, якія ўзнікаюць пры дакрананні да каго-, чаго-н.

**ДРАЖНІ́ЦЬ**, дражню́, дра́жніш, дра́жніць. 1. Знарок, наўмысна злаваць, раздражняць чым-н. 2. Узбуджаць, распальваць, выклікаць якія-н. пачуцці, жаданні.

**ДРА́МА**, -ы. 1. Адзін з трох асноўных родаў літаратуры. 2. Адзін з асноўных і найбольш пашыраных жанраў драматургічных твораў. У шырокім сэнсе слова драма — гэта драматычная паэма, тэкст, напісаны на аснове канфліктнага дзеяння. У 18 ст. пад уплывам Дзідро драмай называлі «сур'ёзны жанр», прамежкавы паміж камедыяй і трагедыяй. Гюго стварыў рамантычную драму ў прозе, дзе паспрабаваў адмежавацца ад правілаў адзінства (акрамя адзінства дзеяння), павялічыў колькасць яскравых, відовішчных дзеянняў, імкнучыся да сінтэзу крайнасцей і эпох. Паэтычная (або лірычная) драма дасягае кульмінацыі свайго развіцця ў канцы 19 ст. (у творчасці Маларме, Рэнье, Метэрлінка, Гофманшталя).

**ДРАМАТУ́РГ**, -а. Пісьменнік, які піша драматургічныя творы.

**ДРАМАТУРГІ́Я**. 1. Драматычнае мастацтва. 2. Сукупнасць драматургічных твораў аднаго пісьменніка, народа, эпохі і пад. Вытокі беларускай Д. — у фальклоры, з якога вырасла Д. школьнага тэатра, батлейкі, народнай драмы.

**ДРАНЦВЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Дзеравянець, нямець, страчваць адчувальнасць.

**ДРАПІРО́ЎКА**, -і. Тканіна, якая спадае (звісае) складкамі; парцьера, занавеска.

**ДРУГАРА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Не асноўны, не самы важны, малаістотны. 2. Не першы, не лепшы па сваіх якасцях, пасрэдны.

**ДРУЖБА́К**, -á. Блізкі друг, сябар.

**ДРЫГО́ТКІ**, -ая, -ае. Які ўздрыгвае, дрыжыць; мігатлівы, трапяткі.

**ДУБЛЁР**, -а. Акцёр, які замяняе асноўнага выканаўцу.

**ДУ́ЖА**. Надта, вельмі, надзвычай.

**ДУ́ЖАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Схапіўшыся адзін з адным, старацца асіліць праціўніка; мерацца сілай.

**ДУРАСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Схільны да свавольства, гарэзлівы.

**ДУХМЯ́НЫ**, -ая, -ае. З моцным прыемным пахам; пахучы.

**ДЫДАСКА́ЛІІ**, -яў. Сцэнічныя ўказанні, дадзеныя аўтарам п'есы выканаўцам адносна інтэрпрэтацыі тэксту роляў.

**ДЫ́КЦЫЯ**, -і. Вымаўленне; манера вымаўляць словы. Дыкцыя змяняецца ў залежнасці ад эпохі, але самым галоўным крытэрыем застаецца яе рэалістычнасць і артыстызм. Дыкцыя заўсёды вагаецца паміж гукам і сэнсам, яна з'яўляецца актам герменеўтыкі, якая надае тэксту аб'ём, вакальную афарбоўку, матэрыяльнасць.

**ДЫПЛО́МНЫ СПЕКТА́КЛЬ**. Спектакль, пастаўлены студэнтамі выпускнога курса тэатральнай ВНУ для атрымання дыплома з кваліфікацыяй акцёр.

**ДЫФІРА́МБ**, -а. 1. У Старажытнай Грэцыі — урачыстая харавая песня ў гонар бога Дыяніса; хвалебны лірычны верш. 2. Перабольшаная хвала, усхваленне.

**ДЫ́ХАЛЬНАЯ АТА́КА**. Актывізацыя працэсу дыхання пры маўленні, спевах.

**ДЫ́ХАЛЬНЫ АПАРА́Т**. Органы, якія служаць для дыхання, удзельнічаюць у дыханні.

**ДЫХА́ННЕ**, -я. Працэс паглынання кіслароду і выдзялення вуглекіслаты жывымі арганізмамі; газаабмен.

**ДЫХА́ННЕ ФАНАЦЫ́ЙНАЕ**. Якое спрыяе фанацыі, утварэнню гуку.

**ДЫХА́ННЕ ФІЗІЯЛАГІ́ЧНАЕ**. Паглынанне і выпусканне паветра лёгкімі, якое спрыяе жыццядзейнасці арганізма.

**ДЫЯЛЕ́КТНАЯ МО́ВА**. Мясцовыя гаворкі ў складзе нацыянальнай мовы.

**ДЫЯЛО́Г**, -у. 1. Размова паміж дзвюма або некалькімі асобамі. 2. Частка літаратурнага твора ў выглядзе размовы дзейных асоб.

**ДЫЯПАЗО́Н**, -у. 1. Сукупнасць усіх гукаў ад ніжэйшага да вышэйшага, даступных музычнаму інструменту або чалавечаму голасу. 2. Аб'ём, памер чаго-н.; шырыня здольнасцей, размах дзейнасці.

**ДЫЯФРА́ГМА**, -ы. Мышачная перагародка, якая аддзяляе грудную поласць ад брушной.

**ДЭБЮ́Т**, -у. Першае выступленне артыста на сцэне.

**ДЭБЮТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Упершыню выступаць на сцэне.

**ДЭБЮТА́НТ**, -а. Той, хто дэбютуе.

**ДЭГРАДА́ЦЫЯ**, -і. Паступовая страта добрых якасцей; заняпад.

**ДЭГРАДЗІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Паступова страціць (страчваць) добрыя якасці; прыйсці (прыходзіць) у заняпад.

**ДЭКАРА́ТАР**, -а. Мастак, які піша дэкарацыі, а таксама мастак-выканаўца, які піша дэкарацыі па эскізах другога мастака.

**ДЭКАРАЦЫ́ЙНАЕ МАСТА́ЦТВА**. Мастацтва стварэння зрокавага вобраза спектакля з дапамогай дэкарацый, касцюмаў, асвятлення, пастановачнай тэхнікі.

**ДЭКАРА́ЦЫЯ**, -і. Афармленне сцэны, якое ствараецца з дапамогай архітэктуры, графікі, мастацкай планіроўкі месца дзеяння, спецыяльных фактур, асвятлення і тэхнікі. Існуе для вобразнай характарыстыкі гістарычных абставін, умоў і атмасферы спектакля, у якіх дзейнічае акцёр.

**ДЭКЛАМА́ТАР**, -а. Той, хто выступае з дэкламацыяй.

**ДЭКЛАМАЦЫ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да дэкламацыі.

**ДЭКЛАМА́ЦЫЯ**, -і. Мастацтва прамаўлення вершаў або прозы. У Старажытным Рыме Д. — практыкаванне ў

красамоўстве, якое складала адзін з важных элементаў прамоўніцкага мастацтва; у Францыі — мастацтва прамаўлення прамоў, а таксама вершаў на сцэне. У класіцыстычным тэатры 17 — 18 ст. паняцце Д. аб'ядноўвала ўсю сукупнасць сродкаў акцёрскай ігры, уключаючы жэст і міміку. Класіцызм кананізаваў урачыста-прыўзнятую, напеўную, умоўную манеру сцэнічнай мовы. Развіццё рэалістычных і рамантычных тэндэнцый у тэатры канца 18 — пачатку 19 ст. прывяло да разбурэння класіцыстычнай Д. З часам словам «Д.» сталі абазначаць штучную, хадульную манеру гаварыць.

# Ж

**ЖАБО́**. 1. Карункавыя або кісейныя брыжы вакол каўняра і на грудзях у мужчынскай сарочцы; высокі палатняны каўнер мужчынскай сарочкі, які закрываў ніжнюю частку шчок. 2. Аздоба з карункаў у брыжы або складкі каля каўнерыка жаночай блузкі, сукенкі.

**ЖАГНА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Хрысціцца.

**ЖАГНА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Хрысціць крыжам. 2. Благаслаўляць.

**ЖАДА́ННЕ**, -я. Унутранае імкненне, цяга да ажыццяўлення чаго-н., хаценне чаго-н.; ахвота.

**ЖАДА́НЫ**, -ая, -ае. Такі, да якога імкнуцца, якога чакаюць, хочуць; любімы, дарагі.

**ЖАДЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Зайздросны; прагны.

**ЖА́ЛАСЛІВЫ**, -ая, -ае. Схільны да жаласці, спачування; спагадлівы, чуллівы.

**ЖА́ЛАСНЫ**, -ая, -ае. Які выклікае жаласць, спачуванне; поўны суму, журботы.

**ЖА́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. 1. Выказваць жальбу, незадаволенасць; бедаваць. 2. Наракаць, скардзіцца на каго-н.; падаваць скаргу.

**ЖАЛО́БА**, -ы. 1. Стан смутку з прычыны чыёй-н. смерці, народнага гора, бедства, які выражаецца ў нашэнні асобай вопраткі, адмене гулянак і інш. 2. Чорнае адзенне, павязка, вуаль і пад. як сімвал смутку.

**ЖАЛЬ**, -ю. 1. Пачуццё жаласці, спагады, выкліканае чыёй-н. пакутай, няшчасцем. 2. Пачуццё горычы, смутку, тугі з прычыны страты каго-, чаго-н. 3. Пачуццё засмучэння, шкадавання.

**ЖА́ЛЬБА**, -ы. 1. Смутак, туга, бедаванне. 2. Скарга, нараканне.

**ЖАЛЬБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Сумаваць, тужыць.

**ЖАНР**, -у. 1. Род твораў у галіне якога-н. мастацтва, які характарызуецца пэўнымі ўласцівасцямі, сюжэтнымі і стылістычнымі прыкметамі. 2. Стыль, манера.

**ЖАРГАНІ́ЗМЫ**, -аў. Словы і выразы любога жаргону, якія выкарыстоўваюцца за яго межамі (толькі ў гутарковай мове і мове мастацкай літаратуры). Як элементы сацыяльна-стылявых разнавіднасцей маўлення Ж. надаюць выказванню яркую эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку.

**ЖАРГО́Н**, -у. Адна з формаў існавання мовы, пэўная разнавіднасць маўлення, якая адрозніваецца ад агульнанароднай мовы спецыфічнай лексікай і фразеалогіяй, часта экспрэсіўна перасэнсаванай. Узнікае ў асяроддзі пэўных груп і калектываў, аб'яднаных агульнымі прафесійнымі і бытавымі ўмовамі.

**ЖАРТ**, -у. 1. Забаўная выхадка; вострая дасціпны выраз. 2. Кароткае апавяданне з забаўным, смешным зместам. 3. Невялікая камічная п'еса.

**ЖАРТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. 1. Гаварыць або рабіць што-н. несур'ёзна, смехам, для пацехі; весела вастрасловіць. 2. Насміхацца, кпіць. 3. Несур'ёзна, безуважна адносіцца да каго-, чаго-н., не-

даацэньваць каго-, што-н. 4. Гаварыць, рабіць што-н. нарокам, легкадумна.

**ЖАРТАЎЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Схільны да жартаў, ахвочы пажартаваць. 2. Вясёлы, гуллівы, гарэзлівы.

**ЖАРТАЎНІ́К**, -á. Той, хто любіць жартаваць.

**ЖА́РТАЧКІ**, -чак. 1. Тое, што і ж а р т (у 1 знач.). 2. Пра вельмі складаную задачу, сітуацыю. 3. Вельмі проста, лёгка.

**ЖАРТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Вясёлы, забаўны, які мае характар жарту.

**ЖАРТУ́ЮЧЫ**. 1. Жартам, дзеля забавы. 2. Лёгка, без намаганняў.

**ЖАХ**, -у. 1. Моцны страх да знямення. 2. Трагічнасць, безвыходнасць.

**ЖАХЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які выклікае жах, вельмі страшны; роспачны, поўны жаху.

**ЖАХНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. Прыйсці ў жах, моцна спалохацца.

**ЖВА́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Поўны жыццёвых сіл, бадзёры, рухавы. 2. Бойкі, ажыўлены, шумны. 3. Поўны руху, ажыўлення, дзейнасці.

**ЖЛУ́КТА**, -ы. Пра таго, хто многа п'е, апіваецца.

**ЖЛУ́КЦІЦЬ**, -кчу, -кціш, -кціць. Многа і прагна піць.

**ЖМІ́НДА**, -ы. Пра скупога чалавека, скнару.

**ЖО́РСТКІ**, -ая, -ае. Крайне суровы; бязлітасны, неміласэрны.

**ЖУ́ДАСНЫ**, -ая, -ае. Які выклікае пачуццё страху, чаго-н. непрыемнага, жахлівага.

**ЖУ́ДАСЦЬ**, -і. Трывожнае пачуццё страху, прадчуванне бяды, небяспекі; жах; тое, што выклікае страх; трагічная з'ява, жахлівае здарэнне.

**ЖУЛІКАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Схільны да жульніцтва, ашуканства, махлярскіх учынкаў; уласцівы жуліку; хітры.

**ЖУРБА́**, -ы́. Пачуццё смутку, душэўнай прыгнечанасці; туга, маркота.

**ЖУРБО́ТА**, -ы. Тое, што і ж у р б а.

**ЖУРБО́ТНА**. Сумна, маркотна, тужліва.

**ЖУРБО́ТНЫ**, -ая, -ае. Ахоплены журбою; сумны, маркотны.

**ЖУРЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Сумны, журботны. 2. Які любіць павучаць, дакараць; бурклівы, сварлівы.

**ЖУРЫ́ЦЦА**, журу́ся, жу́рышся, жу́рыцца. Знаходзіцца ў стане журбы; сумаваць, маркоціцца; нудзіцца, сумаваць.

**ЖУРЫ́ЦЬ**, журу́, жу́рыш, жу́рыць. Злёгку дакараць, сварыцца на каго-н., павучаючы.

**ЖЫ́ВА**. 1. Наглядна, маляўніча, ярка; выразна, яскрава. 2. Хутка, паспешліва. 3. Бадзёра, бойка, ажыўлена.

**ЖЫ́ВАСЦЬ**, -і. Паўната жыццёвых сіл; жвавасць, ажыўленасць.

**ЖЫВАТВО́РНЫ**, -ая, -ае. Які дае жыццё, аднаўляе сілы, ажыўляе.

**ЖЫВІ́НКА**, -і. Тое, што надае каму-, чаму-н. жывасць, прывабнасць, своеасаблівасць.

**ЖЭСТ**, -а. 1. Рух рукі, галавы, які суправаджае або замяняе чалавечую мову. Ж. — рухі цела, часцей валявыя і кантралюемыя акцёрам. Экспрэсіўная прырода Ж. робіць яго выключна прыдатным для служэння ігры акцёра, у якога няма іншых сродкаў, акрамя ўласнага цела, каб даць адчуць розны стан душы. Звычайна адрозніваюць: прыроджаныя жэсты, якія адносяцца да паставы цела або да якога-н. руху; жэсты эстэтычныя, адпрацаваныя з мэтай стварэння твора мастацтва (танца, пантамімы, драмы і пад.); умоўныя жэсты, якія выражаюць паведамленне, зразумелае як таму, хто перадае, так і таму, хто прымае; імітацыйныя жэсты, якімі акцёр рэалістычна ці натуралістычна ўвасабляе персанаж шляхам перадачы яго паводзін, яго звыклых пластычных рухаў (на самай справе непазбежна стылізацыя і характарызацыя жэстаў, якія абумоўліваюць гэты эфект пластычнай рэальнасці). 2. Наўмысны, загадзя разлічаны ўчынак.

**ЖЭСТЫКУЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Рабіць жэсты.

**ЖЭСТЫКУЛЯ́ЦЫЯ**, -і. Карыстанне жэстамі.

**ЖЭ́ЎЖЫК**, -а. Свавольнік, гарэза.

**ЗААХВО́ЦІЦЦА**, -во́чуся, -во́цішся, -во́ціцца. Адчуць жаданне, ахвоту.

**ЗААХВО́ЦІЦЬ**, -во́чу, -во́ціш, -во́ціць. Выклікаць ахвоту да чаго-н., жаданне займацца чым-н.

**ЗАБА́ВА**, -ы. 1. Гульня, пацеха. 2. Тое, што забаўляе, пацяшае, весяліць.

**ЗАБА́ВІЦЦА**, -ба́ўлюся, -ба́вішся, -ба́віцца. 1. Затрымацца дзе-н. даўжэй, чым меркавалася; запазніцца. 2. Зацягнуць, прамарудзіць з чым-н., не зрабіць у час.

**ЗАБАЛАБО́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Пачаць балабоніць.

**ЗАБАЛБАТА́ЦЦА**, -бачу́ся, -бо́чашся, -бо́чацца. Захапіцца балбатнёй; правесці многа часу ў балбатні.

**ЗА́БАРСНІ**, -яў. Вяровачныя петлі, пры дапамозе якіх лапаць прымайстроўваецца да нагі.

**ЗАБАСІ́ЦЬ**, -башу́, -басі́ш, -басі́ць. Пачаць басіць, гаварыць ці спяваць басам.

**ЗА́БАЎКА**, -і. 1. Тое, што і з а б а в а. 2. Рэч, якая служыць для гульні дзецям; цацка.

**ЗАБАЎЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. 1. Пацяшацца, праводзіць час у забавах, гульнях. 2. Адносіцца да чаго-, каго-н. як да цацкі, гуляць ёю.

**ЗАБАЎЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Весяліць, пацяшаць чым-н. цікавым, забаўным; займаць гаворкай, адцягваць увагу; даглядаць, няньчыць.

**ЗАБА́ЎНІК**, -а. Чалавек, які ўмее весяліць, пацяшаць; арганізатар забаў.

**ЗАБА́ЎНЫ**, -ая, -ае. Такі, які можа зацікавіць, пацешыць, развесяліць; дзіўны, займальны, цікавы.

**ЗАБІЯ́КА**, -і. Той, хто любіць распачынаць бойкі; буян, задзіра.

**ЗАВАДА́ТАР**, -а. Той, хто пачынае, арганізоўвае што-н.; верхавод, зачыншчык.

**ЗАВАЖДА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Займаючыся чым-н., затрымацца, забраць шмат часу.

**ЗАВЕ́ДАМЫ**, -ая, -ае. Наперад добра вядомы; несумненны.

**ЗАВЕКАВА́ЦЬ**, -вяку́ю, -вяку́еш, -вяку́е. Застацца незамужняй.

**ЗАВІ́ДКІ**, -аў. Зайздрасць.

**ЗАВІНА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Спешна і старанна рабіць што-н.; рупна займацца чым-н.

**ЗАВІХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Рабіць што-н. вельмі старанна, рупліва. 2. Горача выяўляць сваю прыхільнасць, адданасць.

**ЗАВУЧЫ́ЦЬ**, -вучу́, -ву́чыш, -ву́чыць. Вучачы, запомніць, засвоіць; вывучыць.

**ЗАВУШНІ́ЦА**, -ы. Упрыгожанне, звычайна ў выглядзе кальца, якое прымацоўваецца да мочкі вуха.

**ЗАВЯ́ЗКА**, -і. Пачатак, зыходны момант чаго-н.; эпізод, падзея, з якой пачынаецца развіццё сюжэта ў мастацкім творы.

**ЗАГАВАРЫ́ЦЦА**, -вару́ся, -во́рышся, -во́рыцца. Захапіўшыся размовай, доўга прагаварыць.

**ЗАГАВАРЫ́ЦЬ**, -вару́, -во́рыш, -во́рыць. Надакучыць, стаміць працяглымі размовамі; размовай адцягнуць увагу, прымусіць забыцца пра што-н.

**ЗАГА́ДКА**, -і. 1. Кароткае іншасказальнае апісанне прадмета, з'явы, якія трэба пазнаць, адгадаць. 2. Пра што-н. складанае, заблытанае, незразумелае, што патрабуе разгадкі, тлумачэння.

**ЗАГА́НА**, -ы. 1. Недасканаласць, недахоп, які выклікае асуджэнне. 2. Фізічны недахоп арганізма, прыроджаны або набыты пасля хваробы ці траўмы.

**ЗАГАНАРЫ́ЦЦА**, -ру́ся, -ры́шся, -ры́цца. Пачаць ганарыцца; стаць ганарыстым, фанабэрыстым.

**ЗАГА́ННЫ**, -ая, -ае. 1. Дрэнны, благі, няправільны. 2. Амаральны, непрыстойны.

**ЗАГНЕ́ВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Прыйсці ў гнеў; пачаць гневацца.

**ЗАГРУВА́СЦІЦЬ**, -ва́шчу, -ва́сціш, -ва́сціць. Заставіць, заваліць чым-н. у беспарадку; перапоўніць чым-н. другарадным.

**ЗАГРЫМІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Пакласці на свой твар грым, загрыміраваць сябе.

**ЗАГРЫМІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Пакласці грым на каго-, што-н.; надаць каму-н. з дапамогай грыму іншы знешні выгляд.

**ЗАГУ́БА**, -ы. Гібель, смерць.

**ЗАГУГНІ́ЦЬ**, -ню́, -ні́ш, -ні́ць. Пачаць гугніць; гугнява прагаварыць.

**ЗАГУГНЯ́ВІЦЬ**, -ня́ўлю, -ня́віш, -ня́віць. Пачаць гугнявіць; гугнява прагаварыць; прагугнявіць.

**ЗАГУКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Пачаць гукаць; падаць гучны голас; гукнуць.

**ЗАГУЧА́ЦЬ** і **ЗАГУЧЭ́ЦЬ**, -чы́ць. Пачаць гучаць, гучэць.

**ЗАДАВАЛЬНЕ́ННЕ**, -я. Прыемнае пачуццё ад паспяховага ажыццяўлення, завяршэння чаго-н.

**ЗАДА́ДЗЕНЫ**, -ая, -ае. Загадзя вызначаны, зараней устаноўлены.

**ЗАДА́ЧА**, -ы. Мэта, якую імкнецца дасягнуць акцёр сваімі сцэнічнымі дзеяннямі.

**ЗАДЗІ́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Схільны, ахвочы да боек, сварак, задзірлівы.

**ЗА́ДНІК**, -а. 1. Частка абутку над абцасам, якая схоплівае пяту. 2. Частка дэкарацыі на заднім плане сцэны.

**ЗАДО́Р**, -у. Запал, гарачнасць, бадзёрасць; задзірысты тон, задзірыстыя паводзіны.

**ЗАДУ́ЖА**. Празмерна, занадта.

**ЗАДУ́МА**, -ы. 1. Тое, што задумана, намечана; намеры, план. 2. Асноўная думка, ідэя мастацкага твора; замысел.

**ЗАДУМЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Паглыблены ў думкі, разважанні; задумлівы; які выражае роздум, задуменне; які навявае думкі, схіляе да разважанняў; маўклівы, таямніча-загадкавы.

**ЗАДУШЭ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Сардэчны, шчыры; інтымны, глыбока асабісты.

**ЗАДЫ́ХАНЫ**, -ая, -ае. Які задыхаўся, пачаў цяжка і часта дыхаць.

**ЗАДЫ́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Пачаць цяжка і часта дыхаць, стаміўшыся ад вялікай фізічнай нагрузкі.

**ЗАДЫХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Адчуваць цяжкасць у дыханні з-за недахопу паветра; траціць магчымасць вольна дыхаць. 2. Паміраць ад недахопу паветра, ад дыму, удушлівых газаў.

**ЗАЕ́НЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Пачаць енчыць, вішчаць, екатаць.

**ЗАЖМУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Зажмурыць свае вочы, прыкрыць іх павекамі.

**ЗАЖУРЫ́ЦЦА**, -журу́ся, -жу́рышся, -жу́рыцца. Засумаваць, замаркоціцца.

**ЗАЗЛАВА́ЦЬ**, -злую́, -злуе́ш, -злуе́, -злуём. Прыйсці ў стан азлаблення, разлавацца.

**ЗАЗЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які зазывае, гучыць як заклік.

**ЗАІ́ГРЫВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Жартаўліва какетнічаць, заляцацца. 2. Паддобрывацца, каб выклікаць прыхільнасць.

**ЗАІКА́ННЕ**, -я. Недахоп у мове, які праяўляецца ў міжвольным паўтарэнні асобных гукаў, складоў або ў затрымцы іх вымаўлення.

**ЗАІНТРЫГАВА́ЦЬ**, -гу́ю, -гу́еш, -гу́е. Выклікаць вялікую зацікаўленасць; захапіць, зацікавіць.

**ЗА́ЙЗДРАСЦЬ**, -і. Пачуццё незадаволенасці і раздражнення, выкліканае перавагамі, поспехамі, дабрабытам іншых; жаданне мець тое, што маюць іншыя.

**ЗАЙЗДРО́СНІК**, -а. Той, хто зайздросціць; зайздросны чалавек.

**ЗАЙЗДРО́СЦІЦЬ**, -ро́шчу, -ро́сціш, -ро́сціць. Зведваць, перажываць пачуццё зайздрасці да каго-, чаго-н.

**ЗАКАВЫ́КА**, -і. Затрымка, перашкода.

**ЗАКАВЫ́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Замыслаславаты, мудрагелісты.

**ЗАКАРЧАНЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Вельмі азяблы, здранцвелы ад холаду.

**ЗАКАРЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які засох, зацвярдзеў. 2. Пакрыты засохлай граззю, крывёю і пад.; брудны.

**ЗА́КАХА́НЫ**, -ая, -ае. Які адчувае каханне да каго-н.; улюбёны.

**ЗАКАХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Адчуць пачуццё кахання.

**ЗАКА́ШЛЯЦЦА**, -яюся, -яешся, -яецца. Зайсціся моцным працяглым кашлем.

**ЗА́КІД**, -у. Напамін, лёгкі папрок.

**ЗАКЛАПО́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Ахоплены клопатам, турботай.

**ЗАКЛІНА́ЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Імкнуцца падпарадкаваць каго-, што-н. сілай чараў, малітваў. 2. Горача прасіць, маліць аб чым-н. 3. Моцна лаяць, праклінаць.

**ЗАКЛЯ́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, на якога накладзена закляцце; пракляты. 2. Непрымірымы, вечны (пра ворага, праціўніка).

**ЗА́ЛА**, -ы. Вялікае памяшканне для мнагалюдных сходаў, якіх-н. заняткаў і пад.

**ЗАЛЁТЫ**, -аў. Імкненне выклікаць прыхільнасць жанчыны; заляцанне.

**ЗАЛІ́ШНІ**, -яя, -яе. Які перавышае патрэбу, неабходнасць; празмерны.

**ЗАЛО́ЎКА**, -і. Мужава сястра.

**ЗАЛЫГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Накінуць вяроўку на рогі, на шыю (валу, карове, каню), зашморгнуўшы або завязаўшы вузлом. 2. Узяць пад сваю ўладу, прымусіць падпарадкавацца.

**ЗАЛЮЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Люляючы, супакоіць, закалыхаць.

**ЗА́МАЛАДА**. У маладым узросце.

**ЗАМАЛАДЫ́**, -а́я, -о́е. Надта малады, маладзейшы, чым трэба.

**ЗАМЕ́НА**, -ы. Акцёр, які замяняе другога выканаўцу ў спектаклі.

**ЗАМІЛАВА́ННЕ**, -я. Стан расчуленасці, пачуццё пяшчоты; любаванне кім-, чым-н.

**ЗАМО́ВА**, -ы. Словы і выразы, якім прыпісваецца магічная сіла; заклінанне.

**ЗАМО́РАК**, -рка. Кволая, фізічна недаразвітая істота, расліна і пад.

**ЗА́МЫСЕЛ**, -слу. 1. Задуманы план дзеянняў; намер, задума. 2. Галоўная думка, ідэя мастацкага твора.

**ЗАНА́ДТА**. Залішне, празмерна, задужа.

**ЗАНАТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Запісаць для памяці, зрабіць нататку.

**ЗАНЕМАГЧЫ́**, -немагу́, -нямо́жаш, -нямо́жа. Адчуць недамаганне; захварэць.

**ЗАНЕПАКО́ЕНАСЦЬ**, -і. Стан занепакоенага; трывога, непакой.

**ЗАНЕПАКО́ЕНЫ**, -ая, -ае. Устрывожаны, неспакойны.

**ЗАНУДЗІ́ЦЦА**, -джу́ся, -ну́дзішся, -дзіцца. Засумаваць, замаркоціцца.

**ЗАНУ́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Дакучлівы, шкадлівы.

**ЗАНЯДБА́НЫ**, -ая, -ае. Пакінуты без догляду; такі, якому не ўдзялялася належная ўвага.

**ЗАНЯДУ́ЖАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Адчуваць сябе хворым, нядужым; захварэць.

**ЗАНЯМЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Страціць адчувальнасць; адзеравянець; замерці, абамлець. 2. Замаўчаць, страціць здольнасць гаварыць пад уплывам моцнага пачуцця; анямець.

**ЗАПАВО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Больш павольны, чым звычайна.

**ЗАПАДО́ЗРЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. 1. Пачаць падазраваць, лічыць вінаватым. 2. Пачаць здагадвацца аб чым-н.

**ЗАПА́Л**, -у. Гарачнасць, парыў.

**ЗАПАЛО́ХАНЫ**, -ая, -ае. Палахлівы, забіты.

**ЗАПАЛО́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Выклікаць страх, боязь, зрабіць палахлівым, нясмелым.

**ЗАПА́ЛЬЧЫВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка ўзбуджаецца, запаляецца; гарачы; азартны, задзірлівы.

**ЗАПА́МЯТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе. Забыць.

**ЗА́ПАНКА і ЗА́ПІНКА**, -і. Засцежка для манжэтаў і каўняра мужчынскай сарочкі.

**ЗАПАНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Зрабіцца панам; распанець.

**ЗАПАНІБРА́ТА**. Як з роўным; проста, бесцырымонна.

**ЗАПАНІБРА́ЦТВА**, -а. Бесцырымоннасць у абыходжанні; фамільярнасць.

**ЗАПАНІКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Пачаць панікаваць.

**ЗА́ПАР**. Непасрэдна адзін за адным, без перапынку.

**ЗАПА́СНІК**, -а. Памяшканне ў тэатры, дзе захоўваюцца дэкарацыі.

**ЗАПЕ́РХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Папярхнуўшыся, закашляцца.

**ЗАПІ́НКА**, -і. Замінка, затрымка ў гаворцы, выкліканая цяжкасцю ў падбо-

ры патрэбнага слова, няўпэўненасцю або збянтэжанасцю таго, хто гаворыць

**ЗАПЛЮШЧЫЦЬ**, -шчу, -шчыш, -шчыць. Прыкрыць вочы павекамі, зажмурыцца.

**ЗАПЛЯ́СКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пачаць пляскаць; пляснуць некалькі разоў запар.

**ЗАПНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няце́ся. Раптоўна спыніць або запаволіць гаворку.

**ЗАПО́ЗНЕНАСЦЬ**, -і. Затрымка, спазненне.

**ЗАПО́ЗНЕНЫ**, -ая, -ае. Які з'явіўся, здарыўся са спазненнем; позні.

**ЗАПО́МНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Захаваць, утрымаць у памяці.

**ЗАПРАШЭ́ННЕ**, -я. Просьба, прапанова з'явіцца куды-н., зрабіць што-н. або запіска, пісьмо аналагічнага зместу.

**ЗАПУЖА́НЫ**, -ая, -ае. Палахлівы ад частых пагроз; настрашаны.

**ЗАПУЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Запалохаць, застрашыць, зрабіць баязлівым.

**ЗАПУНСАВЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які запунсавеў, зрабіўся пунсовы.

**ЗАПЫТА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які выражае запытанне.

**ЗАПЫТА́ННЕ**, -я. 1. Пытанне, зварот, які патрабуе адказу, тлумачэння. 2. Афіцыйны дакумент з патрабаваннем даць пэўныя звесткі, тлумачэнні і пад.

**ЗАПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Звярнуцца з пытаннем; спытаць. 2. Звярнуцца з просьбай, папрасіць аб чым-н.

**ЗАПЭ́ЎНЕННЕ**, -я. Катэгарычнае, гарантыйнае сцверджанне.

**ЗАПЭ́ЎНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Пераканаць у правільнасці чаго-н.; паручыцца за што-н.

**ЗАПЭ́ЦКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Забрудзіць, вымазаць. 2. Зняславіць, зганьбіць.

**ЗАРАГАТА́ЦЬ**, -гачу́, -го́чаш, -го́ча. Пачаць рагатаць; азвацца рогатам.

**ЗА́РАЗ**. 1. У сучасны момант, у гэты час, цяпер; толькі што, зусім нядаўна; у самым скорым часе, хутка (пра падзеі, дзеянні, якія маюць вось-вось адбыцца). 2. Неадкладна, у гэты ж момант.

**ЗАРА́З**. Адразу, за адзін раз, адначасова.

**ЗАРАЗІ́ЦЬ**, -ражу́, -разі́ш, -разі́ць. 1. Перадаць заразу каму-н. 2. Перадаць каму-н. сваё пачуццё, схільнасць да чаго-н.

**ЗАРА́ЗЛІВАСЦЬ**, -і. Здольнасць акцёра захапляць партнёраў ці гледачоў сваёй ігрой — сцэнічнымі дзеяннямі.

**ЗАРА́ЗЛІВЫ і ЗАРАЗЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які лёгка перадаецца іншым. 2. Які лёгка захапляе каго-н., пераймаецца кім-н.

**ЗАРАЧЫ́СЯ**, -раку́ся, -рачэ́шся, -рачэ́цца; -рачо́мся, -рачаце́ся, -раку́цца; заро́кся, -ракла́ся, -ло́ся. Даць зарок, абяцанне ніколі не рабіць чаго-н.

**ЗАРДЗЕ́ЦЦА і ЗАІРДЗЕ́ЦЦА**, -е́юся, -е́ешся, -е́ецца. Пачырванець ад сораму, хвалявання і пад.

**ЗАРУ́КА**, -і. Гарантыя, залог.

**ЗАРУ́ЧЫНЫ**, -чын. Абрад аб'яўлення жаніхом і нявестай.

**ЗАСАПЦІ́СЯ**, -пу́ся, -пе́шся, -пе́цца; -пёмся, -пяце́ся. Пачаць цяжка і шумна дыхаць.

**ЗАСАРО́МЕЦЦА**, -меюся, -меешся, -мееццa і **ЗАСАРО́МІЦЦА**, -млюся, -мішся, -міцца. Адчуць сорам, няёмкасць перад кім-н. або за каго-, што-н.

**ЗАСАРО́МІЦЬ**, -млю, -міш, -міць. Выклікаць пачуццё сораму, няёмкасці.

**ЗАСВО́ІЦЬ**, -сво́ю, -сво́іш, -сво́іць. 1. Успрыняўшы новае або чужое, зрабіць уласцівым, прывычным для сябе. 2. Добра зразумеўшы, запомніць, вывучыць.

**ЗАСЛО́НА**, -ы. Шырокае палотнішча (часта з дзвюх палавін), якое закрывае сцэну ад глядзельнай залы. Упершыню З. пачала сістэматычна выкарыстоўвацца ў старажытнарымскім тэатры, затым прыйшла да заняпаду ў сярэднявеччы. У эпоху Адраджэння і класіцызму З. стала абавязковай прыкметай тэатральнасці. Але толькі ў 18 ст. яе пачынаюць апускаць у канцы кожнага дзеяння спектакля.

**ЗАСЛУ́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Слухаючы што-н., захапіцца, забыць на ўсё.

**ЗАСМАЛІ́ЦЬ**, -смалю́, -сма́ліш, -сма́ліць. Закурыць, пускаючы шмат дыму з цыгарэты ці папяросы.

**ЗАСМУТКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Пачаць смуткаваць.

**ЗАСМУЦІ́ЦЦА**, -мучу́ся, -му́цішся, -му́ціцца. Засумаваць, замаркоціцца; выразіць смутак, заклапочанасць (пра твар, вочы і пад.).

**ЗАСМУЦІ́ЦЬ**, -смучу́, -сму́ціш, -сму́ціць. Выклікаць пачуццё смутку, маркоты; азмрочыць.

**ЗАСМУЧЭ́ННЕ**, -я. Смутак, маркота.

**ЗАСМЯ́ГЛЫ**, -ая, -ае. Засохлы, перасохлы (рот, губы).

**ЗАСМЯЯ́ЦЬ**, -смяю́, -смяе́ш, -смяе́; -смеяце́. Высмеяць, абсмяяць.

**ЗАСПАКО́ЕНАСЦЬ**, -і. Стан спакою, ураўнаважанасці; задаволенасць дасягнутым; бестурботнасць, абыякавасць.

**ЗАСПАКО́ІЦЦА**, -ко́юся, -ко́ішся, -ко́іцца. Суняць свой неспакой, узбуджанасць; супакоіцца; задаволіцца дасягнутым.

**ЗАСПАКО́ІЦЬ**, -ко́ю, -ко́іш, -ко́іць. Развеяць чый-н. неспакой, хваляванне, узбуджанасць; прывесці ў стан спакою; супакоіць.

**ЗАСТАГНА́ЦЬ**, -стагну́, сто́гнеш, -сто́гне. Пачаць стагнаць; прастагнаць; абазвацца стогнам.

**«ЗАСТО́ЛЬНЫ» ПЕРЫ́ЯД**. Разбор, аналіз п'есы за сталом. Вызначэнне ўзаемаадносін дзейных асоб, скразнога дзеяння, звышзадачы і інш.

**ЗАСТРА́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Навесці страх на каго-н.; запужаць, запалохаць.

**ЗАСУМАВА́ЦЬ**, -му́ю, -му́еш, -му́е. Пачаць сумаваць; зрабіцца сумным, занудзіцца без каго-, чаго-н.; замаркоціцца па кім-, чым-н.

**ЗАСЦЕРАГЧЫ́**, -рагу́, -ражэ́ш, -ражэ́; -ражо́м, -ражаце́; засцяро́г, -сцерагла́, -ло́; засцеражы́. Загадзя прыняць меры, каб ахаваць каго-, што-н. ад небяспекі, непрыемнасцей і пад.

**ЗАСЦЕРАГЧЫ́СЯ**, -рагу́ся, -ражэ́шся, -ражэ́цца; -ражо́мся, -ражаце́ся; засцяро́гся, -сцерагла́ся, -ло́ся; засцеражы́ся. Абараніць, засланіць, ахаваць сябе ад каго-, чаго-н.

**ЗАСЦІ́ГНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Раптоўна захапіць, застаць каго-н. дзе-н., у якім-н. стане.

**ЗАСЦЯРО́ГА**, -і. 1. Тое, што засцерагае ад чаго-н. 2. Мера, якая прымаецца для аховы, засцеражэння ад чаго-н.; надзвычай асцярожныя адносіны да чаго-н.

**ЗАСЯРО́ДЖАНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць засяроджанага; засяроджаная ўвага, паглыбленасць у што-н.

**ЗАСЯРО́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. 1. Накіраваны, звернуты поўнасцю на што-н. адно; які займае чалавека цалкам (пра пачуцці, настрой і пад.). 2. Цалкам паглыблены ў свае думкі, справу (пра чалавека).

**ЗАСЯРО́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Засяродзіць, сканцэнтраваць сваю ўвагу, волю, думкі, інтарэсы і пад.

**ЗАТАІ́ЦЦА**, -таюся, -то́ішся, -то́іцца. Схавацца, прытаіцца, імкнучыся застацца незаўважаным; скрыць, утаіць ад іншых свае думкі.

**ЗАТАНЦАВА́ЦЬ**, -цу́ю, -цу́еш, -цу́е. Пачаць танцаваць.

**ЗАТЛУМІ́ЦЬ**, -тлумлю́, -тлу́міш, -тлу́міць. Пазбавіць здольнасці ясна мысліць, лагічна разважаць; задурыць.

**ЗАТО́ЕНЫ**, -ая, -ае. Які хавае свае пачуцці, думкі, настрой; скрытны.

**ЗАТРЫ́МКА**, -і. Зацяжка, замінка, часовае спыненне чаго-н. (дыхання).

**ЗАЎВА́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. 1. Успрыняць якімі-н. органамі пачуццяў; убачыць, пачуць, адчуць; разгледзець, падмеціць, зрабіць якое-н. назіранне. 2. Адзначыць, запомніць па якіх-н. прыметах. 3. Выказаць думку, уставіць заўвагу пры размове з кім-н.; зрабіць заўвагу, выгаварыць за промах, памылку, недахоп.

**ЗАЎЗЯ́ТАСЦЬ**, -і. Стараннасць, нястрыманасць, напорыстасць.

**ЗАЎСЁДНЫ**, -ая, -ае. Які бывае заўсёды; пастаянны, звычайны.

**ЗАЎЧА́СНЫ**, -ая, -ае. Які адбыўся, наступіў раней вызначанага часу, раней, чым трэба.

**ЗАФАНТАЗІ́РАВАЦЦА**, -руюся, -руешся, -руецца. Празмерна захапіцца фантазіяй.

**ЗАХАЛАНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́. Замерці, пахаладзець ад страху, жаху, гора, радасці і пад.

**ЗАХАПЛЕ́ННЕ**, -я. 1. Незвычайны ўздым пачуццяў, найвышэйшае задавальненне. 2. Усхваляванасць, запал, натхненне. 3. Павышаны інтарэс да чаго-н.; любімы занятак. 4. Улюбёнасць у каго-н.

**ЗАХАПЛЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які выклікае захапленне; займальны, цікавы.

**ЗАХАЦЕ́ЦЬ**, -хачу́, -хо́чаш, -хо́ча. Адчуць ахвоту да чаго-н.; пажадаць.

**ЗАХВАЛІ́ЦЬ**, -хвалю́, -хва́ліш, -хва́ліць. Празмерна расхваліць чые-н. заслугі, вартасці.

**ЗАХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лююся, -лююешся, -люецца. Пачаць хвалявацца.

**ЗАХІНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няще́ся. Засланіцца, прыкрыцца чым-н.; ахінуць сябе чым-н.; закруціцца ў што-н.; схавацца дзе-н., за што-н.

**ЗАХЛЁБВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Мімаволі перарываць дыханне пры моцным смеху, плачы, хуткай гаворцы і пад.

**ЗАХЛІПНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. Міжвольна спыніць, затрымаць дыханне, папярхнуцца; адчуць цяжкасць пры дыханні ў грудзях ад моцнага пачуцця; задыхнуцца.

**ЗАЦАЛАВА́ЦЬ**, -лу́ю, -лу́еш, -лу́е. Абсыпаць, пакрыць пацалункамі; стаміць пацалункамі.

**ЗАЦВЯРДЗЕ́ЛЫЯ ЗЫ́ЧНЫЯ**. Якія заўсёды вымаўляюцца цвёрда (дж, ж, ч, ц, р, ш).

**ЗАЦІКА́ЎЛЕНАСЦЬ**, -і. Стан зацікаўленага; інтарэс, цікавасць да чаго-н.

**ЗАЦІКА́ЎЛЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Які праяўляе або выражае цікавасць да каго-, чаго-н. 2. Звязаны практычнымі інтарэсамі з якой-н. справай.

**ЗА́ЦІСК**, -у. Фізічнае або псіхічнае напружанне, якое перашкаджае артысту арганічна дзейнічаць на сцэне.

**ЗАЦЯ́ЦЦА**, затну́ся, затне́шся, затне́цца; затнёмся, затняце́ся; зацяўся, -ла́ся, -ло́ся. 1. Заўпарціцца, уперціся. 2. Затаіць свае думкі, пачуцці; затаіць злосць.

**ЗАЧАРАВА́НЫ і ЗАЧАРО́ВАНЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца пад уздзеяннем чараў; захоплены, паланёны чым-н.; які выражае захапленне.

**ЗАЧАРСЦВЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў чэрствым, зацвярдзеў; бяздушны, нячулы.

**ЗАЧМУЦІ́ЦЬ**, -чмучу́, -чму́ціш, -чму́ціць. Увесці ў зман, задурыць галаву каму-н.

**ЗАЧЫ́Н**, -у. 1. Пачатак чаго-н., пачын. 2. Пачатак песні, казкі, былiны, які характарызуецца своеасаблівым складам.

**ЗАШЫ́ЦЦА**, -шы́юся, -шы́ешся, -шы́ецца. 1. Забрацца ў куток, зацішнае, глухое месца і пад.; схавацца, затаіцца. 2. Не справіцца з вялікай колькасцю спраў у пэўны тэрмін.

**ЗАЯ́ДЛЫ**, -ая, -ае. 1. Заўзяты, зацяты, злосны, задзірысты. 2. Які вядзецца з асаблівай упартасцю, напорыстасцю.

**ЗБО́РКА**, -і. Злучэнне, мантаж механізмаў, канструкцый, станкоў, куліс і падуг для атрымання дэкарацый для спектакля.

**ЗВА́ДКА**, -і. Сварка, склока.

**ЗВА́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да звадкі. 2. Схільны да звадак.

**ЗВАДЫЯ́Ш**, -а. Зводнік, падбухторшчык.

**ЗВАНО́К**, -нка́. Гукавы сігнал, які паведамляе артыстам і гледачам аб пачатку спектакля ці наступнага акта.

**ЗВАР'ЯЦЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які страціў розум; псіхічна хворы. 2. Безразважны, раз'юшаны, ашалелы.

**ЗВЫШЗАДА́ЧА**, -ы. Галоўная ідэйная задача, мэта, дзеля якой ставіцца п'еса, ствараецца спектакль. Звышзадачу Станіслаўскі лічыў асновай сцэнічнага твора, а адсутнасць яе — катастрофай.

**ЗВЯ́ГА**, -і. Назойлівае прыставанне з просьбамі, напамінамі, патрабаваннямі.

**ЗВЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Добра і паслядоўна выказаны, лагічны (пра выступленне, прамову і пад.).

**ЗГАВО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Такі, з якім лёгка згаварыцца; уступчывы.

**ЗГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Успомніць, прыгадаць.

**ЗГАДЗІ́ЦЦА**, згаджу́ся, зго́дзішся, зго́дзіцца. Даць згоду на што-н.

**ЗГА́НЬБІЦЬ**, -блю, -біш, -біць. Зняважыць, зняславіць каго-, што-н. сваімі ўчынкамі, паводзінамі.

**ЗГО́ДА**, -ы. 1. Станоўчы адказ, дазвол на што-н. 2. Узаемная дамоўленасць; дагавор. 3. Супадзенне думак; аднадушша. 4. Мірныя, сяброўскія адносіны.

**ЗГЛЕ́ДЗЕЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Убачыць; упільнаваць каго-н., дагледзець за кім-н.; заўважыць што-н.

**ЗДАВО́ЛЕННЕ**, -я. Адчуванне ўнутранага задавальнення.

**ЗДА́ТНЫ**, -ая, -ае. Здольны на што-н., схільны да чаго-н.; умелы.

**ЗДЗЕК**, -у. Злая зневажальная насмешка; зневажальны ўчынак або паводзіны ў адносінах да каго-, чаго-н.

**ЗДО́ЛЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Быць у стане зрабіць, выканаць што-н.; асіліць, змагчы.

**ЗДО́ЛЬНАСЦІ АКЦЁРСКІЯ**. Прыродныя схільнасці да заняткаў акцёрскім мастацтвам; дар, талент.

**ЗДО́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць, асаблівасць, што праяўляецца ў якой-н. дзейнасці, учынках і пад.; уменне рабіць што-н., паводзіць сябе якім-н. чынам і пад.

**З'Е́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Схільны да едкіх, зласлівых насмешак; ядавіты.

**ЗЕ́РНЕ РО́ЛІ, СПЕКТА́КЛЯ**. Вобразнае вызначэнне сутнасці ролі п'есы, спектакля.

**ЗЛАМО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Схільны злосна, з'едліва гаварыць пра каго-, што-н.

**ЗЛАСЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Той, хто пастаянна злуецца; злоснік.

**ЗЛАСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Поўны злосці, варожасці; які выражае злосць.

**ЗЛАСЛО́ВІЦЬ**, -ло́ўлю, -ло́віш, -ло́віць. Злосна, едка гаварыць пра каго-, што-н.; абгаворваць, распускаць плёткі.

**ЗЛОЎЖЫВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Незаконна, нядобрасумленна выкарыстоўваць што-н., карыстацца чым-н.

**ЗЛЫ́ДЗЕНЬ**, -дня. Шкодны чалавек; ліхадзей.

**ЗМАРНЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Змучаны, схуднелы.

**ЗМАРНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Змучыўшыся, страціць свежасць; схуднець.

**ЗМО́ВА**, -ы. Тайнае пагадненне, угавор, дамоўленасць.

**ЗМО́ГА**, -і. Моцная стомленасць, поўнае бяссілле.

**ЗМО́РАНАСЦЬ**, -і. Стан зморанага; стома ад цяжкай працы ці якога-н. занятку.

**ЗНЕЛЮБЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Зрабіцца нялюбым; абрыднуць.

**ЗНЕЛЮБІ́ЦЬ**, знелюблю́, знялю́біш, знялю́біць. Адчуць моцную непрыязнасць да каго-, чаго-н.; неўзлюбіць.

**ЗНО́СКА**, -і. Дадатковы тэкст, змешчаны пад асноўным у самым нізе старонкі.

**ЗНЯБЫ́ЦЦА**, -бу́дуся, -бу́дзешся, -бу́дзецца. Змарыцца, змучыцца.

**ЗНЯВА́ГА**, -і. Тое, што можа абразіць, пакрыўдзіць; абразлівыя паводзіны, словы і пад.

**ЗНЯВА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які зневажае, змяшчае ў сабе знявагу.

**ЗНЯВА́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Зняславіць, прынізіць, абразіць.

**ЗНЯВЕ́РАНЫ**, -ая, -ае. Які страціў веру ў каго-, што-н., перакананасць у чым-н.; які расчараваўся ў кім-, чым-н.

**ЗНЯМЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены здольнасці гаварыць (ад здзіўлення, страху, нечаканай радасці і пад.); анямелы. 2. Які страціў адчувальнасць, гібкасць; здранцвелы. 3. Застылы, пануры, маўклівы.

**ЗНЯМО́ГА**, -і. Стан крайняй стомленасці, страты сілы; знясіленне.

**ЗНЯЧЭ́ЎКУ**. 1. Нечакана, неспадзявана, знянацку. 2. Выпадкова, мімаволі, незнарок.

**ЗО́ЛАК**, -лку і -лаку. Пачатак світання.

**ЗО́ЛКА**. Сыра, пранізліва, холадна.

**ЗОЛЬ**, -і. Сырое, пранізлівае халоднае надвор'е.

**ЗОНГ**, -а. Абазначэнне песень у тэатры Брэхта, тэкст якіх часцей прамаўляецца або манатонна чытаецца, чым спяваецца. Выкарыстоўваецца для ілюстрацыі сітуацыі або стану душы.

**ЗО́НА МАЎЧА́ННЯ**. Маўчанне акцёра ў час рэплік партнёра ці ў паўзах уласнай ролі.

**ЗРАЗУМЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Даступны разуменню; просты, ясны.

**ЗРОК**, -у. 1. Адно з пяці знешніх пачуццяў, органам якога з'яўляюцца вочы; здольнасць бачыць. 2. Погляд, позірк.

**ЗЫЧЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Той, хто жадае каму-н. дабра.

**ЗЫЧЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які жадае дабра другому; прыхільны, спагадны; які выяўляе схільнасць, ласку, дабрату.

**ЗЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Звонкі, праразлівы, гучны. 2. Які ўтвараецца пры праходжанні моцнага струменю паветра праз перашкоду ў якім-н. месцы моўнага апарату (пра гукі мовы).

**ЗЫ́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. 1. Жадаць. 2. Абяцаць, прадказваць што-н.

**ЗЭ́ДАЛЬ**, -для. Услон.

**ЗЭ́ДЛІК**, -а. Невялікі ўслончык.

**З'Я́ВА**, -ы. Частка драматургічнага твора — акта або дзеі, у якой склад дзейных асоб не мяняецца.

# I

**ІГРА́**, -ы. Выкананне сцэнічнай ролі. Тэатральная ігра (так раней называлася сцэнічная ігра, тое, што акцёр робіць на сцэне па-за дыскурсам) уяўляе сабою бачную і ўласна сцэнічную частку пастаноўкі. Для таго каб разумець акцёрскую ігру, гледачу неабходна суаднесці працэс глабальнага выказвання (мова жэстаў, міміка, інтанацыя, якасць голасу, рытм) з прамаўляемым тэкстам або тым становішчам акцёра, што складваецца на сцэне. Ігра тады раскладваецца на серыю знакаў і адзінак, якія забяспечваюць звязнасць прадстаўлення і інтэрпрэтацыю тэксту. Любая ігра будуецца на кадыфікаванай сістэме паводзін і дзеяння, якія выдаюцца за рэалістычныя ці штучныя і тэатралізаваныя. У тэатры той мае поспех, хто лепш валодае правіламі і стварае ўражанне, што працуе без намаганняў і не мае патрэбы прытрымлівацца правілаў.

**ІГРА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Удзельнічаць у спектаклі, выступаць на сцэне, у кіно.

**ІГРЫ́ШЧА**, -а. 1. Народнае зборышча з танцавальна-гульнёвымі і тэатралізаванымі паказамі. Бярэ пачатак ад язычніцкай абраднасці. 2. Вечарынка з пітвом, частаваннем.

**ІДЭА́Л**, -у. 1. Дасканалы ўзор чаго-н. 2. Пра таго, хто з'яўляецца для каго-н. вышэйшым увасабленнем якіх-н. якасцей, узорам годнасці.

**ІДЭНТЫФІКА́ЦЫЯ**, -і. Працэс ілюзіі ў гледача, які ўяўляе, што ўвасабляемы персанаж — ён сам (або акцёр, які поўнасцю «залазіць у скуру» свайго персанажа). У тэатры, улічваючы прысутнасць жывых акцёраў, адбываецца ідэнтыфікацыя не толькі з персанажам, але і з акцёрам, які яго ўвасабляе.

**ІДЭ́Я**, -і. 1. Думка, задума. 2. Асноўная, галоўная думка п'есы.

**ІЛЮ́ЗІЯ**, -і. Скажонае ўяўленне, уражанне, заснаванае на падмане пачуццяў; прыняцце ўяўнага за сапраўднае. Тэатральная І. узнікае тады, калі за рэальнае і сапраўднае мы прымаем мастацкае стварэнне свету, які з'яўляецца як свет магчымы, нібыта наш свет. І. звязана з эфектам рэальнасці, утвораный сцэнай.

**ІМКНЕ́ННЕ**, -я. Настойлівая цяга, парыў, рашучая мэтанакіраванасць.

**ІМПРАВІЗА́ЦЫЯ**, -і. У тэатры — ігра акцёра, заснаваная на яго здольнасці ствараць сцэнічны вобраз, дзейнічаць на зададзеную тэму без папярэдняй падрыхтоўкі. Існуе мноства ступеняў І.: прыдумванне тэксту на аснове вядомай і вельмі выразнай канвы (як у камедыі дэль артэ); ігра драматычная на зададзеную тэму або адказ на ўказанне; поўная пластычная і размоўная І. пры адсутнасці мадэлі, на-

супэрак умоўнасці і правілу (Гратоўскі); адступленне ад тэксту і пошук новай фізічнай мовы (Арто).

**ІМПРЭСА́РЫО**. Асоба, якая арганізуе прыватныя тэатры, асобныя канцэрты, гастролі і пад.

**ІМПУЛЬСІ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Схільны дзейнічаць пад уплывам раптоўнага імпульсу (унутранага штуршка, пабуджэння да якога-н. дзеяння).

**ІМПЭ́Т**, -у. Парывістасць, імклівасць; гарачы парыў, запал.

**ІМПЭ́ТНЫ**, -ая, -ае. Імклівы, парывісты; палымяны, гарачы.

**ІНА́КШ** і **ІНА́ЧАЙ**. 1. Іншым спосабам, па-другому, не так. 2. У адваротным выпадку; а то.

**ІНВЕ́РСІЯ**, -і. Змяненне звычайнага парадку слоў у сказе для падкрэслівання сэнсавай значнасці якога-н. слова або надання ўсёй фразе пэўнай стылістычнай афарбоўкі.

**ІНГАЛЯ́ЦЫЯ**, -і. Лячэнне верхніх дыхальных шляхоў удыханнем лекавых рэчываў у выглядзе пары, газаў, распыленых вадкасцей.

**ІНДЫВІДУА́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Сукупнасць характэрных адметных рыс, якія вылучаюць акцёра або актрысу.

**ІНДЫФЕРЭ́НТНЫ**, -ая, -ае. Абыякавы, раўнадушны; які не дзейнічае, не рэагуе на знешнія ўплывы.

**ІНЕ́РТНЫ**, -ая, -ае. Бяздзейны, пасіўны, косны.

**ІНЖЭНЮ́**. Сцэнічнае амплуа прастадушнай, наіўнай і нявопытнай у жыцці дзяўчыны; актрыса, якая выконвае такія ролі.

**ІНСЦЭНІРО́ЎКА**, -і. Перапрацоўка для сцэны літаратурнага твора, напісанага не ў драматургічнай форме. Мае на мэце стварыць эстэтычны эквівалент літаратурнага твора, раскрыць сродкамі драмы ідэйна-мастацкі змест, канфлікт, сістэму вобразаў, перадаць агульную атмасферу першаасновы.

**ІНТАНА́ЦЫЯ**, -і. Сукупнасць фанетычных і псіхалагічных сродкаў, якія служаць для афармлення вуснага выказвання акцёра. Дапамагае артысту стварыць яскравыя, своеасаблівыя мастацкія вобразы на сцэне.

**ІНТРЫ́ГА**, -і. 1. Скрытыя непрыстойныя дзеянні з мэтай пашкодзіць каму-н.; нагаворы, падкопы. 2. Сюжэтная лінія ў мастацкім творы, для якой характэрны асаблівы драматызм і напружанасць дзеяння.

**ІНТРЫГАВА́ЦЬ**, -гу́ю, -гу́еш, -гу́е. 1. Весці інтрыгі (у 1 знач.). 2. Узбуджаць цікавасць таямнічасцю, незвычайнасцю, загадкавасцю.

**ІНТУІ́ЦЫЯ**, -і. У акцёрскім мастацтве неўсвядомленае чуццё, непасрэднае і цэласнае спасціжэнне артыстам духоўнай сутнасці вобраза героя.

**ІНТЫ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Глыбока асабісты, патаемны, запаветны; які датычыцца пачуццяў; сардэчны, любоўны. 2. Блізкі, сяброўскі, таварыскі.

**ІНТЭЛЕ́КТ**, -у. Розум, здольнасць чалавека мысліць, разважаць; узровень разумовага развіцця.

**ІНТЭЛЕКТУА́Л**, -а. Пра чалавека з высока развітым інтэлектам, а таксама пра чалавека разумовай працы.

**ІНТЭРМЕ́ДЫЯ**, -і. Кароткая п'еса або ўстаўная сцэна, звычайна камічнага зместу, якія выконваюцца паміж актамі драматычнага ці опернага твора.

**ІНТЭРПАЛЯ́ЦЫЯ**, -і. Пазнейшая ўстаўка ў які-н. творы, якая не належыць арыгіналу.

**ІНТЭРПРЭТА́ТАР**, -а. Той, хто інтэрпрэтуе што-н.; тлумачальнік.

**ІНТЭРПРЭТА́ЦЫЯ**, -і. Тлумачэнне, раскрыццё сэнсу чаго-н.; творчае раскрыццё вобраза або твора выканаўцам.

**ІНФАРМАВА́ЦЬ**, -му́ю, -му́еш, -му́е. Даць (даваць) інфармацыю; азнаёміць (азнаямляць) з чым-н.

**ІНФАРМА́ТАР**, -а. Той, хто інфармуе, паведамляе пра што-н.

**ІРАНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які мае ў сабе іронію, выражае іронію.

**ІРО́НІЯ**, -і. 1. Тонкая, скрытая насмешка. 2. Стылістычны зварот, слова, фраза, у якіх прытворна, з мэтай насмешкі сцвярджаецца супрацьлеглае таму, што думаюць аб прадмеце або асобе. Адметныя знакі (інтанацыя, жэсты, міміка, сітуацыя, веданне зместу твора) больш ці менш прама паказваюць гледачу

на неабходнасць замены відавочнага (яўнага) сэнсу яго супрацьлегласцю. Акцёры праз разнастайныя выяўленчыя сродкі мовы карыстаюцца вербальнай І.: яны смяюцца адзін з аднаго, заяўляюць аб сваёй перавазе над партнёрам або сітуацыяй. Гэты тып І. добра адаптуецца да сцэнічнай інтэрпрэтацыі, бо сітуацыя павінна выяўляць персанажаў, якія ўведзены ў зман, або жэстам, інтанацыяй, мімікай абвергнуць відавочны змест, заключаны ў тэксце. Драматычная І. найчасцей звязана з драматычнай сітуацыяй. Глядач адчувае І., калі ўспрымае элементы інтрыгі, якія схаваны ад персанажа і якія не дазваляюць яму дзейнічаць з веданнем справы. І., як элемент, які разбурае тэатральную ілюзію, спрыяе таму, каб аўдыторыя не ўспрымала змест п'есы літаральна. Трагічная І. (або І. лёсу) з'яўляецца прыватным выпадкам драматычнай І., калі герой цалкам памыляецца адносна свайго становішча і знаходзіцца на шляху да гібелі, хаця яму самому здаецца, што выйсце можа быць знойдзена.

**ІСНАВА́ННЕ**, -я. 1. Наяўнасць чаго-н. у рэчаіснасці; быццё. 2. Жыццё, спосаб жыцця.

**ІСНАВА́ЦЬ**, існую́, існуе́ш, існуе́. 1. Быць у наяўнасці; мецца. 2. Быць жывым; жыць; жыць няпоўным жыццём, без радасці, без задавальнення.

**ІСНУ́ЮЧЫ**, -ая, -ае. Які ёсць цяпер, маецца ў рэальнасці.

**І́СНЫ**, -ае. 1. Які існуе, маецца ў рэальнасці. 2. Сапраўдны, рэальны.

**ІСТО́ТА**, -ы. Жывы арганізм; чалавек, жывёліна як носьбіт пэўнай уласцівасці, якасці.

**ІСТО́ТНЫ**, -ая, -ае. Які складае сутнасць або датычыцца сутнасці чаго-н.; значны, важны, асноўны.

**ІСТЭ́РЫК**, -а. Той, хто хварэе на істэрыю.

**ІСТЭРЫ́Я**, -і. Нервовая хвароба, якая праяўляецца ў прыпадках павышанай зласлівасці, сутаргавым смеху са слязамі; узбуджаная, ліхаманкавая дзейнасць у якім-н. кірунку.

**І́СЦІНА**, -ы. Тое, што адпавядае сапраўднасці, адлюстроўвае рэчаіснасць; праўда.

# К

**КААРДЫНА́ЦЫЯ**, -і. Мэтазгодная адпаведнасць, узгодненасць дзеянняў, учынкаў, рухаў і пад.

**КАБЕ́ТА** і **КАБЕ́ЦІНА**, -ы. Сталая жанчына, звычайна замужняя.

**КАВА́РСТВА**, -а. Схільнасць да каварных учынкаў, замыслаў; вераломства; каварныя ўчынкі, замыслы.

**КА́ВЕРЗА**, -ы. Інтрыга, падкопы.

**КА́ВЕРЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Які заключае ў сабе каверзу; заблытаны, складаны. 2. Які робіць, чыніць каверзы, схільны да іх.

**КАГАНЕ́Ц**, -нца́. Свяцільня — прасцейшае прыстасаванне для асвятлення; гліняная, часам металічная пасудзіна, напоўненая тлушчам або алеем з апушчаным у яго кнотам.

**КАЗА́ННЕ**, -я. 1. Размова, гутарка. 2. Прамова рэлігійна-павучальнага характару; пропаведзь.

**КА́ЗАЧНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць казачнага; незвычайнасць, дзівоснасць чаго-н.

**КА́ЗАЧНІК**, -а. Складальнік або распавядальнік казак. Казачнікі вызначаліся індывідуальнай манерай выканання і своеасаблівым рэпертуарам.

**КА́ЗКА**, -і. 1. Апавядальны твор вуснай народнай творчасці або літаратурны твор аб выдуманых падзеях, нярэдка з удзелам чарадзейнай, фантастычнай сілы. 2. Што-н. выдуманае, нерэальнае.

**КА́ЗУС**, -у. Незвычайны, недарэчны выпадак.

**КАКЕ́Т**, -а. Акцёрскае амплуа; ролі

прыгожых, зграбных, задзірлівых маладых жанчын.

**КАЛАМБІ́НА**, -ы. Персанаж італьянскай народнай «камедыі масак» — каханая арлекіна.

**КАЛАМБУ́Р**, -а. Жарт, заснаваны на выкарыстанні розных слоў, блізкіх па гучанні, або розных значэнняў аднаго слова; гульня слоў.

**КАЛАСНІКІ́**, -о́ў. Драўляныя або металічныя брусы, злучаныя ў выглядзе рашоткі, у верхняй частцы тэатральнай сцэны для мацавання і спуску дэкарацый. На калісніках месцяцца блокі дэкарацыйных, індывідуальных, сафітных пад'ёмаў і іншае верхавое абсталяванне.

**КАЛАТНЕ́ЧА**, -ы і **КАЛАТНЯ́**, -і. 1. Сварка, звычайна з пабоямі. 2. Бойка, вайна; мітусня, неразбярыха, перапалох.

**КАЛАШМА́ЦІЦЬ**, -ма́чу, -ма́ціш, -ма́ціць. 1. Шматаць, кудлачыць, тармасіць; моцна тузаць, цягаць, стараючыся разадраць, пашматаць. 2. Біць, калаціць.

**КАЛДЫБА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Ісці кульгаючы, кандыбаць.

**КАЛМА́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Пакрыты густымі скудлачанымі валасамі, поўсцю; касматы, кудлаты. 2. Аброслы валасамі, пушынкамі; нягладкі.

**КАЛМА́ЦІЦЦА**. Станавіцца калматым; кудлаціцца, касмаціцца.

**КАЛМА́ЦІЦЬ**, -ма́чу, -ма́ціш, -ма́ціць. Рабіць калматым; кудлаціць, касмаціць.

**КАМЕ́ДЫЯ**, -і. 1. Драматургічны твор з вясёлым жыццярадасным або сатырычным сюжэтам; спектакль або кінафільм па сцэнарыі такога твора. 2. Смешнае, забаўнае здарэнне. 3. Крывадушныя паводзіны, прытворнае разыгрыванне якой-н. сцэны, ролі з пэўнай мэтай.

**КАМЕДЫЯ́НТ**, -а. 1. Акцёр. 2. Крывадушнік, прытворшчык.

**КАМЕНТА́РЫЙ**, -я. 1. Тлумачэнне да якога-н. друкаванага тэксту ў форме заўваг, зносак і пад. 2. *часцей мн.* (каментарыі, -яў). Крытычныя і тлумачальныя разважанні на якую-н. тэму.

**КАМІ́ЗМ**, -у. Камічнае, смешнае ў людзях, здарэннях, сітуацыях.

**КАМІЗЭ́ЛЬКА**, -і. Кароткая адзежына без рукавоў і каўняра, якую надзяваюць на сарочку або блузку.

**КАМІ́ЧНАЕ**, -ы, -ая. Неадпаведнасць паміж недасканаласцю, нежыццёвасцю, несур'ёзнасцю ці нікчэмнасцю з'явы, прадмета, падзеі і іх выяўленнем, што прэтэндуе на паўнацэннасць або маскіруецца пад іх.

**КАМПАЗІ́ЦЫЯ**, -і. 1. Будова мастацкага твора, суадносіны паміж яго асобнымі часткамі. 2. Твор, які складаецца з літаратурнай і музычнай частак, аб'яднаных адной тэмай, сюжэтам.

**КАМПАНЕ́НТ**, -а. Састаўная частка чаго-н.

**КАМПАНО́ЎКА**, -і. Складанне цэлага з асобных частак.

**КАМПЛЕ́КЦЫЯ**, -і. Будова цела чалавека; целасклад.

**КАМПЛІМЕ́НТ**, -а. Прыемная заўвага, пахвала.

**КАМПРАМЕТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Няславіць каго-, што-н.

**КАМПРАМІ́С**, -у. Пагадненне з кім-н. на падставе ўзаемных уступак; уступка дзеля дасягнення мэты.

**КАМУНІКА́ЦЫЯ**, -і. Абмен думкамі, перадача інфармацыі пры дапамозе мовы.

**КАНА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Паміраць у муках, канчацца; пра найвышэйшую ступень хацення, жадання і пад. 2. Канчацца, набліжацца да канца.

**КАНКРЭ́ТНЫ**, -ая, -ае. Які рэальна існуе, дакладны, прадметна акрэслены.

**КАНКРЭТЫЗАВА́ЦЬ**, -зу́ю, -зу́еш, -зу́е. Даць (даваць) канкрэтнае выражэнне чаму-н.; удакладніць (удакладняць) што-н.

**КАНСТАТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Устанавіць (устанаўліваць) наяўнасць чаго-н.; адзначыць (адзначаць) што-н.

**КАНТА́КТ**, -у. Сутыкненне, непасрэдная блізкасць па месцы знаходжання; цесная ўзаемная сувязь, узгодненасць; узаемаразуменне.

**КАНТАКТАВА́ННЕ**, -я. Спецыфічны для людзей спосаб узаемаадносін (адпавядае рускаму слову «общение»).

**КАНТАКТАВА́ННЕ СЦЭНІ́ЧНАЕ**.

Спосаб быцця акцёра ва ўзаемаадносінах з іншымі выканаўцамі і гледачамі.

**КАНТРА́КТ**, -а. Дагавор, пагадненне, заключанае бакамі з узаемнымі абавязацельствамі.

**КАНТРАКТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Заключаць кантракт на атрыманне, выкарыстоўванне чаго-, каго-н.

**КАНТРАЛЁР**, -а. Службовая асоба ў тэатры, якая правярае білеты ў гледачоў.

**КАНТРАМА́РКА**, -і. Талон або другі ўмоўны знак, які замяняе білет пры ўваходзе ў тэатр, цырк, філармонію і пад.

**КАНТРА́СТ**, -у. Рэзка выражаная процілегласць.

**КАНТРА́СТНЫ**, -ая, -ае. Які з'яўляецца кантрастам каму-, чаму-н.; рэзка процілеглы.

**КАНТЭ́КСТ**, -у. Адносна завершаны ўрывак тэксту ці вуснай мовы, агульны сэнс якога дазваляе найбольш дакладна і правільна вызначыць значэнне асобнага слова ці выразу, што ўваходзяць у склад ўрыўка. К. можа быць сказ, абзац, у шырокім разуменні — увесь твор.

**КАНФЕРА́НС**, -у. Выступленне на сцэне, звязанае з аб'яўленнем нумароў праграмы эстраднага прадстаўлення, канцэрта, а таксама тэкст такога выступлення.

**КАНФЕРАНСЬЕ́**. Артыст, які аб'яўляе нумары праграмы на эстрадным прадстаўленні, канцэрце і займае гледачоў у перапынках паміж нумарамі.

**КАНФЕРЫ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Выконваць абавязкі канферансье.

**КАНФЛІ́КТ**, -у. Сутыкненне процілеглых бакоў, поглядаў, сіл; сур'ёзная спрэчка, нязгода; супярэчнасць, сутычка, пакладзеныя ў аснову сюжэта п'есы ці іншага мастацкага твора. К. узнікае тады, калі нейкі суб'ект (якая б ні была яго прырода), дабіваючыся пэўнай мэты (кахання, улады, ідэалу), супрацьстаіць у сваіх дзеяннях другому суб'екту (персанажу), сутыкаецца з псіхалагічнай або маральнай перашкодай. К. падтрымліваецца і разгортваецца часцей за ўсё ў развіцці дзеяння.

**КАНФЛІКТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Уступаць у канфлікт з кім-н., даходзіць да канфлікту.

**КАНФУ́З**, -у. Няёмкае выпадковае здарэнне, якое выклікае збянтэжанасць, сорам; стан няёмкасці, збянтэжанасці, сораму.

**КАНФУ́ЗІЦЦА**, -фу́жуся, -фу́зішся, -фу́зіцца. Прыходзіць у замяшанне, адчуваць няёмкасць; саромецца, бянтэжыцца.

**КАНФУ́ЗІЦЬ**, -фу́жу, -фу́зіш, -фу́зіць. Ставіць у няёмкае становішча; бянтэжыць.

**КАНФУ́ЗЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка канфузіцца, бянтэжыцца; сарамлівы; які выражае канфуз, збянтэжанасць.

**КАНФУ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Які канфузіць, ставіць у няёмкае становішча.

**КАНЦЭНТРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Збіраць, сцягваць, групаваць у адным якім-н. месцы; звяртаць, накіроўваць на што-, каго-н. увагу, думкі і пад.

**КАНЦЭ́ПЦЫЯ**, -і. 1. Сістэма поглядаў, спосаб разумення якіх-н. з'яў. 2. Асноўная думка, агульная задума п'есы ці іншага мастацкага твора.

**КАНЦЭ́РТ**, -а. Публічнае мастацкае чытанне, выкананне інструментальных, вакальных, харэаграфічных і інш. нумароў па поўнай праграме.

**КАНЦЭРТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Даваць канцэрты, выступаць у канцэртах.

**КАНЦЭРТА́НТ**, -а. Артыст, які дае канцэрт або ўдзельнічае ў канцэрце.

**КА́НЬКАЛА**, -ы. Той, хто канькае, дакучае сваімі просьбамі, скаргамі.

**КА́НЬКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Назойліва прасіць аб чым-н., скардзіцца на што-н.

**КАПІ́РАВАЦЬ**, капі́рую, -руеш, -руе і **КАПІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Пераймаць, падрабляць чые-н. рухі, міміку, жэсты, голас і пад.

**КАПРЫ́З**, -у. 1. Беспадстаўнае, але настойлівае жаданне, патрабаванне; недарэчная задума, дзівацтва. 2. Што-н. нечаканае, выпадковае.

**КАПРЫ́ЗА**, -ы. Капрызны чалавек, капрызнае дзіця.

**КАПРЫ́ЗІЦЬ**, -ры́жу, -ры́зіш, -ры́зіць. Паводзіць сябе капрызна, быць капрызным.

**КАПРЫ́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Свавольны, наравісты, з капрызамі; які выражае капрыз. 2. Поўны нечаканых перамен, выпадковасцей; няўстойлівы.

**КАПРЫЗУ́ЛЯ**, -і. Капрыза, капрызнік.

**КАПТУ́Р**, -а. Традыцыйны галаўны ўбор замужняй жанчыны — паўшарападобная ці плоская шапачка з вушкамі, да якіх прышывалі стужкі для завязвання пад барадой, на патыліцы прызбораны.

**КАПУ́СНІК**, -у. Жартаўлівае, гумарыстычнае прадстаўленне з парадыйна-сатырычных і жартаўліва-гумарыстычных нумароў на розныя тэатральныя, а часам і грамадска-палітычныя злабадзённыя тэмы. Вызначаецца творчай выдумкай і жанравай разнастайнасцю.

**КАРАГО́Д**, -а. Масавая народная гульня, якая суправаджаецца танцамі, песнямі і драматычнымі дзеяннямі; масавы дзіцячы танец-гульня.

**КАРА́ЛІ**, -яў; *адз.* **кара́ля**, -і. Упрыгожанне з каралавых або іншых каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю.

**КАРСА́Ж**, -а. Частка жаночага адзення, якая аблягае грудзі, спіну, бакі; пругкі пояс спадніцы.

**КАРТА́ВЫ**, -ая, -ае. Які нячыста, няправільна вымаўляе санорны «р».

**КАРУ́НКІ**, -аў. Ажурныя, сятчастыя вырабы з ільняных, шаўковых і інш. нітак для аздобы бялізны, адзення і пад.

**КАРЦІ́НА**, -ы. У драме, оперы, балеце — закончаная частка дзеі (акта). К. аддзяляюцца адна ад адной кароткім перапынкам; калі апускаецца заслона, гледачы застаюцца на месцах, а на сцэне адбываецца хуткая змена дэкарацый.

**КАРЭ́КТНЫ**, -ая, -ае. Тактоўны, ветлівы, далікатны.

**КАСЦЮ́М**, -а. 1. Камплект адзення, які складаецца з пінжака, штаноў і часам камізэлькі (у мужчын) або жакета і спадніцы (у жанчын). 2. Адзенне спецыяльнага прызначэння; тэатральнае або маскараднае адзенне.

**КАСЦЮМЕ́Р**, -а. Супрацоўнік тэатра, які рыхтуе касцюмы для спектакля.

**КАСЦЮМЕ́РНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да тэатральных і маскарадных касцюмаў, звязаны з іх падрыхтоўкай і захаваннем.

**КАСЦЮМІ́РАВАНЫ**, -ая, -ае. Адзеты ў тэатральны або маскарадны касцюм; з удзельнікамі, адзетымі ў маскарадныя касцюмы.

**КАСЦЮМІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Адзець (адзяваць) у тэатральны касцюм.

**КАТАВА́ННЕ**, -я. Жорсткія фізічныя здзекі, пакуты.

**КАТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Моцна, балюча біць, жорстка мучыць; дакараць, прымушаць пакутаваць, мучыцца.

**КА́ТАР**, -у. Запаленне слізістай абалонкі якога-н. органа, што суправаджаецца пачырваненнем, набуханнем, ацёкам, выдзяленнем вадкасці.

**КАТАРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да катару, звязаны з катарам.

**КАТУ́РХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Штурхаць, разварушваць каго-н., прымушаючы ачнуцца, прыйсці да памяці; узбуджаць, узрушаць, актывізаваць.

**КАТЭГАРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Рашучы, безумоўны, неаспрэчны.

**КАХА́НАК**, -нка. 1. Любы, каханы. 2. Тое, што і п а л ю б о ў н і к.

**КАХА́НКА**, -і. 1. Лю́бая, каханая. 2. Тое, што і п а л ю б о ў н і ц а.

**КАХА́ННЕ**, -я. Вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы другога полу; любоўныя адносіны.

**КАХА́НЫ**, -ая, -ае. Які выклікае каханне, да якога накіравана каханне; той (тая), каго кахаюць; родны, дарагі; форма фамільярнага звароту.

**КАХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Кахаць адзін аднаго. 2. Пра магчымасць кахаць і быць каханым.

**КАХА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Мець вялікае сардэчнае пачуццё да асобы другога полу; любіць.

**КАЦАВЕ́ЙКА**, -і. Кароткая кофта на ваце, футры або на падкладцы; кабат з рукавамі.

**КАШМА́Р**, -у. 1. Цяжкі, жудасны сон; прывід, здань. 2. Што-н. жахлівае, цяжкае, агіднае.

**КВО́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. 1. Адчуваць сябе нядужым, хворым; крак-

тацць, стагнаць. 2. Жаліцца на нездароўе, болі.

**КВО́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Фізічна не развіты, слабага здароўя, хваравіты. 2. Невялікі па сіле, інтэнсіўнасці, напружанасці.

**КЕЛЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да келлі. 2. Тайны, сакрэтны, скрыты ад іншых.

**КЕ́ЛЛЯ**, -і. Асобны пакой або асобнае жыллё манаха, манашкі ў манастыры; невялікі пакой адзінокага чалавека.

**КЕ́МІЦЬ**, ке́млю, ке́міш, ке́міць. Разумець, разбірацца, цяміць.

**КЕ́МЛІВАСЦЬ** і **КЕ́МНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць кемлівага, кемнага; здольнасць хутка разумець што-н., разабрацца ў чым-н.; здагадлівасць; цямкасць.

**КЕ́МЛІВЫ** і **КЕ́МНЫ**, -ая, -ае. Які ўсё хутка і лёгка разумее, засвойвае; здагадлівы, цямкі; разумны, абдуманы.

**КЕ́ПІКІ**, -аў. Насміханне, кпіны.

**КЕ́РХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Хваравіта пакашліваць.

**КЕ́ШКАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Доўга займацца з чым-н., марудна рабіць што-н.; корпацца.

**КІНЕ́СІКА**, -і. Навука аб камунікацыі жэстамі і выразам твару.

**«КІШЭ́НІ» СЦЭ́НЫ**. Памяшканні для зборкі дэкарацый. З «кішэняў» дэкарацыі падаюцца на сцэнічную пляцоўку.

**КЛА́СІКА**, -і. Узорныя, класічныя творы літаратуры і мастацтва.

**КЛАСІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Створаны класікам, класікамі; узорны, дасканалы. 2. Які адпавядае ідэалу хараства ў рымлян і грэкаў; правільны.

**КЛО́ПАТ**, -у. 1. Неспакойная думка пра што-н.; задача, справы. 2. Увага да патрэб і запатрабаванняў каго-н.; турботы, справы. 3. Трывожны стан; непакой, хваляванне.

**КОСНАЯЗЫ́КАСЦЬ**, -і. 1. Расстройства мовы, якое заключаецца ў няздольнасці правільна вымаўляць гукі; невыразнае вымаўленне. 2. Няўменне лёгка, свабодна гаварыць; памылкі ў вуснай мове.

**КПІ́НКІ**, -нак і **КПІ́НЫ**, -наў. Злыя, абразлівыя жарты, насмешкі над кім-н.

**КПІ́ЦЬ**, кплю, кпіш, кпіць. Строіць кпіны, насміхацца.

**КПЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Схільны да кпінаў; які любіць насміхацца над іншымі.

**КРА́ЙНАСЦЬ**, -і. Празмернае праяўленне чаго-н., крайняя ступень чаго-н.

**КРАКТА́ЦЬ**, кракчу́, крэ́кчаш, крэ́кча і **КРАХТА́ЦЬ**, крахчу́, крэ́хчаш, крэ́хча. Выдаваць ціхія, адрывістыя гукі (пры хваробе, няёмкім становішчы, намаганнях і інш.).

**КРАНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які кранае, расчульвае; які хвалюе.

**КРАПЭ́**. Пасціжорны матэрыял, які прымяняецца для вырабу тэатральных барodaў, вусоў, парыкоў, а таксама прымяняецца ў прычосках.

**КРАПО́Н**, -а. Разнавіднасць крапэ, аб'ёмная пасма валасоў, якую падкладваюць у прычоску для надання ёй неабходнай формы.

**КРАСАМО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Які ўмее добра, прыгожа гаварыць; надзелены красамоўствам. 2. Які выразна перадае, паказвае што-н. 3. Выказаны выразна, умела; поўны красамоўства.

**КРАСАМО́ЎСТВА**, -а. Уменне гаварыць прыгожа і пераканальна; прамоўніцкі талент.

**КРЫВАДУ́ШНІК**, -а. Крывадушны чалавек.

**КРЫВАДУ́ШНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Рабіць, паступаць прытворна, няшчыра; праяўляць у сваіх паводзінах крывадушша.

**КРЫВАДУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Поўны крывадушша; няшчыры, прытворны, двудушны.

**КРЫВАДУ́ШША**, -а. Неадпаведнасць слоў, учынкаў шчырым пачуццям, перакананням; двурушнасць, няшчырасць.

**КРЫВАЖЭ́РНАСЦЬ**, -і. Жорсткасць, лютасць.

**КРЫВАЖЭ́РНЫ**, -ая, -ае. Схільны да забойства; жорсткі, люты.

**КРЫ́ТЫК**, -а. 1. Той, хто аналізуе і ацэньвае чые-н. паводзіны, дзейнасць і пад. 2. Той, хто займаецца крытыкай (у 2 знач.).

**КРЫ́ТЫКА**, -і. 1. Абмеркаванне, разбор каго-, чаго-н. з мэтай ацаніць вар-

тасць, выявіць і выправіць недахопы. 2. Літаратурны жанр, задачай якога з'яўляецца аналіз, тлумачэнне або ацэнка твораў літаратуры, навукі, мастацтва.

**КРЫТЫКА́Н**, -а. Пра чалавека, схільнага да прыдзірлівай, неабгрунтаванай крытыкі, звычайна павярхоўнай.

**КРЫТЫКА́НСТВА**, -а. Прыдзірлівая, неабгрунтаваная, звычайна павярхоўная крытыка.

**КРЫ́ЎДА**, -ы. Пачуццё горычы, выкліканае несправядлівымі ўчынкамі, паводзінамі.

**КРЫЎДАВА́ЦЬ**, -дую, -дуеш, -дуе. Мецъ крыўду на каго-н.; крыўдзіцца.

**КРЫ́ЎДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Адчуваць крыўду, прымаць што-н. за крыўду.

**КРЫЎДЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка крыўдзіцца, бачыць крыўду там, дзе яе няма; поўны крыўды, які выражае крыўду.

**КРЭ́СІВА**, -а. Красала, кавалак сталі для высякання агню з крэменю. Вядома з эпохі жалезнага веку.

**КУЛІ́СА**, -ы; *звычайна мн.* (кулісы, -ліс). Плоскія часткі тэатральнай дэкарацыі, размешчаныя па баках сцэны адна за адной (мяккія ці нацягнутыя на рамы). Разам з іншымі часткамі дэкарацый складаюць мастацкае афармленне спектакля, а таксама закрываюць ад гледачоў службовыя (бакавыя) прасторы сцэны.

**КУЛЬМІНА́ЦЫЯ**, -і. Вяршыня развіцця дзеяння ў літаратурным творы, спектаклі. Выяўляецца ў найвышэйшым пад'ёме, напружанні дзеяння; момант самага моцнага сутыкнення паміж героямі або паміж героем і абставінамі. У К. раскрываецца вастрыня канфлікту, што рэалізуецца ў сюжэце твора; яна перадае найбольш драматычнае выпрабаванне, праз якое праходзіць герой, важнае рашэнне, якое ён прымае і якое высвятляе логіку яго далейшых паводзін, лёсу. К. найбольш выяўляецца ў творах драматургічных і эпічных жанраў.

**КУЛЬТУ́РА МО́ВЫ**. Валоданне нормамі вуснай і пісьмовай літаратурнай мовы (правіламі вымаўлення, націску, граматыкі, славаўжывання і інш.), а таксама ўменне выкарыстоўваць выразныя моўныя сродкі ў адпаведнасці з мэтамі і зместам маўлення. Паняцце ўключае дзве ступені асваення літаратурнай мовы: правільнасць маўлення і моўнае майстэрства.

**КУР'Ё́З**, -у. Недарэчны выпадак, смешнае здарэнне.

**КУ́ФАР**, -фра. Скрыня з векам і замком, у якой захоўвалі тканіну, адзежу, бялізну і каштоўнасці.

**КУХТА́ЛЬ**, -я́. Удар кулаком.

**КУЧО́МКА**, -і. Шапка футрам наверх.

## Л

**ЛАГІ́ЧНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць лагічнага; адпаведнасць законам логікі.

**ЛАГІ́ЧНЫ НА́ЦІСК**. Змяненне сэнсу выказвання з дапамогай выдзялення (парадкам слоў на пісьме або інтанацыяй) таго ці іншага слова.

**ЛАГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Дабрадушны, ласкавы.

**ЛАКАНІ́ЗМ**, -у. Гранічная сціслаcць і дакладнасць у выказванні думак.

**ЛАКАНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Сціслы і дакладна выказаны; немнагаслоўны.

**ЛАПАТА́ЦЬ**, лапачу́, лапо́чаш, лапо́ча. 1. Нязвязна, паспешліва гаварыць, расказваць. 2. Гаварыць многа і беспераcтанку аб чым-н. нязначным, пустым; балбатаць, балабоніць.

**ЛА́СА**. Прагна; з асаблівай цягай да каго-, чаго-н.

**ЛА́СКА**, -і. 1. Выражэнне любві, пяшчоты; мяккасць, лагоднасць. 2. Спачувальныя, прыхільныя адносіны.

**ЛАСУ́НАК**, -нку. 1. Што-н. смачнае; улюбёная страва. 2. *звычайна мн.* (лясу́нкі,

-аў). Салодкія кандытарскія вырабы і наогул усё смачнае; прысмакі.

**ЛАСУ́ХА**, -і, **ЛАСУ́Н**, -а. Тая, той, хто любіць паласавацца.

**ЛА́СЫ**, -ая, -ае. Які мае асаблівую цягу да каго-, чаго-н.; прагны, сквапны.

**ЛАЎРЫ**, -аў. Вянок з галінак лаўра як знак ці сімвал перамогі, трыумфу. Паходзіць ад старажытнага звычаю грэкаў і рымлян увенчваць пераможцаў лаўровым вянком (адсюль назва — лаўрэат).

**ЛАЦВЕ́Й**. Лепей, зручней, ямчэй.

**ЛА́ШЧЫЦЬ**, -шчу, -шчыш, -шчыць. 1. Праяўляць пяшчотнасць, любоў, ласку; пяшчотна дакранацца да каго-, чаго-н., гладзіць. 2. Песціць, выклікаць прыемнае адчуванне.

**ЛА́ЯНКА**, -і. 1. Абразлівыя, грубыя словы, выразы; грубыя дакоры. 2. Сварка.

**ЛА́ЯЦЦА**, ла́юся, ла́ешся, ла́ецца. 1. Гаварыць грубыя, абразлівыя, лаянкавыя словы. 2. Зневажаць адзін аднаго грубым, абразлівым словам; сварыцца.

**ЛЕГЕ́НДА**, -ы. 1. Народнае паданне аб якой-н. гістарычнай падзеі, асобе, якое выдаецца і ўспрымаецца як верагоднае; выдуманы, перабольшаны расказ аб кім-, чым-н. 2. Вымысел, што-н. непраўдападобнае. 3. Выдуманыя звесткі пра сябе (пра таго, хто выконвае сакрэтнае заданне).

**ЛЕГКАВА́ЖНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць легкаважнага.

**ЛЕГКАВА́ЖНЫ**, -ая, -ае. Несур'ёзны, легкадумны, павярхоўны.

**ЛЕГКАВЕ́РНЫ**, -ая, -ае. Які верыць усяму; залішне даверлівы.

**ЛЕГКАДУ́МНАСЦЬ**, -і. Несур'ёзнасць, нясталасць у паводзінах.

**ЛЕГКАДУ́МНЫ**, -ая, -ае. Які дзейнічае без дастатковага разважання; несур'ёзны; ветраны, пусты, павярхоўны.

**ЛЕЖАБО́К**, -а і **ЛЕ́ЖАНЬ**, -жня. Чалавек, які любіць доўга спаць, ляжаць; гультай, лодыр.

**ЛЕЙТМАТЫ́Ў**, -тыву. Асноўная думка твора, якая неаднаразова паўтараецца і падкрэсліваецца.

**ЛЕКСІКО́Н**, -у і -а. 1. -у. Запас слоў і выразаў. 2. -а. Слоўнік.

**ЛЕНАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Крыху лянівы, з адзнакай ленасці.

**ЛЕПЯТА́ЦЬ**, лепячу́, ляпе́чаш, ляпе́ча. Гаварыць невыразна; весці лёгкую несур'ёзную размову; балбатаць.

**ЛЕТУЦЕ́ННАСЦЬ**, -і. Схільнасць да мар, летуцення.

**ЛЕТУЦЕ́ННЕ**, -я. Мара пра што-н. прывабнае, жаданае.

**ЛЕТУЦЕ́ННІК**, -а. Той, хто схільны да летуцення, аддаецца летуценням.

**ЛЕТУЦЕ́ННЫ**, -ая, -ае. 1. Які любіць летуцець, мае схільнасць да летуцення. 2. Створаны ўяўленнем, марай; фантастычны.

**ЛЁГКАСЦЬ**, -і. Пра стан унутранай свабоды, радасці, спакою.

**ЛЁГКІЯ**, -іх, *адз.* лёгкае, -ага. Орган дыхання ў чалавека і пазваночных жывёл, размешчаны ў груднoй поласці.

**ЛІГНІ́Н**, -у. Матэрыял у выглядзе тонкай слаістай паперы, выраблeнай з драўніны, якім акцёры сціраюць з твару грым.

**ЛІКАВА́ЦЬ**, -кую, -куеш, -куе. Праяўляць вышэйшую ступень радасці з выпадку якой-н. выдатнай падзеі.

**ЛІ́НІЯ РО́ЛІ**. Спосаб дзеянняў, думак, поглядаў герояў п'есы, дзейных асоб спектакля.

**ЛІ́ПНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Назойліва прыставаць да каго-н.

**ЛІРЫ́ЗМ**, -у. Элементы эмацыянальнасці, паэтычнай усхваляванасці, сардэчнасці ў творах мастацтва.

**ЛІ́РЫКА**, -і. 1. Адзін з трох родаў мастацкай літаратуры, у якім адлюстроўваюцца перажыванні паэта, яго думкі, настроі, пачуцці (звычайна ў вершаванай форме). 2. Чуллівасць, перажыванні, настрой.

**ЛІ́РЫКА-ДРАМАТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Твор літаратуры, які спалучае элементы лірыкі і драмы.

**ЛІРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Прасякнуты лірызмам, паэтычнай узнёсласцю. 2. Чуллівы, эмацыянальна ўзвышаны. 3. Мякка-пявучы, далікатны па тэмбры (пра голас).

**ЛІСЛІ́ВАСЦЬ**, -і. 1. Празмернае ўсхваленне; угодлівасць. 2. Ласкавасць, пяшчотнасць.

**ЛІСЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. 1. Той, хто ліслівіць, схільны да ліслівасці; падлізнік.

2. Той, хто любіць лашчыцца да каго-н.

**ЛІСЛІ́ВІЦЬ**, -лі́ўлю, -лі́віш, -лі́віць. Крывадушна хваліць каго-н., дагаджаць з карыслівай мэтай.

**ЛІСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які лісლівіць, дагаджае, падлізваецца. 2. Ласкавы, пяшчотны.

**ЛІТАРАТУ́РНАЯ ЧА́СТКА ТЭА́ТРА**. Аддзел у тэатрах, які займаецца фарміраваннем рэпертуару, адборам п'ес з пункту погляду іх мастацкіх вартасцей. У працэсе падрыхтоўкі новых пастановак падбірае неабходны творчаму калектыву гісторыка-літаратурны і іканаграфічны матэрыял, арганізуе гутаркі, даклады, кансультацыі спецыялістаў, рэдагуе праграмы, лібрэта, афішы, рэкламныя выданні аб дзейнасці тэатра.

**ЛІТАРАТУ́РНЫ ГЕРО́Й**. Дзейная асоба ў літаратурным творы, праз якую пісьменнік выяўляе сваё разуменне чалавека, суадносячы яго асобу з гісторыяй і жыццём грамадства. Замест паняцця Л. г. часам ужываюцца іншыя — характар, тып, вобраз, дзейная асоба. Паводле эстэтычнага зместу тэрмін Л. г. у сучасным разуменні бліжэй за ўсё да тэрміна «персанаж», які найбольш дакладна перадае яго сацыяльную ролю ў мастацкім творы.

**ЛІ́ФТАВАЯ СЦЭ́НА**. Двухпавярховая сцэна, якая мае верхні і ніжні планшэты і рухаецца па вертыкалі за стацыянарнай партальнай сцяною.

**ЛО́ГІКА**, -і. 1. Ход разважанняў, вывадаў. 2. Унутраная заканамернасць псіхалагічных і фізічных дзеянняў артыста ў канкрэтных сцэнічных абставінах.

**ЛО́ЖА**, -ы. Месца ў глядзельнай зале, аддзеленае перагародкай для невялікай колькасці асоб.

**ЛО́ЎКІ**, -ая, -ае. Спрытны, умелы.

**ЛЫ́КАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Піць што-н. шумнымі глыткамі.

**ЛЫ́ПАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. То адплюшчваць, то заплюшчваць вочы; маргаць.

**ЛЭ́ПАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Лапаць, мацаць.

**ЛЮ́БА**. Міла, з любоўю; прыемна, падабаецца, да сэрца.

**ЛЮБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. Разглядваць каго-, што-н. з захапленнем, задавальненнем; адчуваць задавальненне, захапленне, наглядаючы чыю-н. дзейнасць, учынкі.

**ЛЮ́БАСЦЬ**, -і. 1. Пачуццё глыбокай прыхільнасці да каго-, чаго-н., адданасць каму-, чаму-н.; любоў; пачуццё пяшчоты, любавання; замілаванне. 2. *у знач. вык.* Любата.

**ЛЮБАТА́**, -ы́. 1. Тое, што выклікае захапленне прывабнасцю, прыгажосцю. 2. Пра захапленне, зачараванне кім-, чым-н., задавальненне ад каго-, чаго-н.

**ЛЮ́БАЧКА**, -і. 1. Любімая, любая. 2. (*ужываецца пры звароце*). Мілая (мілы), дарагая (дарагі).

**ЛЮБІ́МЕЦ**, -мца. Той, каго асабліва любяць, паважаюць, цэняць; улюбёнец.

**ЛЮБІ́МЧЫК**, -а. Той, хто карыстаецца чыёй-н. любоўю, апякунствам, каму аддаюць перавагу на шкоду іншым.

**ЛЮБІ́ЦЬ**, люблю́, лю́біш, лю́біць. 1. Адчуваць глыбокую адданасць, прыхільнасць да каго-, чаго-н., быць адданым каму-, чаму-н.; адчуваць сімпатыю, павагу да каго-н. 2. Адчуваць сардэчную прыхільнасць да асобы другога полу; кахаць.

**ЛЮБО́Ў**, -бо́ві і -бві. 1. Пачуццё глыбокай прыхільнасці да каго-, чаго-н., адданасці каму-, чаму-н.; пачуццё сімпатыі да каго-н. 2. Пачуццё гарачай сардэчнай прыхільнасці да асобы другога полу; каханне.

**ЛЮБО́ЎНІК**, -а. Акцёрскае амплуа; ролі юнакоў, маладых мужчын, якія вызначаюцца розумам, прыгажосцю, высакароднасцю і пад., закаханых або якіх кахалі.

**ЛЮ́БЫ**, -ая, -ае. Які выклікае пачуццё любві; карыстаецца любоўю; блізкі, дарагі, мілы сэрцу; той, каго любяць; каханы, мілы, родны.

**ЛЮ́ДСКАСЦЬ**, -і. Чалавечнасць, спагадлівасць.

**ЛЮ́ДСКІ**, -ая, -ае. 1. Чалавечны, пачцівы, прыстойны. 2. Такі, як трэба.

**ЛЮ́КІ АСВЯТЛЯ́ЛЬНЫЯ**. Прыстасаванні ў планшэце сцэны, пры дапамозе якіх падключаецца асвятляльная апаратура. Л. а. размеркаваны на кожным плане правага і левага бакоў сцэны.

**ЛЮКІ ПРАВАЛУ.** Сцэнічныя ўбудаванні для пад'ёму з трума на ўзровень пляцоўкі сцэны асобных выканаўцаў спектакля або дэталей сцэнічнага афармлення, а таксама для іх правалу (спускання) з узроўню планшэта сцэны ў трум. Л. п. упершыню з'явіліся ў 5 ст. да н. э. у старажытнагрэчаскім тэатры.

**ЛЮЛЬКА**, -і. Прылада для курэння, якая складаецца з цыбука і галоўкі, пустой унутры, у якую насыпаюць тытунь.

**ЛЮСТРА**[1], -а. 1. Паверхня (шкла, металу, вады), здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёю. 2. Пра тое, што з'яўляецца адлюстраваннем якіх-н. з'яў, працэсаў і пад. 3. Паверхня, плошча.

**ЛЮСТРА**[2], -ы. Падвясны асвятляльны прыбор з некалькімі крыніцамі святла (свечкамі ці электралямпамі) і аздобленай арматурай.

**ЛЮТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе. Праяўляць лютасць, жорсткасць у дзеяннях, учынках.

**ЛЮТАСЦЬ**, -і. Люты, раз'юшаны, гнеўны стан.

**ЛЮФТ-ПАЎЗА**, -ы. Маленькая паўза ў сцэнічным дзеянні ці маўленні.

**ЛЯЛЬКАВОД**, -а. Акцёр тэатра лялек. Стварае мастацкі вобраз пры дапамозе лялькі, якую сам прыводзіць у дзеянне.

**ЛЯМАНТ**, -у. Адчайны, немы крык як праяўленне жаху, як кліч на дапамогу; моцны працяглы плач, крык.

**ЛЯМАНТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе. 1. Моцна і працягла крычаць. 2. Галасіць па кім-н.; моцна плакаць.

**ЛЯНІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які схільны да ляноты, ухіляецца ад працы. 2. Вялы, павольны (пра рухі, паходку і пад.).

**ЛЯНОТА**, -ы. Адсутнасць жадання працаваць, рабіць што-н., займацца чым-н.; стан вяласці, санлівасці.

## М

**МАГЕРКА**, -і. Старадаўні мужчынскі галаўны ўбор. Вядомы ў 16 — 19 ст. па ўсёй Беларусі. Паводле спосабаў вырабу бываюць лямцавыя (валеныя з воўны) і шытыя з чатырох кавалкаў тоўстага валенага сукна. Рабілі М. вышынёй 15 — 20 см белага, шэрага, карычневага і чорнага колеру. Насілі круглы год.

**МАДАМ**. Зварот да замужняй жанчыны ў Францыі і некаторых іншых краінах.

**МАДОННА**, -ы. У католікаў — божая маці, багародзіца, а таксама яе скульптурны ці жывапісны партрэт.

**МАДРЫГАЛ**, -а. Невялікі інтымнажартоўны верш, што змяшчае ў сабе камплімент, найчасцей адрасаваны жанчыне.

**МАЖНЫ**, -ая, -ое. Рослы, поўны, моцнага целаскладу.

**МАЖОР**, -у. Вясёлы, бадзёры, радасны настрой.

**МАЙСТАР**, -тра. 1. Спецыяліст у якой-н. галіне творчасці, вытворчасці, рамястве. 2. Чалавек, які дасягнуў высокага майстэрства ў сваёй справе.

**МАЙСТЭРСТВА**, -а. 1. Прафесійны занятак; рамяство. 2. Вялікае ўменне, мастацтва ў якой-н. галіне. У акцёраў праяўляецца ў свабодным валоданні ўсімі сродкамі свайго мастацтва, ва ўменні падпарадкаваць іх стварэнню сцэнічнага вобраза.

**МАКЕТ**, -а. Узор, схема, мадэль дэкарацый спектакля (звычайна ў паменшаным выглядзе).

**МАКСІМАЛІЗМ**, -у. Празмерная, без уліку рэальных умоў крайнасць у якіх-н. патрабаваннях.

**МАЛАДЖАВЫ**, -ая, -ае. Які выглядае маладзей сваіх год.

**МАЛАДЗЕЙСНЫ**, -ая, -ае. Які аказвае малое ўздзеянне на каго-, што-н.

**МАЛАДЗЕЦ**, малайца. 1. Статны,

атлетычнага складу малады чалавек. 2. Ужываецца для выражэння пахвалы, адабрэння.

**МАЛАДЗЁН**, -а. 1. Непаўналетні чалавек, хлапец. 2. Малавопытны па маладосці чалавек.

**МАЛАДУ́ШНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Праяўляць нерашучасць, адсутнасць мужнасці; падаць духам.

**МАЛАДУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Слабавольны, нерашучы; не стойкі духам; труслівы.

**МАЛАДУ́ШША**, -а. Адсутнасць мужнасці, цвёрдасці духу; маладушнасць.

**МАЛАЙЦАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Бравы на выгляд; удалы, спрытны.

**МАЛО́Х**, -а. Ужываецца як сімвал бязлітаснай сілы, якая патрабуе мноства чалавечых ахвяр.

**МАЛЬБА́**, -ы́. Вельмі моцная і страсная просьба.

**МАЛЮ́НАК РО́ЛІ**. Паводзіны дзейнай асобы, якія выяўляюцца і пазнаюцца ў працэсе ўсёй працы над роляй і характар якіх увасабляецца ў дзеяннях і мізансцэнах на працягу выканання ўсёй п'есы.

**МАНАДРА́МА**. Драматургічны твор, разлічаны на выкананне адным акцёрам. Да М. адносяцца п'есы-маналогі, драматургічныя мініяцюры, у якіх персанаж апелюе непасрэдна да гледачоў або ўяўнай дзейнай асобы. М. называюць таксама драматургічны твор з дзвюма ці больш дзейнымі асобамі, ролю якіх выконвае адзін акцёр. Такая форма ігры існавала ў Старажытнай Грэцыі (да Эсхіла). На Беларусі некаторае пашырэнне атрымала ў фальклорным тэатры, асабліва ў выкананні інтэрмедый, невялікіх драматычных сцэнак.

**МАНАЛО́Г**, -а. Працяглая гаворка, словы дзейнай асобы ў п'есе ці іншым літаратурным творы, звернутыя да другой асобы або да самога сябе (унутраны М.) ці непасрэдна да гледача. М. дазваляе выканаўцу раскрыць душэўны стан персанажа, выявіць супярэчнасці яго светапогляду, складанасць характару. На эстрадзе М. называецца самастойны нумар размоўнага жанру (фельетон), які выконваецца адным акцёрам.

**МАНАТО́ННЫ**, -ая, -ае. Аднатонны, аднастайны; нудны.

**МАНЕ́РА**, -ы. 1. Спосаб дзеяння, прыём; звычка. 2. Знешнія формы паводзін, спосаб трымацца. 3. Сукупнасць прыёмаў, характэрных рыс творчасці.

**МАНЕ́РНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Ненатуральна паводзіць сябе; крыўляцца.

**МАНІ́СТЫ**, -аў. Упрыгожанне з пацерак, манет, каштоўных камянёў, якое надзяваецца на шыю.

**МАНІ́ШКА**, -і. Нагруднік, пераважна з белай тканіны, прышыты або прышпілены да мужчынскай кашулі; устаўка на грудзях у жаночай сукенцы.

**МА́НІЯ**, -і. 1. Псіхічны стан, пры якім свядомасць і пачуцці сканцэнтроўваюцца на якой-н. адной ідэі. 2. Незвычайная цяга, слабасць да чаго-н.

**МАНУМЕНТА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які ўражвае сваёй магутнасцю; велічны, грандыёзны; вялікі, рослы, мажны (пра чалавека). 2. Грунтоўны, глыбокі зместам.

**МАНУСКРЫ́ПТ**, -а. Старажытны рукапіс.

**МАНЦІРО́ВАЧНАЯ РЭПЕТЫ́ЦЫЯ**. Папярэдняя праверка ўсіх элементаў дэкарацыйнага афармлення спектакля, пастаноўкі. У час М. р. праводзіцца зборка дэкарацый п'есы па актах у адпаведнасці з аўтарскім эскізам і тэхнічным макетам; распрацоўваюцца спосабы і сродкі для хуткай змены дэкарацый; удакладняецца размяшчэнне прадметаў афармлення спектакля, правяраюцца механізмы для стварэння сцэнічных эфектаў, мастацкага асвятлення дэкарацый. Апошняя М. р. праводзіцца з удзелам акцёраў у касцюмах і грыме.

**МАНЦІРО́ВАЧНАЯ ЧА́СТКА ТЭА́ТРА**. Група цэхаў тэатра, якія выконваюць тэхнічнае абслугоўванне сцэны ў час рэпетыцый, спектакляў. М. ч. т. ставіць і перастаўляе дэкарацыі, мэблю, бутафорыю і рэквізіт, асвятляе сцэну, выконвае ўсе светлавыя, тэхнічныя і гукашумавыя эфекты.

**МАНЦІРО́ЎКА ДЭКАРА́ЦЫЙ**. Мантаж, зборка дэкарацый канкрэтнага спектакля.

**МАНЬЯ́К**, -а. Чалавек, апанаваны, захоплены якой-н. маніяй.

**МАНЮ́КА**, -і. Той, хто гаворыць няпраўду, маніць; хлус.

**МА́РА**, -ы. 1. Тое, што створана фантазіяй, уяўленнем; дзейнасць уяўлення, фантазіі. 2. Жаданне, імкненне. 3. Што-н. нерэальнае, неіснуючае, што не адбылося. 4. *у знач. вык.* Што-н. незвычайна прыгожае, жаданае; вышэйшая ацэнка чаго-н.

**МАРА́**, -ы́. Прывід, здань, насланнё.

**МАРА́ЗМ**, -у. 1. Стан поўнага ўпадку псіхічнай і фізічнай дзейнасці чалавека ў сувязі са старасцю або працяглай хваробай. 2. Упадак, разлажэнне.

**МАРАКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. 1. Крыўдаваць, злавацца. 2. Разбірацца ў якой-н. складанай справе, абдумваць што-н.

**МАРАЛІЗАВА́ЦЬ**, -зу́ю, -зу́еш, -зу́е. Прапаведаваць строгую мараль; павучаць, чытаць натацыі.

**МАРАЛІТЭ́**. Павучальная драма заходнееўрапейскага тэатра 15 — 16 ст. з алегарычнымі дзейнымі асобамі (колькасцю ад 5 да 20). Інтрыга нязначная, але заўсёды патэтычная і кранальная. М. мае адносіны адначасова і да фарсу і да містэрыі.

**МАРА́ЛЬ**, -і. 1. Правілы, нормы паводзін людзей. 2. Павучальны вывад. 3. Павучанне, натацыя.

**МАРДАВА́ЦЦА**, -ду́юся, -ду́ешся, -ду́ецца. 1. Выбівацца з сіл, знясільвацца. 2. Му́чыцца, пакутаваць.

**МАРДАВА́ЦЬ**, -ду́ю, -ду́еш, -ду́е. 1. Знясільваць цяжкай працай, марыць. 2. Мучыць, прыносіць пакуты.

**МАРКО́ТА**, -ы. Сум, туга, журба.

**МАРКО́ТНЫ**, -ая, -ае. Сумны, тужлівы; журботны.

**МАРКО́ЦІЦЦА**, -ко́чуся, -ко́цішся, -ко́ціцца. Сумаваць, тужыць; журыцца.

**МАРМЫТА́ЦЬ**, -мычу́, -мы́чаш, -мы́ча. Гаварыць ціха і невыразна; бубніць.

**МАРМЫТУ́Н**, -а́. Той, хто часта мармыча.

**МА́РНА**. Дарэмна, упустую.

**МАРНАВА́ЦЦА**, -ну́ецца. 1. Траціцца без карысці, прападаць, не ісці на карысць. 2. Тое, што і м а р д а в а ц ц а (у 2 знач.).

**МАРНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. 1. Траціць без карысці, марнатравіць. 2. Мучыць, стамляць.

**МАРНАТРА́ВЕЦ**, -тра́ўца. 1. Той, хто неразумна, марна траціць грошы, маёмасць, здароўе, сілы. 2. Пра дрэннага, нягоднага чалавека.

**МАРНАТРА́ВІЦЬ**, -тра́ўлю, -тра́віш, -тра́віць. Траціць марна, без патрэбы; марнаваць.

**МАРНАТРА́ЎСТВА**, -а. Неразумная, марная трата чаго-н.

**МАРНЕ́ЦЬ**, -не́ю, -не́еш, -не́е. 1. Засыхаць, чахнуць, чэзнуць. 2. Гібець, чахнуць (пра чалавека). 3. Занепадаць, марна прападаць.

**МА́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Дарэмны, бескарысны. 2. Змарнелы, чэзлы, худасочны.

**МАРО́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Уводзіць у зман, ашукваць.

**МАРСКАНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Рэзка штурхнуць, адштурхнуць; ударыць.

**МАРУ́ДА**, -ы. Чалавек, які вельмі павольна ўсё робіць.

**МАРУ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Рабіць што-н. вельмі павольна, доўга не пачынаць справы; выказваць нерашучасць, быць нерашучым; муляцца.

**МАРУ́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Павольны, няспешлівы. 2. Непаваротлівы. 3. Карпатлівы.

**МАРЫ́ЛКА**, -і. Тэатральная фарба, якая выкарыстоўваецца для грыміравання твару або ўсяго цела артыста.

**МА́РЫЦЦА**. 1. Уяўляцца, здавацца ў думках. 2. Аб жаданні або мажлівасці марыць.

**МАРЫ́ЦЦА**, мару́ся, мо́рышся, мо́рыцца. Таміцца, мучыцца.

**МА́РЫЦЬ**, ма́ру, ма́рыш, ма́рыць. Аддавацца марам; думаць пра ажыццяўленне чаго-н. вельмі жаданага, імкнуцца ў думках да каго-, чаго-н.

**МАРЫ́ЦЬ**, мару́, мо́рыш, мо́рыць. 1. Труціць, атручваць. 2. Даводзіць да поўнага знясілення; мардаваць, мучыць. 3. Даводзіць да знямогі.

**МАРЫЯНЕ́ТАЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да марыянеткі, марыянетак (у 1 знач.). 2. Які слепа выконвае чыю-н. волю.

**МАРЫЯНЕ́ТКА**, -і. 1. Тэатральная лялька, якой кіруе акцёр з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў. 2. Той, хто слепа дзейнічае па волі іншых.

**МА́САВАЕ ДЗЕ́ЙСТВА**. Тэатралізаванае відовішча з удзелам вялікай колькасці выканаўцаў і гледачоў. М. дз. наладжваюцца на плошчах, вуліцах, у парках, на стадыёнах.

**МА́САВАЯ СЦЭ́НА** (масо́ўка). У тэатры — сцэна спектакля з вялікай колькасцю ўдзельнікаў, якая паказвае «натоўп», «народ», «масу».

**МАСА́Ж**, -у. Механічнае ўздзеянне спецыяльнымі прыёмамі на паверхню цела або якога-н. органа з лячэбнай або гігіенічнай мэтай.

**МАСАЖАВА́ЦЬ**, -жу́ю, -жу́еш, -жу́е і **МАСІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Рабіць масаж.

**МА́СКА ТЭАТРА́ЛЬНАЯ**. Спецыяльная накладка з прорэзямі для вачэй, з выявай чалавечага твару ці галавой жывёлы, птушкі, міфалагічна-абрадавай істоты, што надзяваецца на твар акцёра. Адзін з мастацкіх сродкаў стварэння сцэнічнага вобраза, кананізаванага выяўлення пэўнага чалавечага тыпу. Паводле прызначэння бываюць рытуальна-абрадавыя (выкарыстоўваюцца ў абрадавых гульнях, рытуальных шэсцях і пад.) і тэатральныя, у тым ліку паўмаскі (павязкі з прорэзямі для вачэй, што закрываюць толькі верхнюю частку твару).

**МАСКАРА́Д**, -у. 1. Баль, вечар, на які прыходзяць у масках і спецыяльных касцюмах; касцюміраваны баль. 2. Незвычайны касцюм, убор, які мяняе чый-н. знешні выгляд; аб прытворстве, якое хавае сутнасць каго-, чаго-н.

**МА́СЛЕНІЦА**, -ы. 1. Свята провадаў зімы ў старажытных славян і іншых народаў, аднесенае хрысціянскай царквой на нядзелю перад т. зв. «вялікім постам». 2. Аб добрым, прывольным жыцці.

**МАСТА́К ТЭАТРА́ЛЬНЫ**. Мастак, які сродкамі выяўленчага мастацтва (жывапісу, архітэктуры, скульптуры і інш.) у адпаведнасці з задумай і пастановачным планам рэжысёра стварае зрокавы вобраз спектакля.

**МАСТА́ЦКАЕ ЧЫТА́ННЕ**. 1. Жанр эстраднага мастацтва. 2. Публічнае выкананне твораў літаратуры са сцэны.

**МАСТА́ЦКАСЦЬ**, -і. Спецыфічная ўласцівасць прадметаў і з'яў, якія ствараюцца ў працэсе творчай дзейнасці і атрымліваюць дзякуючы ёй каштоўнасць эстэтычную і мастакоўскую.

**МАСТА́ЦКІ ГУСТ**. Які адпавядае патрабаванням мастацтва, эстэтычны.

**МАСТА́ЦТВА**, -а. 1. Творчая перадача рэчаіснасці ў мастацкіх вобразах. 2. Галіна творчай мастацкай дзейнасці. 3. Дасканалае ўменне, майстэрства ў якой-н. справе, працы.

**МАСТА́ЦТВА ПЕРАЖЫВА́ННЯ**. Здольнасць акцёра пры кожным выкананні ролі перажываць пачуцці і думкі ствараемага персанажа, як свае ўласныя. «Гэта мастацтва заснавана на ўменні акцёра «ва ўмовах жыцця ролі» і поўнай аналогіі з ёй правільна, лагічна, паслядоўна, па-чалавечы мысліць, хацець, імкнуцца, дзейнічаць... Як толькі артыст дасягне гэтага, ён наблізіцца да ролі і пачне аднолькава з ёю адчуваць» (Станіслаўскі).

**МАСТА́ЦТВА ПРАДСТАЎЛЕ́ННЯ**. Здольнасць акцёра на кожным спектаклі дэманстраваць гатовы вынік творчасці. Акцёр, які перажыў аднойчы або некалькі разоў ролю, у далейшым карыстаецца вынікамі свайго сапраўднага перажывання з дапамогай тэхнікі. «У гэтым накірунку мастацтва працэс перажывання не з'яўляецца галоўным момантам творчасці, а толькі адным з падрыхтоўчых этапаў для далейшай артыстычнай працы... Артыст запамінае не само пачуццё, а яго бачныя знешнія вынікі... Стварыўшы аднойчы і назаўсёды найлепшую форму ролі, артыст вучыцца перадаваць яе тэхнічна, г. зн. вучыцца яе прадстаўляць» (Станіслаўскі).

**МАСЦІ́ТЫ**, -ая, -ае. Які заслужыў сваёй плённай дзейнасцю прызнанне і павагу.

**МАСЦІ́ЦЦА**, машчу́ся, мо́сцішся, мо́сціцца. 1. Зручна размяшчацца, уладкоўвацца. 2. Мець намер, намервацца.

**МАТЛАШЫ́ЦЬ**, -лашу́, -ло́шыш, -ло́шыць. 1. Рваць на шматкі, кавалкі.

2. Прыводзіць у бязладны стан. 3. Біць, дубасіць, нішчыць.

**МАТЛЯ́ЦЦА**, -я́ецца. Часта рухацца з боку ў бок, хістацца.

**МАТУ́ЛІН**, -а. Які мае адносіны да матулі, належыць матулі.

**МАТУ́ЛЬКА**, -і. Ласкавы зварот да маці.

**МА́ТУХНА**, -ы. 1. Маці. 2. Ласкава-фамільярны зварот да пажылой жанчыны. 3. Пра тое, што з'яўляецца самым родным і блізкім.

**МА́ТУШКА**, -і. Жонка святара, пападдзя.

**МАТЫВАВА́НАСЦЬ**, -і. Наяўнасць матывіроўкі; абгрунтаванасць.

**МАТЫВАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які мае матывіроўку.

**МАТЫВАВА́ЦЦА**, -тывуецца. Пацвярджацца якімі-н. матывамі, довадамі; абгрунтоўвацца.

**МАТЫВАВА́ЦЬ**, -тыву́ю, -тыву́еш, -тыву́е. Прывесці (прыводзіць) матывы, довады, якія тлумачаць, апраўдваюць якія-н. дзеянні, учынкі.

**МАТЫВА́ЦЫЯ**, -і. Сукупнасць матываў, довадаў на карысць чаго-н.; матывіроўка.

**МАТЫВІРО́ЎКА**, -і. 1. Абгрунтаванне прычыны, падставы якога-н. дзеяння, учынка. 2. Тое, што і м а т ы в а ц ы я.

**МАТЫ́Ў**, -ты́ву. 1. Прычына, падстава для якога-н. дзеяння. 2. Прасцейшая рытмічная адзінка мелодыі, адна з састаўных частак мелодыі. 3. Прасцейшая састаўная частка сюжэта; тэма ў творах мастацтва.

**МАЎКЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не любіць многа гаварыць; негаваркі; які маўчыць, не ўступае ў размову; поўны маўчання, нямы. 2. Зразумелы без слоў; які не суправаджаецца словамі.

**МАЎЛЕ́ННЕ**, -я. 1. Вуснае і пісьмовае валоданне мовай. 2. Моўная дзейнасць. Вуснае М. на беларускай мове характарызуецца больш павольным тэмпам у параўнанні з М. на рускай, украінскай, польскай мовах. У М. адлюстроўваюцца індывідуальныя і сацыялінгвістычныя асаблівасці, псіхафізіялагічны, эмацыянальны стан асобы, якая гаворыць, яе адносіны да субяседніка, камунікатыўная задача, таму яно мае шматлікія вызначэнні: экспрэсіўнае, эмацыянальнае, шчырае, далікатнае, лісліваe і інш. У адрозненне ад мовы М. рухомае, мэтанакіраванае, дынамічнае, сітуатыўнае і індывідуальна абумоўленае, канкрэтнае і матэрыяльнае. Працэс М. вызначаецца пэўным тэмпам, працягласцю, тэмбравымі асаблівасцямі, артыкуляцыйнай выразнасцю.

**МАЎЛЕ́НЧЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да маўлення.

**МАЎЧА́ЛЬНІК**, -а. Пра таго, хто любіць маўчаць, не любіць гаварыць.

**МАЎЧА́ЦЬ**, -чу́, -чы́ш, -чы́ць. 1. Нічога не гаварыць, не падаваць голасу; не парушаць цішыні, спакою якімі-н. гукамі. 2. Захоўваць што-н. у таямніцы, не расказваць аб чым-н. 3. Не даваць знаць пра сябе. 4. Не выказваць адкрыта сваіх думак, намераў; зносіць што-н., не скардзячыся, не пратэстуючы.

**МАЎЧКО́М**. Нічога не кажучы, захоўваючы маўчанне.

**МАЎЧО́К**, -чка́. 1. Маўчанне. 2. Ні слова, ні гуку (не гаварыць).

**МАЎЧУ́Н**, -а́. Маўклівы, негаваркі чалавек.

**МАХА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Рабіць узмахі, рухі ў паветры; падаваць знак, сігнал. 2. Трэсці чым-н., пагражаючы каму-н.

**МАХІНА́ТАР**, -а. Той, хто займаецца махінацыямі; махляр.

**МАХІНА́ЦЫЯ**, -і. Несумленны спосаб дасягнення чаго-н.; махлярства.

**МАХЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Займацца махлярствам; жульнічаць, ашукваць.

**МАХЛЯ́Р**, -а́. Той, хто махлюе, займаецца махлярствам; жулік, ашуканец.

**МАХЛЯ́РСТВА**, -а. Падман, ашуканства з мэтай набыць што-н.

**МА́ЦІЦА**, -ы. Перламутр.

**МАШЫНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Міжвольны, аўтаматычны, падсвядомы.

**МАШЫНІ́СТ СЦЭ́НЫ**. Загадчык машынна-дэкарацыйнага цэха. Кіруе работнікамі машынна-дэкарацыйнага цэха ў час рэпетыцый або спектакля. Адказвае за стан, захаванне і своечасовы рамонт

дэкарацыйнай маёмасці, за стан, правільнае функцыянаванне і найбольш мэтазгоднае выкарыстанне ўсяго механічнага абсталявання сцэны. М. с. узначальвае ўвесь працэс падрыхтоўкі, вырабу, падгонкі і манціроўкі дэкарацый ад распрацоўкі па макеце тэхнічнага рашэння афармлення да выпуску спектакля.

**МАШЫ́ННАЯ ГАЛЕРЭ́Я**. Частка верхняй сцэны, якая выкарыстоўваецца для кіравання пад'ёмна-апускнымі прыстасаваннямі. М. г. размешчана па бакавых і задняй сценах сцэны. Пад'ём і спуск дэкарацый выконваюць верхавыя рабочыя з дапамогай пяньковых канатаў, што праходзяць ушчыльную каля бар'ера М. г. і звязаны з сістэмай процівагаў. У тэатрах з механізаванай верхавой гаспадаркай на М. г. захоўваюцца лябёдкі, электрарухавікі, пульты кіравання з устройствамі (канструкцыямі), якія дазваляюць рэгуляваць хуткасць пад'ёму і спуску і інш. На М. г. устанаўліваецца таксама і асвятляльная апаратура.

**МАШЭ́ННІК**, -а. Несумленны чалавек, ашуканец, падманшчык.

**МАШЭ́НСТВА**, -а. Несумленны ўчынак, жульніцтва, ашуканства, махлярства.

**МЕДЗВЕДЗЯВА́ТЫ**, -ая, -ае. Падобны чым-н. на мядзведзя; непаваротлівы.

**МЕЛАДРА́МА**, -ы. 1. Драма са спевамі і музыкай. У адрозненне ад оперы ў М. дзейныя асобы не спяваюць, а гавораць (дэкламуюць). Музыка ў М. выконваецца адначасова з прамаўленнем тэксту або перамяжоўвае тэкст аркестровымі рэплікамі; ствараючы эмацыянальны гукавы фон і падкрэсліваючы выразнасць асобных фраз тэксту, музыка ўзбагачае сцэнічнае дзеянне. У М. уключаюцца зрэдку вакальныя (пераважна харавыя) нумары, а таксама пантаміма (з музычным суправаджэннем). М. з'явілася ў сярэдзіне 18 ст. Тэрмін М. існаваў і раней (як адна з назваў оперы); у гэтым значэнні ён прымяняўся ў 17 — 18 ст., а ў Італіі ўжываецца і зараз. 2. Жанр драматургіі; п'еса, якая вызначаецца вострай інтрыгай, перабольшанай эмацыянальнасцю, рэзкім супрацьпастаўленнем дабра і зла, маральна-павучальнай тэндэнцыяй. З'яўленне М. было падрыхтавана развіццём мяшчанскай драмы, а таксама жанраў музычнага тэатра — мяшчанскай камічнай оперы, лірычнымі сцэнамі тыпу «Пігмаліёна» Русо. На Беларусі ўзнікла ў пачатку 20 ст., у перыяд станаўлення беларускага прафесійнага тэатра. Найчасцей развівалася не ў «чыстым» выглядзе, а з выкарыстаннем асобных яе элементаў. Беларускай М. уласцівыя дэмакратычная накіраванасць, сацыяльная напоўненасць і значнасць. Пакінула выразны адбітак на драматургічнай творчасці К. Каганца, У. Галубка. З другой паловы 20-х гг. М. у беларускай драматургіі не мае шырокага развіцця. У большасці выпадкаў выкарыстоўваюцца толькі асобныя элементы і прыёмы гэтага жанру.

**МЕЛАДЭКЛАМА́ЦЫЯ**, -і. 1. Канцэртна-эстрадны жанр. 2. Чытанне вершаў і рытмізаванай прозы пад музыку (звычайна пад акампанемент фартэпіяна).

**МЕЛАНХО́ЛІЯ**, -і. 1. Сумны настрой, нуда, туга. 2. Псіхічнае расстройства, якому ўласцівы прыгнечаны стан, беспрычынныя страхі, недарэчныя ідэі.

**МЕЛО́ДЫКА ВЕ́РША**. Сукупнасць і суладдзе інтанацыйна-сэнсавых адценняў вершаванай мовы, якія перадаюцца праз павышэнне і паніжэнне голасу пры маўленні.

**МЕНЕСТРЭ́ЛЬ**, -я. Вандроўны сярэдневяковы спявак, музыкант, пацешнік, паэт і дэкламатар у Францыі, Англіі.

**МЕРКАВА́ННЕ**, -я. 1. Думка, погляд, вынік роздуму. 2. Разлік, дапушчэнне.

**МЕРКАВА́ЦЬ**, мяркую, мяркуеш, мяркуе. 1. Гаварыць, разважаць, абмяркоўваць што-н.; думаць. 2. Рабіць якія-н. вывады, дапушчэнні, здагадкі. 3. Мець намер, план. 4. Ацэньваць якім-н. чынам, рабіць заключэнне. 5. Прымяраць, прыкідваць.

**МЕ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Рытмічны, роўны. 2. Сярэдні па сіле, памерах.

**МЕ́ТАД ФІЗІ́ЧНЫХ ДЗЕ́ЯННЯЎ**. У творчай сістэме К. Станіслаўскага — метад працы рэжысёра над спектаклем і

акцёра над роляй. М. ф. дз. дапамагае ўстанавіць арганічнае адзінства паміж жыццёвай праўдай акцёра і яго паводзінамі на сцэне ў якасці персанажа п'есы.

**МЕТАМАРФО́ЗА**, -ы. 1. Пераход адной формы чаго-н. у другую са змяненнем знешняга выгляду або функцыі. 2. Поўнае змяненне каго-, чаго-н.

**МЕТАТЭ́ЗА**, -ы. Міжвольная перастаноўка двух суседніх гукаў або складоў у слове.

**МЕТА́ФАРА**, -ы. Ужыванне слова або выразу ў пераносным значэнні, заснаванае на падабенстве або параўнанні.

**МЕТАФАРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да метафары; багаты метафарамі.

**МЕТР**, -а. У вершаскладанні — памер верша, стапа з яе варыяцыямі, рытмавы ўзор.

**МЕШКАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Нязграбны, няспраўны; няўклюдны.

**МІЖВО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не залежыць ад волі, свядомасці. 2. Выпадковы, ненаўмысны.

**МІЖРАДКО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які знаходзіцца паміж радкамі тэксту. 2. Звязаны з чытаннем паміж радкоў; патаемны.

**МІЖРЭ́БЕРНЫЯ МЫ́ШЦЫ**. Якія знаходзяцца паміж рэбрамі.

**МІЗАНСЦЭ́НА**, -ы. Размяшчэнне акцёраў на сцэне ў той ці іншы момант спектакля. Адзін з важных сродкаў выразнага выяўлення ўнутранага зместу п'есы, М. з'яўляецца істотным момантам рэжысёрскай задумы спектакля. Падкрэслівае жанрава-стылістычныя асаблівасці і пластычную форму твора. Кожная М. павінна быць натуральная, арганічная, псіхалагічна апраўданая акцёрамі.

**МІЗАНСЦЭНІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Размяшчаць на сцэне акцёраў у зададзеных сцэнічных абставінах; знаходзіць, будаваць, паказваць мізансцэны, г. зн. раскрываць пластычна псіхалагічнае жыццё дзейных асоб.

**МІЗАНТРАПІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Схільны да мізантропіі, уласцівы мізантропу.

**МІЗАНТРО́П**, -а. Чалавек, які пазбягае людзей, ненавідзіць іх.

**МІЗАНТРО́ПІЯ**, -і. Непрыязныя, варожыя адносіны да людзей.

**МІЗАРНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Худнець, чэзнуць; траціць належны выгляд. 2. Рабіцца меншым, менш значным.

**МІЗЭ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Вельмі малы, нязначны. 2. Схуднелы, худы. 3. Які не мае належнага выгляду, убогі; бедны. 4. З якім не лічацца, не паважаюць, які выклікае адмоўныя пачуцці; нікчэмны.

**МІЛАВА́ЦЦА**, -лу́юся, -лу́ешся, -лу́ецца. Праяўляць узаемную любоў, лашчыцца; абдымацца.

**МІ́ЛАВАЦЬ**, -лую, -луеш, -луе. 1. Дараваць каму-н. віну; шкадаваць. 2. Выказваць увагу, любіць.

**МІЛАВА́ЦЬ**, -лу́ю, -лу́еш, -лу́е. Песціць, лашчыць, галубіць; любіць.

**МІЛАВІ́ДНЫ**, -ая, -ае. З прыемным на выгляд тварам, прывабны.

**МІЛАГУ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Прыемны на слых; які прыемна гучыць.

**МІ́ЛАСЦІВЫ**, -ая, -ае. Які выказвае міласць, прыхільнасць, паблажлівасць; літасцівы.

**МІ́ЛАСЦЬ**, -і. 1. Добрыя, велікадушныя адносіны. 2. Ахвяраванне, дар.

**МІЛАСЭ́РНАСЦЬ**, -і. Схільнасць да спагады іншым, да літасці над кім-н.

**МІЛАСЭ́РНЫ**, -ая, -ае. Які выяўляе міласэрнасць; схільны рабіць дабро.

**МІЛАТА́**, -ы́. 1. Чароўнасць, прыгажосць, абаянне чаго-н. прывабнага. 2. Пра тое, што выклікае зачараванне, захапленне.

**МІ́ЛЕНЬКІ**, -ая, -ае. 1. Прыемны на выгляд, прыгожанькі. 2. Дарагі, любімы. 3. Ласкавы або фамільярны зварот.

**МІЛЬГАНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. Паказацца на момант у руху і знікнуць, прамільгнуць; хутка і нечакана з'явіцца ў памяці.

**МІМ**, -а. 1. Асобы від прадстаўленняў у антычным тэатры, кароткія сцэнкі бытавога і сатырычнага зместу. Узнік у Старажытнай Грэцыі ў 5 ст. да н. э. як народная драматычная імправізацыя. 2. Акцёр або актрыса — выканаўцы М.

**МІ́МІКА**, -і. 1. Рухі мышцаў твару,

якія выражаюць перажыванні, пачуцці, настрой. 2. Мастацтва выражаць пачуцці і настрой адпаведнымі рухамі мышцаў твару. Прадуманая і тэхнічна дасканалая М. узмацняе значэнне сцэнічнага слова, дапамагае глыбей раскрыць яго сэнс.

**МІМІ́СТ**, -а. 1. Акцёр, які па-мастацку валодае мімікай. 2. Акцёр, які ўдзельнічае ў мімічных сцэнах.

**МІНДА́ЛЬНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Быць сентыментальным, да прыкрасці ласкавым. 2. Праяўляць празмерную мяккасць, паблажлівасць да каго-н.

**МІНІЯЦЮ́РА**, -ы. Мастацкі твор малой формы; у тэатры, цырку, на эстрадзе — кароткая п'еса, вадэвіль, інтэрмедыя, скетч, размоўная, харэаграфічная ці музычная сцэнка, эстрадная або клоунская рэпрыза і інш.

**МІНІЯЦЮ́РНЫ**, -ая, -ае. Маленькі і прыгожы; вельмі малы.

**МІНО́Р**, -у. Сумны, прыгнечаны настрой.

**МІРАЛЮБІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які любіць мір, згоду, не схільны да сваркі, вайны; заснаваны на імкненні захаваць мір, мірныя адносіны; дружалюбны.

**МІРАТВО́РНЫ**, -ая, -ае. Які нясе з сабой мір, цішыню, спакой.

**МІРЫ́ЦЦА**, міру́ся, мі́рышся, мі́рыцца. 1. Спыняць сварку, пачынаць жыць у згодзе. 2. Цярпіма адносіцца да чаго-н.; прымірацца з чым-н.

**МІРЫ́ЦЬ**, міру́, мі́рыш, мі́рыць. Наладжваць мірныя адносіны паміж кім-, чым-н.

**МІС**. Назва незамужняй жанчыны і форма звароту да яе ў Англіі, Амерыцы (звычайна ставіцца перад прозвішчам або імем).

**МІ́СІС**. Назва замужняй жанчыны і форма звароту да яе ў Англіі, Амерыцы (звычайна ставіцца перад прозвішчам або імем).

**МІСТЫФІКА́ТАР**, -а. Той, хто займаецца містыфікацыямі; ашуканец, падманшчык.

**МІСТЫФІКА́ЦЫЯ**, -і. Наўмыснае ўвядзенне каго-н. у зман.

**МІСТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Прасякнуты містыкай. 2. Які нельга растлумачыць, незразумелы.

**МІ́СТЭР**, -а. Назва мужчыны ў Англіі і Амерыцы (звычайна ставіцца перад прозвішчам).

**МІСТЭ́РЫЯ**, -і. Рэлігійная драма на біблейскія сюжэты ў сярэднія вякі ў Заходняй Еўропе. Прадстаўлялася ў час рэлігійных святаў акцёрамі-аматарамі (мімамі, жанглёрамі) пад кіраўніцтвам вядучага. М. доўжылася некалькі дзён, у ёй удзельнічаў чытальнік, які звязваў эпізоды.

**МІТРЭ́НГА**, -і. Трывога, неспакой, сумятня, разлад.

**МІТРЭ́НЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Трывожыць, непакоіць, уносіць сумятню, разлад у што-н.

**МІТУЛЬГА́**, -і. Мітусня; мільгаценне.

**МІТУСІ́ЦЦА**, -тушу́ся, -тусі́шся, -тусі́цца. 1. Хутка і бесперастанку перамяшчацца ў розных напрамках; бязладна і мітусліва рухацца; насіцца; бязладна пераносіцца, з'яўляцца і хутка знікаць з памяці. 2. Увіхацца, мітусліва рабіць што-н. 3. Мільгацець перад вачамі.

**МІТУСЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Той, хто мітусіцца; неспакойны чалавек.

**МІТУСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які хутка і бесперапынна рухаецца ў розных напрамках; паспешлівы, неўраўнаважаны; бязладны. 2. Які мільгае перад вачыма. 3. Неспакойны, поўны мітусні (у 1, 2 знач.); якому ўласціва мітусня.

**МІТУСНЯ́**, -і. 1. Хуткі і бесперапынны рух у розных напрамках. 2. Неспакойнае перамяшчэнне з месца на месца. 3. Бязладнае мільганне перад вачыма.

**МІФ**, -а. 1. Старажытнае народнае паданне аб паходжанні свету і з'яў прыроды з фантастычнымі вобразамі багоў і легендарных герояў. 2. Нешта фантастычнае, неверагоднае; вымысел.

**МІФІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Абвеяны паданнямі, легендарны; казачны. 2. Прыдуманы, неверагодны.

**МІШУРА́**, -ы́. Знешняя, падманная бліскучасць.

**МЛЕЦЬ**, мле́ю, мле́еш, мле́е. 1. Траціць прытомнасць, свядомасць; абміраць. 2. Слабнуць, дранцвець, нямець (пра часткі цела). 3. Заміраць ад якога-н. моцнага пачуцця.

**МЛО́СНА**. Нядобра, моташна.

**МЛО́СНЫ**, -ая, -ае. Прыкры, цяжкі; моташны.

**МЛОСЦЬ**, -і. Непрыемнае пачуццё слабасці, якое наступае звычайна перад стратай прытомнасці.

**МЛЯ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены бадзёрасці, энергіі, жывасці, вялы. 2. Павольны; стомлена-пя́шчотны.

**МНІ́ЦЕЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які бачыць небяспеку, непрыемнасць там, дзе іх няма; недаверлівы, беспрычынна падазроны.

**МО́ВІЦЬ**, мо́ўлю, мо́віш, мо́віць. Сказаць; вымавіць.

**МО́ДЛЫ**, -аў. Малітва; моцная просьба, маленне.

**МОНАСПЕКТА́КЛЬ**, -я. Спектакль з удзелам аднаго акцёра.

**МО́РАК**, -у. Змрок, цемра; дурман, цемрашальства.

**МО́РШЧЫЦЦА**, -шчуся, -шчышся, -шчыцца. 1. Збірацца ў маршчыны (пра скуру, часткі твару). 2. Моршчыць твар (ад болю, незадаволенасці і пад.).

**МО́ТАШНА**. 1. Млосна, нядобра (пра стан здароўя). 2. Агідна, прыкра. 3. Аб адчуванні тугі, адзіноты.

**МО́ЎНЫ ТАКТ**. Група слоў, аб'яднаных сэнсам.

**МО́ЎЧКІ**. 1. Нічога не гаворачы. 2. Не пратэстуючы, пакорліва, маўкліва. 3. Паціху, тайком.

**МРО́І**, -яў; *адз.* **мро́я**, -і. Тое, што створана фантазіяй; мары; летуценні.

**МРО́ІЦЦА**. 1. Уяўляцца ў думках; здавацца. 2. З'яўляцца ў снах, сніцца.

**МРО́ІЦЬ**, **мро́ю**, **мро́іш**, **мро́іць**. Уяўляць у думках, марыць.

**МРУ́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Жмурыць (пра вочы).

**МСЦІ́ВАСЦЬ**, -і. Схільнасць да помсты.

**МУДРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. 1. Рабіць што-н. складанае, незвычайнае; прыдумваць што-н. 2. Залішне ўскладняць якую-н. справу; хітрыць.

**МУДРАГЕ́ЛІСТЫ**, -ая, -ае. 1. Цяжкі для разумення, выканання; складаны. 2. Замыславаты, вычварны.

**МУДРАГЕ́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Тое, што і м у д р а в а ц ь.

**МУДРАГЕ́ЛЬСТВА**, -а. Што-н. мудрагельнае, вельмі замыславатае.

**МУ́ДРАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць і якасць мудрага. 2. Мудрыя думкі, выказванні, жыццёвы вопыт. 3. Што-н. складанае, цяжкае для разумення.

**МУДРО́НЫ**, -ая, -ае. Тое, што і м у д р а г е л і с т ы.

**МУ́ДРЫ**, -ая, -ае. 1. Надзелены вялікім розумам; вельмі разумны, празорлівы, з добрым веданнем жыцця. 2. Заснаваны на глыбокім разуменні, вопыце, веданні чаго-н.

**МУ́ДРЫКІ**, -аў. Хітрыкі.

**МУДРЫ́ЦЬ**, -ру́, -ры́ш, ры́ць. Тое, што і м у д р а в а ц ь.

**МУДРЭ́Ц**, -раца́. 1. Мудры, разумны чалавек. 2. Пра таго, хто хітруе.

**МУДРЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. Рабіцца больш мудрым, мудрэйшым.

**МУ́ЖНАСЦЬ**, -і. Рыса характару чалавека, у якой спалучаюцца адвага, рашучасць, вытрымка, смеласць.

**МУЖНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Дасягаць поўнага фізічнага развіцця; рабіцца дарослым, сталым. 2. Набіраць сілы; развівацца.

**МУ́ЖНЫ**, -ая, -ае. Які вызначаецца мужнасцю; які выражае мужнасць, сілу.

**МУЖЫ́К**, -а. 1. Селянін. 2. Пра грубага, нявыхаванага чалавека. 3. Муж.

**МУЖЫКАВА́ТАСЦЬ**, -і. Уласцівасць мужыкаватага.

**МУЖЫКАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Знешнасцю і манерамі падобны да мужыка (у 2 знач.).

**МУЖЫ́ЦКІ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да мужыка (у 1 знач.), належыць мужыкам; уласцівы мужыку.

**МУЖЫ́ЧЫ**, -ая, -ае. Тое, што і м у ж ы ц к і.

**МУ́ЗА**, -ы. 1. У грэчаскай міфалогіі — адна з дзевяці багінь, заступніца навук і мастацтва. 2. Творчае натхненне; крыніца паэтычнага натхнення.

**МУЛЬТА́Н**[1], -у. Баваўняная варсістая тканіна.

**МУЛЬТА́Н**[2], -у. Гатунак тытуню.

**МУ́ЛЯЦЬ**, -яю, -яеш, -яе. 1. Прычыняць боль, ціснуць, націраць. 2. Турбаваць, непакоіць, трывожыць каго-, што-н.; дакучаць каму-н.

**МУТА́ЦЫЯ**, -і. Змена, пералом голасу ў падлеткаў з наступленнем палавой спеласці.

**МУ́ЧАНІК**, -а. 1. Той, хто перанёс ці пераносіць якія-н. мукі. 2. У хрысціян — кананізаваны царквой святы, які перанёс цяжкія мукі за веру.

**МУЧЫ́ЦЕЛЬ**, -я. Той, хто мучыць каго-н.

**МУ́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. 1. Цярпець мукі; пакутаваць; вельмі непакоіцца, перажываць, клапоцячыся аб кім-, чым-н. 2. Рабіць што-н. з вялікімі намаганнямі, без асаблівага поспеху.

**МУ́ЧЫЦЬ**, му́чу, му́чыш, му́чыць. Прычыняць мукі, пакуты каму-н.; быць прычынай мукі; не даваць спакою, хваляваць, непакоіць.

**МУЧЭ́ННЕ**, -я. Мука, пакута.

**МУШ**, -ы. Маленькая бародка пад ніжняй губою; увайшла ў моду ў 17 ст. у Францыі.

**МУШКЕ́Т**, -а. Старажытнае буйнакаліберная ружжо з кнотам для запальвання пораху.

**МУШКЕЦЁР**, -а. Салдат, узброены мушкетам. Мушкецёры складалі від пяхоты ў еўрапейскіх арміях 16 — 17 ст., у Францыі 17 — 18 ст. — частку гвардзейскай кавалерыі.

**МУ́ШТРА АКЦЁРСКАЯ**. Псіхафізічны трэнінг акцёра.

**МУШТРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. 1. Выхоўваць, навучаць залішне строга і сурова. 2. Мучыць несправядлівымі патрабаваннямі.

**МУ́ШТРЫ**, -аў. Прыдзіркі, празмерныя патрабаванні.

**МЫ́КАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Неразборліва гаварыць што-н.; мармытаць.

**МЫЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. Рабіць памылкі, памыляцца.

**МЫЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Варушыць губамі.

**МЫСЛЕ́ННЕ**, -я. Здольнасць мысліць, разважаць.

**МЫ́СЛЕННЫ**, -ая, -ае. Які паўстае ў мыслях; уяўны; які не выказваецца ўголас, існуе толькі ў мыслях.

**МЫСЛІ́ЦЕЛЬ**, -я. Чалавек, здольны творча мысліць, глыбока пранікаць у сутнасць з'яў; мудрэц, філосаф.

**МЫСЛІ́ЦЕЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да мыслення; звязаны са здольнасцю мысліць.

**МЫ́СЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. 1. Разважаць, супрацьпастаўляючы з'явы рэчаіснасці, думкі і робячы з іх вывады. 2. Уяўляць у думках.

**МЫ́СЛЯЧЫ**, -ая, -ае. Здольны глыбока і самастойна мысліць; надзелены здольнасцю філасофскага мыслення.

**МЫ́ШАЧНЫ ЗА́ЦІСК**. Спазма; празмернае напружанне мышцаў акцёра.

**МЭ́ТА**, -ы. Тое, да чаго імкнуцца, чаго жадаюць дасягнуць; пэўны намер, пастаўленая задача; загадзя намечаны пункт, мяжа.

**МЭТАЗГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Які адпавядае вызначанай мэце, разумны, карысны.

**МЭТАІМКЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які імкнецца да пэўнай мэты.

**МЭТАНАКІРАВА́НАСЦЬ**, -і. Імкненне да пэўнай мэты, падпарадкаванасць (дзеянняў, думак і пад.) якой-н. мэце.

**МЭТАНАКІРАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які вызначаецца мэтанакіраванасцю.

**МЭ́ТЛАХІ**, -аў. 1. Шматкі. 2. Пажыткі, манаткі.

**МЯ́ККА**. 1. Не цвёрда, не жорстка; лёгка, далікатна. 2. Ціха, ледзь чутна; плаўна; не рэзка. 3. Сардэчна, ласкава, пяшчотна.

**МЯ́ККАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і якасць мяккага; адсутнасць рэзкасці; уступчывасць, спагадлівасць.

**МЯККАЦЕ́ЛАСЦЬ**, -і. Уласцівасць мяккацелага (у 2 знач.).

**МЯККАЦЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. З мяккім целам, вялымі мускуламі. 2. Які лёгка паддаецца чужому ўплыву; бязвольны, бесхарактарны.

**МЯ́ККІ**, -ая, -ае. 1. Далікатны, не грубы. 2. Прыемны для ўспрымання, не рэзкі; плаўны, павольны; ціхі, прыглушаны; ледзь чутны. 3. Некантрастны; не зусім выразны. 4. Які лёгка паддаецца чужому ўплыву; хісткі, няўстойлівы; сардэчны, спагадлівы, чулы; які выражае сардэчную дабрату. 5. Нястрогі, паблажлівы.

**МЯКЧЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. 1. Рабіцца мякчэйшым, мяккім. 2. Лагаднець, дабрэць.

**МЯ́МЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Незра-

зумела, невыразна і вяла гаварыць.

**МЯ́МЛЯ**, -і. Той, хто мямліць; вялы, нерашучы чалавек.

**МЯНТА́ШКА**, -і. Пра таго, хто шмат і без толку гаворыць; трапло.

**МЯРЗО́ТА**, -ы. Тое, што выклікае агіду; подласць, погань.

**МЯРЗО́ТНІК**, -а. Мярзотны, подлы чалавек; нягоднік.

**МЯРЗО́ТНЫ**, -ая, -ае. Вельмі агідны, паганы; подлы.

## Н

**НААБА́ПАЛ**. З абодвух бакоў.

**НААДВАРО́Т**. 1. Зусім інакш, не так, як трэба. 2. У процілегласць таму, што сказана.

**НААДРЭ́З**. Рашуча, катэгарычна.

**НААПА́ШКІ**. Накінуўшы на плечы, не прадзяваючы рук у рукавы.

**НАБАЖЭ́НСТВА**, -а. Царкоўная служба, богаслужэнне.

**НАБАКІ́Р**. Ссунуўшы, ссунуўшыся на адзін бок, на вуха (аб манеры насіць галаўны ўбор).

**НАБАЛБАТА́ЦЦА**, -бачу́ся, -бо́чашся, -бо́чацца. Уволю нагаварыцца; доўга пабалбатаць.

**НАБАЛБАТА́ЦЬ**, -бачу́, -бо́чаш, -бо́ча. Нагаварыць многа лішняга, непатрэбнага.

**НАБАЛДА́ШНІК**, -а. Надстаўка, патаўшчэнне на верхнім канцы палкі.

**НАБАЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які стаў вельмі балючым ад працяглага болю; які стаў вельмі адчувальным ад доўгіх пакут. 2. Які даўно наспеў і патрабуе неадкладнага вырашэння; які накапляўся, збіраўся на працягу доўгага часу.

**НАБАЛЕ́ЦЬ**, -лі́ць. 1. Стаць вельмі балючым ад працяглага болю; стаць вельмі адчувальным ад доўгіх пакут, змучыцца (аб сэрцы, душы). 2. Сабрацца, накапіцца (пра што-н. цяжкае, нясцерпнае).

**НАБЕДАВА́ЦЦА**, -бяду́юся, -бяду́ешся, -бяду́ецца. Перажыць, зазнаць многа бед, гора.

**НАБЛЫ́ТАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Заблытаць, пераблытаць што-н. 2. Дапусціць блытаніну, нарабіць памылак.

**НА́БРЫДЗЬ**, -і. Зброд.

**НАБЫ́ТАК**, -тку. 1. Маёмасць, уласнасць. 2. Тое, што набыта, прыдбана; скарб. 3. Тое, што набыта ў выніку жыцця, вучобы, працы.

**НАБЫ́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Нахмурыўшыся, глядзець спадылба.

**НАВА́ЖЫЦЦА**, -ва́жуся, -ва́жышся, -ва́жыцца. Намерыцца нешта зрабіць; рашыцца, адважыцца на што-н.

**НАВА́ЛА**, -ы. 1. Нашэсце ворага; напад. 2. Бяда, няшчасце; непрыемнасці. 3. Вялікая колькасць каго-, чаго-н.; скопішча. 4. Нешта цяжкае, непрыемнае, што навісае над чалавекам, чакае яго.

**НА́ВАЛАЧ**, -ы. 1. Хмары, туман, смуга. 2. Той, хто прыйшоў аднекуль, не тутэйшы. 3. Зброд, варожыя людзі.

**НАВАЛАЧЫ́ЦЦА**, -лачу́ся, -ло́чышся, -ло́чыцца. Нахадзіцца, набадзяцца.

**НАВАЛІ́ЦЦА**, -валю́ся, -ва́лішся, -ва́ліцца. 1. Налегчы, націскаючы сваім цяжарам. 2. Напасці; абрушыцца. 3. Дружна ўзяцца за якую-н. працу; пайсці ў наступ на што-н.; накінуцца з прагнасцю на што-н. 4. Нахлынуць, авалодаць, ахапіць (аб пачуцці, настроі і пад.). 5. Нечакана спасцігнуць, напаткаць каго-н.; змарыць (пра сон, дрымоту). 6. Напасці ў вялікай колькасці. 7. Накінуцца на каго-н. з лаянкай, папрокамі.

**НАВАЛТУ́ЗІЦЦА**, -ту́жуся, -ту́зішся, -ту́зіцца. Уволю, шмат павалтузіцца.

**НАВАМО́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Зроблены па новай модзе. 2. Які нядаўна зрабіўся модным, хадавы.

**НАВАСТРЫ́ЦЦА**, -вастру́ся, -во́стрышся, -во́стрыцца. 1. Стаць, зрабіцца больш адчувальным (пра органы пачуццяў). 2. Стаць, зрабіцца больш уважлівым; насцеражыцца. 3. Набыць уменне, спрыт, стаць спрактыкаваным у чым-н.

**НАВЕ́ЛА**, -ы. Кароткая аповесць ці апавяданне, звычайна пра якую-н. падзею з нечаканым фіналам.

**НАВО́ДМАШ**. Размахнуўшыся, з сілай, з размаху.

**НАВО́КАЛ**. Усюды, з усіх бакоў; кругом.

**НАВЫДУ́МВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Вынайсці, стварыць, прыдумаць многа чаго-н.

**НАВЫДУМЛЯ́ЦЬ**, -яю, -яеш, -яе. Тое, што і н а в ы д у м в а ц ь.

**НА́ВЫК**, -у. Уменне, якое склалася ў выніку практыкаванняў, вопыту; *толькі мн.* (**на́выкі**, -аў) практычныя веды ў якой-н. галіне.

**НАВЫ́ПЕРАДКІ**. Стараючыся перагнаць, выперадзіць іншага, адзін аднаго.

**НАВЫШТУКО́ЎВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Выштукаваць, змайстраваць значную колькасць чаго-н.

**НАВЯРЗЦІ́** і **НАВЕ́РЗЦІ**, -вярзу́, -вярзе́ш, -вярзе́; -вярзём, -верзяце́. Нагаварыць недарэчнасцей, бязглуздзіцы, лухты.

**НАВЯРЭ́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Стаміцца, натрудзіцца да стомы, хваравітага стану.

**НАВЯРЭ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Стаміць, натрудзіць да хваравітага стану якую-н. частку цела.

**НАГАВАРЫ́ЦЦА**, -вару́ся, -во́рышся, -во́рыцца. Пагаварыць многа, уволю.

**НАГАВАРЫ́ЦЬ**, -вару́, -во́рыш, -во́рыць. 1. Сказаць шмат чаго-н. 2. Узвесці паклёп, напляткарыць. 3. Запоўніць (пласцінку, магнітную стужку і пад.) якім-н. тэкстам.

**НАГАВО́Р**, -у. 1. Паклёп, данос. 2. Заклінанне, якое нібыта мае магічную сілу.

**НАГАВО́РШЧЫК**, -а. Той, хто ўзводзіць паклёпы на каго-н.; паклёпнік.

**НАГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Паказацца падобным на каго-, што-н. 2. Напомніць каму-н. пра што-н., выклікаць успамін. 3. Успомніць.

**НА́ГАЛА**. 1. Не пакінуўшы валасоў; без адзення. 2. Выняўшы з ножнаў (пра шаблю, цясак).

**НАГАЛАСІ́ЦЦА**, -лашу́ся, -ло́сішся, -ло́сіцца. Доўга, многа паплакаць, галосячы.

**НАГАЛУ́БІЦЦА**, -блюся, -бішся, -біцца. Намілавацца ўволю.

**НАГАМАНІ́ЦЦА**, -манюся, -мо́нішся, -мо́ніцца. Пагаманіць доўга, уволю.

**НАГАРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Зазнаць многа гора.

**НАГАРАДЗІ́ЦЬ**, -раджу́, -ро́дзіш, -ро́дзіць. Нагаварыць, напісаць шмат лішняга, непатрэбнага; напляткарыць.

**НАГАРЛАПА́НІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Уволю, шмат пагарлапаніць.

**НАГАРЭ́ЗАВАЦЬ**, -зую, -зуеш, -зуе. Насваволіць; напракудзіць.

**НАГАРЭ́ЗНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Тое, што і н а г а р э з а в а ц ь.

**НАГАСЦІ́ЦЦА**, -гашчу́ся, -го́сцішся, -го́сціцца. Уволю, доўга пагасціць.

**НАГАСЦЯВА́ЦЦА**, -цю́юся, -цю́ешся, -цю́ецца. Тое, што і н а г а с ц і ц ц а.

**НА́ГІНКАМ**. Сагнуўшыся.

**НАГЛУМІ́ЦЦА**, -глумлю́ся, -глу́мішся, -глу́міцца. Насмяяцца або наздзекавацца з каго-, чаго-н.

**НА́ГЛУХА**. 1. Вельмі шчыльна, без адтулін; вельмі моцна, так, што нельга перамясціць, ссунуць, адвярнуць. 2. На ўсе гузікі, кручкі, засцежкі (зашпіліцца).

**НАГЛЯДА́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Здольнасць бачыць розныя факты, з'явы, якія не заўсёды бачаць, заўважаюць іншыя; назіральнасць.

**НАГО́ЙСАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Уволю, многа пагойсаць; набегацца.

**НАГРАШЫ́ЦЬ**, -грашу́, -гра́шыш, -грашы́ць. Нарабіць грахоў.

**НАГРУБІ́ЦЬ**, -грублю́, -гру́біш, -гру́біць. Нагаварыць чаго-н. дзёрзкага; абысціся груба з кім-н.

**НАГРУВА́СЦІЦЦА**, -ціцца. Сабрацца грудай, кучай.

**НАГРУВА́СЦІЦЬ**, -а́шчу, -а́сціш, -а́сціць. 1. Бязладна накідаць, накласці, наваліць адну рэч на другую. 2. Перапоўніць чым-н.

**НАГРЫМІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Нагрымíраваць сябе.

**НАГРЫМІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Налажыць грым, загрымíраваць каго-н.

**НАДАКУ́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Такі, які надакучвае, робіцца сумным, непрыемным сваёй аднастайнасцю, паўтарэннем, перастае цікавіць каго-н.; апрыкры.

**НАДА́ЛЕЙ** і **НАДАЛЕ́Й**. На будучы час, на потым.

**НАДАРВА́ЦЦА**, -рву́ся, -рве́шся, -рве́цца. 1. Крыху, не да канца падрацца. 2. Ад празмерных намаганняў пашкодзіць сваё здароўе; змяніць свой тэмбр або перарвацца (пра голас).

**НАДАЎЖЭ́Й**. На больш доўгі, працяглы тэрмін.

**НАДАЯДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Зрабіцца сумным, непрыемным, перастаць цікавіць каго-н.; апрыкраць.

**НАДВЯЧО́РКАМ**. Перад самым надыходам вечара.

**НАДЗЕ́Я**, -і. 1. Чаканне чаго-н. добрага, якое спалучаецца з упэўненасцю ў тым, што яно збудзецца. 2. Той або тое, на каго, на што можна спадзявацца, апірацца.

**НАДЗІ́ВА**. Надзвычай; надта, вельмі.

**НАДЗІВІ́ЦЦА**, -дзіўлю́ся, -дзі́вішся, -дзі́віцца. Доўга, уволю дзівіцца.

**НАДЗІМА́НЫ**, -ая, -ае. Поўны пыхі, важнасці; ганарысты.

**НАДЗЬМУ́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Важны, ганарысты, поўны пыхі. 2. Пакрыўджаны, незадаволены, сярдзіты; які выражае крыўду:

**НАДЗЬМУ́ЦЦА**, -дзьму́ся, -дзьме́шся, -дзьме́цца, -дзьмёмся, -дзьмяце́ся. 1. Пакрыўдзіцца, нахмурыцца, зрабіць незадаволены выраз твару. 2. Стаць важным, прыняць ганарысты выгляд.

**НАДЛАМА́ЦЦА**, -ламлю́ся, -ло́мішся, -ло́міцца. 1. Страціць фізічныя або душэўныя сілы, аслабець. 2. Стаць іншым, змяніцца.

**НАДЛО́М**, -у. 1. Рэзкае аслабленне фізічных і душэўных сіл у выніку якога-н. перажывання. 2. Празмерная рэзкасць у праяўленні сваіх пачуццяў.

**НАДО́ЕЧЫ**. Зусім нядаўна; не так даўно, днямі.

**НАДО́ЎГА**. На доўгі час, на вялікі адрэзак часу, на вялікі тэрмін.

**НАДРЫВА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Рабіць што-н. праз меру; старацца з усіх сіл; крычаць з усіх сіл.

**НАДРЫ́ВІСТЫ**, -ая, -ае. Рэзкі, сутаргавы, з надрывам; прарэзлівы.

**НАДРЫ́Ў**, -ры́ву. 1. Празмернае напружанне. 2. Узбуджанасць, хваравітасць у праяўленні пачуццяў.

**НАДРЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Рэзкі, хваравіта напружаны, з надрывам.

**НА́ДТА**. 1. Звыш меры, празмерна. 2. Вельмі, у вялікай ступені.

**НАДУ́МАНЫ**, -ая, -ае. Нерэальны, пазбаўлены натуральнасці, штучны.

**НАДУРЭ́ЦЦА**, -рэ́юся, -рэ́ешся, -рэ́ецца. Шмат, доўга, уволю падурэць.

**НАЖА́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. Звярнуцца да каго-н. са скаргай на каго-, што-н.

**НАЖЛУ́КЦІЦЦА**, -кчуся, -кцішся, -кціцца. Напіцца звыш меры.

**НАЖЭ́РЦІСЯ**, -жару́ся, -жарэ́шся, -жарэ́цца; -жаро́мся, -жарацե́ся. Наесціся праз меру.

**НАЗАЎСЁДЫ**. На ўвесь час, на ўсё жыццё.

**НАЗДЗЕ́КАВАЦЦА**, -куюся, -куешся, -куецца. Вельмі абразіць, прынізіць, зняважыць каго-н.; фізічна ўздзейнічаць на каго-н.; пабіць, збіць.

**НАЗІРА́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Здольнасць бачыць, заўважаць факты, з'явы, якіх не бачаць, не заўважаюць іншыя.

**НА́ЗІРКАМ**. Не спускаючы з вачэй (ісці, бегчы і пад. следам за кім-, чым-н.); паглядаючы час ад часу.

**НАЗЛО́**. Наперакор, знарок, з намерам раззлаваць.

**НАЗНАРО́К**. Спецыяльна, з якой-н. мэтай; знарок; несур'ёзна, для выгляду; насуперак, назло каму-н.

**НАЗО́ЙЛІВАСЦЬ**, -і. Дакучлівыя паводзіны.

**НАЗО́ЙЛІВЫ**, -ая, -ае. Які назаляе, дакучае.

**НАЗО́ЛА**, -ы. 1. Той (тая), хто вельмі дакучае, назаляе. 2. Дакука, назалянне.

**НАЗУСІ́М**. Назаўсёды, зусім.

**НАІ́ЎНАСЦЬ**, -і. Прастадушнасць.

**НАІ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не мае, не набыў жыццёвага вопыту, непасрэдны; прастадушны; непасрэдны, без хітрасцей.

**НАЙБО́ЛЬШ**. 1. Больш за ўсё, больш за іншых; асабліва. 2. У спалучэнні з якасным прыметнікам утварае найвышэйшую ступень апошняга.

**НА́ЙГРЫШ**, -у. Ненатуральнасць, неарганічнасць сцэнічных паводзін артыста.

**НАЙМЕ́ННЕ**, -я. Назва, імя.

**НАЙМЕ́НШЫ**. Самы меншы, самы малы.

**НА́ЙМІТ**, -а. 1. Парабак. 2. Той, хто з карыслівымі намерамі служыць чыім-н. мэтам, хто прадаўся каму-н.

**НА́ЙМІЧКА**, -і. Служанка; парабчанка.

**НАКА́З**, -у. 1. Павучальнае настаўленне. 2. Загад або распараджэнне.

**НАКАЗА́ЦЬ**, -кажу́, -ка́жаш, -ка́жа. 1. Паведаміць, сказаць што-н. каму-н. праз каго-н. 2. Даць наказ, распараджэнне. 3. Нагаварыць, сказаць шмат чаго-н.

**НАКАЛАЦІ́ЦЦА**, -лачу́ся, -ло́цішся, -ло́ціцца. Доўга, шмат, моцна падрыжаць, патрэсціся; надрыжацца (са страху).

**НАКАНАВА́НАСЦЬ**, -і. Тое, што наперад загадзя абумоўлена абставінамі; лёс.

**НАКА́РКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Паводле народных павер'яў — наклікаць няшчасце, ліха; размовамі, прадказаннямі наклікаць непрыемнасць, бяду.

**НАКІВА́ЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Пагразіць, ківаючы пальцам. 2. Прабраць.

**НАКІ́НУЦЦА**, -нуся, -нешся, -нецца. 1. Пачаць раптам папракаць, лаяць каго-н. 2. Пачаць з азартам, прагнасцю што-н. рабіць.

**НАКЛА́ДКА**, -і. Кавалак газавай матэрыі, на якую нашыты валасы; накладваецца і замацоўваецца на галаве акцёра або наклейваецца на лысіну.

**НАКЛЕ́ЙКА**, -і. Вата ці паралон, спрасаваныя ў пэўныя формы; мацуюцца на тонкі трыкатаж або цюль, фіксуюцца лакам па знешняй частцы, а затым наклейваюцца на твар артыста (наклейкі для шчок, шыі, падбародка, носа).

**НАКРО́ІЦЬ**, -кро́ю, -кро́іш, -кро́іць. Нарэзаць лустамі, кавалкамі.

**НАКРЫЧА́ЦЦА**, -чу́ся, -чы́шся, -чы́цца. Уволю, шмат і доўга пакрычаць.

**НАКРЫЧА́ЦЬ**, -чу́, -чы́ш, -чы́ць. Насварыцца на каго-н.

**НАКРЭ́МЗАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Напісаць што-н. нядбайна або дрэнна; надрапаць.

**НАКШТА́ЛТ**. Указвае на прадмет, з'яву, да якіх падобны якія-н. прадметы, з'явы, прызнакі.

**НАЛІ́ХА**. 1. Для якой патрэбы, нашто. 2. На няшчасце; назло.

**НАМАЛО́ЦЬ**, -мялю́, -ме́леш, -ме́ле. Нагаварыць многа лішняга, пустога; набалбатаць.

**НАМАРДАВА́ЦЦА**, -ду́юся, -ду́ешся, -ду́ецца. Вельмі знясіліцца; намучыцца.

**НАМЁК**, -у. 1. Слова, выраз, у якіх адкрыта не выказваецца думка таго, хто гаворыць, але яе можна зразумець. 2. Аб дзеяннях, учынках, якія намякаюць на што-н.

**НАМЁРТВА**. Так, што нельга раз'яднаць; вельмі моцна, трывала.

**НАМІЛАВА́ЦЦА**, -лу́юся, -лу́ешся, -лу́ецца. Налюбавацца адзін на аднаго, палашчыцца.

**НАМІТУСІ́ЦЦА**, -тушу́ся, -тусі́шся, -тусі́цца. Доўга, шмат памітусіцца; залішне паспяшацца ў працы, у рухах, у дзеяннях і пад.

**НАМУДРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. 1. Прыдумаць шмат новага. 2. Вельмі ўскладніць якую-н. справу, зрабіць, сказаць што-н. вельмі замыславата, але не заўсёды зразумела.

**НАМУДРАГЕ́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Тое, што і н а м у д р а в а ц ь.

**НА́МЫСЕЛ**, -слу. Тайны намер, задума (часцей адмоўнага характару).

**НАМЫ́СЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Задумаць, намерыцца зрабіць што-н.

**НА́НАВА**. 1. Не так, як раней, іначай, па-новаму. 2. Яшчэ раз; зноў, спачатку.

**НАНО́ВА**. Тое, што і н а н а в а.

**НАО́ГУЛ**. Увогуле; зусім; у агульных рысах.

**НАПАВЕ́Р**. У доўг, у крэдыт.

**НАПА́ДКІ**, -аў і -дак. Прыдзіркі, папрокі, абвінавачванні.

**НАПАКА́З**. 1. Для агульнага агляду. 2. Для выгляду, з мэтай звярнуць увагу.

**НАПАКЛЁПНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Узвесці паклёп на каго-н., нагаварыць, нахлусіць.

**НАПАКУ́ТАВАЦЦА**, -туюся, -туешся, -туецца. Пеpажыць, вынесці шмат пакут.

**НАПАЛА́М**. 1. На дзве прыблізна роўныя палавіны; надвае. 2. У роўнай долі, на паях з кім-н. 3. Удвая. 4. Напалавіну; у сумесі з чым-н.

**НАПАЛО́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Адчуць страх, моцна спалохацца.

**НАПАЛО́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Выклікаць у каго-н. трывогу, страх, спалохаць.

**НАПАМА́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Намазацца, нацерціся памадай.

**НАПАМА́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Намазаць, нацерці памадай.

**НАПАМІ́Н**, -у. Паведамленне, зварот, якія напамінаюць аб чым-н.

**НАПАМІ́НАК**, -нку. Тое, што і н а п а м і н.

**НАПАМІНА́ННЕ**, -я. Тое, што напамінае аб чым-н.

**НАПАСКУ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Нарабіць паскудства, нашкодзіць.

**НАПАЎГО́ЛАСА**. Не моцна, не гучна, не на поўны голас.

**НАПАЎЖАРТАЎЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Не зусім сур'ёзны, амаль жартаўлівы.

**НАПАЎЗАБЫЦЦЁ**, -я. Стан, блізкі да забыцця, няпоўнае забыццё.

**НАПАЎЗАПЛЮ́ШЧАНЫ**, -ая, -ае. Не зусім заплюшчаны, амаль заплюшчаны (пра вочы).

**НАПАЧА́ТКУ**. Спярша, спачатку.

**НАПЕРАБО́Й**. Перабіваючы, перарываючы адзін аднаго.

**НАПЕРАГО́НКІ**. Стараючыся апярэдзіць іншых; навыперадкі.

**НАПЕ́РАДЗЕ**. На нейкай адлегласці перад кім-, чым-н.

**НАПЕРАКО́Р**. Не так, як жадалі, хацелі, чакалі; насуперак.

**НАПЕРАРЭ́З**. Перасякаючы чый-н. шлях, напрамак руху каго-, чаго-н.; перасякаючы што-н.

**НАПЕ́РСНІК**, -а. 1. Блізкая даверaная асоба або таварыш, якому давяраюць тайны. 2. Традыцыйны персанаж у класічнай драматургіі 16 — 18 ст. — друг галоўнага героя; другасны персанаж, які выслухоўвае яго, дае парады і накіроўвае. У ходзе літаратурнага працэсу і грамадскай эвалюцыі роля Н. істотна мянялася. Яго вага павялічвалася прапарцыянальна таму, як памяншалася значэнне героя. Гэты персанаж больш празаічны ў жаночых вобразах карміліцы, камерысткі або матроны, асоб, якія суправаджаюць галоўных персанажаў на розных «рандэву».

**НАПЛЕ́СЦІ**, -пляту́, -пляце́ш, -пляце́, -пляцём, -плецяце́. Нагаварыць рознага глупства; нахлусіць, напляткарыць.

**НАПЛЕ́ЧНІК**, -а. 1. Наплечнае ўпрыгожанне на адзежы. 2. Частка старадаўніх воінскіх даспехаў, якая засцерагала плячо ад удараў.

**НАПЛО́ІЦЬ**, -ло́ю, -ло́іш, -ло́іць. Зрабіць укладку, завіць валасы.

**НАПЛЯВУ́ЗГАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Нагаварыць глупства, лухты. 2. Напляткарыць, нагаварыць на каго-н.

**НАПЛЯТКА́РЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Нагаварыць плётак.

**НАПО́Р**, -у. Рашучае, энергічнае дзеянне; напад, націск; энергічнае ўздзеянне на каго-н.

**НАПО́РКАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Доўга папоркацца.

**НАПО́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Які ўпарта і настойліва дабіваецца сваёй мэты; які выражае настойлівасць, поўны настойлівасці.

**НАПРАДВЕ́СНІ**. Перад самым наступленнем вясны; ранняю вясною.

**НАПРАКТЫКАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які зрабіўся ў выніку доўгіх практыкаванняў умелым, вопытным.

**НАПРАКТЫКАВА́ЦЦА**, -ку́юся, -ку́ешся, -ку́ецца. Практыкуючыся, набыць якія-н. навыкі ў чым-н.

**НАПРАКУ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш,

-дзіць. Нарабіць чаго-н. непрыемнага, бяды.

**НАПРАЛЁТ**. Без перапынку, увесь час.

**НАПРАЛО́М**. Не лічачыся з перашкодамі, не разбіраючы шляху (пры руху наперад); не лічачыся з абставінамі (пры дасягненні мэты).

**НАПРАПАЛУ́Ю**. Не задумваючыся ні аб чым.

**НАПРАРО́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Прадказаць; прарочаннем наклікаць.

**НАПРАСІ́ЦЦА**, -прашу́ся, -про́сішся, -про́сіцца. 1. Просьбамі ці намёкамі прапанаваць сябе ў якасці чаго-н., дабіцца дазволу на што-н. 2. Сваімі паводзінамі выклікаць якія-н. адносіны да сябе.

**НАПРАСТКІ́**. Па прамой лініі, самым кароткім шляхам.

**НАПРА́ЎДУ**. На самай справе, сапраўды.

**НАПРУ́ЖАНАЕ ЧАКА́ННЕ**. Н. ч. глядач адчувае ў тых сітуацыях, калі герою нешта ці нехта пагражае і яму прадвызначаецца горшае. Н. ч. — гэта псіхалагічны стан, які вынікае з вельмі напружанай драматургічнай структуры: фабула і дзеянне пабудаваны такім чынам, што персанаж, аб'ект глядацкай трывогі, бывае не ў стане пазбегнуць свайго лёсу.

**НАПРУ́ЖАННЕ**, -я. Сканцэнтраванне намаганняў, затрата вялікай энергіі, сіл для ажыццяўлення чаго-н., ненатуральнае становішча, нацягнутасць. Драматычнае Н. — структурны феномен, які звязвае паміж сабою эпізоды фабулы, у прыватнасці ў канцы п'есы. Н. узнікае ад больш ці менш напоўненага трывогай чакання канца. Прадугадваючы паслядоўнасць падзей, глядач уяўляе горшае і таму перажывае моцнае напружанне.

**НАПРУ́ЖАНЫ**, -ая, -ае. 1. Які знаходзіцца ў стане напружання. 2. Які праходзіць з напружаннем, з затратай вялікіх сіл. 3. Неслабы; узмоцнены. 4. Нацягнуты, цяжкі, які патрабуе ўрэгулявання. 5. Які выражае напружанне; ненатуральны.

**НАПРУ́ЖЫЦЦА**, -жуся, -жышся, -жыцца. Сабрацца з сілай, прыкласці намаганні, робячы што-н.

**НАПРУ́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Узмацніць, павысіць ступень праяўлення чаго-н. (пра памяць, зрок, слых і інш.).

**НАПУ́ДРЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Пакрыць свой твар слоем пудры.

**НАПУ́ДРЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Нанесці слой пудры.

**НАПУЖА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Адчуць страх, моцна спужацца; напалохацца.

**НАПУЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Выклікаць у каго-н. страх, моцна спужаць.

**НАПУСКНЫ́**, -а́я, -о́е. Ненатуральны, штучны, няшчыры.

**НАПУСЦІ́ЦЦА**, -пушчу́ся, -пу́сцішся, -пу́сціцца. Накінуцца на каго-н. з лаянкай, папрокамі і пад.

**НАПЫ́ШЛІВАСЦЬ**, -і. Празмерная важнасць, ганарлівасць.

**НАПЫ́ШЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Празмерна важны, ганарысты; поўны важнасці, ганарыстасці; які выражае важнасць, ганарыстасць. 2. Празмерна ўрачысты, штучны ў сваім выражэнні.

**НАПЭ́ЎНА**. 1. Беспамылкова, з разлікам; без рызыкі. 2. Мабыць, хутчэй за ўсё.

**НАПЯВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Ціха, напаўголаса пець.

**НАПЯРЭ́ДАДНІ**. Непасрэдна перад якім-н. днём, перад якой-н. падзеяй.

**НАПЯРЭ́ЙМЫ**. З мэтай перахапіць каго-, што-н., рухаючыся яму насустрач; наперарэз.

**НАПЯРЭ́СЦІГІ**. Тое, што і *напярэймы*.

**НАРАВІ́ЦЦА**, -раўлю́ся, -ро́вішся, -ро́віцца. 1. Упарціцца, паказваць свой нораў. 2. Прыладжвацца, прыстасоўвацца.

**НАРАВІ́ЦЬ**, -раўлю́, -ро́віш, -ро́віць. 1. Старацца дагаджаць. 2. Прыладжвацца, прыстасоўвацца.

**НАРАГАТА́ЦЦА**, -гачу́ся, -го́чашся, -го́чацца. Доўга, уволюparагатаць; насмяяцца.

**НАРАКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Выказваць крыўду на каго-, што-н., незадавальненне кім-, чым-н.

**НАРАСКА́ЗВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Расказаць шмат чаго.

**НАРАСПЕ́Ў**. Працягла, расцягваючы словы.

**НАРАСТА́ЦЬ**, -а́е. Павялічвацца па сіле, узрастаць.

**НАРАСХВА́Т**. Стараючыся перахапіць у іншых, схапіць раней; мець вялікую папулярнасць, попыт.

**НАРАЎНЕ́**. Аднолькава з кім-, чым-н., у роўным становішчы, на роўных умовах, правах.

**НАРАЧО́НЫ**, -ая, -ае. 1. Аб'яўлены, прызначаны быць такім. 2. *у знач. наз.* **нарачо́ны**, -ага; **нарачо́ная**, -ай. Жаніх, нявеста.

**НАРВА́ЦЦА**, -рву́ся, -рве́шся, -рве́цца. Нечакана сустрэцца з кім-, чым-н., выпадкова натрапіць на каго-, што-н.

**НАРО́КАМ**. 1. Жартам, не ўсур'ёз. 2. Наўмысна.

**НАРО́СХЛІСТ**. 1. Насцеж, на ўсю шырыню. 2. Тое, што і н а р о с х р ы с т.

**НАРО́СХРЫСТ**. Расшпіліўшыся, расхінуўшы краі адзежы.

**НАРЭ́ШЦЕ**. 1. Пасля ўсяго, напаследак. 2. Паказвае на завяршэнне працэсу, дзеяння, з'явы. 3. Паказвае, што мера цярпення, чакання і пад. скончылася, або падкрэслівае што-н.

**НАСАГЛО́ТКА**, -і. Верхняя частка глоткі, якая размешчана ззаду насавой поласці і пераходзіць у глотку.

**НАСВАРЫ́ЦЦА**, -свару́ся, -сва́рышся, -сва́рыцца. Выказаць рэзкімі словамі сваё незадавальненне кім-н.

**НАСЕ́СЦІ**, -ся́ду, -ся́дзеш, -ся́дзе. 1. Націснуць сваім цяжарам, навалíцца з сілай; насунуцца, навіснуць. 2. Настойліва патрабаваць ад каго-н. чаго-н. 3. Накінуцца на непрыяцеля.

**НАСЁРБАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Сёрбаючы, наесціся.

**НАСІ́ЛЛЕ**, -я. 1. Прымяненне фізічнай сілы. 2. Прымусовае ўздзеянне на каго-н. для дасягнення сваёй мэты. 3. Злоўжыванне сваёй уладай; прыцясненне.

**НАСІ́ЛУ**. З вялікімі цяжкасцямі, ледзь-ледзь.

**НАСІ́ЦЦА**, нашу́ся, но́сішся, но́сіцца. Празмерна захапляцца кім-, чым-н.; вельмі многа думаць, клапаціцца аб кім-, чым-н.; надаваць вялікае значэнне, удзяляць шмат увагі чаму-н.

**НАСКАКА́ЦЦА**, -скачу́ся, -ска́чашся, -ска́чацца. 1. Стаміцца, скачучы цераз што-н. 2. Доўга, уволю патанцаваць.

**НАСКАНДА́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Учыніць скандал.

**НАСКА́РДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Выказаць якую-н. сваю скаргу; паскардзіцца.

**НАСКЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які настыў, намёрзся.

**НАСКО́К**, -у. 1. Скачок з мэтай нападу. 2. Нападкі, абвінавачванні, часцей грубыя, беспадстаўныя.

**НАСКО́КАМ**. З разгону, хутка; адразу; мімаходам, наездам, выпадкова.

**НАСКО́РА**. Хутка, наспех.

**НАСКО́ЧЫЦЬ**, -ско́чу, -ско́чыш, -ско́чыць. 1. З ходу, з разгону наткнуцца на каго-, што-н.; нечакана сустрэць каго-, што-н., натрапіць на каго-, што-н. 2. Раптоўна накінуцца, напасці на каго-н. 3. Нечакана з'явіцца (прыехаць, прыйсці); раптоўна ўзнікнуць, пачацца і г. д. 4. Хутка надысці, настаць (пра час, пару года).

**НАСКРО́ЗЬ**. 1. Праз усю таўшчыню чаго-н.; з канца ў канец, ад аднаго краю да другога. 2. Поўнасцю, цалкам.

**НАСЛАННЁ**, -я. Няшчасце, напасць, навала.

**НАСЛА́ЦЬ**, нашлю́, нашле́ш, нашле́. Напусціць на каго-н. няшчасце, бяду, навалач і пад.

**НА́СМАРК**, -у. Запаленне слізістай абалонкі носа, якое суправаджаецца слізіста-гноістымі выдзяленнямі і чханнем.

**НАСМЕ́ШКА**, -і. Крыўдны, злосны жарт з каго-, чаго-н., высмейванне каго-, чаго-н.

**НАСМЕ́ШЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які любіць насміхацца. 2. Які выражае насмешку.

**НАСМЕ́ШНІК**, -а. Чалавек, які любіць насміхацца з каго-, чаго-н.

**НАСМІХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Здзекліва смяяцца з каго-, чаго-н.

**НАСМЯШЫ́ЦЬ**, -смяшу́, -сме́шыш,

-смéшыць. Выклікаць смех у каго-н., прымусіць смяяцца; рассмяшыць.

**НАСМЯЯ́ЦЦА**, -смяю́ся, -смяе́шся, -смяе́цца, -смяёмся, -смеяце́ся. 1. Уволю, доўга пасмяяцца. 2. Аднесціся да каго-, чаго-н. з насмешкай, злосна пасмяяцца; абразіць.

**НАСО́ЎКА**, -і. Невялікая хустачка, прызначаная для выцірання носа або твару.

**НАСПЕ́Х**. Спяшаючыся, паспешліва.

**НАСТА́ВІЦЦА**, -ста́ўлюся, -ста́вішся, -ста́віцца. Накіраваць пільны і доўгі позірк на каго-н.

**НАСТАГНА́ЦЦА**, -стагну́ся, -сто́гнешся, -сто́гнецца. Доўга, многа пастагнаць.

**НАСТАЛЬГІ́Я**, -і. Туга па кім-, чым-н.

**НАСТАЎЛЕ́ННЕ**, -я. Павучанне, настойлівая парада.

**НАСТАЎЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Навучаць, наказваць, як трэба рабіць што-н.; даваць настаўленні.

**НАСТАЯ́ЦЕЛЬ**, -я. 1. Кіраўнік мужчынскага манастыра; ігумен. 2. Старшы свяшчэннік у праваслаўнай царкве.

**НАСТАЯ́ЦЬ**, -стаю, -стаі́ш, -стаі́ць. Дамагчыся выканання чаго-н.

**НАСТО́ЙЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Рашучы ў дасягненні сваёй мэты, свайго жадання. 2. Які выражае рашучасць; які ажыццяўляецца з упартасцю, рашучасцю.

**НАСТРАЁВАСЦЬ**, -і. Пэўная накіраванасць думак, пачуццяў, душэўны стан; настрой.

**НАСТРА́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Навесці, выклікаць страх.

**НАСТРО́ЕНАСЦЬ**, -і. Душэўны стан, пэўная накіраванасць думак, пачуццяў; настрой.

**НАСТРО́ІЦЦА**, -стро́юся, стро́ішся, -стро́іцца. Настроіць, падрыхтаваць сябе да чаго-н.

**НАСТРО́ІЦЬ**, -стро́ю, -стро́іш, -стро́іць. 1. Выклікаць які-н. настрой. 2. Выклікаць у каго-н. якія-н. пачуцці, думкі (у адносінах да каго-, чаго-н.).

**НАСТРО́Й**, -ю. 1. Унутраны, душэўны стан; добры гумор. 2. Накіраванасць думак, пачуццяў і пад.; настроенасць. 3. Жаданне, схільнасць рабіць што-н.

**НАСТРУ́НІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. 1. Нацягнуцца, напяцца як струна. 2. Напружыцца.

**НАСТРУ́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. 1. Нацягнуць, напяць як струну. 2. Напружыць.

**НАСТУПА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які мае характар наступлення, з'яўляецца наступленнем; звязаны з наступленнем на каго-, што-н.; баявы, рашучы.

**НАСТУПА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Весці актыўныя дзеянні з якой-н. мэтай. 2. Падступаць да каго-н. з просьбамі, пагрозамі і пад. 3. Набліжацца да чаго-н., распаўсюджвацца, насоўвацца на што-н.

**НАСТУ́ПНІК**, -а. 1. Прадаўжальнік дзейнасці каго-н.; пераемнік. 2. Той, хто заняў месца або пасаду свайго папярэдніка.

**НАСТЫРА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Сварыцца; уступаць у спрэчкі.

**НАСТЫ́РНАСЦЬ**, -і. Настойлівасць, напорыстасць.

**НАСТЫ́РНЫ**, -ая, -ае. Настойлівы, напорысты, упарты ў дасягненні чаго-н.

**НАСУ́ПА**, -ы. Пануры, насуплены чалавек.

**НАСУ́ПЕРАК**. Наперакор, не згодна з чым-н.

**НАСУ́ПІСТЫ**, -ая, -ае. Хмуры, насуплены, пануры.

**НАСУ́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Ссунуўшы бровы, прыняць пахмурны, непрыветлівы выгляд; нахмурыцца (пра твар, бровы).

**НАСУ́ПІЦЬ**, -плю, -піш, -піць. Нахмурыць, наморшчыць (бровы, твар).

**НАСУ́ПЛЕНЫ**, -ая, -ае. Ссунуты, нахмураны.

**НАСУР'Ё́З**. Сур'ёзна, не жартам; грунтоўна, па-дзелавому.

**НАСУРМІ́ЦЦА**, -млю́ся, -мі́шся, -мі́цца; -мі́мся, -міце́ся. Насурміць сабе валасы, бровы і пад.

**НАСУРМІ́ЦЬ**, -млю, -мі́ш, -мі́ць; -мі́м, -міце́. Пафарбаваць, афарбаваць сурмой.

**НАСУ́СТРАЧ**. У кірунку, процілеглым каму-, чаму-н., што рухаецца, набліжаецца.

**НА́СЦЕЖ**. На ўсю шырыню,

поўнасцю (адчыніць, расчыніць, расхінуць і пад.).

**НАСЦЯБА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е і **НАСЦЁБАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Набіць, нахвастаць.

**НАСЦЯРО́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Напружана-ўважлівы і трывожны ў чаканні чаго-н.; які выяўляе напружанасць, насяроджанасць.

**НАСЫ́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Змястоўны, багаты на што-н.

**НАТАЛІ́ЦЦА**, -талю́ся, -то́лішся, -то́ліцца. Задаволіцца, заспакоіцца (пра патрэбы, жаданні і пад.).

**НАТАЛІ́ЦЬ**, -талю́, -то́ліш, -то́ліць. Задаволіць, заспакоіць (патрэбы, жаданні і пад.).

**НАТАМІ́ЦЦА**, -тамлю́ся, -то́мішся, -то́міцца. Змарыцца, змучыцца.

**НАТАМІ́ЦЬ**, -тамлю́, -то́міш, -то́міць. Змарыць, змучыць.

**НАТАПЫ́РАНЫ**. 1. Які стаіць тарчма, прыўзняты ўверх; настаўлены. 2. Надзьмуты, незадаволены; раззлаваны.

**НАТАПЫ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Надзьмуцца, прыняць ваяўнічы выгляд; ускіпець, раззлавацца.

**НАТВАРЫ́ЦЬ**, -твару́, -тво́рыш, -тво́рыць. Нарабіць чаго-н. непажаданага, дрэннага, заганнага.

**НАТКНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няце́ся. 1. Рухаючыся, нечакана наскочыць на каго-, што-н. 2. Рухаючыся, нечакана сустрэцца з кім-, чым-н., набрысці на каго-, што-н.; выпадкова выявіць, знайсці што-н.; сутыкнуцца з кім-, чым-н. на сваім жыццёвым шляху, у сваёй дзейнасці.

**НАТЛУМІ́ЦЬ**, -тлумлю́, -тлу́міш, -тлу́міць. Пазбавіць здольнасці ясна мысліць, лагічна разважаць; задурыць.

**НАТРА́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Выпадкова сустрэцца.

**НАТРА́ПІЦЬ**, -плю, -піш, -піць. Напасці, наткнуцца на што-н.; сустрэцца з кім-н., выпадкова наткнуцца на каго-н.

**НАТРУ́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Стомлены, прыведзены ў хваравіты стан (працай, хадой і пад.).

**НАТРУ́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Стаміцца, прыйсці ў хваравіты стан (ад працяглай або цяжкай працы, хады і пад.); папрацаваць шмат, да стомы.

**НАТРЭНІРАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які атрымаў добрую трэніроўку; вопытны, умелы.

**НАТРЭНІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Набыць навык у чым-н. шляхам трэніроўкі; стаць умелым, спрытным у чым-н.

**НАТРЭНІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Навучыць чаму-н. шляхам трэніроўкі; зрабіць умелым, спрытным у чым-н.

**НАТУ́ГА**, -і. Празмернае напружанне сіл.

**НАТУ́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца або робіцца з натугай.

**НАТУ́ЖНЫ**, -ая, -ае. Тое, што і н а т у ж л і в ы.

**НАТУ́ЖЫЦЦА**, -жуся, -жышся, -жыцца. Напружыцца; напружваць усе сілы.

**НАТУ́ЗАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Стаміцца ад цяжкай працы, звязанай з рэзкімі рухамі.

**НАТУ́ЗАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Тузаючы, ушчуць, пакараць. 2. Натрудзіць цяжкай працай, звязанай з рэзкімі рухамі.

**НАТУ́ПАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Стаміцца ад працяглай хады; нахадзіцца.

**НАТУ́РА**, -ы. Характар, тэмперамент чалавека.

**НАТУРАЛІСТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які характарызуецца ўвагай да бытавых дэталей, імкненнем да фатаграфічнага капіравання рэчаіснасці без абагульнення таго, што паказваецца.

**НАТУРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Уласцівы прыродзе, створаны прыродай; не штучны. 2. Які адпавядае рэчаіснасці; сапраўдны.

**НАТУ́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Наравісты, з норавам; упарты.

**НАТУ́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Тое, што і н а т у р л і в ы.

**НАТУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Наравіцца, упарціцца.

**НАТХНЕ́ННЕ**, -я. 1. Стан творчага ўздыму. 2. Душэўны ўздым, захапленне.

**НАТХНЁНАСЦЬ**, -і. Творчы пад'ём, прыліў творчых сіл.

**НАТХНЁНЫ**, -ая, -ае. Поўны натхнення, прасякнуты натхненнем; які выражае натхненне (у 2 знач.).

**НАТХНІ́ЦЕЛЬ**, -я. Той, хто натхняе.

**НАТХНІ́ЦЦА**, -нюся, -ні́шся, -ні́цца. Адчуць натхненне; прыйсці ў стан душэўнага ўздыму.

**НАТХНІ́ЦЬ**, -ню, -ні́ш, -ні́ць. 1. Выклікаць натхненне, творчы ўздым; выклікаць, абудзіць, навеяць што-н. (пачуцці, думкі і пад.); прымусіць прасякнуцца чым-н. 2. Выклікаць душэўны ўздым, заахвоціць да якіх-н. дзеянняў.

**НАЎГА́Д**. Не будучы цвёрда ўпэўненым; як выйдзе, як прыйдзецца.

**НАЎДА́ЧУ**. У надзеі на зручны выпадак; як удасца.

**НАЎЗА́ХАПКІ**. 1. Стараючыся зрабіць што-н. першым, пераганяючы адзін аднаго ў чым-н.; наперабой. 2. Перабіваючы адзін аднаго.

**НАЎЗБО́Ч**. 1. На нейкай адлегласці, асобна ад чаго-н. 2. Збоку ад чаго-н.

**НАЎЗДАГА́Д**. Наўгад, як выйдзе.

**НАЎЗДАГО́Н**. Услед за тым, хто (што) аддаляецца, адыходзіць.

**НАЎЗДАГО́НКІ**. Даганяючы, пераганяючы каго-, што-н.

**НАЎЗДЗІ́Ў**. Надзіва; надзвычайна.

**НА́ЎЗНІЧ**. На спіну, на спіне тварам угору.

**НАЎКО́Л** і **НАЎКО́ЛА**. Тое, што і н а в о к а л.

**НАЎКО́ЛЛЕ**, -я. Наваколле.

**НАЎКРУ́Г**. 1. Навокал, кругом. 2. Не прама, а ў абход ці ў аб'езд; укругавую. 3. Вакол, кругом каго-, чаго-н.

**НАЎМЕ́**. У галаве, у думках.

**НАЎМЫ́СЛЯ**. З намерам, свядома, спецыяльна, знарок.

**НАЎМЫ́СНА**. Тое, што і н а ў м ы с л я.

**НАЎМЫ́СНЫ**, -ая, -ае. Які робіцца з намерам, свядома, знарок.

**НАЎПЕ́РАД**. Спачатку, спярша, перш за ўсё.

**НАЎПРО́СТ**. Па прамой лініі, найкарацейшым шляхам; нацянькі.

**НАЎРА́Д**. Малаверагодна (ужываецца для выражэння сумнення ў верагоднасці сказанага).

**НАЎСКАПЫ́ТА**. Наўскач (скачкамі, вельмі хутка).

**НАЎСКАСЯ́К**. У бок ад прамога, па дыяганалі.

**НАЎСЦЯ́Ж**. 1. Ва ўсю даўжыню чаго-н. 2. Навокал.

**НАЎЦЕКАЧА́**. Бягом, уцякаючы ад каго-, чаго-н.

**НАЎЦЁКІ**. Тое, што і н а ў ц е к а ч а.

**НАФАРБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. Намазаць сабе губы, шчокі, бровы і інш. касметычнай фарбай.

**НАФАРБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Намазаць касметычнай фарбай губы, шчокі і інш.

**НАФІКСАТУА́РЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Намазаць валасы, бараду, вусы памадай (фіксатуарам).

**НАХА́БА**, -ы. Нахабны чалавек, нахабная істота; назола.

**НАХА́БНАСЦЬ** , -і. 1. Бессаромная назойлівасць, бесцырымоннасць. 2. Нахабны ўчынак.

**НАХА́БНІК**, -а. Бессаромны, бесцырымонны чалавек.

**НАХА́БНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Паводзіць сябе нахабна, бесцырымонна.

**НАХА́БНЫ**, -ая, -ае. Які вызначаецца нахабствам; бесцырымонны, бессаромны; назойлівы, неадчэпны; які выражае нахабства.

**НАХА́БСТВА**, -а. 1. Бессаромная назойлівасць, бесцырымоннасць. 2. Нахабны ўчынак.

**НАХАПА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Захапіць, схапіць шмат чаго-н. 2. Павярхоўна, выпадкова засвоіць што-н.

**НАХА́ПКАМ**. Спеха́м, наспех; на скорую руку.

**НАХВАЛІ́ЦЦА**, -хвалю́ся, -хва́лішся, -хва́ліцца. Нагаварыць аб сабе шмат добрага.

**НАХВАЛІ́ЦЬ**, -хвалю́, -хва́ліш, -хва́ліць. Нагаварыць аб кім-, чым-н. шмат добрага; расхваліць.

**НАХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лю́юся, -лю́ешся, -лю́ецца. Моцна або доўга пахвалявацца.

**НАХВАСТА́ЦЬ**, -хвашчу́, -хво́шчаш, -хво́шча. Сцябаючы, пабіць.

**НАХІНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́. Наспех

накінуць, апрануць на сябе што-н.

**НАХЛАБУ́ЧКА**, -і. Вымова, наганяй.

**НАХЛАБУ́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Насунуць галаўны ўбор на лоб, вушы і пад.

**НАХЛЕ́БНІК**, -а. Той, хто жыве на чужыя сродкі, на чужым хлебе.

**НАХЛУСІ́ЦЬ**, -хлушу́, -хлу́сіш, -хлу́сіць. Нагаварыць няпраўды; налгаць.

**НАХЛЫ́НУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Раптоўна ўзнікнуць, з'явіцца (аб думках, пачуццях і інш.).

**НАХЛЯБТА́ЦЦА**, -хлябчу́ся, -хле́бчашся, -хле́бчацца. 1. Уволю пахлябтаць чаго-н. 2. Напіцца гарэлкі, віна.

**НАХМУ́РАНЫ**, -ая, -ае. Хмуры, пануры; які выражае суровасць, задуменнасць, заклапочанасць.

**НАХМУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Стаць хмурым, панурым; наморшчыцца, насупіцца, выказваючы суровасць, задуменнасць, заклапочанасць.

**НАХМУ́РЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Сурова наморшчыць (твар, лоб), насупіць бровы.

**НАХРА́ПАМ**. Дзёрзка, нахабна.

**НАХРА́ПІСТЫ**, -ая, -ае. Які дзейнічае нахрапам; бесцырымонны, нахабны.

**НАХУЛІГА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Насвавоціць, набуяніць.

**НАЦАЛАВА́ЦЦА**, -лу́юся, -лу́ешся, -лу́ецца. Нацешыцца ўволю пацалункамі.

**НАЦА́ЦКАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Доўга, уволю цацкацца, забаўляцца, гуляць, дурэць.

**НАЦЕ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. 1. Зведаць задавальненне; парадавацца, пацешыцца ўволю. 2. Зведаць асалоду ўзаемнага кахання.

**НА́ЦІСК**, -у. 1. Рашучае, энергічнае дзеянне, імклівы напад на каго-, што-н. 2. Вылучэнне складу ў слове сілай голасу або павышэннем тону, а таксама значок над літарай, які паказвае яе вылучэнне; вылучэнне голасам слова ў размове для таго, каб падкрэсліць яго лагічную значнасць.

**НАЦКАВА́ЦЬ**, -кую́, -кue̋ш, -куе́. Падбухторыць да варожых дзеянняў супроць каго-н.

**НАЦЭ́ЛЕНАСЦЬ**, -і. Накіраванасць, сканцэнтраванасць (думак, інтарэсаў).

**НАЦЯГА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Доўга пахадзіць, паблукаць. 2. Стаміцца, цягаючы цяжкае.

**НАЦЯ́ГНУТАСЦЬ**, -і. Напружанасць, адсутнасць натуральнасці.

**НАЦЯ́ГНУТЫ**, -ая, -ае. 1. Які знаходзіцца ў стане напружання. 2. Пазбаўлены натуральнасці; недружалюбны.

**НАЦЯ́ЖКА**, -і. Неправамернае дапушчэнне чаго-н.

**НАЦЯМКУ́** і **НАЦЯМО́ЧКУ**. Досвіткам, на світанні; прыцемкам.

**НАЦЯНЬКІ́**. Самым кароткім шляхам; наўпрост.

**НАЦЯРПЕ́ЦЦА**, -цярплю́ся, -це́рпішся, -це́рпіцца. Зведаць, перажыць шмат непрыемнага, цяжкага; нагаравацца.

**НАЦЯ́ТЫ**, -ая, -ае. Напружаны.

**НАЧАКА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Доўга прачакаць.

**НАЧАПІ́ЦЬ**, -чаплю, -чэ́піш, -чэ́піць. 1. Накінуўшы, замацаваць; павесіць, навесіць. 2. Надзець што-н., прымацаваўшы, прывесіўшы да чаго-н.

**НАЧАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Выклікаць што-н. чараваннем.

**НАЧАСА́ЦЬ**, -чашу́, -чэ́шаш, -чэ́ша. Зачасаць валасы на лоб, вушы, скроні; пышна ўзбіць валасы для прычоскі.

**НАЧМУЦІ́ЦЬ**, -мучу́, -му́ціш, -му́ціць. Нагаварыць абы-чаго, увесці ў зман; адурманіць.

**НАЧО́С**, -у. Валасы ў прычосцы, начасаныя на лоб, вушы, скроні; прычоска ў выглядзе пышна ўзбітых валасоў.

**НАЧЫ́ННЕ**, -я. Набор прадметаў, інструментаў, прылад і пад.

**НАШАПТА́ЦЦА**, -шапчу́ся, -шэ́пчашся, -шэ́пчацца. Уволю, шмат, доўга пашаптацца.

**НАШВЭ́НДАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Пашвэндацца доўга; набадзяцца.

**НАШКО́ДЗІЦЬ**, -шко́джу, -шко́дзіш, -шко́дзіць. Нарабіць шкоды; натварыць чаго-н.

**НАШЛЁПАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Надаваць плескачоў; набіць.

**НАШПУРЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Накідаць у якой-н. колькасці.

**НАШТУ́РХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Паштурхацца доўга, шмат.

**НАШТУ́РХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Прычыніць боль; набіць.

**НАШУМЕ́ЦЬ**, -млю, -мі́ш, -мі́ць. 1. Нарабіць шуму; накрычаць на каго-н., нагаварыць чаго-н. рэзкім голасам. 2. Прыцягнуць да сябе ўвагу, выклікаць шмат размоў.

**НАШУШУ́КАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Шушукаючыся, нагаварыцца ўволю.

**НА́ШЧА**. Не еўшы нічога.

**НАШЧА́ДАК**, -дка. 1. Чалавек у адносінах да продкаў. 2. *толькі мн.* (нашча́дкі, -аў). Людзі будучых пакаленняў. 3. Сын, наследнік або наогул сваё дзіця.

**НАШЧЭ́НТ**. Зусім, поўнасцю; канчаткова.

**НАШЭ́ПТВАННЕ**, -я. Тое, што нашаптана; нашаптаныя словы.

**НАШЭ́ПТВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Гаварыць шэптам. 2. Нагаворваць на каго-н.; пляткарыць; гаварыць замовы; чараваць.

**НАЯ́ВЕ**. На самай справе, у рэчаіснасці.

**НАЯРШЫ́ЦЦА**, -шу́ся, -шы́шся, -шы́цца. Стаць задзірлівым, раззлавацца; насупіцца.

**НАЯ́ЎНАСЦЬ**, -і. Прысутнасць, знаходжанне, існаванне.

**НАЯ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які ёсць у наяўнасці.

**НЕАБАВЯЗКО́ВЫ**, -ая, -ае. Які не з'яўляецца абавязковым, неабходным.

**НЕАБАРАЧА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, які не можа развівацца ў адваротным кірунку.

**НЕАБА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Які дзейнічае неразважліва, не думае аб выніках; неасцярожны, неабдуманы.

**НЕАБВЕ́РЖНЫ**, -ая, -ае. Такі, які немагчыма абвергнуць; бясспрэчны.

**НЕАБГРУНТАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які не мае дастатковага абгрунтавання, неабходных падстаў, доказаў.

**НЕАБДУ́МАНЫ**, -ая, -ае. Зроблены, прыняты без абдумвання.

**НЕАБДЫ́МНЫ**, -ая, -ае. Вялізны памерамі; бязмежны, бяскрайні.

**НЕАБ'ЕКТЫ́ЎНАСЦЬ**, -і. Неаб'ектыўныя адносіны да каго-, чаго-н.

**НЕАБ'ЕКТЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не адлюстроўвае сапраўднага становішча спраў; прадузяты.

**НЕАБМЕЖАВА́НЫ**, -ая, -ае. Такі, якому не ўласціва абмежаванне ў чым-н.

**НЕАБСЯ́ЖНЫ**, -ая, -ае. Вялікі па працягласці, памерах; бязмежны.

**НЕАБУ́ДНЫ**, -ая, -ае. Вельмі моцны (пра сон).

**НЕАБХО́ДНАСЦЬ**, -і. Патрэба ў кім-, чым-н.; абавязковае, непазбежнае.

**НЕАБХО́ДНЫ**, -ая, -ае. Такі, без якога цяжка або нельга абысціся; патрэбны; абавязковы, непазбежны.

**НЕАБЫЯ́КАВЫ**, -ая, -ае. 1. Які адносіцца да каго-, чаго-н. з цікавасцю. 2. Які адчувае сімпатыю, любоў да каго-н.

**НЕАГЛЯ́ДНЫ**, -ая, -ае. Неабсяжны, бязмежны.

**НЕАДАБРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які выражае неадабрэнне.

**НЕАДАБРЭ́ННЕ**, -я. Адмоўная ацэнка каго-, чаго-н.

**НЕАДВЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Неадступны, неадчэпны.

**НЕАДДЗЕ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, якога нельга аддзяліць ад другога.

**НЕАД'Е́МНЫ**, -ая, -ае. Які з'яўляецца састаўной, арганічнай часткай каго-, чаго-н.; неадрыўны; арганічна ўласцівы каму-, чаму-н.

**НЕАДКЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. Які нельга адкласці; тэрміновы; які ажыццяўляецца, выконваецца без затрымкі, адразу.

**НЕАДЛУ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які заўсёды знаходзіцца пры кім-, чым-н. 2. Такі, пры якім не адлучаюцца, пастаянна прысутнічаюць дзе-н.

**НЕАДМЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Абавязковы, неабходны; традыцыйны, звычайны.

**НЕАДНАРАЗО́ВЫ**, -ая, -ае. Які робіцца, адбываецца або выкарыстоўваецца не адзін раз.

**НЕАДНАРО́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Неаднастайны; разнародны па складу. 2. Які адносіцца да іншай катэгорыі з'яў, прадметаў і інш.

**НЕАДНАСТА́ЙНЫ**, -ая, -ае. Не аднолькавы з чым-н., не падобны да іншых; неаднародны.

**НЕАДНО́ЙЧЫ**. Не адзін раз.

**НЕАДНО́ЛЬКАВЫ**, -ая, -ае. Які не супадае з іншымі, не падобны да іншых; розны.

**НЕАДО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які цяжка, немагчыма пераадолець, перасіліць; такі, якога цяжка, немагчыма адолець, пера-магчы; магутны.

**НЕАДПАВЕ́ДНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць адпаведнасці чаму-н.

**НЕАДПАВЕ́ДНЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае чаму-н., не падыходзіць для чаго-н.

**НЕАДПЛА́ТНЫ** і **НЕАПЛА́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не можа быць аплачаны. 2. Вельмі значны, большы за любую ўзнагароду.

**НЕАДРЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, які адбываецца без спынення, бесперапынны. 2. Непарыўны.

**НЕАДСТУ́ПНЫ**, -ая, -ае. Які не адступае ад каго-, чаго-н., упарта дамагаецца чаго-н.; настойлівы; неадчэпны, пастаянны.

**НЕАДУКАВА́НАСЦЬ**, -і. Недастатковасць, адсутнасць адукаванасці.

**НЕАДУКАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які не мае адукацыі, малапісьменны.

**НЕАДХІ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога нельга адхіліць, якога немагчыма пазбегнуць. 2. Пастаянны, неадступны.

**НЕАДЧУВА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які пазбаўлены адчувальнасці; раўнадушны. 2. Непрыкметны, нязначны.

**НЕАДЧЭ́ПНЫ**, -ая, -ае. Які не дае спакою, неадступны; назойлівы.

**НЕАЖЫЦЦЯВІ́МАСЦЬ**, -і. Немагчымасць ажыццяўлення чаго-н.

**НЕАЖЫЦЦЯВІ́МЫ**, -ая, -ае. Такі, які цяжка, немагчыма ажыццявіць; нездзяйсняльны, нязбытны.

**НЕАКРЭ́ПЛЫ**, -ая, -ае. Які не паспеў акрэпнуць; слабы.

**НЕАКРЭ́СЛЕНАСЦЬ**, -і. Нявызначанасць, няпэўнасць.

**НЕАКРЭ́СЛЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Дакладна нявызначаны, няпэўны. 2. Невыразны, няясны; які нічога не выяўляе, не выказвае.

**НЕАКТУА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не мае істотнага значэння ў сучасны момант, не адпавядае патрабаванням сучаснасці.

**НЕАКУРА́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не захоўвае парадку, дакладнасці. 2. Нядбайна зроблены, недакладна выкананы. 3. Неахайны ў адносінах да сваіх рэчаў.

**НЕАЛАГІ́ЗМЫ**, -аў. Словы або спалучэнні слоў, утвораныя для абазначэння новых прадметаў, паняццяў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці.

**НЕАПЛА́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Такі, які не быў аплачаны.

**НЕАПРА́ЎДАНЫ** і **НЕАПРАЎДА́НЫ**, -ая, -ае. Які не мае апраўдання; неабгрунтаваны.

**НЕАРГАНІЗАВА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены арганізаванасці; бязладны, непланамерны. 2. Які не можа дзейнічаць дакладна і планамерна, правільна арганізаваць жыццё; недысцыплінаваны.

**НЕАРГАНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Жыццёва непераканальны; штучны.

**НЕАСПРЭ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не выклікае пярэчанняў; бясспрэчны, відавочны.

**НЕАСЦЯРО́ГА**, -і. Адсутнасць або недастатковасць асцярожнасці.

**НЕАСЦЯРО́ЖНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць неасцярожнага, недахоп асцярожнасці; неасцярожны ўчынак, паводзіны і пад.

**НЕАСЦЯРО́ЖНЫ**, -ая, -ае. Які дзейнічае, не захоўваючы асцярожнасці; неабачлівы.

**НЕАСЭНСАВА́НЫ**, -ая, -ае. Неабдуманы; неўсвядомлены, няясны.

**НЕАФІЦЫ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які не мае афіцыйнага значэння.

**НЕАХА́ЙНІК**, -а. Неахайны чалавек.

**НЕАХА́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не захоўвае чысціні, парадку; які ўтрымліваецца ў беспарадку, неакуратным стане. 2. Зроблены абы-як, без стараннасці.

**НЕАХВО́ТА**, -ы. 1. Адсутнасць ахвоты да чаго-н. 2. Не хочацца, няма жадання.

**НЕАХВО́ЧЫ**, -ая, -ае. Які не мае жадання рабіць што-н., не выказвае ахвоты.

**НЕАХО́ПНЫ**, -ая, -ае. Неабсяжны, неабдымны, бязмежны.

**НЕАЦЭ́ННЫ**, ая, -ае. Надзвычай важны.

**НЕАШЧА́ДНЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца ашчаднасцю; неэканомны.

**НЕБАГА́ТА**. Мала, у невялікай колькасці.

**НЕБАГА́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Недарагі, сціплы. 2. Абмежаваны, недастатковы.

**НЕБАЖА́ТЫ**, -жа́т. Пляменнікі, унукі (звычайна ў дзіцячым узросце).

**НЕБАКРА́Й**, -ю і **НЕБАСХІ́Л**, -у. Частка неба над лініяй гарызонту.

**НЕБАРА́КА**, -і. Няшчасны чалавек, які выклікае спачуванне, жаль і спагаду.

**НЕБЕЗДАКО́РНЫ**, -ая, -ае. Які не пазбаўлены недахопаў; небеззаганны.

**НЕБЕЗНАДЗЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які не выключае магчымасці поспеху, удачы.

**НЕБЕСКАРЫ́СЛІВЫ**, -ая, -ае. Які выяўляе асабістую зацікаўленасць, разлік; які мае выгаду ад чаго-н.

**НЕБЕСКАРЫ́СНЫ**, -ая, -ае. Які прыносіць пэўную карысць.

**НЕБЕСПАДСТА́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які мае некаторую падставу.

**НЕБЕСПАСПЯХО́ВЫ**, -ая, -ае. Які мае некаторы поспех; даволі паспяховы.

**НЕБЛАГІ́**, -а́я, -о́е. 1. Нядрэнны, даволі добры; даволі ўмелы, вопытны. 2. Дастатковы для якой-н. мэты; даволі значны.

**НЕБЫВА́ЛЫ**, -ая, -ае. Якога раней не было; нябачаны, незвычайны.

**НЕБЫЛІ́ЦА**, -ы. Паведамленне пра тое, чаго не бывае ў рэчаіснасці; выдумка; плёткі, хлусня.

**НЕ́БЫЛЬ**, -і. Тое, чаго не было, не бывае; небыліца.

**НЕБЫЦЦЁ**, -я. Адсутнасць існавання, жыццядзейнасці; нябыт.

**НЕБЯСПЕ́КА**, -і. Стан, становішча, якое пагражае каму-, чаму-н., можа прычыніць няшчасце, зло, шкоду.

**НЕБЯСПЕ́ЧНА**. Звязана з небяспекай; цягне за сабой якую-н. небяспеку.

**НЕБЯСПЕ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які пагражае небяспекай, можа прычыніць няшчасце, зло, шкоду; звязаны з небяспекай, рызыкай.

**НЕВЕРАГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Які ўяўляецца непраўдападобным, немагчымым; фантастычны; незвычайны, дзіўны.

**НЕВІДО́ЧНЫ**, -ая, -ае. Нябачны.

**НЕВІДУ́ЧЫ** і **НЕВІДУ́ШЧЫ**, -ая, -ае. Які страціў зрок; сляпы; які не заўважае таго, што адбываецца навокал.

**НЕВІНАВА́ТАСЦЬ**, -і. Непрычыннасць да віны, злачынства.

**НЕВІНАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Які не мае за сабой віны; які не мае дачынення да злачынства.

**НЕ́ВУК**, -а. Неадукаваны, недасведчаны чалавек.

**НЕ́ВУЦТВА**, -а. Адсутнасць ведаў, неадукаванасць, недасведчанасць у чым-н.

**НЕВЫГО́ДА**, -ы. 1. Адсутнасць выгодаў. 2. Нягода, непрыемнасць; цяжкае становішча.

**НЕВЫГО́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае выгодаў, дрэнна прыстасаваны для чаго-н. 2. Неспрыяльны, нязручны, непрыемны.

**НЕВЫДАТКАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які застаўся не патрачаным, не выкарыстаным на што-н.

**НЕВЫКА́ЗНА**. Вельмі, надзвычай.

**НЕВЫКА́ЗНЫ**, -ая, -ае. Такі, што цяжка або немагчыма выказаць, перадаць словамі.

**НЕВЫКАНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, што не можа быць выкананы.

**НЕВЫКАНА́ННЕ**, -я. 1. Нездзяйсненне таго, што было даручана, намечана, меркавалася зрабіць. 2. Ухіленне ад выканання правілаў, законаў, патрабаванняў.

**НЕВЫНО́СНЫ**, -ая, -ае. Які цяжка, немагчыма вынесці; нясцерпны.

**НЕВЫПАДКО́ВЫ**, -ая, -ае. Які адбыўся, узнік наўмысна.

**НЕВЫРА́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, у якім дэталі, моманты вылучаюцца няярка, неяскрава; цьмяны; не зусім зразумелы; няпэўны. 2. Выказаны недакладна, няясна.

**НЕВЫРАША́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не паддаецца вырашэнню, які нельга вырашыць; вельмі складаны.

**НЕВЫСАКАРО́ДНЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца высокімі маральнымі якасцямі; уласцівы такому чалавеку.

**НЕВЫТЛУМАЧА́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Незразумеласць.

**НЕВЫТЛУМАЧА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не паддаецца тлумачэнню, вытлумачэнню; незразумелы.

**НЕВЫЦЕ́РПНЫ**, -ая, -ае. Які цяжка, немагчыма выцерпець.

**НЕВЫЧАРПА́ЛЬНЫ** і **НЕВЫЧЭ́РПНЫ**, -ая, -ае. Які практычна цяжка вычарпаць, выкарыстаць поўнасцю; вельмі багаты; бязмежны.

**НЕВЯДО́МА**. Няма звестак аб чым-н., пра каго-н.

**НЕВЯДО́МАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць і стан невядомага (у 1 знач.). 2. Адсутнасць звестак, ведаў пра каго-н. 3. Сціплае, непрыкметнае існаванне.

**НЕВЯДО́МЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога не ведаюць, аб якім няма звестак; незнаёмы. 2. Нязведаны, не перажыты раней. 3. Які не карыстаецца шырокай папулярнасцю.

**НЕВЯЛІ́КІ**, -ая, -ае. 1. Нязначны па велічыні і памерах; малы; невысокі ростам; нязначны па колькасці; нешматлікі; нядоўгі (пра час). 2. Нязначны па сіле, інтэнсіўнасці, якасці, змесце і пад. 3. Які не мае вялікага значэння ў грамадстве. 4. Які нічым не вылучаецца; пасрэдны.

**НЕВЯСЁЛЫ**, -ая, -ае. Які сумуе; які выражае смутак, журбу.

**НЕГАВАРКІ́**, -а́я, -о́е. 1. Не схільны ўступаць у размовы; маўклівы. 2. Які ўхіляецца ад размоў з людзьмі; замкнуты.

**НЕГАДА́НЫ**, -ая, -ае. Нечаканы, неспадзяваны; непрадбачаны.

**НЕГАМАНКІ́**, -а́я, -о́е. Маўклівы, негаваркі; які не робіць шуму; ціхі.

**НЕГАРМАНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які пазбаўлены гармоніі; несуразмерны.

**НЕГАСЦІ́ННЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца гасціннасцю; няветлівы.

**НЕГІГІЕНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае патрабаванням гігіены.

**НЕГЛЫБО́КІ**, -ая, -ае. 1. Які не вызначаецца глыбінёй; павярхоўны, несур'ёзны (пра чалавека). 2. Нямоцны (аб пачуццях, стане і пад.).

**НЕГРУНТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Недастаткова абгрунтаваны; неперакананьны. 2. Неглыбокі, нетрывалы; слабы.

**НЕДААЦАНІ́ЦЬ**, -цаню́, -цэ́ніш, -цэ́ніць. Недастаткова, не ў поўнай меры ацаніць каго-, што-н., прызнаць чые-н. якасці.

**НЕДАВЕ́Р**, -у і **НЕДАВЕ́Р'Е**, -я. Адсутнасць даверу, падазроныя адносіны да каго-, чаго-н.; сумненне ў верагоднасці, праўдзівасці чаго-н.

**НЕДАВЕ́РАК**, -рка. Той, хто не верыць у што-н.; недаверлівы чалавек.

**НЕДАВЕ́РЛІВАСЦЬ**, -і. Недаверлівыя адносіны.

**НЕДАВЕ́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не давярае людзям, схільны да недаверу; які выражае недавер'е.

**НЕДАВУЧЫ́ЦЦА**, -вучу́ся, -ву́чышся, -ву́чыцца. Правучыцца менш, чым трэба, не закончыць адукацыі.

**НЕДАВУЧЫ́ЦЬ**, -вучу́, -ву́чыш, -ву́чыць. Правучыць менш, чым трэба; вывучыць не поўнасцю, не да канца.

**НЕДАВЯ́РАК**, -рка. 1. Бязлітасны, жорсткі чалавек; ліхадзей. 2. Чалавек, які не верыць у бога; бязбожнік. 3. Тое, што і н е д а в е р а к.

**НЕДАГАВАРЫ́ЦЬ**, -гавару́, -гаво́рыш, -гаво́рыць. Выказаць не ўсё; скрыць, утаіць свае думкі, намеры.

**НЕДАГАВО́РАНАСЦЬ**, -і. Няпоўнае выказванне, замоўчванне.

**НЕДАГАВО́РКА**, -і. Няпоўнае выказванне, у якім замоўчваецца што-н. або маецца намёк на што-н.

**НЕДАГЛЯ́Д**, -у. Недастатковы нагляд за кім-, чым-н.; памылка, промах, зробленыя з-за няўважлівасці, нядбайнасці.

**НЕДАДУ́МАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Недастаткова, не да канца абдумаць, прадумаць.

**НЕДАЗВО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Забаронены, недапушчальны.

**НЕДАКАЗА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, які немагчыма даказаць, абгрунтаваць.

**НЕДАКА́ЗАНАСЦЬ**, -і. 1. Адсутнасць пераканальных доказаў. 2. Непаўната, незакончанасць выказвання.

**НЕДАКАЗА́ЦЬ**, -кажу́, -ка́жаш, -ка́жа. Выказаць не да канца, недагаварыць.

**НЕДАКЛА́ДНАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць недакладнага. 2. Адхіленне ад ісціны, памылка; няправільнасць.

**НЕДАКЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не адпавядае ісціне, не зусім правільны; які выклікае сумненні; няпэўны. 2. Не поўнасцю адпаведны ўзору, патрабаванням, правілам; не зусім канкрэтны, вы-

чарпальны, правільны. 3. Невыразны, няясны.

**НЕДАКО́НЧАНАСЦЬ**, -і. Незавершанасць.

**НЕДАЛЁКІ**, -ая, -ае. Разумова абмежаваны; някемлівы.

**НЕДАЛІКА́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Няветлівы ў абыходжанні з людзьмі; грубы; нетактоўны. 2. Пазбаўлены мяккасці, рэзкі; неасцярожны.

**НЕДАЛУ́ЖНЫ**, -ая, -ае. 1. Слабы, хваравіты, бяссільны; непрыглядны. 2. Няўклюдны. 3. Недалёкі, прастакаваты.

**НЕДАЛЬНАБА́ЧНАСЦЬ**, -і. Няўменне прадбачыць.

**НЕДАЛЬНАБА́ЧНЫ**, -ая, -ае. Няздатны прадбачыць вынікі чаго-н., непрадбачлівы.

**НЕДАЛЮ́БЛІВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Адчуваць непрыязнасць, непрыхільнасць.

**НЕДАМО́ЎЛЕНАСЦЬ**, -і. Непаўната, незакончанасць выказвання, замоўчванне.

**НЕДАПЕ́ТЫ**, -ая, -ае. Не спеты да канца.

**НЕДАПРАЦАВА́НЫ**, -ая, -ае. Незавершаны, незакончаны, недастаткова апрацаваны.

**НЕДАПРАЦАВА́ЦЬ**, -цу́ю, -цу́еш, -цу́е. 1. Папрацаваць менш, чым патрэбна. 2. Недастаткова апрацаваць; не закончыць працы над чым-н., апрацоўкі чаго-н.

**НЕДАПРАЦО́ЎКА**, -і. Загана, недахоп у працы.

**НЕДАПУШЧА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які нельга дапусціць, дазволіць; недазволены; такі, з якім нельга мірыцца.

**НЕДАРАВА́ЛЬНА**. Не заслугоўвае прабачэння.

**НЕДАРАВА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які нельга дараваць, прабачыць.

**НЕДАРМА́**. 1. Не без падставы, не без прычыны. 2. Не дарэмна.

**НЕДАРО́БКА**, -і. Незакончанасць, незавершанасць працы, справы.

**НЕДАРЭ́КА**, -і. 1. Някемлівы, няўмелы чалавек; адсталы чалавек. 2. Тое, што і н я ў к л ю д а. 3. Слабы, хваравіты, непрацаздольны чалавек; інвалід.

**НЕДАРЭ́ЧНА**. Неразумна, без сэнсу.

**НЕДАРЭ́ЧНАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць недарэчнага. 2. Недарэчны ўчынак, думка, паводзіны і пад.

**НЕДАРЭ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Сказаны, зроблены неўпапад, не да месца. 2. Неразумны, бяссэнсавы. 3. Няўклюдны, нескладны (знешне). 4. Які не адпавядае сітуацыі, абставінам.

**НЕДАРЭ́ЧЫ**. 1. Не ў час, у непадыходзячы момант; не да месца. 2. *у знач. вык.* Не адпавядае абставінам.

**НЕДАСВЕ́ДЧАНАСЦЬ**, -і. 1. Адсутнасць ведаў, звестак. 2. Адсутнасць, недахоп жыццёвага вопыту.

**НЕДАСВЕ́ДЧАНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае належных ведаў. 2. Нявопытны.

**НЕДАСКАНА́ЛАСЦЬ**, -і., Адсутнасць дасканаласці.

**НЕДАСКАНА́ЛЫ**, -ая, -ае. Які не дасягнуў дасканаласці; які не пазбаўлены недахопаў.

**НЕДАСТАТКО́ВА**. Менш, чым патрэбна; мала; не зусім добра, слаба.

**НЕДАСТАТКО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не адпавядае чаму-н., якім-н. патрэбам; слабы, малы. 2. Які патрабуе папаўнення; няпоўны; нездавальняючы; негрунтоўны; несур'ёзны.

**НЕДАСТУ́ПНАСЦЬ**, -і. Непрыступнасць.

**НЕДАСТУ́ПНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, да якога нельга наблізіцца; непрыступны. 2. Такі, да якога цяжка прыступіцца, ганарысты, фанабэрысты; строгай натуры (пра жанчын). 3. Недасяжны з прычыны якіх-н. абставін, умоў; цяжкі для разумення.

**НЕДАСЯГА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога нельга дасягнуць, нельга ажыццявіць. 2. Такі, з якім нельга зраўняцца.

**НЕДАЎМЕ́ННЕ**, -я. Здзіўленне, сумненне, стан нерашучасці як вынік неразумення чаго-н., няяснасці ў чым-н.

**НЕДАЎМЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Які выяўляе недаўменне, поўны недаўмення.

**НЕДАЎМЯВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Быць у недаўменні; выказваць, выяўляць недаўменне.

**НЕДАХО́П**, -у. 1. Памылка, хіба; недасканаласць; фізічная загана; ва́да; адмоўная рыса ў каго-н. 2. Адсутнасць не-

абходнай колькасці каго-, чаго-н.; патрэба ў кім-, чым-н.

**НЕДВУХСЭ́НСАВЫ** і **НЕДВУХСЭНСО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не дапускае дваякага разумення, тлумачэння.

**НЕДРУЖАЛЮ́БНАСЦЬ**, -і. Непрыязныя адносіны, непрыхільнасць.

**НЕДРУЖАЛЮ́БНЫ**, -ая, -ае. Які непрыязна, непрыхільна ставіцца да каго-н.; які выяўляе недружалюбнасць, непрыязнасць.

**НЕДУРНЫ́**, -ая, -ае. Даволі разумны.

**НЕДЫСЦЫПЛІНАВА́НАСЦЬ**, -і. Недысцыплінаваныя паводзіны.

**НЕДЫСЦЫПЛІНАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які парушае парадак, не захоўвае дысцыпліны; уласцівы такому чалавеку.

**НЕЖАДА́ННЕ**, -я. Адсутнасць жадання; ухіленне ад чаго-н.

**НЕЖАДА́НЫ** і **НЕПАЖАДА́НЫ**, -ая, -ае. Якога не жадаюць, які не адпавядае чыім-н. жаданням, інтарэсам.

**НЕЖЫЦЦЁВЫ**, -ая, -ае. Далёкі ад жыцця, ад рэчаіснасці; нерэальны.

**НЕЗАДАВАЛЬНЕ́ННЕ**, -я. Адмаўленне ў чым-н.

**НЕЗАДАВО́ЛЕНАСЦЬ**, -і. 1. Адсутнасць задаволенасці. 2. Пачуцці, перажыванні незадаволенага чалавека.

**НЕЗАДАВО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не атрымаў задавальнення. 2. Які адчувае незадаволенасць чым-н.; які выражае незадаволенасць.

**НЕЗАДО́ЎГА**. Не за многа часу да чаго-н., перад чым-н.

**НЕЗАЙЗДРО́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не адчувае зайздрасці. 2. Які не выклікае зайздрасці; дрэнны, няважны.

**НЕЗАКАНАМЕ́РНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць заканамернасці.

**НЕЗАКАНАМЕ́РНЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца выпадкова, не ў адпаведнасці з законам.

**НЕЗАКО́НЧАНАСЦЬ**, -і. Незавершанасць.

**НЕЗАКО́НЧАНЫ**, -ая, -ае. Які не даведзены да канца; незавершаны.

**НЕЗАЛЕ́ЖНА**. Нягледзячы на што-н., не прымаючы пад увагу чаго-н.; насуперак чаму-н.

**НЕЗАЛЕ́ЖНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не залежыць ад каго-, чаго-н.; самастойны, вольны; які выражае самастойнасць. 2. Суверэнны.

**НЕЗАЎВА́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Які не звярнуў на сябе ўвагі; якога не ўбачылі, не выявілі.

**НЕЗАЎВА́ЖНА**. Непрыкметна, неўзаметку.

**НЕЗАЦІКА́ЎЛЕНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць інтарэсу, цікавасці.

**НЕЗАЦІКА́ЎЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які не выяўляе цікавасці, увагі.

**НЕЗВЫЧА́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які вылучаецца сярод іншых; выключны; дзівосны, неверагодны; вельмі моцны па сіле праяўлення; надзвычайны.

**НЕЗГАВО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. З якім цяжка згаварыцца; упарты.

**НЕЗДАВАЛЬНЕ́ННЕ**, -я. Пачуццё непрыязнасці, неадабрэння ў адносінах да каго-, чаго-н.

**НЕЗДАВАЛЬНЯ́ЮЧЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае пэўным патрабаванням; дрэнны.

**НЕЗДАВО́ЛЕНАСЦЬ**, -і. Стан нездаволенага, яго пачуцці, перажыванні.

**НЕЗДАВО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які адчувае нездавальненне; які не атрымаў задавальнення ад каго-, чаго-н.; які выражае нездавальненне.

**НЕЗДАГА́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Няздольны хутка здагадвацца, прымаць правільнае рашэнне; някемлівы.

**НЕЗДАРМА́**. Не без падстаў, не без прычыны; з намерам, не так сабе.

**НЕЗДЗЯЙСНЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не можа быць выкананы, ажыццёўлены, спраўджаны.

**НЕЗЛАСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не выяўляе злосці; дабрадушны; які выражае незласлівасць, уласцівы дабрадушнаму чалавеку.

**НЕЗНАРО́К**. Выпадкова, ненаўмысна; ненарокам.

**НЕЗРАЗУМЕ́ЛА**. Аб магчымасці для каго-н. зразумець што-н.

**НЕЗРАЗУМЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які цяжка, немагчыма зразумець; які цяжка дакладна вызначыць, ахарактарызаваць; загадкавы, дзіўны.

**НЕЗЫЧЛІ́ВАСЦЬ**, -і. Непрыязныя адносіны да каго-, чаго-н.

**НЕЗЫЧЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не зычыць дабра людзям, праяўляе непрыязнасць, непрыхільнасць да каго-, чаго-н.

**НЕІСТО́ТНЫ**, -ая, -ае. Які не мае істотнага значэння; другарадны.

**НЕЙК** і **НЕ́ЯК**. 1. Якімсьці чынам, спосабам; чамусьці. 2. Аднойчы.

**НЕ́ЙКІ**, -ая, -ае. 1. Невядома які; незнаёмы; няясны; незразумелы, дакладна неакрэслены; якісьці. 2. Знаёмы, вядомы, да якога адносяцца з адценнем пагарды. 3. Не вызначаны дакладна (пра час, тэрмін, колькасць чаго-н.). 4. Пры параўнанні якіх-н. якасцей, адзнак.

**НЕЙМАВЕ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Які значна пераўзыходзіць звычайную ступень чаго-н. 2. Які цяжка сабе ўявіць; немагчымы.

**НЕЙТРАЛІЗАВА́ЦЦА**, -зу́ецца. Стаць (станавіцца) нейтральным.

**НЕЙТРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не мае выразных адзнак.

**НЕ́ЙЧЫ**, не́йчага, не́йчаму, не́йчы (не́йчага), не́йчым, аб не́йчым; не́йчая, не́йчай, не́йчую; не́йчае, не́йчага, не́йчае, аб не́йчым; не́йчыя. Які належыць невядома каму, невядома чый; чыйсьці.

**НЕ́КАГА**, не́каму, не́кага, не́кім, не аб кім. 1. Няма нікога, каб... 2. Кагосьці.

**НЕ́КАЛІШНІ**, -яя, -ае. Які быў калісьці раней, у мінулым; былы.

**НЕ́КАЛЬКІ**, -іх. Некаторая, няпэўная, невялікая колькасць.

**НЕКАРЭ́КТНЫ**, -ая, -ае. Нетактоўны ў абыходжанні з людзьмі; нявеtлівы, недалікатны.

**НЕКАТО́РЫ**, -ая, -ае. 1. Нейкі, дакладна не вызначаны. 2. *толькі мн.* (**некато́рыя**, -ых). Асобныя з агульнага ліку; паасобныя. 3. *у знач. наз.* **некаторыя**, -ых. Не ўсе, асобныя.

**НЕКРАНУ́ТЫ**, -ая, -ае. Такі, якога не кранапі, да якога не дакраналіся; цэлы, не разбураны.

**НЕ́КУДЫ**. 1. Кудысьці, невядома куды. 2. Няма такога месца, куды б можна было адправіцца, змясціць каго-, што-н.

**НЕКУЛЬТУ́РНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць некультурнага, нізкі ўзровень культуры; бескультурнасць.

**НЕЛАГІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які супярэчыць логіцы, пазбаўлены логікі; непаслядоўны, супярэчлівы ў сваіх думках, паводзінах і пад.

**НЕЛАДЫ́**, -оў. Непаразуменні паміж кім-н.; сваркі; няўдачы; непаладкі.

**НЕЛІТАРАТУ́РНЫ**, -ая, -ае. Які не належыць да літаратуры, да літаратурнай мовы.

**НЕ́ЛЬГА**. 1. Немагчыма; няма магчымасці. 2. Забаронена, не дазваляецца; няможна, не трэба.

**НЕ́ЛЮДЗЕНЬ**, -дня і **НЕ́ЛЮДЗЬ**, -я. Нелюдзімы чалавек.

**НЕЛЮДЗІ́М**, -а. 1. Нелюдзімы чалавек. 2. *толькі мн.* (не́людзі, -яў). Вылюдкі, звяры; ворагі.

**НЕЛЮДЗІ́МАСЦЬ**, -і. Панурасць, схільнасць да адзіноты.

**НЕЛЮДЗІ́МЫ**, -ая, -ае. Які пазбягае людзей, які аддае перавагу адзіноце.

**НЕ́МА**. 1. Дзіка, роспачна (крычаць, галасіць, раўці і пад.). 2. Моўчкі, без слоў.

**НЕМАВЕ́ДАМА** (у спалучэнні са словамі «што», «як», «адкуль», «куды» і пад.). Невядома, незразумела.

**НЕМАГЧЫ́МА**. Няма магчымасці, нельга.

**НЕМАГЧЫ́МАСЦЬ**, -і. 1. Адсутнасць умоў, неабходных для ажыццяўлення чаго-н. 2. Невыканальнасць, нездзяйсняльнасць чаго-н.

**НЕМАГЧЫ́МЫ** і **НЕМАЖЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Неажыццявімы, невыканальны. 2. Такі, што нельга вынесці, выцерпець; нясцерпны.

**НЕМАЛАВА́ЖНЫ**, -ая, -ае. Даволі важны, значны.

**НЕМАЛАДЫ́**, -а́я, -о́е. Сярэдніх год; пажылы.

**НЕМАЛЕ́НЬКІ**, -ая, -ае. Досыць вялікі, значны.

**НЕМАЛЫ́**, -а́я, -о́е. 1. Даволі вялікі, значны па велічыні, памерах, колькасці; даволі працяглы (пра тэрмін, час і пад.). 2. Значны па сіле, інтэнсіўнасці, глыбіні праяўлення. 3. Які мае даволі вялікае значэнне, важны, значны.

**НЕ́МАРАЧ**, -ы. Глухое, цёмнае месца; цемра.

**НЕ́МАСЦЬ**, -і і **НЕМАТА́**, -ы. 1.

Адсутнасць дару мовы. 2. Нямая цішыня. 3. Бяспраўе, прыгнечанасць.

**НЕМАЎЛЯ́**, -ля́ці; -ля́ты, -ля́т. Малое дзіця.

**НЕ́МАЧ**, -ы. 1. Недамаганне, слабасць; хвароба. 2. Гора, няшчасце.

**НЕМІЛАГУ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены мілагучнасці; негарманічны.

**НЕМІЛАСЭ́РНАСЦЬ**, -і. Няздольнасць да праяўлення міласэрнасці; жорсткасць.

**НЕМІЛАСЭ́РНЫ**, -ая, -ае. Бязлітасны, суровы; які выражае неміласэрнасць.

**НЕМІНУ́ЧАСЦЬ**, -і. Непазбежнасць.

**НЕМІНУ́ЧЫ**, -ая, -ае. Такі, якога нельга мінуць; непазбежны.

**НЕМНАГАЛЮ́ДНЫ**, -ая, -ае. З малой колькасцю людзей.

**НЕМНАГАСЛО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Лаканічны, які перадаецца невялікай колькасцю слоў. 2. Які сцісла выказвае свае думкі.

**НЕМУДРАГЕ́ЛІСТЫ**, -ая, -ае. Самы звычайны, просты; прымітыўны, нескладаны.

**НЕ́МЫ**, -ая, -ае. Дзікі, роспачны.

**НЕМЭТАЗГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены мэтазгоднасці.

**НЕНАВІ́ДЗЕЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Адчуваць нянавісць да каго-, чаго-н.

**НЕНАВІ́ДНЫ і НЕНАВІ́СНЫ**, -ая, -ае. Які выклікае нянавісць, агіду; які выражае нянавісць, поўны нянавісці.

**НЕНАВІ́СНІК**, -а. Чалавек, які ненавідзіць каго-, што-н.

**НЕНАВІ́СНІЦТВА**, -а. Адносіны, поўныя нянавісці.

**НЕНАГЛЯ́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Каханы, самы дарагі. 2. Такі, на якога нельга наглядзецца, якім нельга налюбавацца; вельмі прыгожы.

**НЕНАДЗЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якому нельга верыць, даверыцца; на якога нельга спадзявацца. 2. Які выклікае апасенне сваёй якасцю, трываласцю і пад.

**НЕНАДО́ЎГА**. На кароткі час.

**НЕНАРМА́ЛЬНАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць і стан ненармальнага; адхіленне ад нормы. 2. Ненармальная з'ява.

**НЕНАРМА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адхіленні ад нормы. 2. Душэўнахворы; псіхічна неўраўнаважаны.

**НЕНАРО́КАМ**. Выпадкова, ненаўмысна; незнарок.

**НЕНАСЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога цяжка накарміць; пражэрлівы. 2. Які не можа здаволіцца дасягнутым, тым, што мае; прагны.

**НЕНАТО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, што цяжка наталіць.

**НЕНАТУРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Штучны; не прыроднага паходжання. 2. Такі, якога не бывае ў прыродзе, які выходзіць за межы звычайнага. 3. Фальшывы, штучны; няшчыры.

**НЕНАЎМЫ́СНЫ**, -ая, -ае. Які зроблены або адбываецца без намеру; загадзя не абдуманы, выпадковы.

**НЕНАЦІСКНЫ́**, -ая, -ое. Які не мае на сабе націску.

**НЕПАВА́ГА**, -і. Адсутнасць павагі да каго-, чаго-н.; непачцівыя адносіны да каго-, чаго-н.

**НЕПАВАРО́ТЛІВАСЦЬ**, -і. Маруднасць, няспрытнасць, нерухавасць.

**НЕПАВАРО́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. Павольны, марудны, няспрытны ў рухах; някемлівы, нерухавы (у справах).

**НЕ́ПАГАДЗЬ**, -і. Зацяжная непагода.

**НЕПАГО́ДА**, -ы. Хмарнае з дажджом або снегам надвор'е.

**НЕПАГО́ДЛІВЫ і НЕПАГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Які вызначаецца дажджлівым, слотным надвор'ем.

**НЕПАГО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які даўно не галіўся.

**НЕПАДАБЕ́НСТВА**, -а. Адсутнасць падабенства; розніца.

**НЕПАДАЛЁК і НЕПАДАЛЁКУ**. На нязначнай адлегласці; паблізу.

**НЕПАДА́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не паддаецца або з цяжкасцю паддаецца ўздзеянню. 2. Няўступчывы, упарты; стойкі; непахісны.

**НЕПАДКУ́ПНЫ**, -ая, -ае. Такі, якога нельга падкупіць; чэсны.

**НЕПАДО́БНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць падабенства.

**НЕПАДО́БНЫ**, -ая, -ае. Які не мае падабенства з кім-, чым-н.

**НЕПАДПАРА́ДКАВАННЕ**, -я. Ад-

маўленне або нежаданне падпарадкавацца.

**НЕПАДРО́БЛЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Сапраўдны. 2. Шчыры, непрытворны; натуральны.

**НЕПАДРО́БНЫ**, -ая, -ае. Тое, што і непадроблены (у 2 знач.).

**НЕПАДРЫХТАВА́НАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан непадрыхтаванага; адсутнасць падрыхтоўкі.

**НЕПАДРЫХТАВА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае, не атрымаў неабходнай падрыхтоўкі. 2. Не гатовы, не прыгодны для чаго-н.

**НЕПАДСТУ́ПНЫ**, -ая, -ае. Такі, да якога нельга звярнуцца з просьбай, пытаннем; ганарысты; фанабэрысты; які ўласцівы такому чалавеку.

**НЕПАДУЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. Які не знаходзіцца пад уладай, уплывам каго-, чаго-н.

**НЕПАДЫХО́ДЗЯЧЫ**, -ая, -ае. Які не падыходзіць, не адпавядае каму-, чаму-н.; непрыгодны.

**НЕПАЖАДА́НЫ**, -ая, -ае. Якога не жадаюць, які не адпавядае чым-н. жаданням, інтарэсам.

**НЕПАЗБЕ́ЖНЫ**, -ая, -ае. Які вынікае з пэўных, канкрэтных абставін; якога нельга пазбегнуць; немінучы.

**НЕПАЗБЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Такі, які не праходзіць, ад якога цяжка пазбавіцца.

**НЕПАЗНАВА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які змяніўся настолькі, што яго цяжка пазнаць. 2. Недаступны пазнанню.

**НЕПАЗНА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Які яшчэ не вывучаны. 2. Якога яшчэ не пазналі, не апазналі.

**НЕПАКО́ІЦЦА**, -ко́юся, -ко́ішся, -ко́іцца. 1. Адчуваць неспакой, трывогу; хвалявацца. 2. Праяўляць клопат, турбавацца.

**НЕПАКО́ІЦЬ**, -ко́ю, -ко́іш, -ко́іць. Выклікаць, абуджаць непакой, хваляванне. 2. Парушаць чый-н. спакой, турбаваць каго-н., перашкаджаць каму-н.; прычыняць боль.

**НЕПАКО́Й**, -ю. 1. Стан душэўнай трывогі, хвалявання. 2. Турботы, клопаты.

**НЕПАКО́РА**, -ы. 1. Непакорнасць, непадуладнасць каму-н. 2. Такі, якога немагчыма скарыць. 3. Упарты чалавек; неслух.

**НЕПАКО́РЛІВЫ і НЕПАКО́РНЫ**, -ая, -ае. Які не хоча пакарацца, быць падуладным; які не паддаецца або з цяжкасцю паддаецца ўздзеянню; непаслухмяны.

**НЕПАЛА́ДКІ**, -дак і -каў. Непаразуменні, сваркі; нелады.

**НЕПАЛАХЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Якога цяжка напалохаць; даволі смелы.

**НЕПАМЕ́РНЫ**, -ая, -ае. Які не паддаецца вымярэнню; вельмі вялікі; празмерны.

**НЕПАМЫ́СНА**. 1. Прыкра, непрыемна. 2. Аб пачуцці прыкрасці, незадавальнення.

**НЕПАМЯРКО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца памяркоўнасцю; з якім цяжка згаварыцца, упарты.

**НЕПАПРА́ЎНАСЦЬ**, -і. Немагчымасць паправіць, выправіць што-н.

**НЕПАПРА́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які немагчыма або цяжка паправіць, выправіць.

**НЕПАРА́ДАК**, -дку. Адсутнасць або парушэнне парадку; беспарадак.

**НЕПАРАЗУМЕ́ННЕ**, -я. 1. Няправільнае або недастатковае разуменне чаго-н., выпадковая памылка. 2. Адсутнасць узаемнага разумення.

**НЕПАРАЎНА́ЛЬНА**. Значна, у шмат разоў.

**НЕПАРАЎНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што цяжка параўнаць з кім-, чым-н. іншым; надзвычайны. 2. Які так адрозніваецца ад чаго-н., што нельга параўноўваць.

**НЕПАРУ́ШНЫ**, -ая, -ае. 1. Якога нельга парушыць; моцны. 2. Які захоўваецца ў цэласці.

**НЕПАРЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога нельга раздзяліць на часткі; суцэльны. 2. Якога нельга раз'яднаць; непарушны.

**НЕПАСЕ́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не можа ўседзець або пабыць на адным месцы; уласцівы такому чалавеку.

**НЕПАСЛУХМЯ́НЫ**, -ая, -ае. Такі, які не слухаецца, не жадае слухаць каго-н.; які дзейнічае насуперак; які не падпарадкоўваецца волі, жаданню, розуму; які не паддаецца або з цяжкасцю паддаецца якому-н. уздзеянню.

**НЕПАСЛУШЭ́НСТВА**, -а. Нежаданне або адмаўленне слухацца, слухаць каго-н.; адмаўленне падпарадкавацца каму-н.

**НЕПАСЛЯДОЎНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены паслядоўнасці; нелагічны; які не кіруецца паслядоўнасцю.

**НЕПАСРЭ́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Які робіць усё без сумнення, кіруючыся толькі ўнутранымі схільнасцямі; просты, шчыры; які праяўляецца натуральна, вольна, раскавана.

**НЕПАСТАЯ́ННЫ**, -ая, -ае. 1. Няўстойлівы, зменлівы. 2. Які часта мяняе свае погляды, звычкі, адносіны да каго-н.

**НЕПАТРАБАВА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Сціплы ў сваіх патрэбах; просты, без прэтэнзій. 2. Які не прад'яўляе высокіх патрабаванняў да каго-н.; які не вызначаецца патрабавальнасцю.

**НЕПАТРЭ́БНЫ**, -ая, -ае. Такі, у якім няма патрэбы; лішні.

**НЕПАТРЭ́БШЧЫНА**, -ы. 1. Тое, у чым няма патрэбы, неабходнасці; непатрэбныя рэчы, хлам. 2. Глупства, бязглуздзіца, лухта.

**НЕПАЎТО́РНЫ**, -ая, -ае. Адзіны ў сваім родзе; выключны, асаблівы.

**НЕПАХІ́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што нельга пахіснуць; устойлівы. 2. Цвёрды, стойкі (у сваіх намерах, пераканаexisting і пад.); які ўласцівы такому чалавеку; які выяўляе стойкасць, непахіснасць.

**НЕПАЧЦІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які адносіцца да людзей без пачцівасці, павагі; недалікатны; які выражае непачцівасць.

**НЕПАША́НА**, -ы. Непачцівыя, нявtotлівыя адносіны да каго-, чаго-н.

**НЕПЕРАБО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не вылучаецца пераборлівасцю, строгасцю ў выбары; які нічым не грэбуе.

**НЕПЕРАКАНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які пазбаўлены пераканальнасці; неабгрунтаваны, бяздоказны.

**НЕПЕРАМО́ЖНЫ**, -ая, -ае. Якога нельга перамагчы; якому цяжка процістаяць; непераадольны.

**НЕПЕРАЎЗЫ́ДЗЕНЫ**, -ая, -ае. Якога нельга пераўзысці, перавысіць.

**НЕПРАГЛЯ́ДНЫ**, -ая, -ае. Такі цёмны або густы, што нічога нельга разгледзець; бязрадасны.

**НЕПРАДБА́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Такі, якога нельга было прадбачыць; нечаканы.

**НЕПРАДБА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не ўяўляе магчымых вынікаў; недальнабачны.

**НЕПРАДУГЛЕ́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Які нельга было прадугледзець; незапланаваны.

**НЕПРАДУЗЯ́ТЫ**, -ая, -ае. Вольны ад прадузятасці; справядлівы.

**НЕПРАЎДАПАДО́БНЫ**, -ая, -ае. Які не падобны на праўду, не адпавядае рэчаіснасці.

**НЕПРАЎДЗІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не гаворыць праўды; ілжывы; далёкі ад праўды.

**НЕПРЫВА́БНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены прывабнасці.

**НЕПРЫВЕ́ТЛІВЫ** і **НЕПРЫВЕ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не праяўляе гасціннасці, сардэчнасці; які выражае нявetлівасць. 2. Хмурны, пануры (аб з'явах прыроды і прадметах).

**НЕПРЫВЫ́КЛЫ**, -ая, -ае. Які не прывык да каго-, чаго-н.

**НЕПРЫВЫ́ЧКА**, -і. Адсутнасць прывычкі.

**НЕПРЫВЫ́ЧНА**. Аб пачуцці непрывычнага, якое адчувае хто-н.

**НЕПРЫВЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, да якога не прывыклі; які з'яўляецца новым для каго-н. 2. Які не мае прывычкі, звычкі да чаго-н.

**НЕПРЫГЛЯ́ДНЫ**, -ая, -ае. Непрывабны з выгляду; несамавіты; дрэнны, якому нельга пазайздросціць.

**НЕПРЫГО́ЖЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены прыгажосці; непрыемны па сваім гучанні (пра голас, музыку, гукі і пад.). 2. Які мае непрывабную знешнасць (пра чалавека). 3. Заганны, нядобры, несумленны.

**НЕПРЫДА́ТНЫ**, -ая, -ае. Які не падыходзіць для чаго-н.; нягодны.

**НЕПРЫЕ́МНАСЦЬ**, -і. 1. Пачуццё нездавальнення, прыкрасці і пад. 2. Непрыемнае здарэнне, паведамленне і пад.

**НЕПРЫЕ́МНЫ**, -ая, -ае. Які не падабаецца сваімі якасцямі, уласцівасцямі і пад.; які выклікае нездавальненне,

прыкрасць, засмучэнне; які выклікае хваляванне, парушае спакой.

**НЕПРЫЗВЫЧА́ЕНЫ**, -ая, -ае. Які не мае звычкі да чаго-н.

**НЕПРЫЗНА́НЫ**, -ая, -ае. Які не атрымаў прызнання, не стаў вядомы, папулярны.

**НЕПРЫКМЕ́ТНА**. 1. Так, што цяжка заўважыць, няўлоўна; паступова, павольна. 2. Нельга заўважыць, убачыць.

**НЕПРЫКМЕ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які цяжка заўважыць, прыкмеціць; які не кідаецца ў вочы; які ледзь адчуваецца, нязначны, невялікі. 2. Які не вылучаецца сярод іншых; нявідны.

**НЕПРЫМА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, якога нельга прыняць, з якім нельга пагадзіцца.

**НЕПРЫМА́ННЕ**, -я. Немагчымасць або нежаданне прыняць, прызнаць што-н., пагадзіцца з чым-н. (пра думкі, погляды, прынцыпы і пад.).

**НЕПРЫНЦЫПО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не вынікае з прынцыпаў, далёкі ад прынцыпаў; неістотны, другарадны. 2. Які не прытрымліваецца прынцыпаў, не кіруецца імі.

**НЕПРЫНЯ́ЦЦЕ**, -я. Адмаўленне ад прыняцця чаго-н.

**НЕПРЫСТАСАВА́НАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан непрыстасаванага; няўменне прыстасавацца.

**НЕПРЫСТАСАВА́НЫ**, -ая, -ае. Няздольны прыстасавацца да чаго-н.; непрыдатны, непадыходзячы для чаго-н.

**НЕПРЫСТО́ЙНА**. У супярэчнасці з прыстойнасцю.

**НЕПРЫСТО́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае правілам прыстойнасці.

**НЕПРЫСТУ́ПНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і якасць непрыступнага.

**НЕПРЫСТУ́ПНЫ**, -ая, -ае. Да якога цяжка падступіцца; ганарысты.

**НЕПРЫТО́МНАСЦЬ**, -і. 1. Страта прытомнасці, выкліканая хваравітым станам або душэўным узрушэннем. 2. Крайняя ступень душэўнага ўзрушэння, пры якой трацідца здольнасць валодаць сабой.

**НЕПРЫТУ́ЛЬНЫ** і **НЯЎТУ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены ўтульнасці.

**НЕПРЫХАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які праяўляецца адкрыта, не хаваецца.

**НЕПРЫХІ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Непрыязна настроены; які праяўляе недружалюбнасць; які змяшчае ў сабе або выказвае неадабрэнне.

**НЕПРЫЯ́ЗНАСЦЬ** і **НЕПРЫЯ́ЗЬ**, -і. Недружалюбныя адносіны да каго-, чаго-н.

**НЕПРЫЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Які недружалюбна настроены ў адносінах да каго-, чаго-н.; які выражае або праяўляе непрыязнасць, недружалюбнасць.

**НЕ́ПРЫЯЦЕЛЬ**, -я. Чалавек, які непрыязна, варожа адносіцца да каго-, чаго-н.

**НЕПРЭТЭНЦЫЁЗНЫ**, -ая, -ае. Які не прэтэндуе на арыгінальнасць; просты.

**НЕРАЗБО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца разборлівасцю, патрабавальнасцю.

**НЕРАЗБЯРЫ́ХА**, -і. Адсутнасць парадку, яснасці ў чым-н.; беспарадак.

**НЕРАЗВА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Такі, якому не ўласціва развáжлівасць; які робіцца без папярэдняй развагі; неабдуманы.

**НЕРАЗУМЕ́ННЕ**, -я. Адсутнасць разумення; няздольнасць зразумець што-н.

**НЕРАЗУ́МНЫ**, -ая, -ае. Які не выяўляе дастатковай кемлівасці; разумова абмежаваны, тупы; які супярэчыць разважлівасці, цвярозай думцы; бяссэнсавы.

**НЕРАСКРЫ́ТЫ**, -ая, -ае. Які застаўся нерастлумачаным, нявыяўленым.

**НЕРАСТАРО́ПНЫ**, -ая, -ае. Някемлівы ў справах; непаваротлівы.

**НЕРАШУ́ЧЫ**, -ая, -ае. Якому не ўласціва рашучасць; які выражае адсутнасць рашучасці.

**НЕРВАВА́ЦЦА**, нерву́юся, -у́ешся, -у́ецца. Быць ва ўзбуджаным стане; хвалявацца, злавацца.

**НЕРВАВА́ЦЬ**, нерву́ю, -у́еш, -у́е. 1. Даводзіць каго-н. да нервовага стану. 2. Тое, што і н е р в а в а ц ц а.

**НЕРВО́ВА**. 1. Узбуджана, усхвалявана; раздражнёна. 2. Хваравіта, сутаргава.

**НЕРВО́ВАСЦЬ**, -і. Павышаная ўзбуджальнасць нервовай сістэмы, хваравітая ўражлівасць.

**НЕРВО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае ад-

носіны да нерва, нерваў. **2.** Які выкліканы захворваннем нерваў, які ўзнік у выніку расстройства дзейнасці нервовай сістэмы. **3.** Звязаны з узбуджальнасцю, раздражненнем нерваў. **4.** Якога лёгка расхваляваць; хваравіта раздражнёны, неспакойны.

**НЕРВО́ЗНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан нервознага; хваравітая раздражнёнасць.

**НЕРВО́ЗНЫ**, -ая, -ае. **1.** Які мае павышаную ўзбуджальнасць. **2.** Звязаны з раздражненнем, узбуджанасцю нерваў; які выражае, выдае нервознасць, узбуджанасць, раздражнёнасць. **2.** Неспакойны, трывожны.

**НЕРУПЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не праяўляе руплівасці, нядбайна ставіцца да чаго-н.; які сведчыць пра адсутнасць руплівасці.

**НЕРУХА́ВЫ**, -ая, -ае. Непаваротлівы, марудлівы.

**НЕРУХО́МАСЦЬ**, -і. Стан, які характарызуецца адсутнасцю рухаў.

**НЕРУХО́МЫ**, -ая, -ае. **1.** Які не рухаецца, застаецца ўвесь час на адным месцы. **2.** Які не змяняе свайго выразу.

**НЕРЫТМІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які пазбаўлены рытму, рытмічнасці.

**НЕРЭА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. **1.** Які не існуе ў рэчаіснасці; фантастычны. **2.** Немагчымы для здзяйснення, выканання; неажыццявімы.

**НЕСАЛІ́ДНЫ**, -ая, -ае. Які не мае саліднасці.

**НЕСАМАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. **1.** Непрывабны з выгляду; непрыгожы. **2.** Не зусім добры, дрэнны; які не заслугоўвае пахвалы, адабрэння.

**НЕСАМАСТО́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які дзейнічае пад уплывам чужой волі; пазбаўлены самастойнасці.

**НЕСАМАХО́ЦЬ**. Мімаволі, незнарок.

**НЕСАПРА́ЎДНЫ**, -ая, -ае. **1.** Падроблены, штучны. **2.** Які толькі вонкава падобны да сапраўднага.

**НЕСАПСАВА́НЫ**, -ая, -ае. **1.** Спраўны, не пашкоджаны. **2.** Маральна чысты, здаровы.

**НЕСВЯДО́МЫ**, -ая, -ае. **1.** Які не ўсведамляе сваіх адносін да рэчаіснасці; якому не ўласціва ўсведамленне сваіх абавязкаў. **2.** Які адбываецца без кантролю, свядомасці; інстынктыўны.

**НЕСІМПАТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не выклікае да сябе сімпатыі; непрывабны.

**НЕСКАНЧО́НЫ**, -ая, -ае. Надзвычай доўгі; працяглы, бясконцы; які не спыняецца; пастаянны.

**НЕ́СЛУХ**, -а. Непаслухмяны, свавольны чалавек (часцей пра дзяцей).

**НЕСПАГА́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Нясхільны да спагады; нячулы; няўважлівы да іншых; які выяўляе адсутнасць спагады, чуласці.

**НЕСПАДЗЕ́ЎКА**, -і. Нечаканы, непрадбачаны выпадак; здарэнне і пад.

**НЕСПАДЗЕ́ЎКІ**. Нечакана, раптоўна.

**НЕСПАДЗЯВА́НАСЦЬ**, -і. Нечаканае здарэнне, выпадак і пад.

**НЕСПАДЗЯВА́НЫ**, -ая, -ае. Нечаканы, непрадбачаны; які вельмі хутка ўзнік; раптоўны.

**НЕСПАЗНА́НЫ**, -ая, -ае. Не перажыты раней, незнаёмы; недаследаваны, нявывучаны.

**НЕСПАКО́Й**, -ю. **1.** Душэўная трывога, узбуджэнне, выкліканыя чым-н. (страхам, чаканнем і пад.); шум, рух, хваляванне. **2.** Масавае хваляванне, узбуджэнне. **3.** Турботы, клопаты.

**НЕСПАКО́ЙНА**. **1.** Аб стане неспакою, хвалявання, які адчуваецца кім-н. **2.** Пра адсутнасць спакою дзе-н.

**НЕСПАКО́ЙНЫ**, -ая, -ае. **1.** Які не жадае спакою; няўрымслівы, мяцежны; які ўласцівы такому чалавеку. **2.** Які адчувае і выказвае трывогу, хваляванне; які выражае трывогу. **3.** Поўны трывогі, неспакою; такі, на якім няма спакою. **4.** Які знаходзіцца ў хваляванні, бурны (пра з'явы прыроды).

**НЕСПАКУ́ШАНЫ**, -ая, -ае. Які не мае вопыту, ведаў; недасведчаны.

**НЕСПРАВЯДЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які адступаецца ад справядлівасці, парушае яе; які супярэчыць справядлівасці, не адпавядае патрабаванням справядлівасці.

**НЕСПРАКТЫКАВА́НАСЦЬ**, -і. Адсутнасць або недахоп ведаў, вопыту.

**НЕСПРАКТЫКАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які не мае дастатковага вопыту, умення, ведаў.

**НЕСПРЫЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае пажаданым або неабходным патрабаванням; дрэнны.

**НЕСТАРЫ́**, -а́я, -óе. Сярэдніх гадоў, параўнальна малады.

**НЕСУЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены суладнасці; нязладжаны.

**НЕСУМЛЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Які страціў сумленнасць, які ідзе на непрыстойныя ўчынкі; які выяўляе адсутнасць сумленнасці.

**НЕСУМНЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Бясспрэчны; які не выклікае сумненняў.

**НЕСУМЯШЧА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не можа існаваць, спалучацца з чым-н.

**НЕСУПАДЗЕ́ННЕ**, -я. Адсутнасць супадзення.

**НЕСУПЫ́ННЫ** і **НЯСПЫ́ННЫ**, -ая, -ае. 1. Які адбываецца бесперастанку, без перарыву; які не спыняецца. 2. Які рухаецца суцэльнай паласой, плынню.

**НЕСУРАЗМЕ́РНЫ**, -ая, -ае. Які пазбаўлены суразмернасці, прапарцыянальнасці.

**НЕСУР'Ё́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Якому не ўласцівы сур'ёзнасць, сур'ёзныя адносіны да жыцця; легкадумны. 2. Які не мае сур'ёзнага значэння; нязначны.

**НЕСУСВЕ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які здзіўляе недарэчнасцю, бязглуздзіцай. 2. Вельмі моцны ў сваім праяўленні; незвычайны.

**НЕСУСВЕ́ЦІЦА**, -ы. 1. Што-н. недарэчнае, бязглуздае, незразумелае. 2. Нешта вельмі моцнае, незвычайнае ў сваім выяўленні; немаведама што.

**НЕСУЦЕ́ШНЫ**, -ая, -ае. Якога цяжка або немагчыма суцешыць; моцны па сіле праяўлення; які не паддаецца суцяшэнню.

**НЕСУЦІ́ШНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не змаўкае, не спыняе свайго шуму, гулу. 2. Які не сціхае; няспынны. 3. Такі, якога нельга суцішыць, стрымаць (пра боль).

**НЕСУЦЯША́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які не прыносіць суцяшэння, заспакаення; які цяжка, нельга суцешыць.

**НЕСХАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які праяўляецца зусім адкрыта; нястоены.

**НЕ́СЦІСЯ**, нясýся, нясéшся, нясéцца; нясёмся, несяцéся. 1. Хутка рухацца, імчацца ўперад. 2. Распаўсюджвацца (пра гукі, пахі); распаўсюджвацца, станавіцца вядомым (пра чуткі, звесткі і пад.).

**НЕСЦІХА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Які не сціхае, не змаўкае, не спыняецца доўгі час; які чуваць бесперапынна. 2. Які не праходзіць, не сунімаецца (пра боль і пад.).

**НЕТАВАРЫ́СКІ**, -ая, -ае. 1. Які не ўласцівы таму, каго лічаць сваім таварышам. 2. Які ўнікае людзей, не схільны да таварыскіх адносін.

**НЕТАКТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які не ўмее паводзіць сябе прыстойна, з тактам; бестактоўны; які сведчыць аб адсутнасці такту, тактоўнасці.

**НЕТАРО́ПКІ**, -ая, -ае. Які ўсё робіць не спяшаючыся, з развагай; няспешны; уласцівы таму, хто не спяшаецца, хто робіць усё няспешна.

**НЕТРЫВА́ЛЫ**, -ая, -ае. Няўстойлівы, ненадзейны, хісткі.

**НЕЎГАМО́НЛІВЫ** і **НЕЎГАМО́ННЫ**, -ая, -ае. 1. Які не можа супакоіцца, утаймавацца; вельмі рухавы; які не спыняецца, не змаўкае. 2. Неспакойны, турботны.

**НЕЎЗАБА́ВЕ**. Хутка, у хуткім часе.

**НЕЎЗАМЕ́ТКУ**. Так, што цяжка заўважыць; скрытна; непрыкметна, незаўважна.

**НЕЎЗДАГА́Д**. Не здагадацца, не зразумець; не прыйшло ў галаву.

**НЕЎЗЛЮБІ́ЦЬ**, неўзлюблю́, няўзлю́біш, няўзлю́біць. Адчуць непрыхільнасць, непрыязнасць да каго-, чаго-н.

**НЕЎЗНАКІ́**. Непрыкметна, неўзаметкý.

**НЕЎЛАДКАВА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Не прыведзены да ладу; неўпарадкаваны. 2. Не забяспечаны ўсім неабходным.

**НЕЎЛАСЦІ́ВЫ**, -ая, -ае. Не характэрны каму-, чаму-н.; нязвычны для каго-, чаго-н.

**НЕЎМІРУ́ЧЫ**, -ая, -ае. 1. Які жыве вечна, не паддаецца смерці. 2. Які застаецца назаўсёды ў памяці людзей; які не забываецца.

**НЕЎПАПА́Д**. Недарэчы, не да месца.

**НЕЎПАРАДКАВА́НАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан неўпарадкаванага.

**НЕЎПАРАДКАВА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Не прыведзены ў парадак; пазбаўлены парадку. 2. Не забяспечаны ўсім неабходным; неўладкаваны.

**НЕЎПРАВАРО́Т**. Вельмі шмат, у вельмі вялікай колькасці.

**НЕЎПРЫКМЕ́Т**. Тое, што і н е п р ы к м е т н а (у 1 знач.).

**НЕЎРАЗУМЕ́ННЕ**, -я. Здзіўленне, азадачанасць з прычыны неразумення чаго-н., сумнення ў чым-н.

**НЕЎРАЗУМЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Які выражае неўразуменне.

**НЕЎРАСТЭ́НІК**, -а. Сцэнічнае амплуа; акцёр, які выконвае ролі хваравітанервовых, неўраўнаважаных, бязвольных людзей, якія лёгка паддаюцца розным уплывам і настроям або знаходзяцца ў стане вострага душэўнага крызісу.

**НЕЎРАЎНАВА́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Якому не ўласціва душэўная раўнавага; які лёгка паддаецца настрою.

**НЕЎСВЯДО́МЛЕНЫ**, -ая, -ае. Якога поўнасцю не ўсвядомілі, не зразумелі; бессвядомы.

**НЕЎСПРЫІ́МЛІВЫ**, -ая, -ае. Які дрэнна ўспрымае, засвойвае, разумее што-н.

**НЕЎСТАЛЯВА́НЫ**, -ая, -ае. Неўладкаваны, неналаджаны.

**НЕЎТАЙМАВА́НЫ** і **НЕЎТАЙМО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Якога цяжка, немагчыма ўтаймаваць, стрымаць, сцішыць; уласцівы такому чалавеку; надзвычайны ў сваім праяўленні, вельмі моцны.

**НЕ́ХАЦЯ**. Неахвотна, без жадання; без намеру, незнарок, міжвольна.

**НЕХЛЯМЯ́ЖЫ**, -ая, -ае. Несамавіты; нязграбны, няўклюдны; дрэнна, непрыгожа зроблены (аб рэчах, прадметах).

**НЕ́ХРЫСЦЬ**, -я. 1. Чалавек нехрысціянскай веры, а таксама чалавек, які не верыць у Бога. 2. Бессаромны, бессардэчны чалавек.

**НЕХРЫШЧО́НЫ**, -ая, -ае. Такі, якога не ахрысцілі.

**НЕ́ХТА**, не́кага, не́каму, не́кага, не́кім, аб не́кім. 1. Нейкі чалавек, нейкая істота; невядома хто. 2. Якісьці мала каму вядомы чалавек (у спалучэнні з прозвішчам, імем). 3. Які-н. чалавек, усё роўна хто; хто-н.

**НЕЦВЯРО́ЗЫ**, -ая, -ае. 1. Які знаходзіцца ў стане ап'янення; п'яны. 2. Пазбаўлены разумнага падыходу да каго-, чаго-н.

**НЕЦІКА́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не выклікае цікавасці. 2. Непрыгожы.

**НЕЦЯРПІ́МЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што нельга цярпець; недапушчальны. 2. Які па сваёй натуры не можа мірыцца з кім-, чым-н., прызнаваць, цярпець каго-, што-н.; які вызначаецца нецярпімасцю.

**НЕЦЯРПЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Такі, якому не ўласціва цярпенне; які выражае нецярпенне.

**НЕЧАКА́НАСЦЬ**, -і. 1. Раптоўнасць. 2. Нечаканая падзея, з'ява, нечаканыя абставіны і інш.

**НЕЧАКА́НЫ**, -ая, -ае. Такі, якога не чакалі; непрадбачаны; які ўзнік вельмі хутка; раптоўны.

**НЕЧАЛАВЕ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены чалавечнасці; негуманны, бесчалавечны.

**НЕЧАЛАВЕ́ЧЫ**, -ая, -ае. 1. Не ўласцівы чалавеку. 2. Які перавышае чалавечыя магчымасці. 3. Бесчалавечны.

**НЕЧУВА́НЫ**, -ая, -ае. Які перасягае ўсё вядомае сваёй незвычайнасцю; небывалы.

**НЕЧУЛЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Са слабай успрыімлівасцю да знешніх раздражняльнікаў; пазбаўлены чуллівасці.

**НЕ́ЧЫ**, не́чага, не́чаму, не́чы (не́чага), не́чым, аб не́чым; не́чая, не́чай; не́чую; не́чае, не́чага, не́чаму, не́чае, не́чым, аб не́чым; не́чыя. Які належыць невядома каму, невядома чый; чыйсьці.

**НЕ́ЧЫСЦЬ**, -і. 1. Нячыстая сіла, чэрці, ведзьмы і пад. 2. Пра ганебных людзей, якія ўвасабляюць сабою варожае, цёмнае.

**НЕЧЫТА́ЛЬНЫ** і **НЕЧЫТЭ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які цяжка прачытаць, разабраць.

**НЕШЧАСЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Нешчаслівы чалавек; няўдачнік.

**НЕШЧАСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які прыносіць няшчасце, гора; поўны няшчасця. 2. Такі, якому не дадзена шчасця, радасці; няшчасны. 3. Які не прынёс або не прыносіць удачы. 4. Такі, якому не спрыяе поспех, шчасце.

**НЕЭТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не адпавядае правілам этыкі.

**НЕ́ЯК**. 1. Нейкім чынам, спосабам; чамусьці. 2. Аднойчы.

**НЕЯСКРА́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены яскравасці. 2. Няясны, невыразны.

**НІАДКУ́ЛЬ**. Ні з якога месца, ні з якога боку.

**НІБЫ́** і **НІБЫ́ТА**. Ужываецца ў параўнальных зваротах і сказах пры дапушчальным параўнанні рэальнага характару; па значэнні адпавядае злучніку «як».

**НІВО́ДЗІН** і **НІВО́ДНЫ**, нівóднага. Ні адзін.

**НІДЗЕ́**. Няма ні ў якім месцы.

**НІЗАВО́ШТА** і **НІЗАШТО́**. 1. Ні ў якім разе, ні пры якіх абставінах. 2. Дарма, без прычыны.

**НІЗЮ́ТКІ**, -ая, -ае. Вельмі нізкі.

**НІ́КЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які схіліўся долу. 2. Слабы, ледзь адчувальны.

**НІКО́ЛІ**. Ні ў які іншы час; ні пры якіх умовах, акалічнасцях.

**НІКУ́ДЫ**. Ні ў якое месца; ні ў якім напрамку.

**НІКЧЭ́МНАСЦЬ**, -і. 1. Крайняя нязначнасць каго-, чаго-н.; убоства. 2. Нікчэмны чалавек.

**НІКЧЭ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Неістотны, нязначны; пазбаўлены змястоўнасці, пусты; нікуды не варты; які выклікае пагарду. 2. Нізкі ў маральных адносінах, нягодны. 3. Вельмі дрэнны, няўдалы; малы.

**НІТАВА́ЦЬ**, -тýю, -тýеш, -тýе. Злучаць, звязваць.

**НІХТО́**, нікóга, нікóму, нікóга, нікíм, ні аб кíм. 1. Ні адзін чалавек. 2. *у знач. наз.* ніхтó, *толькі ў Н. і Т.* Пра чалавека, які не мае ніякага дачынення да кáго-н.

**НІЦ**, **НІ́ЦАМ** і **НІ́ЦМА**. Тварам уніз.

**НІ́ШКАМ**. 1. Моўчкі. 2. Непрыкметна для іншых; употай.

**НІШТАВА́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Досыць добры, нядрэнны. 2. Значны, немалы (па велічыні, колькасці).

**НІШЧЫ́МНІЦА**, -ы. 1. Посная ежа. 2. Бясхлебіца, голад.

**НІШЧЫ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Не прыпраўлены скаромным; посны. 2. Без нічога, без якіх-н. дабавак, пусты.

**НІ́ШЧЫЦЦА**, -чуся. Знішчацца, гінуць, прападаць.

**НІЯ́К**. Ніякім чынам; зусім.

**НІЯКАВА́ТА**. 1. Няёмка, не па сабе, сарамліва; пра адчуванне няёмкасці, сарамлівасці. 2. Нязручна.

**НІЯКАВА́ТАСЦЬ**, -і. Стан, пачуццё няёмкасці, сарамлівасці.

**НІЯКАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Няёмкі.

**НІЯ́КІ**, -ая, -ае. 1. Які б ні быў; ніводны (ужываецца ў адмоўных сказах). 2. У спалучэнні з часціцай «не» ўжываецца для адмаўлення якасці, уласцівасці ў значэнні: зусім не.

**НО́ЗДРА**, -ы; нóздраў. Адна з парных знадворных адтулін носа.

**НО́РАВЫ**, -аў. Звычаі, уклад жыцця, звычка.

**НО́РАЎ**, -раву. Характар, сукупнасць псіхічных якасцей.

**НО́ТА**, -ы. 1. Умоўны графічны знак для запісу гукаў музыкі. 2. Асобны гук пэўнай вышыні ў музыцы і спевах. 3. Тон, інтанацыя мовы, якія выражаюць якое-н. пачуццё.

**НУДА́**, -ы. 1. Непрыемны душэўны стан, выкліканы немагчымасцю здзейсніць свае надзеі, жаданні; сум, туга; непрыемны душэўны стан, выкліканы бяздзейнасцю або адсутнасцю заняткаў, цікавасці да чаго-н. 2. Панылацсь, маркота.

**НУДЗЕ́ЦЬ**, -дзéю, -дзéеш, -дзéе. Нудзіцца.

**НУДЗІ́ЦЦА**, нуджýся, нýдзішся, нýдзіцца. Адчуваць нуду, быць у стане нуды (у 1 знач.).

**НУДЛІ́ВА**. Пра тужлівае пачуццё, якое адчувае хто-н.

**НУДЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Поўны нуды, тужлівага настрою. 2. Які наганяе нуду, сум.

**НУ́ДНА**. Пра пачуццё нуды, якое адчувае хто-н.

**НУДНАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Трохі нудны.

**НУ́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Невясёлы, маркотны. 2. Які наганяе нуду; выклікае тужлівы настрой.

**НУДО́ТА**, -ы. 1. Тое, што н у д а. 2. Пра млосны стан.

**НУТРАНЫ́**, -а́я, -бе. Які выражае душэўныя перажыванні.

**НУТРО́**, -а́. Унутраная сутнасць каго-н.; пра ўнутраны псіхічны свет, душу.

**НЫ́ЦІК**, -а. Чалавек, які ўвесь час ные, на што-н. скардзіцца.

**НЫЦЦЁ**, -я́. Цягучы, тупы боль.

**НЫЦЬ**, ны́ю, ны́еш, ны́е. **1.** (*1 і 2 ас. не ўжыв.*). Балець (пра адчуванне тупога, цягучага болю). **2.** Надакучліва скардзіцца на што-н.

**НЫ́ЮЧЫ**, -ая, -ае. Цягучы, тупы (пра боль).

**НЭ́НДЗА**, -ы. **1.** Галеча, беднасць. **2.** Той (тая), хто ўвесь час ные, скардзіцца. **3.** Тое, што і н у д а (у 1 знач.).

**НЭ́НДЗНЫ**, -ая, -ае. **1.** Дрэнны, мізэрны. **2.** Поўны нэндзы (у 3 знач.), нудны.

**НЮА́НС**, -у. Адценне, тонкае адрозненне ў чым-н.; ледзь прыкметны пераход.

**НЮАНСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Адцяняць, захоўваць ледзь улоўныя пераходы, нюансы чаго-н.

**НЮ́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Надакучліва плакаць, ныць.

**НЯБА́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Выключны, незвычайны (па сіле праяўлення); такі, які не сустракаўся раней, якога не даводзілася бачыць; таямнічы, дзіўны.

**НЯБА́ЧНАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан нябачнага.

**НЯБА́ЧНЫ**, -ая, -ае. Недаступны для зроку; скрыты, непрыкметны.

**НЯБЛА́ГА**. Нядрэнна.

**НЯБО́ГА**, -і. **1.** Дачка брата або сястры; пляменніца. **2.** Ласкавы або спачувальны зварот да малодшай па гадах. **3.** Тая (той), хто выклікае спагаду і жаль; бядак, сірата.

**НЯБО́СЬ**. Ужываецца для ўзмацнення зместу выказвання ў значэнні: напэўна, відаць; ужо ж вядома.

**НЯБРЫ́ДКІ**, -ая, -ае. Які мае даволі прывабны знешні выгляд.

**НЯВЕ́ДАННЕ**, -я. Адсутнасць звестак, ведаў аб чым-н.

**НЯВЕ́Р'Е**, -я. Адсутнасць веры ў што-н.; няўпэўненасць у чым-н.

**НЯВЕ́РНЫ**, -ая, -ае. **1.** Які парушае вернасць каму-, чаму-н.; здрадлівы. **2.** Недакладны ва ўспрыманні.

**НЯВЕ́СЕЛА**. Пра пачуццё суму, журбы, якое перажывае хто-н.

**НЯВЕ́СТА**, -ы. Дзяўчына, якая выходзіць замуж; дзяўчына, якая мае жаніха; будучая жонка; пра дзяўчыну, якая дасягнула шлюбнага ўзросту.

**НЯВЕ́СТКА**, -і. Жонка сына.

**НЯВЕ́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. **1.** Які не выяўляе ветлівасці да іншых; няпрыветлівы; пазбаўлены ветлівасці. **2.** Які парушае прынятыя правілы прыстойнасці; нетактоўны.

**НЯВЕ́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Станавіцца калекай; калечыцца.

**НЯВЕ́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Наносячы фізічныя пашкоджанні, калечыць каго-н.; рабіць дрэнны ўплыў на каго-н.; псаваць.

**НЯВІ́ДНЫ**, -ая, -ае. Непрыкметны, несамавіты.

**НЯВІ́ННІЦА**, -ы. Цнатлівая дзяўчына.

**НЯВІ́ННЫ**, -ая, -ае. **1.** Маральна чысты, бязгрэшны. **2.** Наіўны, прастадушны. **3.** Бяскрыўдны, бясшкодны. **4.** Цнатлівы. **5.** Тое, што і н е в і н а в а т ы.

**НЯВО́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. **1.** Прымушаць рабіць што-н. супраць жадання, волі. **2.** Пазбаўляць волі; трымаць у няволі.

**НЯВЫ́КАЗАНЫ**, -ая, -ае. Не выражаны ў словах; не выяўлены якім-н. чынам.

**НЯВЫ́КРУТКА**, -і. Цяжкае або бязвыхаднае становішча.

**НЯВЫ́ПЛАКАНЫ**, -ая, -ае. Які не праліўся слязамі, не аблегчаны плачам.

**НЯВЫ́ХАВАНЫ**, -ая, -ае. Які не атрымаў належнага выхавання; грубы.

**НЯГЕ́ГЛЫ**, -ая, -ае. **1.** Кволы, слабы; няўдалы. **2.** Непрыгожы з выгляду, нязграбны; няўклюдны. **3.** Няўмелы, ні да чаго не здатны.

**НЯГЛЕ́ДЗЯЧЫ**. У спалучэнні: нягледзячы на... Не прымаючы пад увагу чаго-н., насуперак чаму-н.

**НЯГО́ДНІК**, -а. Чалавек ганебных, несумленных паводзін; нізкі чалавек.

**НЯГО́ДНЫ**, -ая, -ае. Нізкі ў маральных адносінах; паганы, нядобры.

**НЯГО́ЖЫ**, -ая, -ае. Непрыдатны, нягодны; дрэнны, паганы.

**НЯГО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які не пагаліўся; які даўно не галілі.

**НЯГРЭ́БЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца грэблівасцю.

**НЯГУ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Ціхі, слаба чутны. 2. Які не мае належнага гучання; невыразны.

**НЯДА́ЎНА**. Не так даўно.

**НЯДА́ЎНІ**, -яя, -яе. 1. Які адбыўся ў недалёкім мінулым, незадоўга да сучаснага моманту; які існуе мала часу, узнік, з'явіўся нядаўна. 2. Які быў кім-н. незадоўга да сучаснага моманту.

**НЯДБА́ЙЛА**, -ы і **НЯДБА́ЙНІК**, -а. Той, хто абыякава, нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, да справы; лянівы.

**НЯДЗЕ́ЙСНЫ**, -ая, -ае. Такі, якому не ўласціва дзейснасць.

**НЯДЗЕ́ЮЧЫ**, -ая, -ае. Які не дзейнічае, перастаў дзейнічаць.

**НЯДО́БРА**. 1. Дрэнна; не ўсё ў парадку; не па душы. 2. Пра цяжкі фізічны або душэўны стан.

**НЯДОБРАЗЫЧЛІ́ВЕЦ**, -ліўца. Чалавек, які нядобразычліва настроены ў адносінах да каго-, чаго-н.

**НЯДОБРАЗЫЧЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які не зычыць дабра каму-н., непрыязна настроены ў адносінах да каго-, чаго-н.; які выражае непрыязнасць да каго-, чаго-н.

**НЯДО́ЛЯ**, -і. Нешчаслівая, цяжкая доля; цяжкі лёс, гора.

**НЯДО́ЎГА**. На працягу невялікага адрэзку часу, не вельмі доўга.

**НЯДО́ЎГІ**, -ая, -ае. 1. Кароткачасовы. 2. Даволі кароткі.

**НЯДРЭ́ННЫ**, -ая, -ае. Даволі добры.

**НЯДУ́ЖАСЦЬ**, -і. Недамаганне.

**НЯДУ́ЖАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Недамагаць, хварэць.

**НЯДУ́ЖЫ**, -ая, -ае. Слабы фізічна; хваравіты.

**НЯЁМКІ**, -ая, -ае. 1. Такі, у якім нязручна быць. 2. Непрыстойны, недарэчны.

**НЯЗБЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што не можа збыцца; нездзяйсняльны. 2. Такі, якога нельга або цяжка пазбыцца.

**НЯЗВЕ́ДАНЫ**, -ая, -ае. Які не даваўся пераважыць, зведаць; незнаёмы.

**НЯЗВЫ́КЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які не ўвайшоў у звычку, не стаў звычкай; непрывычны, незнаёмы. 2. Які не звыкся з чым-н., не набыў звычкі рабіць што-н.

**НЯЗВЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Які пазбаўлены паслядоўнасці, лагічнай сувязі.

**НЯЗГО́ДА**, -ы. 1. Адсутнасць адзінства ў думках, поглядах; адмоўны адказ на што-н.; адмаўленне. 2. Разлад, сварка.

**НЯЗГРА́БНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае несуразмерную, непрапарцыянальную фігуру, постаць, форму; няскладны, нястройны. 2. Няспрытны, непаваротлівы.

**НЯЗГРЭ́БА**, -ы. Няспрытны, няўмелы, нязграбны чалавек.

**НЯЗДА́ТНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць здольнасці, умення што-н. рабіць.

**НЯЗДА́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае здатнасці да чаго-н.; нездольны. 2. Які не падыходзіць для чаго-н.; непрыгодны.

**НЯЗДЗЕ́ЙСНЕНЫ**, -ая, -ае. Які не быў здзейснены, не быў ажыццёўлены.

**НЯЗДО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае здольнасцей, таленту. 2. Які не ўмее рабіць чаго-н., не мае якасцей, уласцівасцей, патрэбных для чаго-н.

**НЯЗЛА́ДЖАНАСЦЬ**, -і. Адсутнасць гармоніі, зладжанасці, суладнасці.

**НЯЗЛА́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены гармоніі, несуладны.

**НЯЗЛО́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Якога нельга перамагчы, знішчыць. 2. Стойкі, цвёрды ў перакананнях, намерах і пад.

**НЯЗЛО́СНЫ**, -ая, -ае. Не схільны да злосці, добры; які не выражае злосці.

**НЯЗМЕ́НЛІВЫ**, -ая, -ае. Які не мяняецца, не можа змяніцца; пастаянны.

**НЯЗМЕ́ННА**. Заўсёды, пастаянна.

**НЯЗМЕ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не паддаецца вымярэнню; неабдымны. 2. Незвычайна глыбокі, моцны (пра пачуцці).

**НЯЗМО́ЎЧНЫ**, -ая, -ае. Тое, што і н е с ц і х а н ы (у 1 знач.).

**НЯЗНА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Не бачаны раней, невядомы. 2. Такі, якога не даваўся пераважыць, зведаць; нязведаны.

**НЯЗНА́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Невялікі па колькасці, велічыні, сіле і пад. 2. Які не мае істотнага значэння; малаважны; які не прыносіць вялікіх цяжкасцей.

**НЯЗРУ́ЧНА**. Без дастатковай зручнасці для чаго-н.

**НЯЗРУ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены зручнасці ў карыстанні; дрэнна прыстасаваны для чаго-н. 2. Які не садзейнічае поспеху, непрыдатны для дасягнення жаданых вынікаў.

**НЯЙНА́КШ** і **НЯЙНА́ЧАЙ**. 1. Напэўна, іменна. 2. Хутчэй за ўсё, відавочна.

**НЯКЕ́МЛІВЫ**, -ая, -ае. Які слаба кеміць; нездагадлівы.

**НЯКЕ́ПСКІ**, -ая, -ае. Даволі добры, нядрэнны.

**НЯКІ́ДКІ**, -ая, -ае. Які не кідаецца ў вочы; няяркі.

**НЯЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. Дрэнны, нядобры.

**НЯЛА́СКА**, -і. Непрыхільнасць, нядобразычлівасць да каго-н.

**НЯЛА́СКАВЫ** і **НЕЛАСКА́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не праяўляе ласкавасці ў абыходжанні з кім-н.; суровы; які выяўляе суровасць, адсутнасць ласкавасці. 2. Нятлівы, недалікатны ў адносінах да каго-н.

**НЯЛЁГКА**. Пра цяжкі маральны стан, у якім хто-н. знаходзіцца.

**НЯЛЁГКІ**, -ая, -ае. 1. Значны па вазе, даволі цяжкі; які патрабуе шмат энергіі, сіл. 2. Такі, якога можна дасягнуць шляхам вялікіх намаганняў, з вялікай цяжкасцю; які звязаны з цяжкасцямі.

**НЯЛІ́ШНІ**, -яя, -яе. Патрэбны, небескарысны.

**НЯЛО́ЎКІ**, -ая, -ае. 1. Няспрытны, непаваротлівы. 2. Непрыемны, цяжкі; няёмкі.

**НЯЛЮ́БЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога не любяць, да якога адносяцца непрыхільна; які не адпавядае чыім-н. схільнасцям, густам. 2. *у знач. наз.* **нялю́бы**, -ага. Нямілы.

**НЯЛЮ́ДСКІ**, -ая, -ае. 1. Не ўласцівы чалавеку, не характэрны для чалавека; не такі, якім павінен быць; дзіўны. 2. Які перавышае чалавечыя сілы, магчымасці; моцны па ступені праяўлення. 3. Антыгуманны, бесчалавечны; ганебны. 4. Дрэнны, кепскі.

**НЯМА́ЛА**. Даволі многа.

**НЯМЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Станавіцца нямым, траціць здольнасць гаварыць; змаўкаць, застываць у маўчанні. 2. Траціць адчувальнасць (ад холаду, стомы і пад.); рабіцца нерухомым, сціхаць.

**НЯМІ́ЛАСЦЬ**, -і. Непрыязнасць, непрыхільныя адносіны да каго-н.

**НЯМІ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які не прыносіць радасці; абрыдлы. 2. *у знач. наз.* **нямі́лы**, -ага. Чалавек, які не выклікае сімпатыі.

**НЯМКО́**, -а́. Пазбаўлены здольнасці гаварыць.

**НЯМНО́ГА**. Мала, не вельмі многа.

**НЯМНО́ГАЕ**, -ага. Нязначная частка чаго-н.

**НЯМНО́ГІЯ**, -іх. Якія складаюць невялікую частку каго-, чаго-н.; асобныя, некаторыя; пра невялікую колькасць людзей.

**НЯМО́ГЛАСЦЬ**, -і. Слабасць, хваравітасць.

**НЯМО́ГЛЫ**, -ая, -ае. Слабы, хваравіты; уласцівы такому чалавеку.

**НЯМО́ЖАЦЦА**. Нездаровіцца.

**НЯМО́ЖНА**. 1. Не дазваляецца, забаронена. 2. Немагчыма, няма магчымасці; нельга.

**НЯМО́ЎЧНЫ**, -ая, -ае. Тое, што і н е с ц і х а н ы (у 1 знач.).

**НЯНА́ВІСЦЬ**, -і. Пачуццё моцнай варожасці, непрыязнасці.

**НЯ́НЬЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Празмерна клапаціцца аб кім-, чым-н.; аддаваць шмат увагі каму-, чаму-н.; вазіцца; гуляць, забаўляцца.

**НЯПО́ЎНАСЦЮ**. Не ў поўным аб'ёме; не ва ўсіх адносінах, не зусім.

**НЯПО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Які праяўляецца не ў поўнай меры. 2. Які не дасягнуў пэўнай нормы, мяжы, неабходных памераў; не ўвесь; які не з'яўляецца вычарпальным; не закончаны, не завершаны да канца.

**НЯПРА́ВІЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не адпавядае якім-н. правілам, нормам. 2. Які не адпавядае ісціне; няверны, памылковы. 3. Не такі, як трэба; несправядлівы.

**НЯПРА́ЎДА**, -ы. 1. Тое, што знаходзіцца ў супярэчнасці з праўдай; хлусня, мана. 2. Ашуканства; падман.

**НЯПРО́ШАНЫ**, -ая, -ае. Які з'явіўся

без запрашэння; нечаканы, нежаданы.

**НЯПЭ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Не зусім выразны, няясны; пра пачуцці, уяўленні, адчуванні і пад. 2. Дакладна не ўстаноўлены. 3. Пазбаўлены цвёрдасці, упэўненасці, нерашучы. 4. Такі, у якім нельга быць поўнасцю ўпэўненым; ненадзейны.

**НЯРА́ДАСНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены радасці, весялосці; сумны, журботны; які выклікае, прыносіць смутак, журбу.

**НЯРА́НА**. Позна.

**НЯСВОЕЧАСО́ВА**, -ая, -ае. Які адбываецца або адбыўся не ў свой час, не тады, калі трэба; які быў зроблены або адбыўся ў неадпаведны момант, недарэчы.

**НЯСІ́ЛЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Страчваць сілы, станавіцца слабым, бяссільным.

**НЯСІ́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Пазбаўляць сілы, рабіць бяссільным.

**НЯСКЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не вызначаецца складнасцю, зграбнасцю. 2. Пазбаўлены лагічнай паслядоўнасці, сувязі; нязладжаны, нястройны (пра гукі, спеў, гаворку і пад.).

**НЯСКО́РАНЫ** і **НЕСКАРО́НЫ**, -ая, -ае. Які не скарыўся сіле, уладзе каго-, чаго-н.

**НЯСЛА́ВА**, -ы. Благая слава, ганьба.

**НЯСЛА́ВІЦЬ**, -сла́ўлю, -сла́віш, -сла́віць. Сваімі паводзінамі, учынкамі ўзводзіць няславу на каго-н.; ганьбіць; абражаць пры людзях чый-н. гонар; распаўсюджваць плёткі, якія ганьбяць каго-, што-н.

**НЯСЛА́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які варты асуджэння; ганебны.

**НЯСЛУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Які не мае дастатковых падстаў; неабгрунтаваны.

**НЯСМА́ЧНА**. Без апетыту; непрыемна, не па душы.

**НЯСМА́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не мае прыемнага смаку.

**НЯСМЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца смеласцю; сарамлівы; які выражае адсутнасць смеласці.

**НЯСПЕ́ШНЫ**, -ая, -ае. Які робіць што-н. без спеху (пра чалавека); які адбываецца без спеху; павольны, спакойны; які не патрабуе спешнага выканання.

**НЯСПО́РНЫ**, -ая, -ае. Які не ладзіцца.

**НЯСПРА́ЎДЖАНЫ**, -ая, -ае. Які не спраўдзіўся, не збыўся.

**НЯСПРЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. Які не мае спрыту ў рухах; непаваротлівы, нялоўкі.

**НЯСТА́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які не дасягнуў сталасці, поўнага развіцця. 2. Несур'ёзны, легкадумны. 3. Няўстойлівы ў сваіх поглядах, схільнасцях, зменлівы, непастаянны.

**НЯСТРЫ́МАНАСЦЬ**, -і. Няздольнасць або няўменне стрымлівацца.

**НЯСТРЫ́МАНЫ** і **НЕСТРЫМА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Які не можа валодаць сабой, стрымлівацца. 2. Якога немагчыма стрымаць.

**НЯСТРЫ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Якога немагчыма стрымаць, утрымаць. 2. Такі, якога цяжка ўтаймаваць; які з цяжкасцю стрымліваецца. 3. Такі, што цяжка вытрымаць; нясцерпны, невыносны.

**НЯСЦЕ́РПНА**. Цяжка, немагчыма сцярпець, вынесці; невыносна.

**НЯСЦЕ́РПНЫ**, -ая, -ае. Такі, які цяжка, нельга цярпець; невыносны; нязносны, назойлівы; надакучлівы.

**НЯСЦІ́ПЛЫ**, -ая, -ае. Які не вызначаецца сціпласцю; які выражае адсутнасць сціпласці.

**НЯЎВА́ГА**, -і. 1. Адсутнасць або недахоп увагі; рассеянасць. 2. Непавага.

**НЯЎВА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Рассеяны. 2. Які не выказвае ўвагі да каго-, чаго-н.

**НЯЎВЯ́ЗКА**, -і. Адсутнасць узгодненасці; непаразуменне.

**НЯЎДА́ЛІЦА**, -ы. Такі, якому нічога не ўдаецца; няўмелы, няўклюдны чалавек.

**НЯЎДА́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які канчаецца няўдачай; непаспяховы. 2. Няўмелы. 3. Дрэнны; нікуды не варты.

**НЯЎДА́ЧА**, -ы. Адсутнасць удачы, поспеху.

**НЯЎДА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Такі, якому не шанцуе, у якога ва ўсім няўдача.

**НЯЎДА́ЧНІК**, -а. Няўдачлівы чалавек.

**НЯЎДЗЯ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які не праяўляе ўдзячнасці за зробленыя паслугі.

**НЯЎЖЫЎЧЫВЫ**, -ая, -ае. Які дрэнна ўжываецца з іншымі людзьмі; які ўласцівы такому чалавеку.

**НЯЎЗНАК**. 1. Непрыкметна. 2. Хоць бы што, неўзаметку. 3. Выпадкова, ненаўмысна.

**НЯЎКЛЮДА**, -ы. Той (тая), хто мае нязграбную паставу, пазбаўлены зграбнасці, спрыту ў рухах.

**НЯЎКЛЮДНАСЦЬ**, -і. Непаваротлівасць.

**НЯЎКЛЮДНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены зграбнасці, лоўкасці ў рухах; непаваротлівы.

**НЯЎЛОЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Якога цяжка застаць дзе-н. 2. Ледзь прыкметны; няясны.

**НЯЎМЕКА**, -і. Няўмелы, няздатны да працы чалавек.

**НЯЎМЕЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які дрэнна, без умення выконвае сваю працу; які выяўляе няўменне рабіць што-н., карыстацца чым-н. 2. Які робіцца без належнага ўмення.

**НЯЎМЕЛЬСТВА**, -а і **НЯЎМЕННЕ**, -я. Недахоп навыкаў у чым-н.

**НЯЎМЕРУ**. Больш, чым трэба, чым патрабуе мера; занадта.

**НЯЎМОЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, якога немагчыма ўпрасіць; непахісны; які выяўляе, выказвае непахіснасць, цвёрдасць. 2. Няўхільны, немінучы; бязлітасны.

**НЯЎПРАЎКА**, -і. Немагчымасць выканаць, зрабіць усё, што патрэбна; непаладкі ў чым-н.

**НЯЎПЭЎНЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Які сумняваецца ў правільнасці чаго-н., пазбаўлены веры, упэўненасці. 2. Які выказвае нерашучасць, адсутнасць цвёрдасці.

**НЯЎРОКАМ**. Ненаўмысна; выпадкова.

**НЯЎРОЧНЫ**, -ая, -ае. Які робіцца, адбываецца не ў вызначаны або не абумоўлены раней час.

**НЯЎРЫМСЛІВАСЦЬ**, -і. Непаседлівасць, несупакоенасць.

**НЯЎРЫМСЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які не можа суняцца, супакоіцца; непаседа. 2. Які не сціхае, не спыняе працяглы час сваёй дзейнасці; нецярплівы.

**НЯЎСТОЙЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які часта мяняецца, непастаянны. 2. Які лёгка паддаецца якім-н. уплывам, нястойкі ў сваіх поглядах, перакананнях.

**НЯЎСТУПЧЫВЫ**, -ая, -ае. Не схільны да ўступак; незгаворлівы.

**НЯЎТОЛЬНЫ**, -ая, -ае. Такі, што нельга здаволіць, наталіць; пра пачуцці, перажыванні і пад.

**НЯЎТУЛЬНА**. 1. Пра адсутнасць утульнасці дзе-н. 2. Пра непрыемнае, тужлівае пачуццё.

**НЯЎХІЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не мае адхіленняў ад чаго-н.; пастаянны; нязменны. 2. Які непазбежна вынікае з абставін; немінучы.

**НЯЎЦЕШНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што немагчыма суцешыць, супакоіць. 2. Вельмі моцны па сіле праяўлення (пра слёзы, гора і пад.). 3. Які не прыносіць суцяшэння; несуцяшальны.

**НЯЎЦЯМНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, што цяжка зразумець, усвядоміць; незразумелы; які выклікае недаўменне; загадкавы. 2. Які выяўляе неразуменне чаго-н. або адсутнасць думак аб чым-н.

**НЯЎЧАСНЫ**, -ая, -ае. 1. Які наступіў вельмі рана; заўчасны. 2. Які адбываецца ў непадыходзячы момант.

**НЯХІТРЫ**, -ая, -ае. 1. Прастадушны. 2. Просты, нескладаны, немудрагелісты.

**НЯЦЯМЛІВЫ**, -ая, -ае. Нездагадлівы.

**НЯЧЛЕНАРАЗДЗЕЛЬНЫ**, -ая, -ае. Невыразны.

**НЯЧУЛЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены чуласці, спагадлівасці; які выяўляе адсутнасць чуласці, спагадлівасці. 2. Які не рэагуе на што-н.; раўнадушны.

**НЯЧУТНЫ**, -ая, -ае. Такі, што не робіць шуму; якога зусім не чуваць; вельмі ціхі.

**НЯЧЫСТЫ**, -ая, -ае. 1. Неахайны, брудны. 2. Невыразны, не зусім дакладны, правільны (пра гукі, выказванне думак). 3. Які не вызначаецца сумленнасцю, здольны да машэнства.

**НЯШКОДНЫ**, -ая, -ае. Які не здатны зрабіць каму-н. шкоды.

**НЯШЧАДНЫ**, -ая, -ае. Бязлітасны; вельмі моцны па сіле праяўлення.

**НЯШЧАСНЫ**, -ая, -ае. Які церпіць

гора, бяду, перажывае няшчасце.

**НЯШЧА́СЦЕ**, -я. 1. Бяда, гора. 2. Няўдача, адсутнасць поспеху.

**НЯШЧЫ́РЫ**, -ая, -ае. Які тоіць ад іншых свае сапраўдныя пачуцці, думкі; фальшывы, крывадушны.

**НЯЯ́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Які ледзь чуваць. 2. Невыразны; не зусім зразумелы.

## О

**ОГО́**. 1. Вокліч, які выказвае здзіўленне, захапленне. 2. Ужываецца пры выказванні пярэчання.

**О-ГО-ГО́**. 1. Тое самае, што і о г о (у 1 знач.). 2. Вокліч, якім пераклікаюцца, каб знайсці або не згубіць адзін аднаго ў лесе.

**О́ДА**, -ы. Жанр лірычнай паэзіі. Верш, напісаны ў гонар якой-н. асобы ці гістарычнай падзеі ва ўрачыстым стылі. Узнікла ў Старажытнай Грэцыі, дзе О. называлі лірычныя песні, што выконваліся хорам падчас танцаў.

**О́ДУМ**, -у. Стан разважання, засяроджанасці, паглыблення ў сябе, у свае думкі.

**О́РГІЯ**, -і. 1. У старажытных народаў — рэлігійныя абрады, звязаныя з культам багоў віна і вінаробства (Дыяніса і Арфея — у Грэцыі, Вакха — у Рыме). 2. Разгульнае, разбэшчанае баляванне.

**О́ТРАК**, -а. Член малодшай дружыны князя ў Старажытнай Русі.

## П

**ПААПЛАДЗІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Апладзіраваць некаторы час.

**ПААСО́БКУ**. 1. Па адным, не разам. 2. Асобна, разлучыўшыся.

**ПАБАДЗЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. 1. Пацягацца, павалачыцца; павандраваць. 2. Пахадзіць, пагуляць без пэўнай мэты.

**ПАБАЖЫ́ЦЦА**, -бажу́ся, -бо́жышся, -бо́жыцца. Паклясціся імем Бога, каб пацвердзіць свае словы.

**ПАБАЙЧЭ́ЦЬ**, -чэ́ю, -чэ́еш, -чэ́е. Стаць больш бойкім.

**ПАБАЛБАТА́ЦЬ**, -бачу́, -бо́чаш, -бо́ча. Балбатаць некаторы час.

**ПАБАЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Баляваць некаторы час.

**ПАБАРУКА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Падужацца, пабароцца з кім-н.; пазмагацца з кім-, чым-н.

**ПАБА́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Убачыцца, сустрэцца з кім-н. асабіста.

**ПАБЕДАВА́ЦЬ**, -бяду́ю, -бяду́еш, -бяду́е. Выказаць свае скаргі, нараканні.

**ПАБЕРАГЧЫ́СЯ**, -берагу́ся, -беражэ́шся, -беражэ́цца; -беражо́мся, -беражаце́ся. Аднесціся з увагай, асцярожнасцю да сябе.

**ПАБЛА́ЖКА**, -і. Нястрогія, паблажлівыя адносіны да каго-н.

**ПАБЛА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Нястрогі, непатрабавальны. 2. Мяккі, велікадушны.

**ПАБЛАЖЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. Схуднелы; непрывабны.

**ПАБЛІ́ЗУ**. Непадалёку, блізка.

**ПАВА́БНЫ**, -ая, -ае. Які вабіць да сябе, прывабны, прыемны.

**ПАВА́ГА**, -і. Пачуццё пачцівасці да каго-, чаго-н., выкліканае прызнаннем высокіх якасцей, заслуг, важнасці і пад.

**ПАВАГА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Вагацца некаторы час. 2. Пабыць у нерашучасці на працягу нейкага часу.

**ПАВАЖА́НЫ**, -ая, -ае. Які выклікае пачуццё павагі, да якога адчуваюць павагу; ужываецца ў якасці эпітэта ў ветлівым звароце; *у знач. наз.* **паважа́ны**, -ага, паважаная, -ай ужываецца як зваротак з выражэннем фамільярнасці, пагарды, іроніі.

**ПАВАЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Адчуваць павагу, адносіцца з павагай да каго-, чаго-н. 2. Любіць, цаніць што-н.

**ПАВАЖДА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Важдацца некаторы час.

**ПАВА́ЖНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Важнічаць некаторы час.

**ПАВА́ЖНЫ**, -ая, -ае. 1. Важны, поўны годнасці, самавітасці; вельмі важны; уплывовы. 2. Спакойны, няспешны, павольны. 3. Старэчы (пра ўзрост).

**ПАВАЛАВО́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Валаводзіць некаторы час.

**ПАВАЛТУ́ЗІЦЦА**, -ту́жуся, -ту́зішся, -ту́зіцца. Валтузіцца на працягу нейкага часу.

**ПАВАЛТУ́ЗІЦЬ**, -ту́жу, -ту́зіш, -ту́зіць. Валтузіць на працягу нейкага часу.

**ПАВАЛЭ́НДАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Валэндацца некаторы час.

**ПАВАРО́ТНЫ КРУГ**. Частка сцэнічнай пляцоўкі, якая прыводзіцца ў рух механізмамі, што знаходзяцца пад сцэнай. П. к. дазваляе рабіць хуткія змены карцін на сцэне, ствараць рэальнае адчуванне бесперапыннасці сцэнічнага дзеяння. Рух П. к. можа непасрэдна ўплываць на змену тэмпу і рытму спектакля. П. к. вынайдзены ў Японіі; у 1758 г. стацыянарным П. к. быў абсталяваны тэатр Кабукі. У Еўропе П. к. упершыню быў выкарыстаны ў 1896 г. інжынерам К. Лаўтэншлегерам і рэжысёрам Э. Посартам для пастаноўкі оперы «Дон Жуан» у «Рэзідэнц-тэатры» (Мюнхен). Адкрыццё глыбокай перспектывы на П. к. належыць К. С. Станіслаўскаму і М. Рэйнхарду. П. к. бываюць накладныя і стацыянарныя.

**ПАВАРУШЫ́ЦЦА**, -рушу́ся, -ру́шышся, -ру́шыцца. 1. Зрабіць некалькі рухаў. 2. Заняцца чым-н., праявіць актыўнасць у чым-н.

**ПАВЕ́К**. На доўгія гады, назаўсёды.

**ПАВЕ́КА**, -а. Рухомая складка скуры, якая прыкрывае вока.

**ПАВЕСЯЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў, зрабіўся больш вясёлым, весялейшым.

**ПАВЕСЯЛІ́ЦЬ**, -весялю́, -вясе́ліш, -вясе́ліць. Крыху забавіць, пацешыць каго-н.

**ПАВІНІ́ЦЦА**, -ню́ся, -ні́шся, -ні́цца. Прызнацца, пакаяцца ў сваёй віне.

**ПАВІ́ННАСЦЬ**, -і. Абавязак, тое, што абавязкова трэба зрабіць, выканаць.

**ПАВІТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Павітаць адзін аднаго пры сустрэчы; паздароўкацца.

**ПАВІТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Звярнуцца да каго-, чаго-н. з прывітаннем.

**ПАВО́ДДАЛЬ**. На некаторай адлегласці ад каго-, чаго-н.

**ПАВО́ДЗІНЫ**, -дзін. Спосаб жыцця; сукупнасць дзеянняў; манера трымаць сябе, рабіць што-н.; характар учынкаў.

**ПАВО́ДЛЕ**. Спалучэнне з прыназоўнікам «паводле» выражае аб'ектыўныя адносіны і абазначае: у адпаведнасці з чым-н., згодна з якімі-н. прыметамі.

**ПАВО́ЛІ**. 1. Няспешна; марудна. 2. Асцярожна, з перасцярогай. 3. Паступова, не адразу.

**ПАВО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Няспешны, марудны; спакойны; размераны.

**ПАВУЧА́ННЕ**, -я. 1. Парада, настаўленне. 2. Пропаведзь, прамова, якія ўтрымліваюць павучальныя парады.

**ПАГАЛЁКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пакрычаць, пагукаць.

**ПАГАЛО́СКА**, -і. 1. Чуткі, размовы, якія перадаюцца. 2. Моцныя гукі, якія выклікаюць адгалосак; рэха.

**ПАГАМАНІ́ЦЬ**, -маню́, -мо́ніш, -мо́ніць. Пагаварыць з кім-н. пэўны час.

**ПАГАРАЧЫ́ЦЦА**, -чу́ся, -чы́шся, -чы́цца. 1. Выказаць залішнюю раздражнёнасць, нервовасць, гарачнасць. 2. Праявіць паспешлівасць.

**ПАГА́РДА**, -ы. Ганарлівыя адносіны да каго-, чаго-н.; поўная адсутнасць павагі да каго-, чаго-н.; здзек.

**ПАГАРДЖА́НЫ**, -ая, -ае. Той, да каго адносяцца з пагардай, кім пагарджаюць.

**ПАГАРЛА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Пакрычаць.

**ПАГЛА́ДЖВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Гладзіць злёгку або час ад часу.

**ПАГЛУМІ́ЦЦА**, -глумлюся, -глу́мішся, -глу́міцца. Паздзекавацца, панасміхацца.

**ПАГРАЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Абяцаць зрабіць каму-н. зло, непрыемнасць, выяўляць варожыя намеры, грозячы або пужаючы чым-н.; рабіць пагражальныя жэсты рукамі, прадметамі і пад.

**ПАГРАЗІ́ЦЦА**, -гражу́ся, -гро́зішся, -гро́зіцца. Выказаць пагрозу.

**ПАГРАЗІ́ЦЬ**, -гражу́, -гро́зіш, -гро́зіць. 1. Зрабіць пагражальны жэст. 2. Выказаць пагрозу.

**ПАГУ́ТАРЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Правесці час у гутарцы; перагаварыць.

**ПАДАБА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Выклікаць сімпатыю, добрыя пачуцці да сябе; выклікаць інтарэс у асоб іншага полу. 2. Быць прыемным, адказваць пэўным патрабаванням.

**ПАДАБРЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў, зрабіўся добрым, дабрэйшым.

**ПАДАЗРО́НАСЦЬ**, -і. Падазроныя адносіны да каго-, чаго-н., недаверлівасць.

**ПАДАКЛЯРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Паабяцаць што-н.

**ПАДА́ННЕ**, -я. Вуснае апавяданне, якое жыве ў народзе, у пэўнай мясцовасці і перадаецца з пакалення ў пакаленне.

**ПАДАПЛЁКА**, -і. Сапраўдная, але скрытая, не яўная прычына, падстава, сутнасць чаго-н.

**ПАДА́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. Згаворлівы, уступчывы (пра чалавека); уласцівы такому чалавеку.

**ПАДАХВО́ЦІЦЦА**, -во́чуся, -во́цішся, -во́ціцца. Добраахвотна ўзяць на сябе выкананне якой-н. справы, працы і пад.

**ПАДАХВО́ЦІЦЬ**, -во́чу, -во́ціш, -во́ціць. Выклікаць жаданне што-н зрабіць; разахвоціць.

**ПАДБАДЗЁРЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Стаць, зрабіцца больш бадзёрым, падбавіць бадзёрасці сабе.

**ПАДБАДЗЁРЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Надаць, падбавіць каму-н. упэўненасці, сілы, бадзёрасці; падняць настрой.

**ПАДБУХТО́РЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Падгаварыць каго-н. да якога-н. дзеяння; настроіць супроць каго-н.

**ПАДВАРУШЫ́ЦЬ**, -рушу́, -ру́шыш, -ру́шыць. Прымусіць рабіць што-н. лепш, хутчэй; ажывіць справу.

**ПАДВЕСЯЛІ́ЦЦА**, -весялю́ся, -вясе́лішся, -вясе́ліцца. Крыху развесяліцца, зрабіцца весялейшым.

**ПАДВЕСЯЛІ́ЦЬ**, -весялю́, -вясе́ліш, -вясе́ліць. Крыху развесяліць.

**ПАДВІ́ЦЦА**, падаў́юся, падаўе́шся, падаўе́цца; падаўёмся, падаўяце́ся, падаў́юцца; падві́ўся, -віла́ся, -віло́ся. Злёгку, трошку завіцца; падправіць сабе завіўку.

**ПАДВІ́ЦЬ**, падаў́ю, падаўе́ш, падаўе́; падаўём, падаўяце́; падві́ў, -віла́, -віло́; падві. Злёгку, трохі завіць; падправіць завіўку.

**ПАДВО́Х**, -у. Дзеянне, якое мае сваёй мэтай падвесці або паставіць каго-н. у няёмкае, непрыемнае становішча.

**ПАДВУЧЫ́ЦЦА**, -вучу́ся, -ву́чышся, -ву́чыцца. Павучыцца дадаткова; павялічыць свае веды, уменні; павысіць сваю кваліфікацыю.

**ПАДВУЧЫ́ЦЬ**, -вучу́, -ву́чыш, -ву́чыць. 1. Назучыць чаму-н. трохі; дапамагчы лепш засвоіць што-н.; вывучыць лепш. 2. Падбіць, падгаварыць на што-н. (часцей нядобрае).

**ПАДГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Паспець або здолець зрабіць што-н. у зручны час, у найбольш спрыяльны момант.

**ПАДГА́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. 1. Нарабіць чаго-н. кепскага, гадкага каму-н., нашкодзіць. 2. Сапсаваць.

**ПАДГАДЗІ́ЦЬ**, -гаджу́, -го́дзіш, -го́дзіць. Угадзіць, дагадзіць каму-н.

**ПАДГЛЯДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Употай выглядаць каго-, што-н.

**ПАДГРЫМІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. Загрыміравацць сябе злёгку або дадаткова.

**ПАДГРЫМІРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Загрыміраваць злёгку або дадаткова.

**ПАДГУЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Ап'янець пры выпіўцы.

**ПАДДО́БРЫЦЦА**, -руся, -рышся,

-рыцца. Заваяваць да сябе прыхільнасць; падлашчыцца.

**ПАД'ЁМНАЕ АБСТАЛЯВА́ННЕ с ц э н ы.** Сукупнасць механізмаў, з дапамогай якіх адбываецца пад'ём і спуск дэкарацый, т. зв. адзення сцэны, асвятляльных прыбораў і інш.

**ПАД'ЁМНА-АПУСКНА́Я ПЛЯЦО́ЎКА.** Частка планшэта сцэны, якая падымаецца над ім на патрэбную вышыню і апускаецца пад сцэну ў трум.

**ПАД'ЁМНА-АПУСКНА́Я СЦЭ́НА.** Сцэна з пад'ёмна-апускным планшэтам.

**ПАД'ЁМНА-АПУСКНЫ́ ПЛАН.** Пад'ёмна-апускная пляцоўка, якая цалкам займае адзін з планаў сцэны.

**ПАДЖАРТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Пасмяяцца з каго-, чаго-н., зрабіць каго-, што-н. прадметам сваіх жартаў.

**ПАДЖГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Хутка пайсці, пабегчы, паімчацца.

**ПАДЗАДО́РЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Выклікаць запал, падбіць, падахвоціць на што-н.

**ПАДЗЕ́ЙНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Аказаць нейкае дзеянне, уздзеянне, уплыў.

**ПАДЗЕ́Я**, -і. Здарэнне, выпадак; тое, што парушае звычайны парадак, нармальную плынь жыцця; выдатная, важная з'ява, здарэнне ў сюжэце п'есы, якое вызначае (змяняе) паводзіны дзейных асоб.

**ПАДЗО́Р**, -у. Першая падуга сцэны. П. таксама называюць дэкаратыўную тканіну, якая перакрывае верхнюю частку люстра сцэны.

**ПАДЗЯ́КА**, -і. Пачуццё ўдзячнасці за што-н. добрае; словы або іншы знак выражэння гэтага пачуцця.

**ПАДКУЗЬМІ́ЦЬ**, -млю́, -мі́ш, -мі́ць. Паставіць у няёмкае становішча; падкусіць.

**ПАДКУ́СЛІВЫ**, -ая, -ае. Які гаворыць з'едлівыя, непрыемныя словы.

**ПАДЛАБУ́НІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Падлашчыцца, падлізацца.

**ПАДЛАВІ́ЦЬ**, -лаўлю́, -ло́віш, -ло́віць. 1. Падпільнаваўшы, злавіць. 2. Знянацку застаць. 3. Злавіць на чым-н. няўдала сказаным, напісаным.

**ПАДЛАГО́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся; -дзіцца. Падлашчыцца да каго-н., дагаджаючы.

**ПАДЛАГО́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Зрабіць добрае каму-н., дагадзіць.

**ПАДЛА́ДЗІЦЦА**, -ла́джуся, -ла́дзішся, -ла́дзіцца. Прыстасавацца, прыладзіцца да руху, дзеяння каго-, чаго-н.; жадаючы дагадзіць, прыстасавацца да чыіх-н. патрабаванняў, поглядаў і пад.

**ПАДЛА́ШЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Ліслівасцю дабіцца прыхільнасці, ласкі і пад.

**ПАДЛЕ́НЬВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Крыху ленавацца.

**ПАДЛІ́ЗА**, -ы. Той, хто падлізваецца да каго-н.

**ПАДМАГЧЫ́**, -магу́, -мо́жаш, -мо́жа. Трохі памагчы.

**ПАДМА́Н**, -у. 1. Мана, хлусня, ашуканства. 2. Памылковае, ілюзорнае ўяўленне; абман.

**ПАДМА́НВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Дражніцца, узбуджаючы чыю-н. цікаўнасць.

**ПАДМА́НЛІВЫ**, -ая, -ае. Які тоіць у сабе падман, служыць асновай для няправільнага меркавання; падманны.

**ПАДМА́ННЫ**, -ая, -ае. Які ўводзіць у зман.

**ПАДМАНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. 1. Наўмысна сказаўшы няпраўду, увесці ў зман каго-н. 2. Не выканаць абяцання, не апраўдаць чыіх-н. спадзяванняў; падвесці, ашукаць. 3. Абмануць, салгаць.

**ПАДМА́НШЧЫК**, -а. Той, хто падманвае каго-н.

**ПАДМАЦУ́НАК**, -нку. Тое, што падмацоўвае сілы, надае бадзёрасці.

**ПАДМІРГНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Міргнуць, ухваляючы што-н. або робячы намёк ці звяртаючы ўвагу на што-н.

**ПАДМО́ГА**, -і. Дапамога, падтрымка.

**ПАДМО́СТКІ**, -аў. 1. Драўляны памост на ўзвышэнні. 2. Сцэна.

**ПАДНЯБЕ́ННЕ**, -я. Верхняя частка поласці рота.

**ПАДНЯВО́ЛІЦЬ**, -во́лю, -во́ліш, -во́ліць. Зрабіць паднявольным.

**ПАДНЯВО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Залежны, падначалены; прыгнечаны. 2. Які

адбываецца не па сваёй волі, прымусовы.

**ПАДНЯДЗЕ́ЛІЦЦА**, -дзе́люся, -дзе́лішся, -дзе́ліцца. Надаць сабе святочны выгляд, прыбрацца.

**ПАДО́БНЫ**, -ая, -ае. Які мае падабенства з кім-, чым-н., нагадвае каго-, што-н.

**ПАДРАБЯ́ЗНАСЦЬ**, -і. Прыватная дэталь, дробная акалічнасць якой-н. справы і пад.

**ПАДРАБЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Вельмі грунтоўны, дакладны, з усімі дэталямі і дробязямі.

**ПАДРЫХТАВА́ЦЦА**, -ту́юся, -ту́ешся, -ту́ецца. Падрыхтаваць сябе да чаго-н.

**ПАДРЫХТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. 1. Правесці папярэднюю працу для ажыццяўлення, выканання чаго-н.; зрабіць поўнасцю гатовым, прыдатным для выкарыстання. 2. Даць неабходныя веды, навучыць для якой-н. мэты. 3. Настроіць адпаведным чынам для ўспрымання навіны, звесткі і пад.

**ПАДРЫХТО́ЎКА**, -і. Пэўны запас ведаў, вопыту, навыкаў, атрыманых у працэсе навучання, практычнай дзейнасці.

**ПАДРЫХТО́ЎЧЫ**, -ая, -ае. 1. Які з'яўляецца падрыхтоўкай да чаго-н., папярэдні. 2. Які служыць для папярэдняга навучання, падрыхтоўкі.

**ПАДСВЕ́Т**, -у. Дадатковае святло ад чаго-н.

**ПАДСВЕ́ТКА**, -і. Дадатковае асвятленне.

**ПАДСВЯДО́МАСЦЬ**, -і. Не зусім усвядомленыя думкі, пачуцці, уяўленні.

**ПАДСВЯДО́МЫ**, -ая, -ае. Неўсвядомлены, інстынктыўны, няясны.

**ПАДСВЯЦІ́ЦЬ**, -свячу́, -све́ціш, -све́ціць. Асвяціць з якога-н. боку; даць дадатковае асвятленне, узмацніць асвятленне.

**ПАДСКО́К**, -у. 1. Скачок. 2. Прытанцоўванне.

**ПАДСЛУ́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Употай прыслухоўваючыся, пачуць што-н.; улавіць, зразумець чые-н. пачуцці, думкі і пад.

**ПАДСМЕ́ЙВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. 1. Кпіць, жартаваць з каго-, чаго-н. 2. Ціхенька смяяцца, пасмейвацца час ад часу.

**ПАДСПУ́ДНЫ**, -ая, -ае. Скрыты, патаемны.

**ПАДСТА́ВА**, -ы. Прычына, абставіны, якія даюць тлумачэнне, робяць зразумелымі ўчынкі, паводзіны і пад. каго-н.; абставіны, якія могуць быць асновай для чаго-н.

**ПАДСУ́НУЦЦА**, -нуся, -нешся, -нецца. Сунучыся, наблізіцца да каго-, чаго-н.; прысунуцца.

**ПАДСУ́НУЦЬ**, -ну, -неш, -не. 1. Сунучы, наблізіць да каго-, чаго-н.; прысунуць. 2. Засунуць пад што-н. 3. Непрыкметна падлажыць што-н.; карыстаючыся чыёй-н. няўважлівасцю, даць што-н. фальшывае, непатрэбнае, непрыдатнае. 4. Даць хабар.

**ПАДТЭ́КСТ**, -у. 1. Унутраны, прыхаваны сэнс якога-н. тэксту, выказвання. 2. Разуменне і перадача ў жывым слове сэнсу адлюстраваных у тэксце з'яў і падзей.

**ПА́ДУГА**, -і. Верхняя (гарызантальная) дапаможная дэкарацыя з паласы тканіны, якая закрывае ад гледачоў механізм верхняй часткі тэатральнай сцэны.

**ПАДУ́ЖАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Памерацца сіламі; пазмагацца.

**ПАДУ́ЖАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Перамагчы, асіліць у барацьбе; пераадолець чыё-н. супраціўленне, справіцца з кім-н.

**ПАДУЖЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які падужэў.

**ПАДУЖЭ́ЦЬ**, -эю, -эеш, -эе. Стаць дужэйшым, набрацца сіл.

**ПАДУЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Які знаходзіцца пад уладаю каго-, чаго-н., залежны; несамастойны; падпарадкаваны волі, загаду каго-, чаго-н. 2. Які паддаецца ўздзеянню, уплыву каго-, чаго-н.

**ПАДФАРБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. Крыху, злёгку пафарбаваць сабе губы, шчокі і пад.

**ПАДФАРБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Пафарбаваць злёгку, дадаткова; паднавіць афарбоўку.

**ПАДХАДЗІ́ЦЦА**, -хаджу́ся, -хо́дзішся, -хо́дзіцца. Ухадзіцца.

**ПАДХАЛІ́М**, -а. Нізкі, подлы чалавек, які дагаджае, хваліць у мэтах асабістай выгады; падлізнік.

**ПАДХАЛІМА́Ж**, -у. Паводзіны падхаліма.

**ПАДХАЛІ́МНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Паводзіць сябе як падхалім.

**ПАДХАПІ́ЦЦА**, -хаплю́ся, хо́пішся, -хо́піцца. Хутка, імкліва ўстаць, ускапіцца з месца.

**ПАДХАПІ́ЦЬ**, -хаплю́, -хо́піш, -хо́піць. 1. Схапіўшы або абхапіўшы рукамі, падняць, падтрымаць. 2. Схапіць у момант палёту, падзення. 3. Падтрымаць пачатае іншымі. 4. Пачаць падпяваць.

**ПАДХАРАШЫ́ЦЦА**, -харашу́ся, -харо́шышся, -харо́шыцца. Надаць сабе больш прыгожы выгляд.

**ПАДЦІКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Цікуючы тайком, убачыць; падгледзець, высачыць.

**ПАДЦЯ́ЦЬ**, падатну́, падатне́ш, падатне́; падатнём, падатняце́. 1. Падагнуць пад сябе або прыціснуць да сябе (ногі, калені і пад.). 2. Адсячы, падрэзаць.

**ПАДЧАПІ́ЦЬ**, -чаплю́, -чэ́піш, -чэ́піць. Сказаць што-н. з'едлівае, паставіўшы ў няёмкае, смешнае становішча.

**ПАДЧАПУРЫ́ЦЦА**, -чапуру́ся, -чапуры́шся, -чапуры́цца. Надаць сабе больш прыгожы выгляд; прыбрацца.

**ПА́ДЧАРКА**, -і і **ПА́ДЧАРЫЦА**, -ы. Няродная дачка мужа ці жонкі (родная аднаго з двух).

**ПАДЧА́С**. Калі-нікалі, іншы раз.

**ПАДЫ́БАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пайсці размерана або нязграбна.

**ПАДЫГРА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Сваёй ігрой (на сцэне, у спорце) памагчы ігры партнёра. 2. Падрабіцца, падладзіцца пад чые-н. інтарэсы і пад.

**ПАЖ**, -а. 1. У сярэднія вякі — падлетак, юнак дваранскага роду, які служыў пры двары караля або феадала; пра мужчыну, які аддана ставіцца да жанчыны, дагаджае ёй. 2. У царскай Расіі і краінах Заходняй Еўропы — малодшая прыдворная пасада. 3. У царскай Расіі — выхавальнік Пажскага корпуса.

**ПАЖАДА́ННЕ**, -я. 1. Выказанае словамі жаданне, часцей чаго-н. добрага, адрасаванае каму-н. 2. Патрабаванне, прапанова.

**ПАЖАДА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, які патрэбны; які адпавядае інтарэсам, патрабаванням. 2. Такі, якога чакаюць; жаданы; прыемны, мілы.

**ПАЖАДА́ЦЦА**, -а́ецца. Захацецца чаго-н.

**ПАЖАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Выказаць або займець якое-н. жаданне; захацець. 2. Выказаць пажаданне.

**ПАЖА́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. Выказаць сваю жальбу, незадаволенасць; паскардзіцца на што-н.

**ПАЖАЛКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Пашкадаваць аб чым-н.

**ПАЖАРТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. 1. Сказаць жарт; сказаць або зрабіць што-н. дзеля жарту; пасмяяцца з каго-, чаго-н. 2. Жартаваць некаторы час.

**ПАЖВАВЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў жвавым, жвавейшым.

**ПАЖВАВЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Стаць жвавым, жвавейшым.

**ПАЖЛУ́КЦІЦЬ**, -жлу́кчу, -жлу́кціш, -жлу́кціць. Выжлукціць (выпіць) усё, многае.

**ПАЖУРЫ́ЦЦА**, -журу́ся, -жу́рышся, -жу́рыцца. Журыцца некаторы час.

**ПАЖУРЫ́ЦЬ**, -журу́, -жу́рыш, -жу́рыць. Крыху або злёгку журыць.

**ПАЖЫЛЫ́**, -а́я, -о́е. Немалады, у гадах; характэрны для немаладога чалавека.

**ПАЖЭСТЫКУЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Жэстыкуляваць нейкі час.

**ПАЗАБАЎЛЯ́ЦЦА**, -ля́юся, -ля́ешся, -ля́ецца. Забаўляцца некаторы час.

**ПАЗАБАЎЛЯ́ЦЬ**, -ля́ю, -ля́еш, -ля́е. Забаўляць некаторы час.

**ПАЗАБЫВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Забыць усё, многае або ўсіх, многіх.

**ПАЗАЛЕ́ТАСЬ**, Два гады назад.

**ПАЗАЛЕ́ТАШНІ**, -яя, -яе. Які быў пазалетась; які мае два гады, захоўваецца два гады.

**ПАЗАЛЯЦА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Заляцацца да каго-н. на працягу нейкага часу.

**ПАЗАПЛЮ́ШЧВАЦЬ**, -ае, -аеш, -аеце, -аюць. Заплюшчыць вочы.

**ПАЗАРА́НАК**, -нку. Пачатак світання, досвітак.

**ПАЗАРЭ́З**. Вельмі, да крайнасці.

**ПАЗА́ЎТРА**. Паслязаўтра.

**ПАЗАЎТРАШНІ**, -яя, -яе. Пасля-заўтрашні.

**ПАЗАЎЧАРАШНІ**, -яя, -яе. Які быў пазаўчора.

**ПАЗАЎЧОРА**. Два дні назад.

**ПАЗАХІНАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Захінуць, засланіць усё, многае або ўсіх, многіх.

**ПАЗАХУТВАЦЦА**, -аемся, -аецеся, -аюцца. Захутацца, укрыцца чым-н. — пра ўсіх, многіх.

**ПАЗАХУТВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Захутваць усіх, многіх або ўсё, многае.

**ПАЗБАВІЦЦА**, -збаўлюся, -збавішся, -збавіцца. 1. Збавіцца, вызваліцца ад каго-, чаго-н. 2. Страціць што-н., застацца без чаго-н.

**ПАЗБАВІЦЬ**, -збаўлю, -збавіш, -збавіць. 1. Адняць што-н., пакінуць без чаго-н. 2. Вызваліць ад чаго-н., даць магчымасць не рабіць чаго-н.

**ПАЗБЫЦЦА**, -збудуся, -збудзешся, -збудзецца. 1. Збавіцца, вызваліцца ад каго-, чаго-н.; пазбегнуць чаго-н. 2. Страціць што-н.

**ПАЗБЯГАЦЦА**, -аецца, -аемся, -аецеся. Збегчыся — пра ўсіх, многіх.

**ПАЗБЯГАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Унікаць каго-, чаго-н., ухіляцца ад каго-, чаго-н.; старацца не рабіць чаго-н. 2. Пазбаўляцца, вызваляцца ад чаго-н.

**ПАЗВАЛАКАЦЦА**, -аецца, -аемся, -аецеся, -аюцца. 1. Сысці куды-н. — пра ўсіх, многіх. 2. Сабрацца ў адно месца — пра ўсіх, многіх.

**ПАЗВАНЧЭЦЬ**, -эе. Стаць, зрабіцца больш звонкім.

**ПАЗДАРОЎКАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Павітацца.

**ПАЗДЗЕКАВАЦЦА**, -куюся, -куешся, -куецца. Здзекавацца некаторы час з каго-н.

**ПАЗДЗІМАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Здзьмуць адкуль-н. усё, многае.

**ПАЗДЗЬМУХВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Здзьмухнуць усё, многае.

**ПАЗЁР**, -а. Той, хто схільны або любіць пазіраваць, разлічваючы на знешні эфект.

**ПАЗІЦЫЯ ГУКАЎТВАРЭННЯ**. Пэўнае палажэнне органаў моўнага апарату ў час утварэння гукаў.

**ПАЗЛАВАЦЦА**, -злуюся, -злуешся, -злуецца; -злуёмся, -злуяцеся. Злавацца некаторы час на каго-, што-н.

**ПАЗЛАВАЦЬ**, -злую, -злуеш, -злуе; -злуём, -злуяце. Злаваць на каго-н. некаторы час.

**ПАЗМРАЧНЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Стаць, зрабіцца змрочным, змрачнейшым.

**ПАЗНАВАТЫ**, -ая, -ае. Даволі позні.

**ПАЗНАННЕ**, -я. Працэс аб'ектыўнага азнаямлення з акаляючым светам.

**ПАЗНЕЙ**. Праз нейкі час.

**ПАЗНІЦЦА**, пазнюся, познішся, позніцца. 1. З'яўляцца пазней вызначанага часу. 2. Выконваць што-н. пазней, чым трэба, чым прызначана. 3. Затрымлівацца дзе-н.

**ПАЗНОГАЦЬ**, -гця. Плоскае рагавое засцерагальнае ўтварэнне на тыльным баку канцавых фалангаў пальцаў.

**ПАЗЯХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Міжвольна глыбока ўдыхаць і адразу ж выдыхаць паветра шырока адкрытым ротам (пры жаданні спаць, пры стоме).

**ПАІНФАРМАВАЦЬ**, -мую, -муеш, -муе. Паведаміць каму-н. якія-н. звесткі, давесці да ведама.

**ПАІРАНІЗАВАЦЬ**, -зую, -зуеш, -зуе. Іранізаваць некаторы час.

**ПАКАЗ**, -у. 1. Тэатралізаванае выступленне; спектакль. 2. Псіхафізічныя дзеянні рэжысёра, накіраваныя на тое, каб падказаць акцёру шлях сцэнічнага ўвасаблення канкрэтнай ролі, вобраза.

**ПАКАЗНЫ**, -ая, -ое. Які разлічаны на знешні эфект; які не адпавядае сапраўднасці, прытворны.

**ПАКАКЕТНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Какетнічаць некаторы час.

**ПАКАЛМАЦІЦЬ**, -мачу, -маціш, -маціць. Зрабіць калматым.

**ПАКАРЫЦЦА**, -каруся, -корышся, -корыцца. 1. Падпарадкавацца чыёй-н. сіле, уладзе, выявіўшы пакорлівасць. 2. Змірыцца з чым-н., адмовіўшыся ад барацьбы.

**ПАКАРЫЦЬ**, -кару, -корыш, -корыць. 1. Сілай, прымусам падпарадкаваць сваёй уладзе; заваяваць. 2. Моцна ўздзейнічаць, падпарадкаваць сабе;

выклікаць сімпатыю, давер.

**ПАКАХА́ЦЦА**, -а́емся, -а́ецеся, -а́юцца. Пакахаць адно аднаго.

**ПАКАХА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Адчуць каханне да каго-н.; палюбіць; закахацца.

**ПАКАЯ́ННЕ**, -я. Прызнанне сваіх памылак.

**ПАКАЯ́ННЫ**, -ая, -ае. Які змяшчае ў сабе пакаянне.

**ПАКА́ЯЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Прызнаць сваю віну, памылку перад кім-н. 2. Усвядоміўшы сваю памылку, пашкадаваць аб зробленым.

**ПАКВА́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Спакусіцца чым-н., пагнацца на што-н.

**ПАКВІТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Разлічыцца з доўгам; адпомсціць каму-н. за што-н.

**ПАКЕ́ПЛІВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Насміхацца.

**ПАКЛА́ДЗІСТЫ**, -ая, -ае. Уступчывы, згаворлівы, мяккі па характары.

**ПАКЛАНЕ́ННЕ**, -я. Адданае захапленне, глыбокая павага.

**ПАКЛАНІ́ЦЦА**, -ланю́ся, -ло́нішся, -ло́ніцца. 1. Зрабіць паклон (як знак прывітання, удзячнасці, павагі, у час малітвы і пад.). 2. Уніжана прасіць.

**ПАКЛАНЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. 1. Слепа адносіцца да каго-, чаго-н. як да найвышэйшай сілы. 2. Аддаваць перавагу каму-н. у чым-н., глыбока паважаць, шанаваць.

**ПАКЛАПАТА́ЦЬ**, -пачу́, -по́чаш, -по́ча. Прыкласці сілы, намаганні, каб зрабіць што-н., дамагчыся чаго-н.

**ПАКЛАПАЦІ́ЦЦА**, -пачу́ся, -по́цішся, -по́ціцца. 1. Патурбавацца, панепакоіцца з выпадку чаго-н., каб забяспечыць кім-, чым-н. 2. Праявіць клопат аб чым-н., пра каго-н.

**ПАКЛЁП**, -у. Ілжывае абвінавачанне.

**ПАКЛЁПНІК**, -а. Той, хто паклёпнічае, распаўсюджвае паклёп.

**ПАКЛЁПНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Займацца паклёпам, распаўсюджваць пра каго-н. заведама ілжывыя чуткі; нагаворваць на каго-н.

**ПАКЛО́Н**, -у. 1. Знак прывітання, павагі, удзячнасці і пад., які выяўляецца ў нахіленні галавы або верхняй часткі тулава. 2. Шчырае, сардэчнае пажаданне шчасця, дабра ў пісьмовай або вуснай форме.

**ПАКЛО́ННІК**, -а. 1. Той, хто пакланяецца каму-н. як Богу. 2. Той, хто з захапленнем, з павагай адносіцца да каго-, чаго-н. 3. Той, хто праяўляе ў адносінах да дзяўчыны, жанчыны сваю сімпатыю.

**ПАКЛЫ́ПАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пайсці павольна, стомленай хадою, хістаючыся, кульгаючы.

**ПАКО́ЛЬКІ**. Ужываецца пры дададных прычынных сказах у значэнні: так як, таму што.

**ПАКО́РА**, -ы. 1. Поўнае падпарадкаванне, пакорнасць. 2. Паслушэнства, пакорлівае прыняцце лёсу.

**ПАКО́РЛІВАСЦЬ**, -і. Уласцівасць пакорлівага; паслухмянасць.

**ПАКО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка пакараецца каму-, чаму-н., паслухмяны, падатлівы; які выражае паслухмянства

**ПАКПІ́ЦЬ**, -плю́, -пі́ш, -пі́ць. Сказаць з'едлівы жарт; з'едліва пасмяяцца з каго-, чаго-н., паздзекавацца.

**ПАКРАКТА́ЦЬ**, -кракчу́, -крэ́кчаш, -крэ́кча і **ПАКРАХТА́ЦЬ**, -крахчу́, -крэ́хчаш, -крэ́хча. Некаторы час кра-таць (крахтаць).

**ПАКРАСАВА́ЦЦА**, -су́юся, -су́ешся, -су́ецца. Некаторы час красавацца.

**ПАКРЫВІ́ЦЦА**, -крыўлю́ся, -кры́вішся, -кры́віцца. Зрабіць грымасу ад якога-н. пачуцця; скрывіцца.

**ПАКРЫВІ́ЦЬ**, -крыўлю́, -кры́віш, -кры́віць. На некаторы час скрывіць у грымасе твар, рот, губы ад незадавальнення ці якога-н. іншага пачуцця.

**ПАКРЫ́КВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Крычаць зрэдку, час ад часу; камандаваць, распараджацца, павышаючы голас.

**ПАКРЫСЕ́**. 1. Патроху, у невялікай колькасці, ступені, меры. 2. Павольна, паступова.

**ПАКРЫ́ЎДЖАНЫ**, -ая, -ае. Які выражае пачуццё крыўды.

**ПАКРЫ́ЎДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Адчуць крыўду, успрыняць што-н. як крыўду.

**ПАКРЫ́ЎДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. 1. Прычыніць крыўду каму-н. 2. Абдзяліць каго-н. чым-н., даць менш, чым патрэбна.

**ПАКРЫ́ХУ**. Тое, што і п а к р ы с е (у 2 знач.).

**ПАКУДЛА́ЦІЦЬ**, -ла́чу, -ла́ціш, -ла́ціць. Зрабіць кудлатым; узлахмаціць.

**ПАКУДЛА́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Растрапаны, узлахмачаны.

**ПАКУМІ́ЦЦА**, -кумлю́ся, -ку́мішся, -ку́міцца. Стаць кумамі.

**ПАКУ́ТА**, -ы. Вялікая фізічная або душэўная мука; мучэнне.

**ПАКУ́ТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе. 1. Цярпець пакуты; мучыцца. 2. Пераносіць якія-н. нягоды, цяжкасці, здзекі.

**ПАКУ́ТЛІВА**. 1. З адчуваннем, пачуццём пакуты; выяўляючы, паказваючы пакуту; прычыняючы пакуту. 2. Цяжка, нязносна.

**ПАКУ́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які прычыняе пакуты, мукі. 2. Які выяўляе пакуту, муку; выкліканы пакутай, мукай.

**ПАКУ́ТНІК**, -а. Чалавек, які перанёс, пераносіць пакуты.

**ПАКУ́ТНІЦКІ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да пакутніка і пакутніцтва.

**ПАКУ́ТНІЦТВА**, -а. Стан, доля пакутніка.

**ПАЛАГАДНЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў, зрабіўся больш лагодным, памяркоўным.

**ПАЛАГАДНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Стаць больш лагодным, памяркоўным; падабрэць; стаць больш прыветлівым, сардэчным (пра голас, твар, погляд і пад.). 2. Стаць цяплейшым; памякчэць.

**ПАЛА́ДЗІЦЬ**, -ла́джу, -ла́дзіш, -ла́дзіць. 1. Наладзіць з кім-н. добрыя адносіны; ужыцца. 2. Памірыцца з кім-н. пасля сваркі.

**ПАЛАТАЛІЗА́ЦЫЯ**, -і. Змякчэнне зычных гукаў шляхам дабавачнага пад'ёму сярэдняй часткі языка да паднябення.

**ПАЛАХЛІ́ВАСЦЬ**, -і. Уласцівасць палахлівага.

**ПАЛАХЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Нясмелы чалавек.

**ПАЛАХЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які лёгка палохаецца, баязлівы; які выражае нясмеласць, прасякнуты баязлівасцю. 2. Мітуслівы, дрыготкі.

**ПАЛА́ШЧЫЦЦА**, -шчуся, -шчышся, -шчыцца. Лашчыцца некаторы час.

**ПАЛАЯ́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Пасварыцца з кім-н.

**ПАЛЕ́ГЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Зрабіць менш цяжкім; зменшыць цяжар чаго-н.; змякчыць, паслабіць.

**ПАЛЕ́ЖВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Праводзіць час лежачы.

**ПАЛЕМІЗАВА́ЦЬ**, -зу́ю, -зу́еш, -зу́е. Весці палеміку; спрачацца, пярэчыць.

**ПАЛЕМІ́СТ**, -а. Той, хто ўмее або любіць палемізаваць.

**ПАЛЕНАВА́ЦЦА**, -ляну́юся, -ляну́ешся, -ляну́ецца. 1. Не зрабіць чаго-н. з-за ляноты. 2. Ленавацца некаторы час.

**ПАЛЕТУЦЕ́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Аддацца марам на працягу нейкага часу.

**ПАЛЁГКА**, -і. Пачуццё заспакаення, вызвалення ад трывогі, непакою і пад.

**ПАЛІЧЫ́ЦЦА**, -лічу́ся, -лі́чышся, -лі́чыцца. 1. Адпомсціць, адплаціць каму-н.; паквітацца за што-н. 2. Прыняць у разлік каго-, што-н., улічыць.

**ПАЛО́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Прыходзіць у стан страху, боязі; апасацца чаго-н., трывожыцца.

**ПАЛО́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Наводзіць страх, боязь; страшыць кім-, чым-н.; успуджваць; выклікаць трывогу.

**ПАЛУ́ЗВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Час ад часу лузаць.

**ПАЛУ́СКВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Час ад часу лускаць.

**ПАЛЫМНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. 1. Пакрывацца румянцам. 2. Быць ахопленым якім-н. вельмі моцным пачуццём.

**ПАЛЫМЯ́НАСЦЬ**, -і. Уласцівасць палымянага.

**ПАЛЫМЯ́НЫ**, -ая, -ае. Палкі, страсны; які выражае страснасць, палкасць.

**ПАЛЮБІ́ЦЦА**, -люблю́ся, -лю́бішся, -лю́біцца. 1. Спадабацца каму-н., прыйсціся даспадобы. 2. Пакахаць адно аднаго.

**ПАЛЮБІ́ЦЬ**, -люблю́, -лю́біш, -лю́біць. 1. Адчуць любоў да асобы другога полу; пакахаць. 2. Адчуць глыбокую прыязнасць да каго-, чаго-н., стаць адданым

каму-, чаму-н. 3. Адчуць схільнасць, цягу да чаго-н.; упадабаць што-н.; адчуць замілаванне да чаго-н.

**ПАЛЮБОЎНІК**, -а. Мужчына ў адносінах да жанчыны, з якою знаходзіцца ў пазашлюбнай палавой сувязі.

**ПАЛЮБОЎНІЦА**, -ы. Жанчына ў адносінах да мужчыны, з якім знаходзіцца ў пазашлюбнай палавой сувязі.

**ПАЛЮБОЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Заснаваны на ўзаемнай згодзе. 2. Любоўны; ласкавы.

**ПАЛЯГЧЭННЕ**, -я. Пачуццё лёгкасці, вызвалення ад чаго-н.

**ПАЛЯСКВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Ляскаць час ад часу.

**ПАМАДА**, -ы. Пахучая касметычная мазь.

**ПАМАДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Мазацца памадай.

**ПАМАЖНЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Зрабіцца мажным, мажнейшым.

**ПАМАЗГАВАЦЬ**, -гую, -гуеш, -гуе. Падумаць над чым-н.; падумаць некаторы час.

**ПАМАЛАДЗЕЛЫ**, -ая, -ае. Які набыў больш малады выгляд; адчуў сябе маладзейшым.

**ПАМАЛЕНЬКУ**. 1. Патроху, у невялікай колькасці. 2. Не спяшаючыся, паціху. 3. Паступова, не адразу. 4. Асцярожна.

**ПАМАНЕРНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Манернічаць некаторы час.

**ПАМАРКА**, -і. Папраўка ў тэксце, зробленая ад рукі.

**ПАМАРКОЦІЦЦА**, -кочуся, -коцішся, -коціцца. Пасумаваць, патужыць, пажурыцца некаторы час.

**ПАМАРУДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Не спяшацца, пачакаць рабіць што-н.

**ПАМАСІРАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Масіраваць некаторы час.

**ПАМАЎЗА**, -ы. Шкоднік, свавольнік.

**ПАМАЎЗЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Шкадлівы. 2. Ласы, прагны да чаго-н. смачнага, прыгожага.

**ПАМАЎЧАЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Не гаварыць некаторы час.

**ПАМАЦАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Распазнаючы, даследуючы, пакратаць каго-, што-н. 2. Пашукаць некаторы час вобмацкам.

**ПАМАЦНЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Зрабіцца моцным, мацнейшым.

**ПАМЕРКАВАЦЦА**, -мяркуюся, -мяркуешся, -мяркуецца. Прыйсці да ўзаемнага пагаднення; паладзіць.

**ПАМЕРКАВАЦЬ**, -мяркую, -мяркуеш, -мяркуе. 1. Усебакова разгледзець, абдумаць што-н., дзелячыся думкамі, меркаваннямі. 2. Падумаўшы, разважыць, прыйсці да якога-н. вываду.

**ПАМІЗАРНЕЛЫ**, -ая, -ае. Які зрабіўся мізэрным; схуднелы.

**ПАМІЛАВАЦЬ**, -лую, -луеш, -луе. 1. Дараваць віну; пашкадаваць каго-н. 2. Адмяніць або змякчыць пакаранне асуджанаму.

**ПАМІНКІ**, -нак. Звычай ушаноўваць памяць нябожчыка частаваннем за жалобным сталом пасля пахавання і ў памінальныя дні: трэці, шосты, дзявяты, саракавы (сарачыны), паўгодкі і гадавіну пасля смерці, а таксама на радуніцу. У беларусаў існуе таксама звычай агульнага памінання ўсіх памерлых родзічаў — дзяды.

**ПАМІРГВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Міргаць час ад часу.

**ПАМІРЫЦЦА**, -міруся, -мірышся, -мірыцца. Спыніць спрэчку, дайсці да згоды, пачаць жыць у згодзе.

**ПАМІРЫЦЬ**, -міру, -мірыш, -мірыць. Наладзіць згоду, мірныя адносіны паміж кім-, чым-н.

**ПАМКНЕННЕ**, -я. Намер, спроба што-н. зрабіць.

**ПАМЛЕЦЬ**, -млее, -млеем, -млеюць. 1. Аслабець, здранцвець, анямець (пра часткі цела). 2. Страціць прытомнасць ад якога-н. моцнага перажывання, пачуцця і пад. — пра ўсіх, многіх.

**ПАМОЎЧВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Устрымлівацца або ўхіляцца ад размоў, захоўваць маўчанне.

**ПАМОЧНІК РЭЖЫСЁРА**. Арганізацыйна-тэхнічны памочнік рэжысёра-пастаноўшчыка. П. р. кантралюе правільнае выкананне рэпетыцыйнага раскладу, своечасовую падрыхтоўку сцэны для ўсіх відаў рэпетыцый («застольных», «выгарадачных», штодзённых

сцэнічных, «прагонных», генеральных і інш.), вызначае ступень падрыхтаванасці неабходных для рэпетыцый і спектакляў аксесуараў (неабходнай мэблі, бутафорыі, рэквізіту і пад.). Калі П. р. кіруе ходам спектакля, яго называюць вядучым спектакля. Ён забяспечвае, пры дапамозе спецыяльнай сцэнічнай сігналізацыі, своечасовы выхад акцёраў на сцэну, своечасовае ўключэнне шумавых, гукавых, светлавых і інш. сцэнічных эфектаў, кіруе зменамі дэкарацый. Працуе па загадзя складзенай партытуры, г. зн. па тым экземпляры п'есы, дзе адзначана, што павінны рабіць у кожны момант спектакля рабочыя сцэны. У рускім тэатры П. р. часта называлі сцэнарыусам.

**ПАМПУ́ШКА**, -і. Аб тоўстым, пульхным дзіцяці, жанчыне.

**ПАМУЖНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Стаць больш развітым фізічна; узмужнець.

**ПАМФЛЕ́Т**, -а. Жанр публіцыстыкі, вострасатырычны твор, які мае на мэце выкрыццё пэўных з'яў грамадскага ладу, поглядаў і дзеянняў канкрэтных асоб. Стылю П. уласцівы адкрытая тэндэнцыйнасць, экспрэсіўнасць, вобразнасць характарыстык.

**ПАМЫ́ЛКА**, -і. Няправільнасць у дзеяннях, учынках, выказваннях, думках і інш.

**ПАМЫ́ЛЯЦЬ**, -яю, -яеш, -яе. Паварушыць, парухаць губамі.

**ПАМЫ́СНЫ**, -ая, -ае. Жаданы, згодны з думкамі; удалы, шчаслівы.

**ПАМЯКЧЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які страціў суровасць, стаў больш лагодным.

**ПАМЯКЧЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. Страціць суровасць, стаць больш лагодным; стаць больш прыветлівым, сардэчным (пра твар, голас і пад.).

**ПАМЯРКО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Падатлівы, уступчывы, які лёгка прыстасоўваецца да іншых. 2. Які выяўляе мяккасць, цярпімасць; добразычлівы. 3. Не схільны да крайнасцей.

**ПАМЯРЦВЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Такі, як у мёртвага, смяротна-бледны, змярцвелы; застылы.

**ПА́МЯТЛІВЫ**, -ая, -ае. Які мае добрую памяць, здольны лёгка запамінаць.

**ПА́МЯЦЬ**, -і. Здольнасць запамінаць, захоўваць і аднаўляць у свядомасці ранейшыя ўражанні.

**ПАНАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Які мае панскія замашкі.

**ПАНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. 1. Мець уладу над кім-, чым-н., уладарыць. 2. Быць галоўным у чым-н., дзе-н.; першынстваваць. 3. Жыць у раскошы.

**ПАНА́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Які панадзіўся рабіць што-н. непажаданае, лёгка паддаецца на што-н. непажаданае.

**ПАНА́ДНЫ**, -ая, -ае. Такі, што прыцягвае да сябе якімі-н. якасцямі; прыемны, прывабны.

**ПАНАРА́МНАЯ АВАНСЦЭ́НА**. Авансцэна, бакавыя часткі якой размешчаны ўздоўж бакавых сцен глядзельнай залы.

**ПАНЕГІ́РЫК**, -а. 1. У Старажытнай Грэцыі і Рыме — надмагільная пахавальная прамова, якая ўслаўляе подзвігі памерлага. 2. Празмерна хвалебны водзыў аб кім-, чым-н.; пра літаратурны твор, які з'яўляецца хвалебным водзывам аб кім-, чым-н., пахвалой.

**ПАНЕ́НКА**, -і. 1. Незамужняя дачка пана. 2. Маладая дзяўчына.

**ПАНІ́КЛЫ**, -ая, -ае. 1. Схілены, прыгнуты. 2. Прыгнечаны, засмучаны; разбіты духоўна.

**ПАНІ́КНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. 1. Схіліцца, апусціцца, прыгнуцца. 2. Паддацца прыгнечанаму настрою; стаць разбітым духоўна.

**ПАНІ́Ч**, -а́. 1. Сын пана; малады пан. 2. Спешчаны чалавек; беларучка.

**ПА́ННА**, -ы. 1. Незамужняя дачка пана. 2. Форма ветлівага звароту да маладой дзяўчыны.

**ПАНТАМІ́М**, -а. Прадстаўленне ў Старажытным Рыме, змест і эмоцыі якога перадаваліся без слоў, жэстамі і пластыкай; акцёр — выканаўца П.

**ПАНТАМІ́МА**, -ы. Тэатральны спектакль, у якім дзейныя асобы выражаюць свае думкі і пачуцці не словамі, а мімікай, жэстамі, пластычнымі рухамі; адпаведны жанр у тэатральным мастацтве; цыркавы паказ феерычнага характару, у якім асобныя нумары злучаны пэўным сюжэтам.

**ПАНТАМІ́МІКА**, -і. Выразныя рухі

чалавечага цела, якія поруч з мімікай служаць формай выражэння ўнутраных перажыванняў.

**ПАНТО́ФЛІ**, -яў. Дамашнія туфлі, звычайна без заднікаў.

**ПАНУ́РА**. Змрочна, непрыветліва.

**ПАНУ́РЫ**, -ая, -ае. 1. Непрыветлівы, хмурны, суровы (пра чалавека). 2. Які выклікае сваім выглядам цяжкае пачуццё, змрочны. 3. З апушчанай галавой, панылы, бязрадасны.

**ПАНУ́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Хмурны, непрыветлівы, нелюдзімы (пра чалавека).

**ПАНУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Апусціць галаву, паныла схіліцца.

**ПАНЫ́ЛА**. Пра панылы настрой, які адчувае хто-н.; пра акружэнне, якое наводзіць панылы настрой.

**ПАНЫ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які мае хмурны, тужлівы, прыгнечаны настрой; сумны, маркотны; бязрадасны.

**ПАНЯВЕ́РКА**, -і. Няпэўны стан, сумненне, нерашучасць.

**ПАНЯ́ЦЦЕ**, -я. 1. Разуменне, якое адлюстроўвае найбольш агульныя істотныя ўласцівасці, сувязі і адносіны прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці. 2. Уяўленне аб чым-н.; веданне чаго-н.; *звычайна мн.* (паня́цці, -яў) сукупнасць поглядаў на што-н.; узровень разумення чаго-н.; здольнасць разабрацца ў чым-н.; разуменне, меркаванне.

**ПАПІКНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Выказаць каму-н. нездавальненне, дакор; папракнуць.

**ПАПЛАЦІ́ЦЦА**, -плачу́ся, -пло́цішся, -пло́ціцца. Панесці страту, быць пакараным у адплату за што-н.

**ПАПЛЕ́ЧНІК**, -а. Таварыш па справе.

**ПАПЛЯВУ́ЗГАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Гаварыць абы-што некаторы час.

**ПАПЛЯ́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Знішчыць усё, многае або ўсіх, многіх.

**ПАПЛЯ́СКАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пляснуць некалькі разоў запар.

**ПАПО́МНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Надоўга запомніць (што-н. непрыемнае).

**ПАПО́МСЦІЦЦА**, -по́мшчуся, -по́мсцішся, -по́мсціцца. Адпомсціць, адплаціць за нанесеную каму-н. крыўду.

**ПАПРАКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Выказваць дакор, нездавальненне чым-н., дакараць каго-н.; абвінавачваць у чым-н., асуджаць за што-н.

**ПАПРАСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Апрацаваць гарачым прасам што-н.; выпрасаваць.

**ПАПРА́ЎДЗЕ**. На самай справе, сапраўды.

**ПАПРО́К**, -у. Дакор, незадавальненне, абвінавачанне, выказаныя словамі, позіркам і пад.

**ПАПРО́СТУ**. Проста, непасрэдна; без цырымоніі.

**ПАПЫТА́ННЕ**, -я. Дазвол.

**ПАПЫТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Задаць пытанне, каб даведацца пра што-н. 2. Папрасіць дазволу на што-н., звярнуцца з просьбай.

**ПАПЯРЭ́ДНЕ**. Перад чым-н., раней чаго-н.

**ПАПЯРЭ́ДНІК**, -а. Той, хто займаў якую-н. пасаду, выконваў якія-н. абавязкі раней каго-н.; той, хто сваёй дзейнасцю падрыхтаваў дзейнасць каго-н. іншага.

**ПАРАГАТА́ЦЬ**, -рагачу́, -рагочаш, -раго́ча. Уволю пасмяяцца.

**ПАРА́ДА**, -ы. Прапанова, як дзейнічаць, рада.

**ПАРА́ДАВАЦЦА**, -дуюся, -дуешся, -дуецца. Адчуць радасць, задавальненне.

**ПАРАДЗІРАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Падаць (падаваць) у парадыйным выглядзе.

**ПАРА́ДЗІЦЦА**, -ра́джуся, -ра́дзішся, -ра́дзіцца. 1. Папрасіць парады ў каго-н. 2. Абмяняцца думкамі, парадамі; параіцца.

**ПАРА́ДЗІЦЬ**, -ра́джу, -ра́дзіш, -ра́дзіць. Даць параду, падказаць, як дзейнічаць.

**ПАРАКСІ́ЗМ**, -а. 1. Прыступ якога-н. душэўнага ўзбуджэння, пачуцця і знешняя яго праява. 2. Момант п'есы, калі драматычнае напружанне дасягае свайго апагею, найчасцей пасля павольнага пад'ёму дзеяння і якраз перад катастрофай, у кульмінацыйны момант драматычнай крывой.

**ПАРАТУ́НАК**, -нку. 1. Ратунак, дапамога ў бядзе. 2. Выхад з цяжкага становішча.

**ПАРАТЭ́КСТ**, -у. Тэкст, які суправаджае дыялогі п'есы. П. уключае назву п'есы, спіс дзейных асоб, часавыя і прасторавыя ўказанні, апісанні дэкарацый, дыдаскаліі, а таксама любы суправаджальны дыскурс (напрыклад, прысвячэнне, прадмова і пад.).

**ПАРАЎНА́ННЕ**, -я. 1. Супастаўленне каго-, чаго-н. для выяўлення падабенства ці розніцы або для вызначэння перавагі аднаго над другім. 2. Мастацкі сродак, які заключаецца ў тым, што параўноўваюцца падобныя ў чым-н. прадметы, з'явы.

**ПАРАФРА́ГМА**, -ы. У антычным тэатры — пераносная шырма.

**ПАРАФРА́ЗА**, -ы. 1. Пераказ сваімі словамі літаратурнага твора, а таксама скарочаны выклад (адаптацыя) вялікіх мастацкіх твораў. 2. Пашыраны ў 19 ст. пераклад чужых музычных тэм з самастойнымі варыяцыямі, зменамі, дадаткамі.

**ПАРАШЫ́ЦЬ**, -шу́, -шы́ш, -шы́ць; -шы́м, -шыце́. 1. Прыняць рашэнне, вырашыць. 2. Падумаўшы, разважыўшы, прыйсці да якога-н. вываду, заключэння.

**ПАРО́ДЫЯ**, -і. 1. Твор, сатырычна або камічна падроблены пад іншы твор. 2. Знешняе, няўдалае перайманне чаго-н., скажонае падабенства да чаго-н.

**ПАРО́НІМЫ**, -аў. Словы, блізкія па гучанні і структуры, але розныя па значэнні.

**ПАРТА́ЛЬНАЯ КУЛІ́СА**. Куліса, якая знаходзіцца за парталам сцэны.

**ПАРТА́ЛЬНАЯ СЦЯНА́**. Пярэдняя сцяна сцэны, у якой выразана партальная адтуліна.

**ПАРТА́ЛЫ СЦЭ́НЫ**. Правы і левы бакі архітэктурнай аркі, якая абрамляе люстра сцэны.

**ПАРТНЁР**, -а. Той, хто разам з кім-н. прымае ўдзел у тэатральных спектаклях, спартыўных гульнях, танцах і пад.

**ПАРТРЭ́Т**, -а. У літаратуры — апісанне знешняга выгляду героя (рыс твару, мімікі, жэстаў, паходкі, адзення); характэрныя рысы каго-, чаго-н.

**ПАРТЫТУ́РА**, -ы. П. тэатральная — рэжысёрскія графічныя або тэкставыя паметы, знакі, запісы, замалёўкі, якія з'яўляюцца творчымі арыенцірамі сцэнічнага ўвасаблення п'есы. Спробамі стварэння П. былі, напрыклад, іерогліфы Арто або Гратоўскага, запіскі сукупнасці дзеянняў Брэхта, рытмічныя хвалі Станіслаўскага, біямеханічныя схемы Мерхольда.

**ПАРТЫТУ́РА ЧЫТА́ННЯ**. Графічнае абазначэнне элементаў мастацкага расповяду ў тэксце літаратурных твораў.

**ПАРТЭ́Р**, -а. Ніжні паверх тэатральнай залы з месцамі для гледачоў.

**ПАРУКА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Павітацца (развітацца) за рукі.

**ПАРУ́МЗАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Паплакаць некаторы час.

**ПАРУ́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Паклапаціцца, панепакоіцца аб кім-, чым-н.

**ПАРУ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. 1. Перашкодзіць далейшай плыні, ходу чаго-н.; перапыніць. 2. Не захаваць чаго-н., парушыць што-н. 3. Скрануць, разварушыць.

**ПАРЫВА́ННЕ**, -я. Імкненне да чаго-н., жаданне, намер што-н. зрабіць.

**ПАРЫ́К**, -а́. Адзін са сродкаў грыму. Выкарыстоўваецца ў тых выпадках, калі ўласныя валасы акцёра не даюць магчымасці зрабіць неабходную для пэўнай ролі прычоску. П. дапамагае акцёру значна змяніць сваю знешнасць.

**ПАРЫ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. 1. Адбіць (адбіваць) удар. 2. Абвергнуць (абвяргаць) чые-н. довады, нападкі і пад.

**ПАРЫТЭ́Т**, -у. Прынцып роўнасці і раўнапраўя бакоў пры разборы канфліктаў і пад.

**ПАРЫ́Ў**, -ры́ву. Уздым духоўных сіл, энергіі, імкненне да чаго-н., да ажыццяўлення якіх-н. мэт; моцнае, нечаканае праяўленне якога-н. пачуцця .(радасці, злосці, захаплення і пад.).

**ПАСАВА́ЦЬ**, -су́е. Падыходзіць, адпавядаць каму-, чаму-н.

**ПАСАЛАВЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Невыразны, мутны ад стомленасці, ап'янення і пад. (пра вочы).

**ПАСКА́РДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Пажаліцца, выказаць сваё гора, незадавальненне.

**ПА́СКВІЛЬ**, -я. Зняважлівы, паклёпніцкі твор, які мае на мэце зганьбаваць, скампраметаваць асобнага чалавека, групу людзей і пад.

**ПАСЛА́ННЕ**, -я. Жанр эпісталярнай літаратуры; медытацыя, напісаная ў форме звароту да пэўнай асобы ці некалькіх асоб, нярэдка маналагічная прамова-развага або адкрыты ліст да каго-н. Адрасат П. (часам гэта асоба з гістарычнага мінулага) цікавіць аўтара не столькі сам па сабе, колькі магчымасцю, якую ён дае, каб паразважаць над пэўнымі спецыяльнымі, палітычнымі, гістарычнымі ці іншымі праблемамі.

**ПАСЛУХМЯ́НЫ**, -ая, -ае. Які слухаецца каго-н., пакорны; які лёгка падпарадкоўваецца жаданню, волі каго-н.

**ПАСЛУШЭ́НСТВА**, -а. Беспярэчнае падпарадкаванне; пакорнасць, паслухмянства.

**ПАСЛЯ́**. Потым, пазней некаторага тэрміну.

**ПАСЛЯСЛО́ЎЁ**, -я. Дадатак аўтара ці іншай асобы да літаратурнага твора або кнігі, дзе прыводзіцца інфармацыя, звязаная са зместам твора (кнігі), гісторыяй яго напісання і пад.

**ПАСМАКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Пасправабаваць на смак, пакаштаваць.

**ПАСМЯЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў смелы, смялейшы.

**ПАСМЯЯ́ЦЦА**, -смяю́ся, -смяе́шся, -смяе́цца. Выказаць смехам адносіны да каго-, чаго-н.; аднесціся да каго-, чаго-н. з насмешкай; пажартаваць з каго-, чаго-н.

**ПАСПАГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Выказаць спагаду.

**ПАСПАЧУВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Аднесціся са спачуваннем да каго-, чаго-н., выказаць спачуванне.

**ПАСПЕ́ЕЦЦА**. Не трэба спяшацца, яшчэ ёсць час.

**ПАСПЕ́ШЛІВЫ і ПАСПЕ́ШНЫ**, -ая, -ае. 1. Які прывык спяшацца; уласцівы таму, хто спяшаецца. 2. Неабдуманы, заўчасны.

**ПАСПРАЧА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Уступіць у спрэчку з кім-н.; пасварыцца, палаяцца.

**ПАСПРЫЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. 1. Стварыць спрыяльныя ўмовы для паспяховага здзяйснення чаго-н. 2. Добразычліва аднесціся да каго-, чаго-н., паспагадаць; дапамагчы.

**ПАСПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Пакаштаваць, паспрабаваць на смак. 2. Перажыць, зведаць у жыцці, на практыцы; адведаць, спазнаць.

**ПАСПЯША́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Пастарацца зрабіць што-н. хутчэй; зрабіць што-н. паспешліва, неабдумана; пагарачыцца.

**ПАСТА́ВА**, -ы. 1. Становішча корпуса, фігуры, уласціва каму-н.; фігура чалавека. 2. Поза. 3. Становішча якой-н. часткі цела.

**ПАСТАНО́ВАЧНАЯ ЧА́СТКА**. Матэрыяльная арганізацыя спектакля загадчыкам пастановачнай часткі або галоўным пастаноўшчыкам. Да з'яўлення мізансцэніравання ў 19 ст. сцэнічная праца разглядалася як адзіная пазалітаратурная дзейнасць і загадчык пастановачнай часткі займаўся арганізацыяй практычных задач. Пасля таго, як прыйшло разуменне неабходнасці агульнага кантролю за мастацкімі сродкамі, функцыі загадчыка пастановачнай часткі падзелены паміж рэжысёрам і пастаноўшчыкам.

**ПАСТАНО́ЎКА**, -і. 1. Спектакль, інсцэніроўка. 2. Становішча якой-н. часткі цела, твару; манера трымаць якую-н. частку цела.

**ПАСТАНО́ЎКА ГО́ЛАСУ**. Сукупнасць прыёмаў, пры дапамозе якіх дасягаецца максімальная эфектыўнасць дзеяння органаў, што ўдзельнічаюць у голасаўтварэнні. Мэта П. г. — дасягненне натуральнасці і нязмушанасці моўнага і вакальнага гукаўтварэння, максімальнае пашырэнне дыяпазону голасу, яго сілы, выразнасці і прыгажосці тэмбра.

**ПАСТАНО́ЎШЧЫК**, -а. Той, хто ажыццяўляе пастаноўку спектакля, фільма, канцэртнай праграмы; рэжысёр.

**ПАСТАРА́ЛЬ**, -і. У літаратуры — жанравая разнавіднасць букалічнай паэзіі; невялікі лірычны твор, у якім ідэалізавана малявалася жыццё пастухоў

і пастушак. Узнікла ў антычны перыяд літаратуры.

**ПАСТРАЖЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. Стаць строгім, стражэйшым.

**ПАСТРА́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Папужаць.

**ПАСТУПІ́ЦЦА**, -ступлю́ся, -сту́пішся, -сту́піцца. Добраахвотна пазбавіць сябе чаго-н., адмовіцца ад чаго-н. на карысць каго-, чаго-н.

**ПАСТЫДА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Пасаромецца.

**ПАСЦІЖО́Р**, -а. Спецыяліст па працы з абстрыжанымі валасамі, вырабу пасціжорскіх вырабаў у тэатры.

**ПАСЫ́Л ГО́ЛАСУ**. Здольнасць голасу пераадольваць, распаўсюджвацца на пэўную адлегласць.

**ПАТАЕ́МНЫ**, -ая, -ае. Скрыты ад іншых, схаваны; які тоіцца ў душы, запаветны, дарагі; загадкавы, таямнічы.

**ПАТАКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Паблажліва, нястрога адносіцца да каго-, чаго-н., патураць.

**ПАТА́ЧКА**, -і. Патуранне, паблажка.

**ПАТРАБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Прасіць у катэгарычнай форме, дамагацца чаго-н., прад'яўляць да каго-, чаго-н. якія-н. патрабаванні.

**ПАТРО́ХІ, ПАТРО́ХУ, ПАТРО́ШКІ і ПАТРО́ШКУ**. 1. У невялікай колькасці, няшмат. 2. Паступова, памаленьку.

**ПАТРУСІ́ЦЬ**, -трушу́, -тру́сіш, -тру́сіць. Пабегчы, пайсці дробнымі крокамі.

**ПАТРУ́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Пабегчы трушком.

**ПАТРЭ́БА**, -ы. Неабходнасць чаго-н.

**ПАТРЭ́БНА**. Неабходна, трэба.

**ПАТУ́ЗВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Час ад часу, злёгку тузаць.

**ПАТУРА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Паблажліва, нястрога адносіцца да каго-, чаго-н., рабіць паблажку каму-, чаму-н.

**ПАТУРБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. Паклапаціцца аб кім-, чым-н.

**ПАТУРБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Прычыніць клопат, неспакой, турботы каму-н.; патрывожыць.

**ПАТЭ́ТЫКА**, -і. Патэтычны, усхваляваны тон.

**ПАТЭТЫ́ЧНАСЦЬ**, -і. Усхваляванасць, страснасць.

**ПАТЭТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Поўны пафасу, усхваляваны, страсны.

**ПАЎЖА́РТАМ**. Не зусім сур'ёзна, з адценнем жартаўлівасці.

**ПА́ЎЗА**, -ы. 1. Кароткі перапынак у гучанні чаго-н. 2. Перапынак у якім-н. дзеянні, занятку, працэсе.

**ПА́ЎЗА СЭ́НСАВАЯ**. Перапынак у гучанні вуснай мовы, абумоўлены логікай зместу або рытмам.

**ПА́ЎЗА ПСІХАЛАГІ́ЧНАЯ**. Перапынак у мастацкім расповядзе, выкліканы эмацыянальнай узрушанасцю і ўсхваляванасцю, што ўзнікаюць у выканаўцы ад суперажывання лёсу літаратурнага героя, ад глыбіні ўспрымання з'яў і падзей, адлюстраваных у мастацкім творы.

**ПАЎЗАБЫЦЦЁ**, -я. Стан, блізкі да забыцця.

**ПАЎСЮ́ДНА**. Усюды.

**ПАЎСЮ́ДНЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца, бывае ўсюды.

**ПАЎТО́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Які робіцца, адбываецца другі раз. 2. Прызначаны для паўтарэння чаго-н.

**ПАХА́БНЫ**, -ая, -ае. Непрыстойны, бессаромны.

**ПАХА́БСТВА**, -а. Непрыстойнасць, бессаромнасць.

**ПАХАРАШЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. Стаць прыгожым, прыгажэйшым.

**ПАХВАЛА́**, -ы. Добры водзыў, адабрэнне.

**ПАХВАЛЬБА́**, -ы. Выхваленне сваімі справамі, учынкамі і пад.; самахвальства.

**ПАХВА́ЛЬВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Час ад часу хваліць.

**ПАХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лю́юся, -лю́ешся, -лю́ецца. Хвалявацца некаторы час.

**ПАХВАЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. Хваліцца, выхваляцца.

**ПАХІЛІ́ЦЦА**, -хілю́ся, -хі́лішся, -хі́ліцца. 1. Нахіліцца, нагнуцца. 2. Адчуць прыхільнасць да каго-, чаго-н.

**ПАХІ́ЛЫ**, -ая, -ае. Згорблены (пра чалавека).

**ПАХІСНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. 1. Страціўшы раўнавагу, хіснуцца. 2. Стаць менш устойлівым, трывалым.

**ПАХІ́СТВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Час ад часу, злёгку хістацца.

**ПАХІТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Паківаць.

**ПА́ХКІ**, -ая, -ае. Які мае моцны пах; пахучы.

**ПАХМУ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Непагодлівы, хмарны. 2. Змрочны, невясёлы.

**ПАХРЫСТО́САВАЦЦА**, -суюся, -суешся, -суецца. У праваслаўных — пацалавацца тройчы, віншуючы са святам Вялікадня.

**ПАЦВЕ́ЛЬВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Падражніцца з кім-н., пасмейвацца з каго-н.

**ПАЦВЕ́ЛЬВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Злёгку дражніць, пасмейвацца з каго-н.

**ПАЦЕ́ПВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Час ад часу злёгку сцепацца, рабіць сутаргавыя рухі (звычайна плячамі).

**ПА́ЦЕРКІ**, -рак. Дробныя ўпрыгожанні са скразнымі адтулінамі, нанізаныя на нітку або шнурок. Носяць на шыі ў выглядзе караляў; паасобныя П. выкарыстоўваюць для ўпрыгожання вопраткі, галаўных убораў, абутку. У старажытнасці П. надавалі магічнае значэнне.

**ПА́ЦЕРЫ**, -аў. Малітва.

**ПАЦЕ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. 1. Парадавацца, палюбавацца, атрымаць задавальненне. 2. Паздзекавацца з каго-, чаго-н., пазабаўляцца.

**ПАЦЕ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. 1. Парадаваць каго-н. 2. Павесяліць, развесяліць, забавіць. 3. Суцешыць, заспакоіць.

**ПАЦІКА́ВІЦЦА**, -ка́ўлюся, -ка́вішся, -ка́віцца. Праявіць цікавасць да каго-, чаго-н.

**ПАЦІ́ХУ**. 1. Нягучна, ціха; ледзьледзь, злёгку. 2. Павольна, не спяшаючыся.

**ПАЧВА́РА**, -ы. 1. Казачная, страшная істота, звычайна вялікіх памераў. 2. Пра надта непрыгожага чалавека; пра жорсткага чалавека, вырадка.

**ПАЧВА́РНЫ**, -ая, -ае. Вельмі непрыгожы, агідны, брыдкі.

**ПАЧУВА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца і **ПАЧУВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Адчуваць.

**ПАЧУ́ЦЦЕ**, -я. Здольнасць адчуваць, успрымаць з'явы аб'ектыўнай рэальнасці.

**ПАЧУЦЦЁ**, -я́. 1. Псіхічныя працэсы перажывання чалавекам сваіх адносін да навакольнага свету; усведамленне, адчуванне чаго-н. 2. Псіхічны стан або фізічнае адчуванне чалавека. 3. Знешняе праяўленне душэўнага пад'ёму, усхваляванасці. 4. Каханне, сімпатыя, прыхільнасць да каго-н.

**ПАЧУЦЦЁВЫ**, -ая, -ае. Які ажыццяўляецца або ўспрымаецца пры дапамозе органаў пачуццяў

**ПАЧЦІ́ВАСЦЬ**, -і. Уласцівасць пачцівага; пачцівыя адносіны да каго-. чаго-н.

**ПАЧЦІ́ВЫ**, -ая, -ае. Паважны, шаноўны, паважаны, добразычлівы; які выказвае павагу, пашану да каго-н.

**ПАЧЫКІЛЬГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е і **ПАЧЫКІЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Пайсці пакульгваючы.

**ПАША́НА**, -ы. Павага, якая выказваецца каму-н. людзьмі.

**ПАШАНАВА́ЦЦА**, -ну́юся, -ну́ешся, -ну́ецца. Праявіць некаторую асцярожнасць, аднесціся да сябе клапатліва.

**ПАШАНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. 1. Аднесціся клапатліва да каго-, чаго-н. 2. Аднесціся з пашанай, павагай да каго-, чаго-н.

**ПАШАНЦАВА́ЦЬ**, -шанцу́е. Пра спрыяльны збег акалічнасцей, пра ўдачу ў чым-н.

**ПАШКУМАТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Парваць на шматкі.

**ПАШЧА́СЦІЦЬ**, -ціць. Пра спрыяльны збег акалічнасцей для каго-н.

**ПАШЧЭ́НКІ**, -аў. Скіўіцы.

**ПАШЫБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Хутка пайсці.

**ПАЭ́ЗІЯ**, -і. Сукупнасць розных жанравых формаў вершаванай творчасці, да 19 ст. — мастацкая літаратура ў адрозненне ад усёй іншай літаратуры. Гісторыя беларускай П. бярэ пачатак ад вуснай народнай творчасці (песні, балады, замовы).

**ПАЭ́МА**, -ы. 1. Вялікі вершаваны твор з апавядальным або лірычным сюжэтам. 2. Пра што-н. прыгожае, велічнае, незвычайнае.

**ПЕКНАТА́**, -ы́. Прыгажосць.

**ПЕ́КНЫ**, -ая, -ае. Прыгожы.

**ПЕ́ЛЬКА**, -і. Палонка.

**ПЕРААСЭНСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Асэнсаваць па-новаму, інакш.

**ПЕРАБО́Р**, -у. Лішак, узятае звыш меры, нормы.

**ПЕРАБО́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Вельмі патрабавальны, капрызны пры выбары каго-, чаго-н.

**ПЕРАВА́ГА**, -і. 1. Асаблівасць, якая выгадна адрознівае каго-, што-н. 2. Выключнае права на што-н., прывілея.

**ПЕРАВА́ЖНА**. Галоўным чынам, у большасці.

**ПЕРАГЛЯНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -леняце́ся. Абмяняцца позіркамі.

**ПЕРАГУ́КВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Абменьвацца час ад часу воклічамі, словамі, гукамі, даючы знаць пра сябе; пераклікацца.

**ПЕРАДПЛЕ́ЧЧА**, -а. Частка рукі ад локця да кісці.

**ПЕРАДРАЖНІ́ЦЬ**, -дражню́, -дра́жніш, -дра́жніць. Падрабляючыся пад каго-н., падаць у наўмысна смешным, з'едлівым выглядзе чые-н. рухі, голас, мову і пад.

**ПЕРАДУМО́ВА**, -ы. Папярэдняя ўмова.

**ПЕРАЖЫВА́ННЕ**, -я. 1. Асобы псіхічны стан, які выяўляецца ў наяўнасці якіх-н. адчуванняў, пачуццяў (звычайна непрыемных). 2. Здольнасць акцёра пры кожным выкананні ролі перажываць пачуцці і думкі ствараемага персанажа, як свае ўласныя.

**ПЕРАЖЫВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Быць у стане душэўнага неспакою ў сувязі з чым-н., хвалявацца з прычыны чаго-н. 2. Аднаўляць у памяці мінулае, перажытае. 3. Пранікацца пачуццямі, думкамі персанажа.

**ПЕРАЙМА́ЛЬНІК**, -а. Той, хто запазычвае, пераймае што-н., робіць так, як хто-н.

**ПЕРАЙНА́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Змяніўшы, зрабіць іншым; перамяніць; падаць у іншым выглядзе, змяніць пры пераказе, перадачы і інш.

**ПЕРАКА́З**, -у. Пісьмовая або вусная перадача сваімі словамі чаго-н. прачытанага, пачутага.

**ПЕРАКАЗА́ЦЬ**, -кажу́, -ка́жаш, -ка́жа. 1. Расказаць, выкласці сваімі словамі што-н. прачытанае, пачутае. 2. Паўтарыць сказанае яшчэ раз.

**ПЕРАКАНА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які пераконвае, прымушае паверыць у правільнасць, праўдзівасць чаго-н.; пранікнуты сілай перакананасці.

**ПЕРАКАНА́ННЕ**, -я. Упэўненасць, цвёрды, непахісны погляд.

**ПЕРАКАНА́НЫ**, -ая, -ае. 1. Цвёрда ўпэўнены ў чым-н. 2. Непахісны, паслядоўны ў сваіх поглядах.

**ПЕРАКАНА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Упэўніцца ў чым-н., паверыць у што-н.

**ПЕРАКАНА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Прымусіць паверыць чаму-н., упэўніць у чым-н.; угаворамі схіліць да чаго-н., прымусіць зрабіць што-н.

**ПЕРАКАСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Закрэсліць што-н. ад пачатку да канца.

**ПЕРАКО́НАНАСЦЬ**, -і. Цвёрдая ўпэўненасць у чым-н.; перакананасць.

**ПЕРАЛО́МНЫ**, -ая, -ае. Звязаны з пераломам, крутым паваротам у развіцці чаго-н.

**ПЕРАМО́ВІЦЦА**, -мо́ўлюся, -мо́вішся, -мо́віцца. Сказаць адзін другому некалькі слоў, нядоўга пагаварыць.

**ПЕРАМО́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Той, якога перамаглі.

**ПЕРАМУДРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Занадта ўскладніць, заблытаць што-н.

**ПЕРАМУ́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Вельмі змучыцца; перастаць мучыцца.

**ПЕРАМЯНІ́ЦЦА**, -мянюся, -ме́нішся, -ме́ніцца. Стаць іншым, змяніцца; змяніць свае адносіны да каго-, чаго-н.

**ПЕРАНАПРУ́ЖАННЕ**, -я. Празмернае фізічнае або псіхалагічнае напружанне акцёра.

**ПЕРАНО́С**, -у. Стылістычны прыём, калі сінтаксічна цэласнае словазлучэнне, пачатак якога знаходзіцца ў адным вершаваным радку, заканчваецца ў наступ-

ным. Заснаваны на несупадзенні рытмічнай міжрадковай паўзы з сэнсавай. П. памагае стварыць размоўную інтанацыю, перадаць эмацыянальную напружанасць маўлення, падкрэсліць пэўную думку, вылучыць нейкую з'яву, прадмет і інш. Існуюць радковы, строфны і складовы віды П.

**ПЕРАНО́СНАЕ ЗНАЧЭ́ННЕ СЛО́ВА**. Вытворнае, або другаснае, значэнне, якое набывае слова ў працэсе яго ўжывання. У адрозненне ад прамога значэння П. з. с. матываванае. Перанос значэнняў адбываецца на аснове падабенства паміж асобнымі прадметамі ці з'явамі рэчаіснасці, а таксама аналогіі, асацыяцый, што ўзнікаюць у свядомасці чалавека.

**ПЕРАПАКУ́ТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе. 1. Зазнаць, перажыць многа пакут. 2. Перажыўшы што-н., кончыць пакутаваць.

**ПЕРАПАЛО́Х**, -у. Збянтэжанасць; паніка.

**ПЕРАПАЛО́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Вельмі моцна спалохацца.

**ПЕРАПРАСІ́ЦЬ**, -прашу́, -про́сіш, -про́сіць. Угаварыць каго-н. прабачыць за што-н.; папрасіць прабачэння.

**ПЕРАПУ́Д**, -у. Вельмі моцны спалох.

**ПЕРАПУ́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Ахоплены перапудам.

**ПЕРАПУ́ДЗІЦЦА**, -пу́джуся, -пу́дзішся, -пу́дзіцца. Перапужацца.

**ПЕРАПЫТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца і **ПЕРАПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Спытаць яшчэ раз; зноў звярнуцца з тым жа пытаннем.

**ПЕРАСМЕ́ЙВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Падаючы адзін другому знакі, пацішку смяяцца, падсмейвацца з каго-, чаго-н.

**ПЕРАСМЕ́ШКІ**, -шак. Смешкі, жарты з каго-, чаго-н.

**ПЕРАСМЫКНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няце́ся. Зрабіць сутаргавы, нервовы рух; сутаргава перакрывіцца.

**ПЕРАСМЫКНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Зрабіць сутаргавы рух чым-н.; перакрывіць твар.

**ПЕРАСТАНО́ЎКА ДЭКАРА́ЦЫЙ**. Змена дэкарацый у спектаклі.

**ПЕРАСЦЕРАГЧЫ́**, -рагу́, -ражэ́ш, -ражэ́; -ражо́м, -ражаце́, -рагу́ць. Даць параду асцерагацца чаго-н., што можа прычыніць шкоду; папярэдзіць аб небяспецы.

**ПЕРАСЦЯРО́ГА**, -і. Тое, што засцерагае ад небяспекі.

**ПЕРАТРЫВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Перажыць, перацярпець многае.

**ПЕРАЎВАСАБЛЕ́ННЕ**, -я. Здольнасць акцёра дзейнічаць на сцэне ў вобразе іншага чалавека, таго персанажа, якога ён іграе ў спектаклі.

**ПЕРАЎВАСАБЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. Прымаць іншы выгляд, ствараць характар чалавека выяўленчымі сродкамі акцёрскага мастацтва.

**ПЕРАЎВАСО́БІЦЦА**, -со́блюся, -со́бішся, -со́біцца. Прыняць новы выгляд, увасобіцца ў вобраз, створаны драматургам.

**ПЕРАШАЛЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Пасля разгульнага жыцця, свавольства ўціхамірыцца, стаць спакойным, разважным, сталым.

**ПЕРАШЭ́ПТВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Перагаворвацца шэптам.

**ПЕРСАНА́Ж**, -а. Дзейная асоба ў мастацкім творы (драме, рамане, аповесці і пад.).

**ПЕРСПЕКТЫ́ВА РО́ЛІ**. Развіццё дзеяння ў ролі ў накірунку канчатковай мэты — да звышзадачы.

**ПЕРСПЕКТЫ́ЎНАЯ ДЭКАРА́ЦЫЯ**. Дэкарацыя, якая выканана ў адпаведнасці з законамі перспектыўнага змяншэння натуральных памераў.

**ПЕРФАРМА́НС**, -у. Тэатр візуальных мастацтваў. З'явіўся ў 60-я гады, але толькі ў 80-я 20 ст. гэты від тэатра дасягнуў сваёй сталасці. П. аб'ядноўвае як раўнапраўныя розныя мастацтвы: тэатр, танец, музыку, відэа, паэзію і кіно. Дзеянне разыгрываецца не ў тэатры, а ў музеях або мастацкіх галерэях. У П. падкрэсліваецца хутчэй сам працэс творчасці, чым завершанасць твора мастацтва.

**ПЕРШ**. Спачатку, раней.

**ПЕРШААСНО́ВА**, -ы. Першапачатковая аснова, сутнасць чаго-н.

**ПЕРШАПАЧАТКО́ВЫ**, -ая, -ае. 1.

Самы першы, зыходны. 2. Які з'яўляецца пачаткам, першай ступенню чаго-н. 3. Самы просты, элементарны.

**ПЕРШАПРЫЧЫ́НА**, -ы. Асноўная, першапачатковая прычына.

**ПЕРШАСТУПЕ́ННЫ**, -ая, -ае. Найважнейшы, галоўны.

**ПЕРШЫНЯ́**, -і. Першы раз.

**ПЕРЫПЕТЫ́І**, -ый. Рэзкія, нечаканыя перамены, павароты сітуацый або дзеяння; пра вельмі складаны ход падзей. П. — пад'ём і спад дзеяння («падарожжа з прыгодамі») або эпізод, які ідзе за напружаным момантам дзеяння.

**ПЕРЫФРА́ЗА**, -ы і **ПЕРЫФРА́З**, -а. Сэнсава непадзельны выраз, утвораны непасрэдна ў моўнай плыні, у пэўным мастацкім апісанні, у пэўнай сітуацыі як апісальная назва прадмета або дзеяння, што адначасова і абазначае іх, і праз апісанне прымет дае ім характарыстыку.

**П'Е́СА**, -ы. Драматургічны твор, прызначаны для пастаноўкі на сцэне; агульная назва драматургічных твораў розных жанраў (трагедыі, камедыі, драмы ў вузкім сэнсе і інш.).

**ПЕСІМІ́ЗМ**, -у. Светаадчуванне, прасякнутае нявер'ем у лепшае будучае, схільнасцю бачыць ва ўсім толькі адмоўнае.

**ПЕСІМІ́СТ**, -а. Той, хто схільны да песімізму.

**ПЕ́СТА**, -ы. 1. Той, хто любіць песціцца. 2. Той, каго вельмі песцяць.

**ПЕ́СТАВАЦЦА**, -туюся, -туешся, туецца і **ПЕ́СЦІЦЦА**, пе́шчуся, пе́сцішся, пе́сціцца. Аддавацца пяшчотам, цешыцца спакоем, бестурботнасцю.

**ПЕ́СТАВАЦЬ**, -тую, -туеш, -туе і **ПЕ́СЦІЦЬ**, пе́шчу, пе́сціш, пе́сціць. 1. Любоўна даглядаць, гадаваць каго-н.; патураць усім жаданням. 2. Праяўляць ласку, лашчыць, галубіць каго-н.

**ПЕ́СТЫ**, -аў. Пяшчотныя, ласкавыя адносіны.

**ПЕ́ШКАМ**. Пяшком.

**ПЕ́ШКІ**. Пешшу, пяшком.

**ПІ́ГАЛІЦА**, -ы. Пра маленькага, шчуплага чалавека, пераважна жанчыну.

**ПІКА́НТНЫ**, -ая, -ае. 1. Востры на смак, рэзкі. 2. Які сваёй незвычайнасцю выклікае цікавасць, не зусім прыстойны. 3. Прывабны, спакуслівы.

**ПІ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які патрабуе неадкладнага выканання, неабходны, тэрміновы. 2. Старанны. руплівы, дбайны. 3. Уважлівы, неаслабны.

**ПІ́ПКА**, -і. Люлька для курэння.

**ПІСКЛЯ́**, -і́. Пра чалавека з пісклявым голасам.

**ПІСУ́ЛЬКА**, -і. Маленькае пісьмо, запіска.

**ПІСЬМО́ СЦЭНІ́ЧНАЕ**. П. с. — гэта рэжысура, калі за яе бярэцца мастак, які кантралюе сукупнасць сцэнічных сістэм, у тым ліку тэкст, што арганізуе іх узаемадзеянне, так што спектакль не ёсць субпрадукт тэксту, але аснова тэатральнага сэнсу. П. с. — спосаб выкарыстання сцэнічнага апарату для пастаноўкі — «у духоўных і цялесных вобразах» — персанажаў, месца і разгортваемага дзеяння.

**ПІТО́К**, -ткá. Чалавек, які любіць і можа выпіць шмат спіртных напіткаў.

**ПЛАН СЦЭ́НЫ**. Умоўная частка сцэны, размешчаная паралельна рампе. Сцэна падзяляецца на некалькі П.: нулявы, першы, другі і г. д.

**ПЛАНШЭ́Т**, -а. У тэатры — падлога сцэны. П. бывае гарызантальны і пакаты (часцей у тэатрах оперы і балета).

**ПЛА́СТЫКА**, -і. У шырокім сэнсе — эмацыянальная мастацкая выразнасць, гармонія, зграбнасць. У танцы — плаўнасць, зграбнасць, выразнасць рухаў. П. складае больш ці менш звязную сістэму разнастайных характарыстык цела, у той час як жэст адсылае да аднаго асобнага дзеяння цела.

**ПЛА́ЎНЫ**, -ая, -ае. Роўны, без рэзкіх пераходаў (аб рухах, гуках і пад.).

**ПЛАШЧАНІ́ЦА**, -ы. Прадмет культу ў праваслаўнай царкве ў выглядзе кавалка тканіны з намаляваным Хрыстом у труне.

**ПЛЕЧАВЫ́**, -ая, -ое. Які мае адносіны да пляча.

**ПЛЁН**, -у. Вынік старанняў; дасягненне.

**ПЛЁННЫ**, -ая, -ае. Які дае добрыя вынікі.

**ПЛО́ЙМА**, -ы. Вельмі вялікая колькасць, мноства.

**ПЛЮГА́ВЫ**, -ая, -ае. Мізэрны, худы, нікчэмны з выгляду.

**ПЛЯВУ́ЗГАННЕ**, -я. Бязглуздая, пустая, нудная размова.

**ПЛЯВУ́ЗГАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Гаварыць абы-што, пустое, без толку.

**ПО́ЗА**, -ы. 1. Становішча цела, пастава. 2. Прытворства, няшчырыя паводзіны.

**ПО́ЗІРК**, -у. Накіраванасць зроку на каго-, што-н.; погляд. П. акцёра — крыніца інфармацыі не толькі ў сэнсе псіхалагічнай характарыстыкі, адносін да іншых выканаўцаў, але і ў сэнсе структурыравання прасторы, працэсу выказвання тэксту, выяўлення сэнсу. На сцэне П. увязвае словы са сцэнічнай сітуацыяй, падключае дыскурс да якога-н. элемента сцэны, забяспечвае сістэму перадачы слова і слоўнага дзеяння і пластычнага ўзаемадзеяння. Калі вочы — «люстра душы», то П. — «апора цела», руху і ўсяго працэсу сцэнічнага выказвання.

**ПО́МСЛІВЫ**, -ая, -ае. Схільны да помсты; які выражае помсту.

**ПО́МСТА**, -ы. Адплата за прычыненае зло; жаданне адпомсціць.

**ПО́МСЦІЦЦА**, -мшчуся, -мсцішся, -мсціцца і **ПО́МСЦІЦЬ**, -мшчу, -мсціш, -мсціць. Чыніць помсту каму-н.

**ПО́РСТКІ**, -ая, -ае. 1. Хуткі, жвавы. 2. Запальчывы.

**ПО́СКУДЗЬ**, -і. Пра каго-н. агіднага, паскуднага або пра што-н. агіднае, паскуднае.

**ПО́СЛУХ**, -а. Пакорнасць, паслушэнства.

**ПО́ТАРЧ** і **ПО́ТЫРЧ**. 1. Стаўма, старчаком, у вертыкальным становішчы. 2. Тварам уніз; тарчма.

**ПО́ХАПКАМ**. Вельмі хутка, спяшаючыся.

**ПО́ШАСЦЬ**, -і. Хвароба, эпідэмія; напасць, насланнё.

**ПО́ШУМ**, -у. Ціхі шум.

**ПРАБА́ВІЦЦА**, -ба́ўлюся, -ба́вішся, -ба́віцца. Прабыць доўга, затрымацца дзе-н.

**ПРАБА́ВІЦЬ**, -ба́ўлю, -ба́віш, -ба́віць. Правесці, затраціць (час).

**ПРАБАДЗЯ́ЦЦА**, -дзя́юся, -дзя́ешся, -дзя́ецца. Прабыць, правесці дзе-н. час, звычайна марна.

**ПРАБА́ЧЫЦЬ**, -ба́чу, -ба́чыш, -ба́чыць. 1. Зняць віну за што-н., не лічыць за віну што-н. 2. *заг.* **праба́ч(це)**. Ужываецца пры звароце да каго-н. як выказванне шкадавання за прычыненыя турботы (часам у якасці пабочнага слова); ужываецца для выражэння пратэсту, нязгоды.

**ПРАБАЧЭ́ННЕ**, -я. Дараванне віны; паблажлівасць за правіннасць.

**ПРАБУБНІ́ЦЬ**, -ню́, -ні́ш, -ні́ць. Невыразна, незразумела сказаць што-н.

**ПРАБУРЧА́ЦЬ**, -чу́, -чы́ш, -чы́ць. Сярдзіта, невыразна прамармытаць што-н.

**ПРАВАЖДА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Патраціць шмат часу на што-н.

**ПРАВАЛАЧЫ́ЦЦА**, -лачу́ся, -ло́чышся, -ло́чыцца. Працягацца, прахадзіць доўгі час без толку.

**ПРАВАЛТУ́ЗІЦЦА**, -ту́жуся, -ту́зішся, -ту́зіцца. Валтузіцца некаторы час.

**ПРАВАЛЭ́НДАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Валэндацца некаторы час.

**ПРАВО́БРАЗ**, -а. Асоба, якая паслужыла аўтару ўзорам для стварэння літаратурнага персанажа; прататып.

**ПРАГАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. Які вельмі моцна чаго-н. хоча.

**ПРАГАМАНІ́ЦЬ**, -маню́, -мо́ніш, -мо́ніць. Гаманіць некаторы час.

**ПРАГАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Гараваць некаторы час.

**ПРА́ГНА**. З вялікай ахвотай, жаданнем; з вялікай цікавасцю, інтарэсам; нецярпліва.

**ПРА́ГНАСЦЬ**, -і. 1. Імкненне задаволіць свае празмерныя жаданні, патрэбы; выяўленне жадання задаволіць якія-н. патрэбы. 2. Скупасць, жадлівасць.

**ПРА́ГНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Адчуваць моцную прагу; моцна жадаць чаго-н.

**ПРАГНЯВІ́ЦЬ**, -гняўлю́, -гне́віш, -гне́віць. Угнявіць; пакрыўдзіць.

**ПРАГО́Н**, -у. Рэпетыцыя, праверачны прагляд усяго спектакля, асобнай сцэны, акта.

**ПРАГРА́МА**, -ы. Сукупнасць нумароў, твораў, якія выконваюцца на канцэрце, у цырку, перадаюцца па радыё, тэлебачанні і пад.; друкаваны паказальнік

нумароў, п'ес, выканаўцаў (у канцэрце, спектаклі і пад.).

**ПРАГУГНЯ́ВІЦЬ**, -ня́ўлю, -ня́віш, -ня́віць. Сказаць у нос гугнявым голасам.

**ПРАГУДЗЕ́ЦЬ**, -джу́, -дзі́ш, -дзі́ць; -дзі́м, -дзіце́. Утварыць працяжны, нізкі гук, гул.

**ПРАГУЧА́ЦЬ**, -чыць. 1. Утварыць гук, гукі; раздацца, пачуцца. 2. Праявіцца, выявіцца (пра пачуццё, настрой); выклікаць уражанне, успрыняцца.

**ПРАДБА́ЧЛІВЫ**, -ая, -ае. Здольны прадбачыць.

**ПРАДЖГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Хутка прайсці; прамчацца.

**ПРАДО́ННЕ**, -я. Бездань, бяздонне; прорва.

**ПРАДСТАЎЛЕ́ННЕ**, -я. Тэатралізаванае відовішча (музычнае, народнае, парадыйнае, цыркавое, навагодняе і пад.).

**ПРАДУЗЯ́ТЫ**, -ая, -ае. Заснаваны на думцы, якая загадзя беспадстаўна была прынята за правільную.

**ПРАДУ́МАНЫ**, -ая, -ае. Над якім доўга думалі; абдуманы.

**ПРАДУ́МАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Дакладна, старанна абдумаць.

**ПРАДЧУВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Загадзя адчуваць; мець прадчуванне чаго-н.

**ПРАЗМЕ́РНА**. Занадта, залішне.

**ПРАЙДЗІСВЕ́Т**, -а. Пранырлівы, лоўкі, хітры чалавек.

**ПРАКАВЕ́ТНЫ** і **ПРАКАВЕ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Вельмі стары, даўні, векавечны.

**ПРАКАЎТНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́. Праглынуць.

**ПРАКІДА́ЦЦА**, -а́ецца. Праяўляцца (пра пачуцці, перажыванні).

**ПРАКЛЁН**, -у. 1. Лаянка, абурэнне. 2. Крайняе асуджэнне, якое суправаджаецца прадраканнем, пажаданнем. 3. *у знач. вык.* Ужываецца для выказвання гневу, раздражнення, абурэння.

**ПРАКРЫЧА́ЦЬ**, -чу́, -чы́ш, -чы́ць. 1. Абазвацца крыкам. 2. Закрычаць, гучна сказаць што-н.

**ПРАКСЕ́МІКА**, -і. Дысцыпліна амерыканскага паходжання П. (канец 50-х — сярэдзіна 60-х гг. 20 ст.) вывучае спосаб структурыравання чалавечай прасторы: пknown тып; дысганцыі, якія можна назіраць паміж асобамі; арганізацыю жытла; структурыраванне прасторы аднаго будынка і аднаго пакоя. П. ставіць мэтай разглядаць праксемічныя паводзіны індывідаў у залежнасці ад васьмі наступных варыянтаў: агульнае цялеснае становішча (у залежнасці ад полу); вугал арыентацыі партнёраў; цялесная дыстанцыя, якая вызначаецца рукой; цялесны кантакт у залежнасці ад формы і інтэнсіўнасці; абмен позіркамі; адчуванне цяпла; нюхальнае ўспрыманне; сіла голасу.

**ПРА́КСІС**, -а. Па Арыстоцелю П. — дзеянне персанажаў, якое выяўляецца ў паслядоўнасці падзей, або фабуле.

**ПРАКУ́ДА**, -ы. 1. Ахвотнік (ахвотніца) да свавольстваў, розных штук; гарэза. 2. Навала; праява.

**ПРАКУ́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Які любіць пракудзіць; свавольны, гарэзлівы.

**ПРАЛЕПЯТА́ЦЬ**, -лепячу́, -ляпе́чаш, -ляпе́ча. Сказаць што-н. ціха або неразборліва, невыразна.

**ПРАЛЯМАНТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Моцна, працягла пракрычаць.

**ПРАМАРМЫТА́ЦЬ**, -мычу́, -мы́чаш, -мы́ча. Сказаць ціха і неразборліва.

**ПРАМАРНАВА́ЦЦА**, -ну́юся, -ну́ешся, -ну́ецца. Прамучыцца, прапакутаваць, прагараваць.

**ПРАМАРНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. Дарма, марна патраціць (час).

**ПРАМАРНАТРА́ВІЦЬ**, -тра́ўлю, -тра́віш, -тра́віць. Марна патраціць што-н.

**ПРАМАРУ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Спазніцца, марудзячы; не зрабіць своечасова.

**ПРАМАТА́**, -ы́. Праўдзівасць, шчырасць.

**ПРАМІЛЬГНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. 1. З'явіцца і хутка знікнуць. 2. Узнікнуць, з'явіцца на імгненне (пра думкі, пачуцці і інш.).

**ПРАМІТУСІ́ЦЦА**, -тушу́ся, -тусі́шся, -тусі́цца. Правесці некаторы час у мітусенні, мітусні.

**ПРАМО́ВА**, -ы. Публічнае выступленне.

**ПРАМО́ЎЦА**, -ы. Той, хто выступае

з прамовай; той, хто валодае талентам гаварыць прамовы.

**ПРАНІ́КЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які глыбока і правільна разгадвае, разумее што-н.; здагадлівы, прадбачлівы; назіральны, пільны, дапытлівы (пра вочы, погляд і пад.). 2. Які змяшчае ў сабе глыбіню пачуццяў, праўдзівы, шчыры.

**ПРАНІКНЁНАСЦЬ**, -і. Хвалюючая шчырасць, сардэчнасць, унутраная перакананасць.

**ПРАНІ́КНУЦЦА**, -нуся, -нешся, -нецца. Напоўніцца, ахапіцца якім-н. пачуццём, думкай і пад.

**ПРАНЯ́ЦЬ**, праймý, прóймеш, прóйме; праня́ў, -нялá, -нялó. Глыбока, моцна падзейнічаць, зрабіць вялікае ўражанне на каго-н.

**ПРАПАНУ́ЕМЫЯ АБСТА́ВІНЫ**. Факты, падзеі, час і месца дзеяння, умовы жыцця, у якіх існуюць і дзейнічаюць персанажы п'есы і ў якіх неабходна жыць сцэнічным жыццём акцёрам пры рэалізацыі творчай задумы пастаноўкі спектакля рэжысёрам.

**ПРАРВА́ЦЦА**, -рвéцца. Нечакана і буйна выявіцца, праявіцца (пра якое-н. стрыманае пачуццё, стан).

**ПРАСВЕ́ТЛАСЦЬ**, -і. Здольнасць ясна, правільна мысліць; часовая яснасць, выразнасць усведамлення.

**ПРАСВЕ́ТЛЕНЫ**, -ая, -ае. Ясны, радасны, светлы; які выяўляе радасць, задавальненне;ззяючы.

**ПРАСВЕ́ТЛЫ**, -ая, -ае. Радасны, шчаслівы.

**ПРАСВЯТЛЕ́ЦЬ**, -éю, -éеш, -ée. 1. Стаць светлым, святлейшым. 2. Стаць ясным, спакойным, радасным.

**ПРАСВЯТЛІ́ЦЦА**, -свéтліцца. Стаць ясным, спакойным, радасным.

**ПРАСІПЕ́ЦЬ**, -плю, -пі́ш, -пі́ць. Вымавіць сіплым голасам.

**ПРАСКАНДЗІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Прагаварыць моцна і выразна, падзяляючы словы на склады.

**ПРАСО́ДЫЯ**, -і. Націск, які падае на галосныя ў час чытання вершаў, або рытмічная структура, якая выкарыстоўваецца для надання выразнасці тэксту, чаргаванне колькасці складоў, у прыватнасці доўгіх і кароткіх, у залежнасці ад метрыкі верша. Прасадычныя асаблівасці драматургічнага тэксту залежаць ад меладычнага малюнка, які можна выявіць пры чытанні тэксту: ад версіфікацыі, ад метрычных заканамернасцей, але таксама і ад майстэрства акцёра, ад яго здольнасці валодаць сваім целам, каб надаць тэксту пэўны рытм і «дыханне», суправаджаць чытанне адпаведнымі жэстамі, падкрэсліваць адны часткі тэксту і затушоўваць другія, выдзяляць алітэрацыі, паўторы, выкарыстоўваць усю рыторыку дэкламацыі. Той сэнс, які глядач вынесе з пачутага і ўбачанага, шмат у чым залежыць ад выбранага рэжысёрам і акцёрам спосабу гукавога ўвасаблення тэксту.

**ПРАСТАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Няхітры; недалёкі, наіўны.

**ПРАСТАДУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Просты, даверлівы, няхітры.

**ПРАСТА́К**, -á. Акцёрскае амплуа, выканаўца роляў прастадушна-наіўных або недалёкіх людзей. Раннія правобразы П. — 2-і дзані ў італьянскай камедыі дэль артэ, персанажы ў старых нямецкіх, рускіх і іншых народных прадстаўленнях. Пазней гэта амплуа атрымала распаўсюджанне ў камедыйным, у прыватнасці вадэвільным, і аперэтачным жанрах.

**ПРАСТАРЭ́КАВАЦЬ**, -кую, -куеш, -куе. Расказваць пра пустое, несур'ёзнае.

**ПРАСТО́РА** (т э а т р а л ь н а я), -ы. Паняцце П. выкарыстоўваецца ў адносінах да розных аспектаў пастаноўкі. Можна вызначыць наступныя віды П.: 1) драматычная П.; П., пра якую гаворыцца ў тэксце, — абстрактная П., якая ствараецца чытачом або гледачом з дапамогай уяўлення; 2) сцэнічная — рэальная П. сцэны, дзе дзейнічаюць акцёры, якія знаходзяцца ўласна на сцэне ці сярод гледачоў; 3) сцэнаграфічная (або тэатральная) П. — сцэнічная П., больш дакладна вызначаемая як прастора, у якой знаходзіцца публіка і акцёры ў час прадстаўлення; 4) іграваая (жэстыкуляцыйная) П., ствараемая акцёрам, яго прысутнасцю і яго перамяшчэннямі, яго месцам у адносінах да іншых акцёраў, яго размяшчэнне на сцэне; 5) тэкставая — П. у яе

графічнай, фанічнай і рытарычнай матэрыяльнасці; П. партытуры, дзе запісаны рэплікі і дыдаскаліі; тэкставая П. рэалізуецца тады, калі тэкст выкарыстоўваецца не як драматычная П., прыдуманая чытачом ці гледачом, а як сыры матэрыял, які прадстаўлены як узор для зрокавага і слыхавога ўспрымання; 6) унутраная — П., дзе адбываецца спроба прадстаўлення фантазма, мары, бачання драматурга або аднаго з персанажаў.

**ПРАСТО́РАВАЯ СЦЭ́НА**. Адкрытая сцэна, акружаная з трох бакоў месцамі для гледачоў.

**ПРАСТРА́ЦЫЯ**, -і. Стан прыгнечанасці, знямогі, заняпаду псіхічнай актыўнасці, выкліканы нервовым расстройствам і інш.

**ПРАСЦЭ́НІУМ**, -а. Частка сцэны перад заслонай.

**ПРАСЯ́КНУЦЦА**, -нуся, -нешся, -нецца. Пранікнуцца, напоўніцца якім-н. пачуццём, перакананнем, ідэяй.

**ПРАТАГАНІ́СТ**, -а. У старажытных грэкаў П. — акцёр, які выконваў галоўную ролю. Акцёр, які выконваў другую ролю, называўся дэўтараганістам, трэцюю — трытаганістам. Яны з'яўляліся ў такой паслядоўнасці: хор, затым пратаганіст (у Тэпсіса), дэўтараганіст (у Эсхіла), трытаганіст (у Сафокла). Цяпер П. называюць галоўных дзейных асоб п'есы, якія знаходзяцца ў цэнтры дзеяння і канфліктаў.

**ПРАТАТЫ́П**, -а. Першавобраз, арыгінал; асоба, якая паслужыла аўтару арыгіналам для стварэння вобраза.

**ПРАТЫКА́БЛЬ**, -я. Небутафорская, сапраўдная частка дэкарацыі, якая складаецца з прадметаў, што выкарыстоўваюцца ў рэальным жыцці, у прыватнасці ў якасці апоры для руху (як на цвёрдай сцэнічнай пляцоўцы). П. шырока выкарыстоўваецца не як дэкаратыўны, а як функцыянальны прадмет. Ён становіцца эфектыўным элементам дэкарацыі, як і тэатральны механізм.

**ПРА́ЎДА СЦЭНІ́ЧНАЯ**. Перакананасць, праўдзівасць адлюстравання ў ігры акцёра жыццёвых з'яў (перажыванняў, думак, дзеянняў, паводзін).

**ПРАЎДЗІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які любіць праўду, схільны гаварыць праўду; які выражае праўдзівасць як уласцівасць характару. 2. Які адпавядае праўдзе, заснаваны на праўдзе. 3. Сапраўдны.

**ПРАФА́Н**, -а. Недасведчаны ў якой-н. галіне чалавек.

**ПРАФАНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. Апашляць, па-невуцку скажаць што-н. агульнапрынятае (ідэю, вучэнне, твор мастацтва і пад.).

**ПРАЧУ́ЛЫ**, -ая, -ае. Напоўнены вялікім пачуццём.

**ПРАЧУХА́НКА**, -і. Вымова за што-н.; праборка.

**ПРАШАПТА́ЦЬ**, -шапчу́, -шэ́пчаш, -шэ́пча. Сказаць ціха, шэптам.

**ПРАШПАЦЫРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Прайсці павольнай хадою, прагуляцца.

**ПРАШЫБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Хутка прайсці, праехаць.

**ПРАЯ́ВА**, -ы. 1. Незвычайнае здарэнне. 2. З'ява, праяўленне.

**ПРО́ЗВІШЧА**, -а. Найменне, агульнае для ўсёй сям'і, якое дзеці атрымліваюць звычайна па бацьку, а жонка па мужу.

**ПРОЦІДЗЕ́ЯННЕ**, -я. Дзеянне, якое перашкаджае другому дзеянню, накіравана супраць яго.

**ПРЫАДПЛЮ́ШЧЫЦЬ**, -плю́шчу, -плю́шчыш, -плю́шчыць. Адплюшчыць трохі, не да канца.

**ПРЫВА́БА**, -ы. Тое, што прываблівае, прыцягвае да сябе; прывабнасць.

**ПРЫВА́БІЦЬ**, -ва́блю, -ва́біш, -ва́біць. Выклікаць да сябе сімпатыю, прыхільнасць, любоў якімі-н. рысамі характару, знешнасцю і інш.

**ПРЫВА́БЛІВЫ і ПРЫВА́БНЫ**, -ая, -ае. Які прываблівае, прыцягвае да сябе сваімі якасцямі, уласцівасцямі.

**ПРЫВАРАЖЫ́ЦЬ**, -ражу́, -ро́жыш, -ро́жыць. Выклікаць любоў да сябе, прымусіць пакахаць сябе; прывабіць, зачараваць.

**ПРЫВЕ́ТЛІВЫ**, -ая, -ае. Добразычлівы, гасцінны; ветлівы.

**ПРЫВЕ́ЦІЦЬ**, -ве́чу, -ве́ціш, -ве́ціць. Прыязна, ласкава сустрэць каго-н., аднесціся да каго-н.; даць прытулак каму-н.

**ПРЫ́ВІД**, -у. 1. Здань; вобраз каго-, чаго-н., які здаецца ва ўяўленні або ў сне. 2. Тое, што ўявілася, здалося. 3. Няясныя, ледзь акрэсленыя рысы чаго-н.

**ПРЫВІЛЕ́Я**, -і. Выключнае права, якім карыстаецца хто-н. у адрозненне ад іншых.

**ПРЫВІТА́ННЕ**, -я. Словы, рух, жэст, звернутыя да каго-н. пры сустрэчы, як знак добразычлівасці, дружалюбнасці; зварот да блізкага знаёмага пры сустрэчы.

**ПРЫВІТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Звярнуцца з прывітаннем пры сустрэчы з кім-н.; паздароўкацца.

**ПРЫВІТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Выказаць прывітанне пры сустрэчы (словам, жэстам і пад.). 2. Звярнуцца да каго-н. з прамовай, словамі прывітання (звычайна з прычыны радаснай падзеі).

**ПРЫВУЧЫ́ЦЬ**, -вучу́, -ву́чыш, -ву́чыць. Прымусіць прывыкнуць, прызвычаіцца да каго-, чаго-н.; выпрацаваць звычку, навык да пэўнага занятку і пад.

**ПРЫГАДА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Прыйсці на памяць, успомніцца.

**ПРЫГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Узнавіць у памяці; прыпомніць. 2. Навесці на ўспамін, прымусіць успомніць што-н. па асацыяцыі.

**ПРЫГАЖО́СЦЬ**, -і. 1. Хараство. 2. Прыгожы знешні выгляд.

**ПРЫГАЖУ́Н**, -а́. Прыгожы мужчына.

**ПРЫГАЖУ́НЯ**, -і. Прыгожая жанчына.

**ПРЫГАЛУ́БІЦЬ**, -блю, -біш, -біць. Прылашчыць.

**ПРЫГАРНУ́ЦЦА**, -гарну́ся, -го́рнешся, -го́рнецца. З ласкаю, пяшчотай прытуліцца да каго-н.

**ПРЫГАРНУ́ЦЬ**, -гарну́, -го́рнеш, -го́рне. З ласкаю, пяшчотаю прытуліць да сябе; аднесціся да каго-н. добразычліва, спагадліва.

**ПРЫГЛЕ́ДЗЕЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца і **ПРЫГЛЯДЗЕ́ЦЦА**, -гляджу́ся, -глядзі́шся, -глядзі́цца. 1. Уважліва паглядзець, каб добра ўбачыць, разгледзець; уважліва паназіраць за чым-н. 2. Прывыкнуць да каго-, чаго-н.

**ПРЫГЛЯНУ́ЦЦА**, -гляну́ся, -гля́нешся, -гля́нецца. Спадабацца; выклікаць увагу, сімпатыю.

**ПРЫГНЕ́ЧАННЕ**, -я. Змрочны стан.

**ПРЫГНЕ́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Якога штосьці гняце; засмучаны, занепакоены чым-н.; які выяўляе цяжкі, змрочны стан, настрой.

**ПРЫГО́ДА**, -ы. 1. Нечаканы выпадак; нежаданая, непрыемная, небяспечная для каго-н. падзея. 2. *звычайна мн.* (прыго́ды, -год). Учынкі, здарэнні, звычайна цікавыя, незвычайныя або рызыкоўныя.

**ПРЫДЖГА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Хутка прыйсці або прыбегчы, прыбыць куды-н.

**ПРЫДЗІ́РА**, -ы. Прыдзірлівы чалавек.

**ПРЫДЗІ́РКА**, -і. Папрок, заўвага, абвінавачанне, зробленае без дастатковых падстаў.

**ПРЫДЗІ́РЛІВЫ**, -ая, -ае. Які часта і да ўсяго прыдзіраецца, вышуквае ва ўсім недахопы.

**ПРЫДО́БРЫЦЦА**, -до́бруся, -до́брышся, -до́брыцца. Выклікаць прыхільнасць да сябе, увайсці ў ласку да каго-н., робячы паслугі, падарункі і пад.; паддобрыцца.

**ПРЫДРАМА́ЦЬ**, -драмлю́, -дрэ́млеш, -дрэ́мле. Заснуць неглыбокім сном на кароткі час; задрамаць.

**ПРЫДУ́МАНЫ**, -ая, -ае. Які не існуе ў сапраўднасці; штучны, надуманы.

**ПРЫДУ́МАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. 1. Думаючы, раздумваючы, прыйсці да якога-н. рашэння; здагадацца зрабіць што-н.; выдумаць. 2. Выдумаць тое, чаго не было на самай справе.

**ПРЫЕ́МНАСЦЬ**, -і. 1. Пачуццё задавальнення, радасці ад чаго-н. прыемнага. 2. Тое, што прыносіць задавальненне, радасць.

**ПРЫЖМУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Зморшчыўшы, сціснуўшы павекі, прыплюшчыць вочы, вока.

**ПРЫЗАБЫ́ЦЬ**, -бу́ду, -бу́дзеш, -бу́дзе. Не поўнасцю захаваць у памяці; у некаторай ступені забыць.

**ПРЫЗАДУ́МАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Аддацца роздуму; задумацца.

**ПРЫЗАПА́СІЦЬ**, -па́шу, -па́сіш, -па́сіць. Зрабіць запас чаго-н.; падрых-

таваць, зрабіць што-н. загадзя.

**ПРЫЗВЫЧА́ІЦЦА**, -ча́юся, -ча́ішся, -ча́іцца. Прывыкнуць да чаго-н. як да звычайнага, абавязковага; адчуць сябе звыкла ў якой-н. абстаноўцы; асвоіцца, звыкнуцца.

**ПРЫЗЕ́МЛЕНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены ўзвышанага, незвычайнага; прыніжаны.

**ПРЫЗНА́ННЕ**, -я. 1. Словы, у якіх хто-н. прызнаецца ў чым-н. 2. Станоўчая ацэнка, адабрэнне.

**ПРЫЗНА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Адкрыта расказаць аб чым-н., сазнацца.

**ПРЫЗНА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Па якіх-н. знешніх прыкметах выявіць, убачыць у кім-, чым-н. знаёмага або што-н. знаёмае; пазнаць. 2. Ацаніць каго-, што-н. па заслугах. 3. Згадзіцца з чым-н.

**ПРЫ́КАЗКА**, -і. Кароткі лагічна і граматычна завершаны афарыстычны выраз, які адлюстроўвае шматвяковы жыццёвы вопыт і мудрасць народа, мае пераважна пераноснае значэнне. Па сваёй структуры П. звычайна двухчленныя, нярэдка рыфмаваныя, мова іх багатая на метафары, параўнанні, алегорыі і інш. выяўленчыя сродкі.

**ПРЫКАРХНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́. Заснуць на кароткі час; задрамаць. .

**ПРЫКЛЕ́НЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Стаць на калені, укленчыць.

**ПРЫКМЕ́ТА** і **ПРЫМЕ́ТА**, -ы. Адметная рыса, па якой можна пазнаць каго-, што-н., вызначыць што-н.

**ПРЫКМЕ́ЦІЦЬ**, -ме́чу, -ме́ціш, -ме́ціць. Убачыць, звярнуць увагу; заўважыць, вылучыць сярод іншых.

**ПРЫКРА́СА**, -ы. Аздоба, упрыгожанні; перабольшанне, выдумка.

**ПРЫ́КРАСЦЬ**, -і. 1. Непрыемнае пачуццё незадавальнення, крыўды, смутку. 2. Непрыемнасць.

**ПРЫКРЫ́КНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Крыкнуць, павысіць голас на каго-н., каб прымусіць зрабіць што-н.

**ПРЫКУ́С**, -у. Становішча зубоў пры стуленых сківіцах.

**ПРЫЛА́ШЧЫЦЬ**, -ла́шчу, -ла́шчыш, -ла́шчыць. 1. Праявіць ласку, пяшчоту ў адносінах да каго-н. 2. Ласкавымі, пяшчотнымі адносінамі прыцягнуць, прывабіць да сябе.

**ПРЫЛІ́ЗАНЫ**, -ая, -ае. Гладка зачасаны.

**ПРЫМА́ЗАЦЦА**, -ма́жуся, -ма́жашся, -ма́жацца. Далучыцца да каго-, чаго-н. з карыслівымі мэтамі.

**ПРЫМА́Т**, -у. Перавага, найважнейшае значэнне; першаснасць.

**ПРЫ́МАЎКА**, -і. Кароткі афарыстычны выраз, у якім вобразна з пэўнай эмацыянальнай афарбоўкай вызначаецца якая-н. жыццёвая з'ява. У адрозненне ад прыказкі П. не з'яўляецца самастойным закончаным суджэннем і залежыць ад кантэксту, у ёй няма павучання і абагульнення. П. у вялікай ступені ўласцівы экспрэсіўнасць, сатыра і гумар, тэматычная канкрэтнасць.

**ПРЫМАЎЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. 1. Гаварыць, вымаўляць што-н., суправаджаючы якое-н. дзеянне; прыгаворваць. 2. Угаворваць каго-н. што-н. зрабіць.

**ПРЫМЕ́РАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Прыстасавацца, прызвычаіцца да чаго-н.

**ПРЫМІЛЬГА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Стаць звычайным, прывычным, страціць арыгінальнасць (пра тое, што часта сустракаецца).

**ПРЫМІРЫ́ЦЦА**, -міру́ся, -мі́рышся, -мі́рыцца. 1. Пакласці канец сварцы, варожасці паміж сабой і кім-н. 2. Памяркоўна аднесціся да чаго-н.; звыкнуцца з чым-н.

**ПРЫМІТЫ́Ў**, -ты́ву. Пра што-н. спрошчанае, невысокае па тэхніцы выканання.

**ПРЫМІТЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Просты, нескладаны па будове; груба зроблены. 2. Недастаткова глыбокі, спрошчаны. 3. Малакультурны.

**ПРЫМО́ЎКНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Спыніць размову, спевы, крык і пад.; прыціхнуць, замоўкнуць.

**ПРЫМУ́С**, -у. Уздзеянне, якое аказваецца на каго-н. з мэтай дамагчыся выканання чаго-н.; прымушэнне.

**ПРЫМУ́СІЦЬ**, -му́шу, -му́сіш, -му́сіць. Сілаю або нейкім іншым уздзеяннем дамагчыся, каб нешта было зроблена, выканана; абавязаць, запатрабаваць зрабіць

што-н.; выклікаць пэўныя дзеянні, учынкі, стан у каго-н.

**ПРЫМУСО́ВЫ**, -ая, -ае. Які праводзіцца, робіцца па прымусу; вымушаны неабходнасцю, якімі-н. акалічнасцямі.

**ПРЫНІ́ЖАНЫ**, -ая, -ае. 1. Зняважаны. 2. Бяспраўны.

**ПРЫНІ́ЗІЦЬ**, -ні́жу, -ні́зіш, -ні́зіць. 1. Паставіць у зневажальнае становішча. 2. Зменшыць, знізіць значэнне, ролю каго-, чаго-н. 3. Пазбавіць узвышанасці, уздыму.

**ПРЫНІ́КНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. Прыціснуцца, прыпасці да каго-, чаго-н.

**ПРЫНУ́КА**, -і. Прымус, прымушэнне.

**ПРЫПЕ́ЎКА**, -і. Жанр пазаабрадавага фальклору — аднастрофная, пераважна чатырохрадковая песенька; частушка. Вядома ў фальклоры многіх славянскіх народаў. Вызначаецца лаканізмам, ідэйнай і тэматычнай разнастайнасцю: ад інтымных перажыванняў да гратэску і вострай сатыры.

**ПРЫПІЛЬНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. Пільнуючы, дачакацца паяўлення каго-, чаго-н.; высачыць.

**ПРЫПЛЕ́СЦІСЯ**, -плятýся, -пляцéшся, -пляцéцца; -пляцёмся, -плецяцéся, -плятýцца; -прыплёўся, -плялáся, -плялóся. 1. Прыйсці, ідучы паволі, з цяжкасцю. 2. Прыблюзніцца, здацца.

**ПРЫПУЖА́ЦЬ**, -áю, -áеш, -áе. Пристрашыць, прыгразіць чым-н. з мэтай уздзеяння.

**ПРЫПУСЦІ́ЦЦА**, -пушчýся, -пýсцішся, -пýсціцца. Пайсці, пабегчы хутка; паскорыць хаду, крок.

**ПРЫСАРО́МІЦЬ**, -млю, -міш, -міць. Папракнуць, каб выклікаць пачуццё сораму, раскаяння.

**ПРЫСАРО́МЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які адчувае сорам, няёмкасць.

**ПРЫ́СВІСТ**, -у. Гук свісту, які суправаджае асноўны гук (часцей свісцячы «с»).

**ПРЫСВЯЧЭ́ННЕ**, -я. Радкі, што папярэднічаюць твору і паведамляюць чытачу, у гонар якой асобы ці падзеі напісаны твор. П. бывае сціслым указаннем адрасата або разгорнутым, часам вершаваным выказваннем.

**ПРЫСЛУГА́Ч**, -á. Той, хто прыслужваецца перад кім-н.

**ПРЫСЛУ́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. 1. Напружыць слых, каб пачуць што-н.; звярнуць увагу на свае адчуванні, на свой фізічны стан; звярнуць увагу на свае пачуцці, перажыванні і пад. 2. Аднесціся да чаго-н. уважліва, прыняць да ведама што-н.

**ПРЫСМА́КІ**, -аў. Ласункі, салодкае; смачныя, па-асабліваму прыгатаваныя стравы.

**ПРЫСМАКТА́ЦЦА**, -смакчýся, -смóкчашся, -смóкчацца. Прыладзіцца да каго-, чаго-н. дзеля ўласнай выгады.

**ПРЫСМАЛІ́ЦЬ**, -смалю́, -смáліш, -смáліць. 1. Прыпаліць, прыкурыць. 2. Моцна прыгрэць, прыпячы.

**ПРЫСМІРЭ́ЦЬ**, -э́ю, -э́еш, -э́е. Сцішыцца, супакоіцца, уціхамірыцца.

**ПРЫСПЕ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. 1. Наблізіць наступленне чаго-н. 2. Прымусіць рабіць што-н. хутчэй.

**ПРЫСТАСАВА́НЕЦ**, -нца. Чалавек, які прыстасоўваецца да абставін, утойваючы свае сапраўдныя намеры, погляды.

**ПРЫСТАСАВА́ЦЦА**, -сýюся, -сýешся, -сýецца. Асвоіўшыся з чым-н., набыць навыкі, уменне жыць, працаваць, абыходзіцца ў пэўных абставінах.

**ПРЫСТО́ЙНА**. Ветліва, далікатна, выхавана.

**ПРЫСТО́ЙНАСЦЬ**, -і. Ветлівасць, далікатнасць, выхаванасць у паводзінах, манерах і пад.

**ПРЫСТО́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Добра выхаваны; сумленны, не здольны на дрэнныя ўчынкі. 2. Дастаткова добры, нядрэнны; дастатковы па велічыні, памерах.

**ПРЫСТРУ́НІЦЬ**, -стру́ню, -стру́ніш, -стру́ніць. Прымусіць весці сябе як належыць; праявіць строгасць у адносінах да каго-н.

**ПРЫТАІ́ЦЦА**, -таюся, -тóішся, -тóіцца. Схавацца або прыцішыцца, імкнучыся застацца незаўважаным; прыціхнуць, замерці.

**ПРЫТВАРЫ́ЦЦА**, -тварýся, -твóрышся, -твóрыцца. Прыняць які-н. выгляд з мэтай увесці каго-н. у зман; прыкінуцца.

**ПРЫТВО́РСТВА**, -а. Няшчырыя, ілжывыя паводзіны з мэтай увесці ў зман.

**ПРЫ́ТКІ**, -ая, -ае. 1. Хуткі, імклівы; вёрткі, спрытны. 2. Які прагне хутчэй дасягнуць чаго-н.

**ПРЫТКНУ́ЦЦА**, -ткну́ся, -ткне́шся, -ткне́цца; -ткнёмся, -ткняце́ся. 1. Злёгку дакрануцца, даткнуцца да каго-, чаго-н. 2. Прыхіліцца да каго-, чаго-н.; абаперціся аб што-н. 3. Уладкавацца, прыстроіцца.

**ПРЫТО́ЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Тайны, скрыты; затоены. 2. Загадкавы.

**ПРЫТО́МНАСЦЬ**, -і. Стан, у якім чалавек здольны ўсведамляць, успрымаць навакольны свет.

**ПРЫТО́МНЕЦЬ**, -ею, -ееш, -ее. Прыходзіць да прытомнасці.

**ПРЫТРЫ́ЗНІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Здацца, паказацца ва ўяўленні, у сне.

**ПРЫТРЫ́ЗНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Уявіць, убачыць у сне.

**ПРЫТУЛІ́ЦЦА**, -тулю́ся, -ту́лішся, -ту́ліцца. Прыгарнуцца, прыхіліцца да каго-, чаго-н. з ласкай, пяшчотай.

**ПРЫ́ТЧА**, -ы. Павучальна-дыдактычны жанр апавядальна-філасофскага зместу, заснаваны на алегарычных сюжэтах і вобразнай сістэме сімвалічнага сэнсу. У адрозненне ад байкі ці навелы можа быць без развітага сюжэта, які часта рэдуцыруецца да разгорнутага параўнання.

**ПРЫЎЗНЯ́ТЫ**, -ая, -ае. Радасна-ўзбуджаны, ажыўлены; высокі, урачысты.

**ПРЫХАРАШЫ́ЦЦА**, -рашу́ся, -ро́шышся, -ро́шыцца. 1. Апрануцца хораша, прыгожа, лепш, чым раней, чым звычайна. 2. Надаць сабе больш прыгожы, прыгажэйшы выгляд.

**ПРЫ́ХВАТКАМІ**. Нерэгулярна, урыўкамі, час ад часу.

**ПРЫХІ́ЛЬНАСЦЬ**, -і. 1. Прыхільныя, добразычлівыя, спагадлівыя адносіны да каго-, чаго-н.; сімпатыя. 2. Схільнасць да якога-н. занятку, да якіх-н. спраў, учынкаў.

**ПРЫХІ́ЛЬНІК**, -а. 1. Той, хто прытрымліваецца якіх-н. поглядаў, ідэй; прыхільна адносіцца да каго-, чаго-н. 2. Той, хто выказвае сімпатыі, прыхільнасць да каго-н.; паклоннік.

**ПРЫЦІ́ХНУЦЬ**, -ну, -неш, -не. 1. Перастаць падаваць гукі, ствараць шум і пад.; сціхнуць; стаць амаль нячутным; перастаць чуцца. 2. Перастаць рухацца, замерці.

**ПРЫЦІ́ШАНЫ**, -ая, -ае. 1. Прыглушаны, слаба чутны. 2. Замаруджаны, запаволены.

**ПРЫЦЯГА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які прыцягвае, вабіць да сябе.

**ПРЫЦЯРПЕ́ЦЦА**, -цярплю́ся, -це́рпішся, -це́рпіцца. Прывыкнуць, прызвычаіцца да непрыемнага, непажаданага; звыкнуцца з чым-н.

**ПРЫЧАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Прывабіць сваёй прыгажосцю або іншымі якасцямі.

**ПРЫЧЫ́НА**, -ы. 1. З'ява, акалічнасць, якая служыць падставай чаго-н., выклікае, абумоўлівае другую з'яву. 2. Падстава, зачэпка для якіх-н. дзеянняў, учынкаў.

**ПРЫЧЫТА́ННЕ**, -я. Словы, якія прыгаворваюцца ў час плачу.

**ПРЫЧЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Плакаць, прыгаворваючы словы жальбы.

**ПРЫЧЫ́ТЫ**, -аў. Тое, што і п р ы ч ы т а н н е.

**ПРЫЯ́ЗНАСЦЬ**, -і. Сяброўскія, добразычлівыя адносіны.

**ПРЫЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Прасякнуты сяброўскімі адносінамі, дружалюбнасцю, даверам. 2. Спагадлівы, добразычлівы.

**ПРЫ́ЯЦЕЛЬ**, -я. Блізка знаёмы чалавек, з якім усталяваліся добрыя, прыязныя адносіны.

**ПРЫ́ЯЦЕЛЬСТВА**, -а. Таварыскія адносіны; сяброўства.

**ПРЭМ'Е́Р**, -а. Акцёр, які выконвае першыя, галоўныя ролі і займае ў трупе вядучае палажэнне.

**ПРЭМ'Е́РА**, -ы. Першая пастаноўка новага спектакля.

**ПРЭТЭ́НЗІЯ**, -і. 1. Прад'яўленне сваіх правоў на каго-, што-н.; патрабаванне чаго-н. 2. Патрабаванні, незадаволенасць, прад'яўленыя да каго-, чаго-н.; скарга.

**ПРЭТЭНЦЫЁЗНЫ**, -ая, -ае. Які прэтэндуе на арыгінальнасць; надуманы, манерны.

**ПСЕЎДАНІ́М**, -а. Выдуманае імя або прозвішча, пад якім часта выступаюць пісьменнікі, акцёры, мастакі і інш.

**ПСІХАЛАГІ́ЗМ**, -у. Паглыблены паказ псіхічных, духоўных перажыванняў, глыбокі псіхалагічны аналіз.

**ПСІХАЛАГІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Створаны на паглыбленым паказе псіхалогіі героя.

**ПСІ́ХІКА**, -і. Душэўная арганізацыя чалавека, сукупнасць яго душэўных перажыванняў, сіл, пачуццяў.

**ПУ́БЛІКА**, -і. Людзі, якія знаходзяцца дзе-н. у якасці слухачоў, гледачоў, наведвальнікаў.

**ПУБЛІЦЫ́СТЫКА**, -і. Жанр грамадска-палітычнай літаратуры на тэмы сучаснасці.

**ПУБЛІ́ЧНАЯ АДЗІНО́ТА**. Сцэнічныя дзеянні акцёра перад публікай, у прысутнасці гледачоў.

**ПУБЛІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца ў прысутнасці публікі; адкрыты.

**ПУ́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Пужацца; баяцца, палохацца (звычайна пра жывёлу).

**ПУЖА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Адчуваць страх, палохацца.

**ПУЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Наводзіць страх, палохаць; прымушаць баяцца каго-, чаго-н., страшыць кім-, чым-н.

**ПУЖЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка пужаецца; палахлівы; у якім выражаецца страх, спалох; уласцівы таму, хто пужаецца, палохаецца.

**ПУЖНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Прыстрашыць, прыпужнуць.

**ПУ́ЛЬХНЫ**, -ая, -ае. 1. Мяккі, быццам надзьмуты, пухлы. 2. Лёгкі, пухкі.

**ПУНКТУА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Вельмі акуратны, дакладны.

**ПУНКТУА́ЦЫЯ**, -і. Сістэма расстаноўкі знакаў прыпынку; знакі прыпынку.

**ПУСТАБРЭ́Х**, -а. Пра балбатлівага чалавека.

**ПУСТАДО́МАК**, -мка. Чалавек, які не мае гаспадаркі; дрэнны, нядбайны гаспадар.

**ПУСТАЗВО́Н**, -а. Чалавек, які гаворыць пустое; балбатун, пустамеля.

**ПУСТАЗВО́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Гаварыць пустое, балбатаць.

**ПУСТАЗВО́НСТВА**, -а. 1. Пустыя, беззмястоўныя словы, размовы. 2. Паводзіны, словы пустазвона.

**ПУФ**, -а. Нізкая табурэтка з мяккім, звычайна круглым, сядзеннем.

**ПХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Штурхаць адзін аднаго.

**ПХАЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Штуршкамі прымушаць рухацца куды-н., у якім-н. напрамку. 2. Паспешліва запіхваць што-н. куды-н. 3. Даваць у вялікай колькасці, звыш меры.

**ПЫТА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які змяшчае ў сабе пытанне, выяўляе пытанне.

**ПЫТА́ННЕ**, -я. Зварот да каго-н., які патрабуе адказу, тлумачэння і пад.

**ПЫТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца і **ПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Звяртацца да каго-н. з пытаннем, каб даведацца пра што-н., задаваць пытанне. 2. Прасіць дазволу на што-н.

**ПЫ́ХА**, -і. Фанабэрыстасць, ганарлівасць.

**ПЫХЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Фанабэрысты, празмерна ганарысты.

**ПЫ́ШНЫ**, -ая, -ае. Мяккі; пухкі; лёгкі; пушысты, густы, мяккі (пра валасы, шэрсць і пад.); поўны, круглявы (пра чалавека, яго твар).

**ПЭ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Дакладна вызначаны, прызначаны. 2. Выразны, акрэслены, які склаўся канчаткова. 3. Некаторы, той ці іншы. 4. Перакана괪 ў чым-н. 5. Такі, якому можна даверыцца; надзейны.

**ПЯРШЫ́ЦЬ**, -шы́ць. Пра адчуванне раздражнення, козыту ў горле.

**ПЯРЭ́ВАРАЦЕНЬ**, -тня. Фантастычны персанаж народных павер'яў і казак; чалавек, ператвораны ці здольны сам дзівосным чынам ператварацца ў звера, расліну, камень. У славянскай міфалогіі найчасцей набываў аблічча воўка.

**ПЯРЭ́ЧАННЕ**, -я. Заява аб нязгодзе з чым-н.

**ПЯШЧО́ТА**, -ы. 1. Пачуццё ласкі, замілавання, мяккасці ў адносінах да каго-, чаго-н. 2. *толькі мн.* (**пяшчо́ты**, -от). Учынкі, словы, якімі выказваюцца пачуцці ласкі, замілавання.

**ПЯШЧО́ТНАСЦЬ**, -і. Ласкавасць, пяшчота.

**ПЯШЧО́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Вельмі ласкавы, поўны ласкі, замілавання, аддасці; які выяўляе, выказвае ласку, любоў. 2. Мяккі; лагодны; вельмі прыемны, далікатны, тонкі.

## Р

**РАБО́ЧЫ СЦЭ́НЫ**. Тэхнічны работнік машынна-дэкарацыйнага цэха тэатра, у абавязкі якога ўваходзіць устаноўка дэкарацый да спектакля, падрыхтоўка і рамонт дэкарацый, перамена іх у ходзе спектакля. Брыгада рабочых сцэны працуе пад кіраўніцтвам машыніста сцэны і яго памочнікаў.

**РАГАТА́ЦЬ**, -гачу́, -го́чаш, -го́ча. Гучна, нястрымана смяяцца.

**РАГАТУ́Н**, -а. Той, хто любіць смяяцца, рагатаць; смяшлівы чалавек.

**РА́ДАВАЦЦА**, -дуюся, -дуешся, -дуецца. Адчуваць радасць; праяўляць радасць, быць у радасным, вясёлым настроі.

**РА́ДАВАЦЬ**, -дую, -дуеш, -дуе. Выклікаць радасць, прыносіць радасць; быць прыемным, даваць асалоду.

**РА́ДАСНЫ**, -ая, -ае. Які адчувае радасць; які выклікае, прыносіць радасць.

**РА́ДАСЦЬ**, -і. Пачуццё вялікай асалоды, задаволенасці, якое выклікае вясёлы настрой; весялосць, трыумф.

**РА́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Даваць якую-н. раду; прапанаваць паступіць пэўным чынам; раіць.

**РАДО́К ВЕРШАВА́НЫ**. Графічна і інтанацыйна выдзелены моўны рад у вершаваным творы; адзінка вершаванага рытму. Р. в. розных памераў спалучаюцца ў пэўным парадку, утвараючы строфы. Р. в., у якім поўнасцю змяшчаецца схема вершаванага памеру, называецца вершарадам.

**РАДЫЁКАМПАЗІ́ЦЫЯ**, -і. Кампазіцыя з літаратурных і музычных твораў, складзеных для перадачы па радыё.

**РАДЫЁПАСТАНО́ЎКА**, -і. Адна з формаў мастацкага радыёвяшчання. Уяўляе сабой трансфармацыю літаратурных, тэатральных, слоўна-музычных сцэнічных твораў, а таксама арыгінальныя драматургічныя творы (радыёп'есы).

**РАДЫЁТЭА́ТР**, -а. Від мастацкага радыёвяшчання, у аснове якога ляжыць вобразна-пачуццёвае адлюстраванне рэчаіснасці ў яе гукавой форме. Узнік у сярэдзіне 20-х гг. Меў свае музычныя калектывы і спецыяльныя тэатральныя трупы, якія выступалі ў радыёстудыі. Вытокі — у сферы музычнага мастацтва, першапачатковая форма якога — канцэрт.

**РАЁШНІК**, -а. 1. Акцёр, які паказвае раёк. 2. Райковы верш, від народнага верша. Назва паходзіць ад райка — кірмашовага прадстаўлення 19 — пач. 20 ст., якое суправаджалася вершаванымі тлумачэннямі. Р. выкарыстоўваўся таксама вандроўнымі артыстамі, мядзведнікамі, валачобнікамі і каляднікамі, у тэкстах для батлейкі. 3. Рыфмаваны, пераважна сатырычны маналог на злабадзённую тэму.

**РАЁК**, -йка́. 1. Скрынка з павелічальным шклом для разглядвання малюнкаў, якія прымацоўваліся да драўлянай восі, што круцілася ў сярэдзіне скрынкі. Паказ такіх малюнкаў на кірмашах, распаўсюджаны ў 18 — 19 ст., суправаджаўся жартоўнымі або сатырычнымі тлумачэннямі. 2. Лялечны тэатр. 3. Устарэлая назва верхняга яруса глядзельнай залы тэатра.

**РАЗАБРА́ЦЦА**, разбяру́ся, разбяро́шся, разбярэ́цца; разбяро́мся, разберацё́ся. Унікнуўшы ў падрабязнасці, зразумець сутнасць чаго-н., уясніць для сябе што-н.

**РА́ЗАМ**. 1. Сумесна, у сукупнасці з кім-, чым-н. 2. Адначасова.

**РАЗАМЛЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Расслаблены, вялы.

**РАЗАМЛЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Стаць

расслабленым, вялым.

**РАЗАРВА́НАСЦЬ**, -і. Адсутнасць сувязі паміж кім-, чым-н., адсутнасць цэласнасці, раз'яднанасць.

**РАЗАХВО́ЦІЦЦА**, -ахво́чуся, -ахво́цішся, -ахво́ціцца. 1. Пачаць адчуваць мацнейшую ахвоту, жаданне рабіць што-н. 2. Страціць ахвоту, жаданне рабіць што-н.

**РАЗБАЛБАТА́ЦЦА**, -бачу́ся, -бо́чашся, -бо́чацца. Пачаўшы балбатаць, захапіцца балбатнёй.

**РАЗБАЛБАТА́ЦЬ**, -бачу́, -бо́чаш, -бо́ча. Расказаць каму-н. тое, пра што не варта, нельга было расказваць.

**РАЗБЕДАВА́ЦЦА**, -бяду́юся, -бяду́ешся, -бяду́ецца. Пачаць моцна бедаваць.

**РАЗБІ́ТАСЦЬ**, -і. Вялікая стомленасць, расслабленасць.

**РАЗБІТНЫ́**, -а́я, -о́е. Лоўкі, праворны, бойкі.

**РАЗБІ́ЎКА ТЭ́КСТУ**. Падзел літаратурнага тэксту на моўныя такты.

**РАЗБУБНІ́ЦЦА**, -ню́ся, -ні́шся, -ні́цца. Пачаць доўга і многа бубніць.

**РАЗБУДЗІ́ЦЬ**, -буджу́, -бу́дзіш, -бу́дзіць. Выклікаць да жыцця, абудзіць, актывізаваць.

**РАЗБЭ́СЦІЦЦА**, -бэ́шчуся, -бэ́сцішся, -бэ́сціцца. 1. Прывучыцца да дрэнных звычак, маральна распусціцца. 2. Стаць непаслухмяным.

**РАЗБЭ́ШЧАНЫ**, -ая, -ае. З дрэннымі, амаральнымі звычкамі.

**РАЗВА́ГА**, -і. Думка, меркаванне, вывад, якія з'явіліся ў выніку роздуму.

**РАЗВАЖА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Супастаўляючы падзеі, паняцці і пад., мысліць, рабіць вывады; меркаваць, лічыць. 2. Выказваць свае думкі, меркаванні, гаварыць аб чым-н.; доўга і падрабязна абмяркоўваць што-н.

**РАЗВА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які любіць падумаць, дзейнічае разумна і правільна.

**РАЗВА́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. 1. Разабраўшы абставіны, супаставіўшы факты, прыняць рашэнне ў якой-н. справе. 2. Падумаўшы, вырашыць. 3. Падумаць над чым-н., абдумаць што-н.

**РАЗВАРУШЫ́ЦЬ**, -рушу́, -ру́шыш, -ру́шыць. 1. Вывесці са стану апатыі, абыякавасці; ажывіць; выклікаць жаданне дзейнічаць, займацца чым-н. 2. Прабудзіць, выклікаць, узмацніць (думкі, пачуцці і пад.); расхваляваць, пазбавіць спакою.

**РАЗВІТА́ННЕ**, -я. Апошняе спатканне перад развітаннем; словы, якія гаворацца пры расстанні.

**РАЗВІТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Абмяняцца развітальнымі словамі, паціснуць адзін другому рукі і пад. пры расстанні; расстацца з чым-н., пакінуць што-н. надоўга, назаўсёды.

**РАЗВО́ДКА**, -і. Размеркаванне акцёраў, занятых у спектаклі, па розных месцах сцэнічнай пляцоўкі.

**РАЗВЯ́ЗКА**, -і. Падзея або эпізод, якім заканчваецца развіццё дзеяння ў літаратурным творы і вырашаецца канфлікт, што ляжыць у аснове сюжэта. Часцей за ўсё Р. наступае за кульмінацыяй. Ад Р. у многім залежыць ідэйны сюжэт твора. У ёй адлюстроўваецца пазіцыя аўтара, яго адносіны да герояў і падзей, уяўленне пра іх далейшы лёс.

**РАЗВЯ́ЗНАСЦЬ**, -і. Празмерная свабода, бесцырымоннасць у паводзінах, абыходжанні.

**РАЗВЯ́ЗНЫ**, -ая, -ае. Празмерна вольны, бесцырымонны (пра чалавека і яго паводзіны, абыходжанне).

**РАЗВЯРЭ́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. Растрывожыць, расхваляваць (душу, сэрца); узбудзіць, узмацніць (пачуццё, жаданне і пад.).

**РАЗГАВАРЫ́ЦЦА**, -вару́ся, -во́рышся, -во́рыцца. Пачаць шчырую гаворку; пачаць шмат гаварыць, стаць гаваркім.

**РАЗГА́ДВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Раздумваць, разважаць.

**РАЗГАМАНІ́ЦЦА**, -маню́ся, -мо́нішся, -мо́ніцца. 1. Тое, што разгаварыцца. 2. Гаворачы, падняць шум.

**РАЗГАРАЧЫ́ЦЦА**, -чу́ся, -чы́шся, -чы́цца. Дайсці да стану ўзбуджэння, узрушэння, раздражнення.

**РАЗГНЕ́ВАНЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў стане гневу.

**РАЗГУ́БЛЕНАСЦЬ**, -і. Нерашучасць, замяшанне (ад страху, хвалявання,

збянтэжанасці і пад.).

**РАЗГУ́БЛЕНЫ**, -ая, -ае. Які страціў рашучасць, знаходзіцца ў замяшанні; які ад хвалявання, збянтэжанасці не ведае, як быць; які выказвае разгубленасць, збянтэжанасць, замяшанне.

**РАЗДВО́ЕНЫ**, -ая, -ае. Які страціў цэльнасць, унутранае адзінства.

**РАЗДРАЖНЕ́ННЕ**, -я. Стан злоснага ўзбуджэння; пачуццё незадаволенасці, злосці.

**РАЗДРАЖНІ́ЦЦА**, -дражню́ся, -дра́жнішся, -дра́жніцца. Выклікаць, распаліць у сабе якое-н. жаданне.

**РАЗДУ́МВАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Думаць, вагаючыся; доўга не магчы прыняць рашэння.

**РАЗДУ́РАНЫ**, -ая, -ае. 1. Распешчаны; капрызны, свавольны. 2. Разбэшчаны, распусны.

**РАЗДУРЭ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які раздурэў, развесяліўся. 2. Які распусціўся, разленаваўся.

**РАЗДУРЭ́ЦЦА**, -э́юся, -э́ешся, -э́ецца. Пачаць моцна дурэць.

**РАЗЖА́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Выклікаць пачуццё жалю.

**РАЗЗЛАВА́НЫ**, -ая, -ае. Якога ўвялі ў злосць, раззлавалі; які выяўляе злосць.

**РАЗЗЛАВА́ЦЬ**, -злую́, -злуе́ш, -злуе́; -злуём, -злуяце́. Увесці ў злосць, прывесці ў стан злоснага раздражнення.

**РАЗЛА́Д**, -у і **РАЗЛА́ДДЗЕ**, -я. 1. Адсутнасць адзінства, адпаведнасці, згоднасці. 2. Нязгода, нелады.

**РАЗЛАЙДА́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Разленавацца, стаць лайдаком.

**РАЗЛЕНАВА́ЦЦА**, -ляну́юся, -ляну́ешся, -ляну́ецца. Стаць зусім лянівым, страціць ахвоту працаваць.

**РАЗЛЮТАВА́ЦЦА**, -ту́юся, -ту́ешся, -ту́ецца. Прыйсці ў лютасць; дайсці да крайняй ступені жорсткасці; раз'юшыцца.

**РАЗЛЯТА́ЙКА**, -і. Крылатка або нагул якое-н. верхняе адзенне са свабоднымі, без шпілек поламі.

**РАЗМАТЛАШЫ́ЦЬ**, -лашу́, -ло́шыш, -ло́шыць. Давесці да бязладнага стану; зрабіць раскудлачаным, растрапаным.

**РАЗМЕРКАВА́ННЕ РО́ЛЯЎ**. Доўгі час лічылася, што склад выканаўцаў абумоўлены тэкстам і інтэрпрэтацыяй яго рэжысёрам. Большасць рэжысёраў працягваюць фарміраваць склад выканаўцаў у залежнасці ад прачытання п'есы, з улікам занятасці кожнага акцёра. Некаторыя лічаць, што больш ці менш выпадковы выбар пры Р. р. надае спектаклю своеасаблівасць. Сапраўды, тэатральная творчасць не залежыць больш, як, напрыклад, у 19 ст., ад амплуа, якое акцёры павінны былі захоўваць. Але якая б ні была канцэпцыя рэжысёра, для артыстаў Р. р. мае вялікае значэнне, бо ад дакладнасці «пападання» ў ролю залежыць увесь сэнс пастаноўкі.

**РАЗМО́ВА**, -ы. 1. Слоўны абмен звесткамі, думкамі; гаворка. 2. Мова, гаворка, маўленне.

**РАЗНАПЛА́НАВЫ АКЦЁР**. Акцёр, які здольны выконваць ролі розных амплуа.

**РАЗРУ́МЗАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Пачаць моцна і доўга плакаць.

**РАЗУМЕ́ННЕ**, -я. 1. Здольнасць разумець, спасцігаць розумам змест, сэнс, значэнне чаго-н.; здольнасць разабрацца ў чым-н. 2. Пэўны пункт погляду на што-н., пэўнае вытлумачэнне чаго-н. 3. Уяўленне аб чым-н.

**РАЗУМЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Усведамляць, спасцігаць розумам сэнс, змест і пад. чаго-н.; асэнсоўваць; разбірацца ў думках, паводзінах, учынках, намерах каго-н.

**РАЗУ́МНЫ**, -ая, -ае. Разважлівы, кемлівы, надзелены жыццёвай мудрасцю, розумам.

**РАЗУМО́ВЫ**, -ая, -ае. Звязаны з дзейнасцю розуму; які патрабуе напружанай працы розуму, думкі.

**РАЗУПЭ́ЎНІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Страціць упэўненасць у чым-н.; перастаць быць упэўненым.

**РАЗУПЭ́ЎНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Довадамі прымусіць каго-н. адмовіцца ад сваіх перакананняў, ад упэўненасці ў чым-н.

**РАЗЫГРА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Пачаўшы іграць, захапіцца ігрой. 2. Паступова ўзмацніцца, дасяг-

нуць высокай ступені ў сваім праяўленні.

**РАЗЫГРА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Іграючы сумесна, выканаць (п'есу, музычны твор). 2. Прадставіць што-н. як рэальнае; састроіць з сябе каго-, што-н. 3. Паставіць у недарэчнае становішча шляхам падману.

**РАЗ'Ю́ШАНЫ**, -ая, -ае. Які ашалеў ад злосці, раз'ятраны, разлютаваны; які адлюстроўвае крайняе ўзбуджэнне, шаленства; неўтаймаваны.

**РАЗ'Ю́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. Стаць раз'юшаным; разлютавацца.

**РАЗ'Ю́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Давесці да шаленства, ярасці.

**РАЗЯ́ВА**, -ы. Рассеяны, няўважлівы чалавек.

**РАЗЯВА́КА**, -і. 1. Той, хто бяздумна прыглядаецца да́ каго-, чаго-н. 2. Тое, што і р а з я в а.

**РА́ІЦЦА**, ра́юся, ра́ішся, ра́іцца. Пытацца, прасіць парады; абменьвацца думкамі; радзіцца.

**РА́ІЦЬ**, ра́ю, ра́іш, ра́іць. Даваць параду, рэкамендаваць, як зрабіць што-н., як паступіць.

**РА́МПА**, -ы. Невысокі бар'ер уздоўж авансцэны, які прыкрывае ад гледачоў прыборы для асвятлення сцэны; асвятляльная апаратура, якая за ім знаходзіцца; у пераносным сэнсе — сцэна, тэатр увогуле.

**РА́НАК**, -нку. Пачатак дня; раніца.

**РАНЕ́Й**. Да пэўнага, указанага моманту.

**РАНЕ́ЙШЫ**. 1. Які мае адносіны да мінулага, былога; колішні. 2. Які быў перад гэтым, папярэдні. 3. Той самы; такі, які і быў.

**РАНІ́МЫ**, -ая, -ае. Якому лёгка прычыніць душэўны боль, пакуты; уражлівы.

**РА́НІШНІ**, -яя, -яе. Які бывае раніцай, уранні.

**РА́ННІ**, -яя, -яе. 1. Які з'яўляецца самай першай, пачатковай парой якога-н. часу. 2. Які наступае, прахо́дзіць, адбываецца раней, чым звычайна.

**РА́ПТАМ**. Знянацку, нечакана, неспадзявана; ураз, адразу.

**РАПТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які надышоў, адбыўся нечакана.

**РАСКАВА́НЫ**, -ая, -ае. Вольны, нічым не абмежаваны.

**РАСКА́З**, -у. Славеснае паведамленне пра якія-н. падзеі.

**РАСКАЗА́ЦЬ**, -кажу́, -ка́жаш, -ка́жа. Вусна апісаць, паведаміць пра што-н. бачанае, чутае і пад.

**РАСКА́ЗЧЫК**, -а. Той, хто расказвае; артыст, які выступае з вуснымі расказамі.

**РАСКАТУ́РХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Абудзіцца ад сну; выйсці са стану пасіўнасці, разварушыцца.

**РАСКАТУ́РХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Нямоцна штурхаючы, трасучы, абудзіць ад сну, прымусіць прачнуцца; вывесці са стану прыгнечанасці.

**РАСКА́ЦІСТЫ**, -ая, -ае. Гулкі, моцны, з раскатамі.

**РАСКАШАВА́ЦЦА**, -шу́юся, -шу́ешся, -шу́ецца. Жыць у раскошы, мець усяго ў дастатку; дазваляць сабе што-н. лішняе, звыш патрэбы.

**РАСКВІТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Расплаціцца за што-н., аддаць доўг; адпомсціць за ўчыненую крыўду, зло.

**РАСКО́ЧНЫ ПЛАНШЭ́Т СЦЭ́НЫ**. Планшэт сцэны, складзены з асобных шчытоў, якія пры адкрыцці люкаў адкочваюцца ў бакі.

**РАСПАВЯДА́ЛЬНІК**, -а (**НАРА́ТАР**, -а). Прынцыпова выключаны з «драматычнага» тэатра, дзе драматург ніколі не гаворыць ад свайго імя, Р. з'яўляецца ў пэўных тэатральных формах, у прыватнасці ў эпічным тэатры. Некаторыя народныя формы (афрыканскія і ўсходнія тэатры) часта выкарыстоўваюць яго ў якасці пасрэдніка паміж дзейнымі асобамі і публікай. Р. не ўводзіцца ў тэкст п'есы (за некаторымі выключэннямі: у пралогу, эпілогу, указаннях сцэнічных). Такім чынам, наратар можа фігураваць толькі ў выглядзе персанажа, на якога ўскладваецца задача інфармаваць дзейных асоб або публіку, непасрэдна распавядаючы пра падзеі або каменціруючы іх. Часцей гаворка ідзе пра персанажа-Р., які ў класіцыстычным расповядзе паведамляе пра тое, што не магло быць паказана на сцэне з прычыны

праўдападобнасці або добрапрыстойнасці. Бывае нялёгка правесці мяжу паміж распавяданнем і драматычным дзеяннем, бо працэс выказвання Р. звязаны са сцэнай так, што расповяд заўсёды пэўным чынам «драматызаваны». У калектыўных інсцэніроўках раманаў або ў трупах, якія працуюць на аснове імправізацый да распрацоўкі сцэнічнага тэксту, акцёр-наратар растлумачвае свае адносіны да персанажа, тое, што ён павінен будзе сказаць, што не ў стане выразіць і пад. Не баючыся вывесці наратараў на сцэну, ставяць апавядальныя тэксты, «не прызначаныя» для сцэны (раманы, аповесці і інш.).

**РАСПАЛІ́ЦЦА**, -палю́ся, -па́лішся, -па́ліцца. Моцна ўзрушыцца, расхвалявацца; разгневацца.

**РАСПАНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Разгультаіцца, распусціцца; стаць пераборлівым.

**РАСПЕ́ШЧАНЫ**, -ая, -ае. Які прывык да пяшчот; капрызны, распусны.

**РАСПЛЫ́ВІСТЫ**, -ая, -ае. Недастаткова выразны, няпэўны, няясны.

**РАСПЛЮ́ШЧЫЦЬ**, -шчу, -шчыш, -шчыць. Раскрыць (пра вочы); разамкнуць (пра павекі).

**РАСПО́ВЯД**, -у. Публічнае вуснае выступленне з расказваннем, чытаннем па памяці.

**РАСПО́ВЯД МАСТА́ЦКІ**. Сцэнічнае публічнае ўвасабленне тэксту літаратурнага твора ў жывым вусным слове; мастацкае расказванне, чытанне.

**РАСПУ́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Які вызначаецца маральнай разбэшчанасцю, амаральнымі паводзінамі. 2. Свавольны.

**РАСПУ́СТА**, -ы. 1. Распусны спосаб жыцця. 2. Свавольства, раздуранасць, адсутнасць дысцыпліны. 3. Пра таго, хто раздурэў, распусціўся.

**РАСПУСЦІ́ЦЦА**, -пушчу́ся, -пу́сцішся, -пу́сціцца. Пачаць весці сябе непрыстойна; даць волю сваім пачуццям, настроям; стаць распушчаным.

**РАСПЫТА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца і **РАСПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Пытаючы ў каго-н., даведацца, высветліць што-н.

**РАССЛА́БІЦЦА**, -блюся, -бішся, -біцца. Пазбавіцца сіл, напружання; аслабець.

**РАССМЯШЫ́ЦЬ**, -смяшу́, -сме́шыш, -сме́шыць. Выклікаць смех, прымусіць смяяцца.

**РАСТАЛКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Зрабіць зразумелым; растлумачыць.

**РАСТЛУМА́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Тлумачачы, раскрыць сэнс чаго-н., зрабіць ясным, зразумелым.

**РАСТРЫВО́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Якога апанавала трывога, хваляванне; які выказвае трывогу, хваляванне.

**РАСТРЫВО́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. 1. Выклікаць моцную трывогу, неспакой. 2. Прычыніць боль; развярэдзіць.

**РАСФУФЫ́РАНЫ**, -ая, -ае. Занадта пышна і без густу адзеты.

**РАСХАДЗІ́ЦЦА**, -хаджу́ся, -хо́дзішся, -хо́дзіцца. Дайсці да крайняй ступені ў праяўленні чаго-н., у якіх-н. дзеяннях.

**РАСХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лю́юся, -лю́ешся, -лю́ецца. Пачаць моцна хвалявацца, непакоіцца.

**РАСЧАРАВА́ННЕ**, -я. Пачуццё, стан незадаволенасці, выкліканы нязбыўнымі спадзяваннямі, надзеямі, марамі; страта веры ў каго-, што-н.

**РАСЧАРАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў стане расчаравання, які страціў веру ў каго-, што-н.

**РАСЧАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Выклікаць у каго-н. пачуццё незадаволенасці, разбурыць чые-н. спадзяванні, надзеі, мары.

**РАСЧУ́ЛЕНАСЦЬ**, -і. Усхваляванасць.

**РАСЧУ́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Прыемна ўсхваляваны; які паддаўся жалю, чуллівасці.

**РАСЧУ́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. Паддацца пачуццю хвалявання, замілавання, жалю.

**РАСЧУ́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Выклікаць пачуццё ўсхваляванасці, замілавання, жалю.

**РАСШКУМАТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Разадраць, разарваць на дробныя часткі.

**РАТАВА́ЦЦА**, -ту́юся, -ту́ешся, -ту́ецца. Пазбаўляцца ад небяспекі, пагрозы,

гібелі; берагчыся; засцерагацца ад чаго-н. непрыемнага, непажаданага.

**РАТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Пазбаўляць ад небяспекі, пагрозы, гібелі; берагчы; засцерагаць ад чаго-н. непрыемнага, непажаданага.

**РАТАЦЫ́ЗМ**, -у. Картавасць, няправільнае вымаўленне гука «р».

**РАЎНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. Адчуваць, выказваць рэўнасць.

**РАЎНАДУ́ШНАСЦЬ**, -і. Абыякавыя, безудзельныя адносіны да каго-, чаго-н.

**РАЎНАДУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Абыякавы да навакольнага, да таго, што адбываецца; які не выказвае цікавасці, пачуцця любві да каго-н.

**РАЎНІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Схільны да рэўнасці; ахоплены рэўнасцю; які выяўляе рэўнасць. 2. Напоўнены зайздрасцю, выкліканы бояззю перавагі каго-н. над сабой.

**РАШУ́ЧАСЦЬ**, -і. Смеласць, гатоўнасць прыняць і ажыццявіць сваё рашэнне.

**РАШУ́ЧЫ**, -ая, -ае. Які прымае рашэнні смела, без хістанняў і не спыняецца перад цяжкасцямі ў іх выкананні; дзейсны, энергічны.

**РАШЫ́ЦЦА**, рашу́ся, рэ́шышся, рэ́шыцца. 1. Прыняць якое-н. рашэнне абдумаўшы, знайшоўшы ў сабе сілы, смеласць на гэта; асмеліцца, адважыцца. 2. Страціць што-н.

**РАШЫ́ЦЬ**, рашу́, рэ́шыш, рэ́шыць. 1. Пасля раздумвання, меркавання прыйсці да якога-н. выніку, заключэння. 2. Вынесці, прыняць рашэнне адносна каго-, чаго-н. 3. Знайсці неабходны адказ, вызначыць невядомае; вырашыць, ажыццявіць.

**РАШЭ́ННЕ**, -я. 1. Заключэнне, вывад, намер зрабіць што-н. і пад., да якога прыходзяць пасля абдумвання, абмеркавання. 2. Пастанова.

**РО́ГАТ**, -у і **РАГАТА́ННЕ**, -я. Гучны, нястрыманы смех.

**РО́ДНАСНЫ**, -ая, -ае. Звязаны, выкліканы агульным паходжаннем; блізкі па асноўных прыкметах, якасцях да чаго-н.

**РО́ЗГАЛАС**, -у. Рэха, адгалоскі.

**РО́ЗДУМ**, -у. Паглыбленасць у свае думкі.

**РОЗНАГАЛО́ССЕ**, -я. 1. Бязладныя галасы, гукі. 2. Супярэчлівасць, няўзгодненасць (слоў, думак і пад.). 3. Адсутнасць згоды, адзінства ў поглядах, думках, інтарэсах.

**РО́ЗНІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Мець асаблівасці, рысы, якія адрозніваюць каго-, што-н. ад іншага (іншых), робяць непадобным да іншых; адрозніваецца.

**РО́ЗНЫ**, -ая, -ае. 1. Неаднолькавы, непадобны. 2. Другі, іншы, не той самы. 3. Разнастайны.

**РО́ЛЯ**, -і. 1. Літаратурны вобраз, створаны драматургам або сцэнарыстам у п'есе (кінасцэнарыі) і адпаведна сцэнічны або кінематаграфічны вобраз, увасоблены акцёрам у спектаклі ці фільме. Р. бываюць: камедыйныя, трагедыйныя, драматычныя, трагікамічныя і інш. Адрозніваюць таксама: першыя (галоўныя, цэнтральныя, асноўныя) і другія (другарадныя) ролі, выхадныя Р. — без слоў ці з мінімальнай (2—3 фразы) колькасцю тэксту, эпізадычныя Р. — у адным з эпізодаў спектакля. 2. Сукупнасць тэксту адной дзейнай асобы ў п'есе.

**РО́СПАЧ**, -ы. Стан, пачуццё крайняй безнадзейнасці, упадку духу, выкліканы няшчасцем, непрыемнасцю і пад.

**РО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Ураўнаважаны (пра характар, паводзіны чалавека). 2. Які мае аднолькавыя з кім-н. правы, становішча, значэнне.

**РУ́МЗА**, -ы. Той (тая), хто доўга, без дастатковай прычыны плача; плакса.

**РУ́МЗАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Перарывіста і надакучліва плакаць.

**РУ́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Старацца, клапаціцца, непакоіцца аб кім-, чым-н.

**РУПЛІ́ВАСЦЬ** і **РУ́ПНАСЦЬ**, -і. Дбайнасць, клапатлівасць, стараннасць.

**РУПЛІ́ВЕЦ**, -лі́ўца. Пра дбайнага, клапатлівага, стараннага чалавека.

**РУПЛІ́ВЫ** і **РУ́ПНЫ**, -ая, -ае. Дбайны, клапатлівы, старанны.

**РУХА́ВАСЦЬ**, -і. Уласцівасць рухавага, жывасць.

**РУХА́ВЫ**, -ая, -ае. Які вызначаецца

жывасцю, хуткасцю рухаў; непаседлівы; які валодае лёгкасцю рухаў, лёгка прыводзіцца ў рух; які часта мяняе свой выраз (пра твар).

**РУ́ХАЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да руху, кіруе рухам чаго-н., прыводзіць у рух што-н.

**РУ́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Рабіць рухі, варушыць якімі-н. часткамі цела.

**РУХО́МАСЦЬ**, -і. Уласцівасць і стан рухомага.

**РУХО́МЫ**, -ая, -ае. Які можа змяняцца ў залежнасці ад умоў; які хутка развіваецца, мяняецца.

**РУЦІ́ННЫ**, -ая, -ае. Адсталы, косны.

**РУЧА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Запэўніваць у чым-н., гарантаваць што-н., прымаць на сябе адказнасць за каго-, што-н.

**РЫЗЗЁ**, -я. Старое, падранае адзенне; анучы, старызна.

**РЫ́ЗЫКА**, -і. 1. Магчымая небяспека, пагроза чаму-н. 2. Дзеянне наўдачу ў якой-н. справе з надзеяй на шчаслівы канец.

**РЫЗЫКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. 1. Ісці, адважыцца на рызыку, рабіць рызыкоўны ўчынак. 2. Ставіць пад пагрозу, падвяргаць небяспецы. 3. Ісці на ўчынак, звязаны з магчымымі непрыемнасцямі, непажаданымі вынікамі.

**РЫЗЫКА́НТ**, -а. Смелы, адважны чалавек.

**РЫЗЫКНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́; -нём, -няце́. Нягледзячы на рызыку, адважыцца зрабіць што-н.

**РЫЗЫКО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Звязаны з рызыкай, напоўнены рызыкай.

**РЫ́СА**, -ы. Прыкмета, асаблівасць, якасць, уласцівасць.

**РЫ́ТАР**, -а. 1. Прамоўца, настаўнік красамоўства ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. 2. Прамоўца, які гаворыць прыгожа, напышліва, але малазмястоўна. 3. Вучань ці настаўнік па класу рыторыкі ў духоўнай семінарыі.

**РЫТАРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Заснаваны на правілах рыторыкі; напісаны па правілах рыторыкі, які складаецца з эфектных, знешне прыгожых прыёмаў.

**РЫТМ**, -у. Раўнамернае чаргаванне якіх-н. элементаў (гукавых, рухальных і пад.), уласцівае дзеянню, развіццю чаго-н.

**РЫТМ СПЕКТА́КЛЯ**. Узгоднены ў часе і прасторы рух, чаргаванне і адпаведнасць усіх элементаў і выразных сродкаў сцэнічнага дзеяння. Р. с. звязаны з нарастаннем або спадам, паскарэннем ці запаволеннем, плаўным або бурным развіццём дзеяння. Р. с. быццам зліваецца з тэмпам, паядноўваючыся з ім, таму Станіслаўскі ўвёў тэрмін «тэмпа-рытм». Выбар Р. с. надае спецыфічны сэнс тэксту так, як пэўная манера вуснага выказвання надае спецыфічны сэнс расповяду.

**РЫТМ РАСПО́ВЯДУ**. Актыўная ўнутраная сіла, якая садзейнічае раскрыццю псіхалагічнага стану герояў, псіхалагічнага напружання і дынамікі з'яў і падзей.

**РЫТМАПЛА́СТЫКА**, -і. Сістэма фізічных практыкаванняў для ўсебаковага гарманічнага развіцця цела.

**РЫ́ТМІКА**, -і. Сістэма фізічных практыкаванняў пад музыку, якая мае мэтай развіваць пачуццё рытму.

**РЫТМІ́ЧНАСЦЬ**, -і. Наяўнасць рытму ў чым-н.

**РЫТМІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Падпарадкаваны рытму, які адбываецца ў пэўным рытме; раўнамерны.

**РЫТО́РЫКА**, -і. 1. Старажытная навука пра аратарскае (прамоўніцкае) мастацтва, красамоўства. 2. Залішняя прыгўзнятасць выкавання, эфектнасць.

**РЫ́ФМА**, -ы. Сугучнасць у канцы вершаваных радкоў.

**РЫХТАВА́ЦЦА**, -ту́юся, -ту́ешся, -ту́ецца. Быць, знаходзіцца ў стане падрыхтоўкі да якой-н. дзейнасці.

**РЫ́ХТЫК**. 1. Якраз, дакладна (таксама, такі самы). 2. Выліты хто-н., падобны на каго-н.

**РЭАГАВА́ЦЬ**, -гу́ю, -гу́еш, -гу́е. 1. Паступаць нейкім чынам у адказ на што-н., праяўляючы свае адносіны да чаго-н. 2. Адказваць якімі-н. рухамі, рэфлексамі на тое ці іншае раздражненне.

**РЭА́КЦЫЯ**, -і. Дзеянне або ўчынак, які з'яўляецца адказам на якое-н. уздзеянне.

**РЭАЛІ́СТ**, -а. Чалавек, які вызнача-

ецца практычным падыходам да жыцця, цвярозымі адносінамі да рэальных абставін.

**РЭАЛІСТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які зыходзіць з разумення і ўліку рэальных абставін; практычны. 2. Які кіруецца прынцыпамі рэалізму.

**РЭВЕРА́НС**, -а. Пачцівы паклон з прысяданнем як знак прывітання, падзякі і пад.; перабольшанае выказванне пачцівасці.

**РЭГІ́СТР**, -а. Участак гукавога дыяпазону голасу або музычнага інструмента, які займае пэўнае становішча па вышыні.

**РЭЖЫСЁР**, -а. Мастацкі кіраўнік, пастаноўшчык, які ўзначальвае і аб'ядноўвае ўсю творчую працу па падрыхтоўцы спектакля, кіна-, тэлефільма, канцэртнай праграмы.

**РЭЖЫСЁРСКІ ЭКЗЕМПЛЯ́Р**. Экземпляр п'есы, у якім рэжысёр-пастаноўшчык вызначае ўсе мізансцэны спектакля, сцэнічныя эфекты, дае апісанне грыма, касцюмаў і пад. Р. э. п'есы з'яўляецца як бы партытурай спектакля.

**РЭЖЫСУ́РА**, -ы. Майстэрства стварэння адзінага, гарманічнага цэльнага твора тэатральнага мастацтва з дапамогай творчай арганізацыі ўсіх элементаў спектакля. Здзяйсняецца на аснове пастановачнай задумы рэжысёра, які ставіць п'есу і кіруе працай усіх удзельнікаў пастаноўкі спектакля — акцёраў, мастака, кампазітара і інш.

**РЭЗАНА́НС**, -у. Здольнасць павялічваць сілу і працягласць гукаў.

**РЭЗАНА́ЦЫЯ**, -і. Насычанае гучанне голасу, выклікане спецыяльнай арганізацыяй работы органаў моўнага апарату.

**РЭЗАНЁР**, -а. Сцэнічнае амплуа; акцёр, які выконвае ролю разважлівага чалавека, схільнага да павучальных развагаў, на якога ўскладзена задача паведаміць праз свой каментарый «аб'ектыўныя» або «аўтарскія» адносіны да сітуацыі. Гэты тып персанажа — пераемнік хора ў старажытнагрэчаскай трагедыі — фігуруе галоўным чынам у эпоху класіцызму ў некаторых формах дыдактычных п'ес. Ён з'яўляецца таксама і ў сучасным тэатры, але ў парадыйнай форме.

**РЭЗАНЁРСТВАВАЦЬ**, -ствую, -ствуеш, -ствуе. Доўга і нудна развažаць аб чым-н. у павучальным тоне.

**РЭЗАНІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Даваць, выклікаць рэзананс для гукаўтварэння, маўлення, спеваў.

**РЭ́ЗКІ**, -ая, -ае. Грубы, дзёрзкі.

**РЭЗО́Н**, -у. Сэнс, падстава, разумны довад.

**РЭЗО́ННЫ**, -ая, -ае. Які мае дастаткова разумных падстаў, абгрунтаваны.

**РЭЗЮМЕ́**. Кароткі выклад зместу, сутнасці чаго-н.; кароткая выснова са сказанага.

**РЭ́КВІЕМ**, -а. 1. Памінальнае каталіцкае набажэнства. 2. Музычны твор жалобнага характару.

**РЭКВІЗІ́Т**, -у. Розныя рэчы (акрамя дэкарацый і касцюмаў), неабходныя для пастаноўкі спектакляў ці здымкі фільма і якімі карыстаюцца па ходу разгортвання дзеяння ў спектаклі. У рэалістычным тэатры, у якім узнаўляецца асяроддзе з усімі яго атрыбутамі, Р. надзвычай разнастайны, але зараз ён мае тэндэнцыю страчваць сваю характарызуючую ролю і саступае месца тэатральным механізмам або абстрактным прадметам. Бывае, што Р. трансфармуецца, як у тэатры абсурду (у прыватнасці, у Іанеска), у прадметы-метафары, якія становяцца раўнапраўнымі персанажамі і запаўняюць сцэну.

**РЭКВІЗІ́ТАР**, -а. Тэхнічны супрацоўнік тэатра, у абавязкі якога ўваходзіць захаванне, рамонт, а таксама набыццё і падбор сапраўднага і бутафорскага рэквізіту. Ён жа падае рэквізіт на сцэну і прымае яго. У невялікіх тэатрах пасаду рэквізітара часта спалучаюць з пасадай бутафора.

**РЭКЛА́МА**, -ы. 1. Мерапрыемствы, якія праводзяцца з мэтай стварыць шырокую вядомасць каму-, чаму-н., прыцягнуць гледачоў; распаўсюджанне звестак пра каго-, што-н., каб стварыць папулярнасць (спектаклю, акцёру, рэжысёру, мастаку і пад.). 2. Аб'ява, паведамленне з мэтай прыцягнуць увагу да чаго-н.

**РЭКЛАМАВА́ЦЬ**, -му́ю, -му́еш,

-му́е. Расхваліць (расхвальваць) з мэтай папулярнасці.

**РЭМА́РКА**, -і. У драматургіі — тлумачэнне, указанне драматурга для чытача, пастаноўшчыка і акцёра ў тэксце п'есы, што змяшчаюць кароткую характарыстыку абставін дзеяння, знешняга выгляду, манеры вымаўлення, асаблівасцей персанажаў. Р. маюць важнае значэнне для разумення п'есы пры чытанні і асабліва пры яе пастаноўцы на сцэне.

**РЭПЕРТУА́Р**, -у. Сукупнасць твораў, якія выконваюцца ў тэатры, на эстрадзе і пад. Існуюць паняцці «сучасны» Р., «класічны» Р. Рэпертуар вызначае ідэйныя і мастацкія пазіцыі тэатра. Р. называюць таксама спіс роляў, літаратурных ці музычных твораў, якія выконваюцца акцёрам.

**РЭПЕТЫЦЫ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да рэпетыцыі; прызначаны для рэпетыцыі.

**РЭПЕТЫ́ЦЫЯ**, -і. Развучванне, паўтарэнне або пробнае выкананне драматургічнага, музычнага і пад. твора, прызначанага для спектакля, фільма, канцэрта і пад. Для таго, каб устанавіць і выверыць мастацка-тэхнічныя сродкі афармлення спектакля, праводзяцца спецыяльныя манціровачныя, светлавыя і музычна-шумавыя рэпетыцыі кожнай з'явы, кожнай дзеі (акта) з усімі ўстаноўкамі дэкарацый, мэблі, бутафорыі, але без акцёраў. На манціровачных і светлавых рэпетыцыях мастак канчаткова вывярае асобныя элементы афармлення і робіць патрэбныя папраўкі да знешняга афармлення спектакля; музычныя і шумавыя рэпетыцыі праводзяцца для таго, каб вызначыць месца і ўзровень гучнасці асобных музычных і шумавых нумароў. «Зводныя рэпетыцыі» — гэта прагоны ў дэкарацыях, з музычным і шумавым суправаджэннем, са светлавымі эфектамі. Акцёры надзяваюць касцюмы, робяць грым, спрабуюць дзейнічаць сярод канкрэтнага сцэнічнага абсталявання, прывыкаюць карыстацца бутафорыяй, рэквізітам. Перад выпускам спектакля праводзяцца звычайна дзве генеральныя рэпетыцыі, якія патрабуюць стварэння пэўных умоў «рэжыму спектакля»; рэжысёр ужо не ўмешваецца ў ход спектакля, пасля заканчэння якога робіць падрабязны разбор ігры акцёраў і працы ўсіх службаў. Усе недахопы і памылкі павінны быць выпраўлены да прэм'еры.

**РЭПЕЦІ́РАВАЦЬ**, -рую, -рueш, -руе. Праводзіць рэпетыцыю, развучваць, паўтараць ролю, п'есу і пад., рыхтуючыся да выступлення перад публікай.

**РЭ́ПЛІКА**, -і. Элемент сцэнічнага дыялога — адказ дзейнай асобы на словы партнёра, а таксама канец фразы, апошнія словы аднаго персанажа, пасля якіх гаворыць другі.

**РЭПУТА́ЦЫЯ**, -і. Грамадская думка, якая склалася пра каго-, што-н.

**РЭСПЕКТА́БЕЛЬНЫ**, -ая, -ае. Паважаны, прыстойны, важны.

**РЭ́ЎНАСЦЬ**, -і. Пачуццё пакутлівага сумнення ў чыёй-н. вернасці, падазрэнне ў каханні да каго-н. другога.

**РЭФЛЕ́КСІЯ**, -і. Роздум, поўны сумненняў, хістанняў; аналіз сваіх думак і перажыванняў.

**РЭФЛЕКТЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. Міжвольны, машынальны, несвядомы; рэфлекторны.

**РЭФРЭ́Н**, -а. Радок або некалькі радкоў, якія паўтараюцца ў канцы кожнай страфы верша або куплета песні; прыпеў.

**РЭЦІРАВА́ЦЦА**, -ру́юся, -ру́ешся, -ру́ецца. 1. Адступіць (адступаць). 2. Адысці (адыходзіць), пайсці.

**РЭЦЭ́НЗІЯ**, -і. Артыкул, у якім даецца аналіз і ацэнка спектакля, мастацкага твора і пад.

**РЭЧАІ́СНАСЦЬ**, -і. 1. Тое, што сапраўды існуе; рэальнасць. 2. Аб'ектыўныя ўмовы жыцця людзей.

**РЭЧЫТАТЫ́Ў**, -ты́ву. Напеўная размова ў вакальна-музычным творы; пра манеру гаварыць нараспеў або спяваць, напеўна дэкламуючы. У драматычным творы Р. — некаторыя пасажы, якія дэкламуюцца іншым, чым агульны тэкст, тонам: гэта лейтматывы і тэматычныя рэфрэны (Чэхаў); адметна «сканструяваныя» часткі класіцыстычнага апавядання; маналогі, якія прамаўляюцца даверлівым тонам; пасажы, што паказваюць на пераходы да дзеяння (напрыклад, эпічныя

каментарыі) або на сувязь паміж некалькімі лірычнымі і музычнымі момантамі. У французскай лірычнай трагедыі 17 ст. дасягнуў росквіту дэкламуемы Р., для якога былі характэрныя змены рытму, акампанемент аркестра, штучнасць дыкцыі. Р. — надзвычай эфектыўны сродак пабудовы тэатральнага дыскурсу.

# С

**СААЎТАР**, -а. Асоба, якая сумесна з кім-н. з'яўляецца аўтарам літаратурнага, мастацкага і інш. твора, адкрыцця, вынаходства.

**САБРА́ЦЦА**, збяру́ся, збярэ́шся, збярэ́цца. (Звычайна са словамі: сілы, думкі, дух і пад.) Унутрана арганізаваць сябе.

**САКАВІ́ТАСЦЬ**, -і. Яркасць, каларытнасць (вобраза, мовы і пад.).

**САКАВІ́ТЫ**, -ая, -ае і **САКАЎНЫ́**, -а́я, -о́е. Трапны, вобразны (пра мову, словы і пад.).

**САКАТА́ЦЬ**, -качу́, -ко́чаш, -ко́ча. Хутка, не сціхаючы гаварыць; балбатаць.

**САКРА́МАНТ**, -у. Нешта свяшчэннае, рытуальнае; талісман.

**САКРАМЕНТА́ЛЬНЫ**, -ая. -ае. 1. Свяшчэнны, варты пакланення. 2. Традыцыйны, які стаў звычаёвым.

**САЛАДЖА́ВЫ**, -ая, -ае. Празмерна ветлівы, да прыкрасці ласкавы; які вызначаецца фальшывай пяшчотнасцю.

**САЛІЛО́КВІЙ**, -я. Мова, звернутая да самога сябе (сінонім: маналог). С. больш, чым маналог, стварае становішча, калі персанаж разважае аб псіхалагічнай і маральнай сітуацыі, у якой знаходзіцца, агаляючы, дзякуючы тэатральнай умоўнасці, тое, што засталося б проста ўнутраным маналогам. Тэхніка С. раскрывае гледачу душу або неўсвядомленае персанажа: адсюль яго эпічная значнасць, лірычны пафас, здольнасць вылучыць з п'есы пэўны фрагмент і надаць яму аўтаномнае значэнне (напрыклад, салілоквій Гамлета аб існаванні).

**САМААДДА́ЧА**, -ы. Поўная аддача ўсіх сіл, здольнасцей, ведаў якой-н. справе.

**САМААДРАЧЭ́ННЕ**, -я. Свядомае адмаўленне ад асабістых выгад у імя каго-, чаго-н.

**САМААРГАНІЗА́ЦЫЯ**, -і. Арганізацыя сваёй працы, дзейнасці.

**САМААСУДЖЭ́ННЕ**, -я. Асуджэнне ўласных дзеянняў, учынкаў і пад.

**САМААХВЯРАВА́ННЕ**, -я. Ахвяраванне сабой, сваімі асабістымі інтарэсамі дзеля агульнай справы, у імя шчасця іншых.

**САМААЦЭ́НКА**, -і. Ацэнка самога сябе, сваёй годнасці, недахопаў.

**САМААШУКА́НСТВА**, -а. Ілжывая ўпэўненасць у чым-н.; пераконванне сябе ў тым, што не адпавядае сапраўднасці.

**САМАБЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. Арыгінальны, не падобны да іншых; своеасаблівы.

**САМАВАЛО́ДАННЕ**, -я. Уменне валодаць сабою; стрыманасць, душэўная ўраўнаважанасць.

**САМАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. Паважны, салідны; удумлівы, самастойны; упэўнены, спакойны.

**САМАВО́ЛЬНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Чыніць, тварыць самавольства; дзейнічаць самавольна.

**САМАВО́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які дзейнічае па сваёй волі, як сам жадае, не лічачыся ні з кім. 2. Які робіцца без дазволу, самаўпраўна.

**САМАВО́ЛЬСТВА**, -а. 1. Схільнасць рабіць што-н. па сваёй волі, не лічачыся з іншымі. 2. Самавольныя паводзіны, самавольны ўчынак.

**САМАВЫ́ЗНАЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. Знайсці, вызначыць сваё месца ў жыцці, у грамадстве.

**САМАВЫЯЎЛЕ́ННЕ**, -я. Выяўленне

самога сябе ў чым-н., у якой-н. дзейнасці.

**САМАГУ́БСТВА**, -а. Наўмыснае пазбаўленне сябе жыцця; шкода, якую чыніць сам сабе чалавек.

**САМАДУ́Р**, -а. Той, хто дзейнічае па асабістаму капрызу, не лічачыся з іншымі людзьмі.

**САМАДУ́РСТВА**, -а. Характар дзеянняў, паводзіны самадура.

**САМАДЫСЦЫПЛІ́НА**, -ы. Уменне кіраваць сабой, падпарадкоўваць свае дзеянні пэўным патрабаванням, прынцыпам.

**САМАЗАБЫЦЦЁ**, -я. Найвышэйшая ступень узбуджанасці, якая прыводзіць да забыцця самога сябе і ўсяго навакольнага; узрушанасць, расхваляванасць.

**САМАЗАСПАКАЕ́ННЕ**, -я. Уяўнае заспакаенне сябе думкай аб тым, што справы ідуць добра.

**САМАЗАСПАКО́ЕНАСЦЬ**, -і. Бесклапотныя адносіны да справы, заснаваныя толькі на адной упэўненасці, што яна ідзе добра.

**САМАЗАСПАКО́ЕНЫ**, -ая, -ае. Які не клапоціцца аб справе, лічачы, што яна ідзе добра.

**САМАЗДАВО́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Такі, які здаволены сабой, перакана751 ў сваёй перавазе, годнасці і. паказвае, праяўляе гэту здаволенасць; які выражае здаволенасць самім сабою, сведчыць пра гэта.

**САМАКАНТРО́ЛЬ**, -ю. Кантроль над самім сабой, назіранне за сваёй працай, паводзінамі, станам здароўя.

**САМАЛЮБАВА́ННЕ**, -я. Любаванне самім сабой, сваімі здольнасцямі, поспехамі.

**САМАЛЮ́БСТВА**, -а. Пачуццё ўласнай годнасці, якое звычайна спалучаецца з раўнівымі адносінамі да думкі пра сябе іншых людзей; нястрымная прага да славы.

**САМАМАСА́Ж**, -у. Расціранне, разміванне самім свайго цела з лячэбнымі або касметычнымі мэтамі.

**САМАНАДЗЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. Празмерна ўпэўнены ў самім сабе, у сваіх сілах і здольнасцях; які адлюстроўвае празмерную ўпэўненасць у сабе, сведчыць пра яе.

**САМАСТО́ЙНАСЦЬ**, -і. Незалежнасць, свабода ад чыйго-н. уплыву, прымусу; уласцівасць адрозніваецца, вылучацца сваімі асаблівасцямі.

**САМАСТО́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Які існуе незалежна, свабодна; які вылучаецца сярод іншых, мае ўласнае значэнне. 2. Здольны дзейнічаць сам, без чужой дапамогі або кіраўніцтва.

**САМО́ТА**, -ы. 1. Адзінота. 2. Смутак, туга.

**САМО́ХАЦЬ**. Па сваёй ахвоце; само сабой, мімаволі.

**САНЕ́Т**, -а. Лірычны верш з 14 радкоў — двух чатырохрадкоўяў і двух трохрадкоўяў з асаблівым размяшчэннем рыфмаў.

**САНТЫМЕ́НТЫ**, -аў. Празмерная чуллівасць; празмерна нерашучае, мяккае дзейнічанне.

**САПЕ́РНІК**, -а. Той, хто імкнецца перамагчы каго-н., дабіваючыся адной і той жа мэты; той, хто ўступае ў саперніцтва з кім-н., дамагаючыся кахання якой-н. жанчыны.

**САПЕ́РНІЦТВА**, -а. Імкненне перамагчы каго-н. у чым-н.

**САПЕ́РНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Імкнуцца перамагчы каго-н., дабіваючыся адной і той жа мэты; уступаць у саперніцтва, дамагаючыся кахання якой-н. жанчыны (якога-н. мужчыны).

**САПРА́ЎДНАСЦЬ**, -і. 1. Тое, што існуе на самай справе, у жыцці; рэальнае існаванне чаго-н., рэальнасць. 2. Аўтэнтычнасць, праўдзівасць.

**САПРАЎДЫ́**. На самай справе.

**САРАМАТА́**, -ы́. Сорам, ганьба; пачуццё маральнай адказнасці за свае паводзіны, учынкі.

**САРАМАЦІ́ЦЦА**, -мачу́ся, -маці́шся, -маці́цца. 1. Адчуваць сорам ад усведамлення непрыстойнасці сваіх учынкаў і пад. 2. Няславіць, ганьбіць сябе. 3. Саромецца, бянтэжыцца.

**САРАМАЦІ́ЦЬ**, -мачу́, -маці́ш, -маці́ць. 1. Дакараць, выклікаючы пачуццё сораму. 2. Ганьбіць, няславіць. 3. Прыводзіць у замяшанне, бянтэжыць, канфузіць.

**САРАМЛІ́ВЫ** і **САРАМЯ́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка саромеецца, бянтэжыцца; нясмелы.

**САРДАНІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Зласліва-насмешлівы; кплівы, з'едлівы (пра ўсмешку, смех і пад.).

**САРДЭ́ЧНАСЦЬ**, -і. Шчырасць, спагадлівасць, чуласць.

**САРДЭ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Спагадлівы, добры, чулы (пра чалавека, яго характар). 2. Звязаны з каханнем; любоўны.

**САРКА́ЗМ**, -у. З'едлівая, вострая, злосная насмешка, кпіны.

**САРКАСТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які выражае сарказм, прасякнуты сарказмам.

**САРО́МЕЦЦА**, -еюся, -еешся, -еецца. 1. Адчуваць сорам, няёмкасць за свае паводзіны, учынкі і пад. 2. Бянтэжыцца, канфузіцца; не адважвацца рабіць што-н. з-за няёмкасці, сарамлівасці.

**САРО́МІЦЬ**, -ро́млю, -ро́міш, -ро́міць. 1. Дакараць, выклікаючы пачуццё сораму. 2. Няславіць, ганьбіць.

**САРО́ЧКА**, -і. Мужчынская (верхняя і сподняя) або жаночая (сподняя) кашуля.

**САСЛАБЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. Які стаў фізічна слабы, нядужы.

**САСТУПІ́ЦЬ**, -ступлю́, -сту́піш, -сту́піць. 1. Добраахвотна адмовіцца ад каго-, чаго-н., аддаўшы, перадаўшы што-н. каму-н. іншаму. 2. Перастаць супраціўляцца; пайсці на ўступкі.

**САТАНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Станавіцца злым, злавацць; прыходзіць у стан моцнага ўзбуджэння.

**САТЫ́РА**, -ы. 1. Спецыфічная форма мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, якой уласціва з'едлівае высмейванне розных адмоўных з'яў жыцця, заган асобных людзей. 2. Твор літаратуры і мастацтва, у якім высмейваюцца людскія заганы, рэзка асуджаюцца негатыўныя з'явы жыцця. 3. Рэзкае, з'едлівае высмейванне, развянчанне каго-, чаго-н.

**САТЫРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Выкрывальны. 2. З'едліва-насмешлівы; іранічны.

**САТЫСФА́КЦЫЯ**, -і. Задавальненне ў форме паядынку, дуэлі, якое даецца абражальнікам па патрабаванні абражанага для абароны гонару.

**САЎЛАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Перамагчы, пераадолець, перасіліць (пачуццё, стан і пад.).

**САФА́**, -ы. Мяккая шырокая канапа з нізкімі спінкай і падлакотнікамі.

**САФІ́Т**, -а. 1. Сцэнічны прыбор, які складаецца са свяцільняў рассеянага святла. Свяцільні зманціраваны ў секцыях, падвешаных да спецыяльных металічных фермаў, якія падымаюцца і апускаюцца з дапамогай грузавых пад'ёмаў або электраматора. Задача С. — асвятленне сцэны зверху і спераду. Сучасныя С. канструіруюцца ў два або тры ярусы (па-рознаму накіраваныя). 2. Частка дэкарацыі на сцэне, якая з'яўляецца відарысам столі, неба.

**САЦІ́**. Сярэдневяковая камічная п'еса (14 — 15 ст.), п'еса «дурняў» (блазнаў), якія пад маскай вар'яцтва накідваюцца на тых, хто ўладарыць, і на норавы грамадства (напрыклад, «Гульня прынца дурняў» Грэнгара).

**САЧЫ́ЦЬ**, сачу́, со́чыш, со́чыць. 1. Цікавячыся чым-н., назіраць за развіццём, станам, ходам чаго-н.; уважліва ўглядвацца, услухвацца ў што-н., каб правільна зразумець, не ўпусціць чаго-н. 2. Апекаваць каго-н., клапаціцца пра каго-, што-н. 3. Устанавіць пастаянны нагляд за кім-, чым-н. з тым, каб выкрыць, выявіць што-н., злавіць каго-н. на чым-н.

**СВАВО́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. 1. Гарэзаваць, дурэць. 2. Весці сябе несур'ёзна, легкадумна.

**СВАВО́ЛЬНІК**, -а. 1. Гарэза, дуронік. 2. Неслух. 3. Несур'ёзны, легкадумны чалавек.

**СВАРЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Схільны да сварак, спрэчак.

**СВАРЫ́ЦЦА**, свару́ся, сва́рышся, сва́рыцца. 1. Лаяцца з кім-н. 2. Крычаць на каго-н., лаяць каго-н.

**СВАТ**, -а. 1. Асоба, якая сватае жаніху нявесту ці нявесце жаніха. 2. Бацька мужа ў адносінах да жончыных бацькоў ці бацька жонкі ў адносінах да мужавых бацькоў.

**СВА́ТАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Прасіць згоды на шлюб з сабой.

**СВА́ТАЦЬ**, -аю, -аеш. 1. Прапаноўваць каго-н. у мужы ці ў жонкі; клапаціцца аб чым-н. шлюбе. 2. Прасіць згоды на шлюб з кім-н. (у жанчыны або ў яе родных).

**СВА́ЦЦЯ**, -і. 1. Жанчына, якая сватала нявесту жаніху ці жаніха нявесце. 2. Маці мужа ў адносінах да жончыных бацькоў ці маці жонкі ў адносінах да мужавых бацькоў.

**СВАЯ́К**, -а́. Той, хто знаходзіцца ў сваяцтве з кім-н.

**СВАЯ́ЦКІ**, -ая, -ае. 1. Заснаваны на сваяцтве, які мае адносіны да сваяцтва. 2. Блізкі па агульнасці паходжання.

**СВАЯ́ЦТВА**, -а. 1. Адносіны паміж людзьмі, якія маюць агульных продкаў. 2. Роднасць не па крыві, а па шлюбу (адносіны паміж роднымі тых, хто жаніўся). 3. Радня.

**СВЕТАПО́ГЛЯД**, -у. Сістэма поглядаў на жыццё, прыроду і грамадства.

**СВЁКАР**, -кра. Бацька мужа.

**СВІСЦЯ́ЧЫ ЗЫ́ЧНЫ**. Гук, які ўтвараецца пры праходжанні струменю паветра праз вузкую шчыліну ў месцы збліжэння пярэдняй часткі языка з верхнімі пярэднімі зубамі.

**СВОЕАСАБЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які мае адметныя ўласцівасці, прыметы, якасці; не падобны на іншых, незвычайны, арыгінальны.

**СВОЕЧАСО́ВЫ**, -ая, -ае. Які адбываецца, выконваецца ў належны, у вызначаны час.

**СВЯДО́МАСЦЬ**, -і. 1. Працэс адлюстравання рэчаіснасці мозгам чалавека, што ўключае ўсе формы псіхічнай дзейнасці і абумоўлівае мэтанакіраваную дзейнасць чалавека. 2. Успрыманне і разуменне навакольнага, уласцівае чалавеку. 3. Здольнасць правільна разумець і ацэньваць з'явы жыцця, вызначаць сваe адносіны да рэчаіснасці.

**СВЯДО́МЫ**, -ая, -ае. 1. Разумны, асэнсаваны. 2. Здольны мысліць і разважаць; перакананы ў правільнасці сваіх поглядаў, дзеянняў.

**СВЯКРО́Ў**, свекрыві́, **СВЯКРО́ЎКА** і **СВЯКРУ́ХА**, -і. Маці мужа.

**СВЯ́ТАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць святога. 2. Прадмет захаплення, чыстаты; рысы незвычайнасці, уласцівыя святому (у 2, 3 знач.).

**СВЯТЛО́ НА СЦЭ́НЕ**. Адзін з важных мастацка-пастановачных сродкаў, які дапамагае ўзнавіць месца і абставіны дзеяння, перспектыву, стварыць неабходны настрой і пад. Розныя віды дэкарацыйнага афармлення патрабуюць адпаведных прыёмаў асвятлення.

**СВЯТЫ́**, -а́я, -о́е. 1. Паводле рэлігійных вераванняў — надзелены абсалютнай дасканаласцю і чысцінёй, боскай сілай. 2. Высокай маралі, бездакорны ў сваім жыцці, паводзінах; бязгрэшны. 3. Высакародны, чысты, узвышаны.

**СВЯЦІ́ЛЬНЯ**, -і. Вялікая асвятляльная прылада, а таксама арматура да яе.

**СЕНТЫМЕНТА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Залішне чуллівы, пяшчотны, здольны лёгка расчуліцца; прытарна-саладжавы.

**СЕНЬЁР**, -а. У Іспаніі — форма ветлівага звароту да мужчыны (ужываецца ў спалучэнні з імем або прозвішчам асобы).

**СЕНЬЁРА**, -ы. У Іспаніі — форма ветлівага звароту да жанчыны (ужываецца ў спалучэнні з імем або прозвішчам асобы).

**СЕНЬЯРЫ́ТА**, -ы. У Іспаніі — форма ветлівага звароту да дзяўчыны.

**СЕРДАВА́ЦЬ**, сярду́ю, сярду́еш, сярду́е. Адчуваць раздражненне, гнеў на каго-, што-н.; быць у стане раздражнення, гневу.

**СІБАРЫ́Т**, -а. Распешчаны, раздураны раскошаю чалавек.

**СІМПАТЫЗАВА́ЦЬ**, -зу́ю, -зу́еш, -зу́е. Адчуваць сімпатыю, адносіцца з сімпатыяй да каго-, чаго-н.

**СІМПАТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які выклікае сімпатыю, прывабны, мілы, прыемны (пра чалавека).

**СІМПА́ТЫЯ**, -і. Прыхільнасць да каго-, чаго-н.

**СІПАТА́**, -ы́. 1. Уласцівасць і стан сіпатага; сіпатыя гукі. 2. Адчуванне сухасці ў горле, што перашкаджае яснасці, выразнасці мовы.

**СІПА́ТЫ**, -ая, -ае. Які страціў чысціню і гучнасць (пра голас, гукі і пад.); які гаворыць прыглушана-хрыплым голасам (пра чалавека).

**СІПЛАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Крыху сіплы.

**СІ́ПЛЫ**, -ая, -ае. Прыглушана-хрыплы, з лёгкім сіпеннем і прысвістваннем (пра голас, гукі і пад.).

**СІТУА́ЦЫЯ**, -і. Сукупнасць абставін,

у якіх што-н. адбываецца; становішча, у якім хто-н. знаходзіцца.

**СКАЗА́ННЕ**, -я. Апавяданне гістарычнага або легендарнага зместу — адзін з жанраў старажытнай рускай літаратуры.

**СКАЛАНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. Задрыжаць, затрэсціся; страсянуцца, здрыгануцца; ускалыхнуцца, ажывіцца.

**СКАМАРО́Х**, -а. 1. У Старажытнай Русі і ў пазнейшы час — вандроўны акцёр. 2. Пра чалавека, які пацяшае другіх штукарскімі выхадкамі.

**СКАМЯНЕ́ЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які стаў нерухомы, здранцвелы. 2. Які страціў здольнасць праяўляць якія-н. пачуцці, стаў абыякавы да ўсяго.

**СКАНЦЭНТРАВА́НАСЦЬ**, -і. Накіраванасць на адзін які-н. прадмет, сабранасць (думак, увагі і пад.).

**СКА́РГА**, -і. Выражэнне незадавальнення, нараканне з прычыны якіх-н. непрыемнасцей, болю і пад.

**СКАСАВУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Паглядзець скоса, скрыва.

**СКВАЛЫ́ГА**, -і. Скнара, жмінда.

**СКВА́ПНЫ**, -ая, -ае. 1. Прагны да багацця, хцівы, скупы. 2. Які прагна імкнецца што-н. мець у вялікай колькасці; ласы да чаго-н.

**СКЕ́ПТЫК**, -а. Той, хто ва ўсім сумняваецца, да ўсяго адносіцца недаверліва.

**СКЕТЧ**, -а. Кароткая сцэнка, у якой звычайна разыгрываецца камічная сітуацыя з удзелам некалькіх акцёраў, якія, не вельмі клапоцячыся пра глыбокую характарыстыку або складаную інтрыгу, робяць акцэнты на смешныя моманты. С. — эстрадны нумар, у якім увасабляецца гумарыстычны або сатырычны персанаж, сцэна ў мюзік-холе, кабарэ, на тэлебачанні або ў кавярні-тэатры. Яго галоўны прынцып — сатыра, часам пародыя, бурлеск і гратэск аб сучасным жыцці.

**СКІ́БА**, -ы. 1. Луста (звычайна хлеба). 2. Пласт узаранай зямлі.

**СКІ́ВІЦА**, -ы. Кожная з дзвюх костак твару, у якіх умацаваны зубы; верхняя або ніжняя частка твару, дзе знаходзіцца гэта костка.

**СКНА́РА**, -ы. Надзвычай скупы чалавек.

**СКОРАГАВО́РКА**, -і. 1. Хуткае маўленне. 2. Жартаўлівая фраза, пабудаваная на спалучэнні гукаў, якія робяць цяжкім хуткае вымаўленне яе.

**СКРАЗНО́Е ДЗЕ́ЯННЕ**. Дзейснае, унутранае імкненне псіхалагічнага жыцця дзейных асоб (роляў), якое праходзіць праз усю п'есу і вядзе да выканання звышзадачы пастаноўкі спектакля.

**СКРУ́ХА**, -і. Туга, маркота; жаль, шкадаванне.

**СКРЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. Які хавае ад іншых свае пачуцці, настроі, думкі, намеры і пад.

**СЛАТА́**, -ы́ і **СЛО́ТА**, -ы. Сырое надвор'е з дажджом і мокрым снегам.

**СЛО́ЎНАЕ ДЗЕ́ЯННЕ**. Мэтанакіраванае маўленне артыста на сцэне, якое ўводзіць гледачоў у сутнасць думак, пачуццяў, паводзін, характару канкрэтнага персанажа (вобраза).

**СЛУ́ШНЫ**, -ая, -ае. Разумны, абгрунтаваны; практычна карысны.

**СМА́ГА**, -і. 1. Моцнае жаданне піць. 2. Моцнае імкненне да чаго-н.

**СМАКАТА́**, -ы́. 1. Што-н. смачнае. 2. Пра што-н. вельмі смачнае; аб'ядзенне.

**СМУ́ТАК**, -тку. Пачуццё суму, маркоты, жалю; журботны, сумны выраз (вачэй, твару і пад.).

**СМУТКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. 1. Гараваць з прычыны чыёй-н. смерці. 2. Сумаваць, журыцца; засмучацца, бедаваць.

**СО́РАМ**, -у. Пачуццё моцнай збянтэжанасці, хвалявання ад усведамлення непрыгожасці свайго ўчынку; пачуццё няёмкасці.

**СО́РАМНА**. 1. Брыдка, няёмка. 2. Пра пачуццё сораму, што адчувае хто-н.

**СПАГА́ДА**, -ы. 1. Спачуванне каму-н. у сувязі з чым-н.; добразычлівыя адносіны да каго-, чаго-н.; маральная падтрымка. 2. Літасць да каго-н.

**СПАГАДА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Спачуваць, адносіцца са спагадай да гора, перажыванняў каго-н. 2. Адносіцца добразычліва да каго-, чаго-н.; праяўляць літасць.

**СПАГА́ДЛІВЫ** і **СПАГА́ДНЫ**, -ая,

-ае. 1. Уважлівы да людзей, чулы, сардэчны; які выяўляе спачуванне, спагаду. 2. Які выяўляе падтрымку, добразычлівасць, літасць.

**СПАДЗЯВА́ННЕ**, -я. Чаканне нечага, што павінна адбыцца, здзейсніцца, надзея на што-н.

**СПАДЗЯВА́ЦЦА**, -дзяю́ся, -дзяе́шся, -дзяе́цца; -дзяёмся, -дзеяце́ся. 1. Мець надзею, разлічваць на што-н.; чакаць чаго-н. 2. Мець упэўненасць у кім-, чым-н.; мець спадзяванні на каго-н.

**СПАДКАЕ́МЕЦ**, -мца. 1. Асоба, якая атрымала спадчыну або мае права на яе; наследнік. 2. Той, хто працягвае чые-н. традыцыі, чыю-н. дзейнасць.

**СПАДНІ́ЦА**, -ы. 1. Жаночае адзенне, а таксама частка сукенкі ад таліі ўніз. 2. Пра жанчыну (як прадмет цягі мужчын).

**СПАДЦІШКА́**. Скрытна, ціха, непрыкметна.

**СПАЗНА́ЦЬ**, -зна́ю, -зна́еш, -зна́е. 1. Ахапіць розумам, асэнсаваць з'явы рэчаіснасці. 2. Адчуць, зазнаць што-н. на ўласным вопыце, перанесці, перажыць што-н. 3. Усвядоміць, зразумець, пераканацца.

**СПАКВАЛЯ́**. Паступова, патроху; марудна, павольна.

**СПАКУ́СА**, -ы. 1. Тое, што вельмі вабіць чалавека, выклікае неадольнае жаданне; цяга да чаго-н., жаданне валодаць чым-н. спакуслівым. 2. Схіленне да інтымнай блізкасці; прывабліванне.

**СПАКУСІ́ЦЬ**, -кушу́, -ку́сіш, -ку́сіць. 1. Прывабіць; захапіць. 2. Падгаварыць, падбіць на што-н. нядобрае. 3. Пяшчотамі, абяцанкамі дабіцца ад жанчыны (дзяўчыны) інтымнай блізкасці.

**СПАКУ́ТАВАНЫ**, -ая, -ае. Змардаваны, змучаны.

**СПАЛО́Х**, -у. 1. Раптоўнае адчуванне страху; перапалох, агульная нечаканая трывога, хваляванне.

**СПАЛО́ХАНЫ**, -ая, -ае. Ахоплены страхам, жудасцю.

**СПАЛО́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Раптоўна адчуць страх, боязь.

**СПАЛО́ХАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Выклікаць у каго-н. пачуццё страху, прымусіць баяцца чаго-н.

**СПАЧУВА́ННЕ**, -я. 1. Спагадлівыя, зычлівыя адносіны да чыйго-н. гора, няшчасця; спагада. 2. Пачуццё спагады, жалю; пісьмовае або вуснае выражэнне пачуцця спагады, жалю ў сувязі з кім-н. горам, няшчасцем. 3. Добразычлівыя адносіны да каго-, чаго-н.; падтрымка, ухваленне чаго-н.

**СПЕКТА́КЛЬ**, -я. Твор тэатральнага мастацтва, падрыхтаваны і публічна паказаны тэатральным калектывам.

**СПРАВАКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Наўмысна выклікаць, падбухторыць каго-н. на якія-н. дзеянні, учынкі.

**СПРА́ЎДЗІЦЦА**, -дзіцца. 1. Ажыццявіцца, здзейсніцца; збыцца. 2. Аказацца правільным, пацвердзіцца.

**СПРАЧА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Весці спрэчкі; пярэчыць каму-н., даказваючы што-н.; выступаць супраць чаго-н., не згаджацца з чым-н.; сварыцца.

**СПРЫ́ТНЫ**, -ая, -ае. 1. Якому ўласцівы фізічны спрыт; лоўкі, паваротлівы. 2. Акуратны, зграбны. 3. Які лёгка знаходзіць выхад з цяжкага становішча, кемлівы, знаходлівы; прадпрымальны, абаротлівы.

**СПРЫЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. 1. Садзейнічаць; памагаць. 2. Праяўляць добразычлівасць да каго-н.

**СПУ́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Перапалоханы, ахоплены спалохам; які выражае спалох.

**СПЫТА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Задаць каму-н. пытанне, каб даведацца пра што-н.; звярнуцца да каго-н. з пытаннем. 2. Папрасіць што-н., звярнуцца з просьбай. 3. Перажыць, зведаць, зазнаць (гора, турботы і пад.). 4. Ускласці на каго-н. адказнасць за дзеянні, учынкі; спагнаць.

**СТАНО́К**, -нк а́. У тэатры — канструктыўная частка дэкарацыйнай устаноўкі. С. служыць для стварэння на сцэне розных пляцовак, узвышэнняў і інш.

**СТАНС**, -а. 1. Вершаваная страфа з чатырох радкоў, якая мае закончаную думку. 2. *толькі мн.* (ста́нсы, -аў). Верш з такіх строф.

**СТАПА́**, -ы́. Спалучэнне націскнога з адным ці двума ненаціскнымі складамі, якое заканамерна паўтараецца ў вершаваным радку.

**СТА́ТЫКА**, -і. Стан спакою, раўнавагі; нязменнасць, адсутнасць руху, развіцця.

**СТАТЫ́СТ**, -а. 1. Акцёр, які выконвае на сцэне другарадныя ролі без слоў, удзельнік масавых сцэн. 2. Асоба, якая адыгрывае зусім малую ролю ў той ці іншай справе, дзейнічае пасіўна.

**СТА́ЎЛЕННЕ**, -я. Адносіны да каго-, чаго-н., погляд на што-н.

**СТОГН**, -у. 1. Жаласны енк, выкліканы болем або вялікім горам; выражэнне пакуты, адчаю. 2. Скарга, нараканне.

**СТО́МА**, -ы. Аслабленне сіл, змаранасць ад цяжкай працы ці якога-н. занятку.

**СТО́МЛЕНЫ**, -ая, -ае. Абяссілены, змораны.

**СТРА́ВА**, -ы. 1. Пэўным чынам прыгатаваныя для яды прадукты харчавання; яда. 2. Адзін з відаў яды, які падаецца на снеданне, абед або вячэру.

**СТРАПЯНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца. Мімаволі ўздрыгнуць, страсянуцца (ад страху, узрушэння і пад.); выйсці са стану нерухомасці, зняменя; схамянуцца, успомніўшы што-н. важнае, істотнае.

**СТРА́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Вельмі моцны, нястрыманы ў сваім праяўленні (пра пачуцці). 2. Здольны на моцнае каханне, страсць; вельмі палкі, гарачы. 3. Які з вялікім уздымам адносіцца да чаго-н., цалкам аддаецца якой-н. справе.

**СТРАСЦЬ**, -і. 1. Нястрымнае пачуццё, моцнае захапленне; уздым, запал. 2. Пастаянная прыхільнасць да чаго-н., моцная цяга да чаго-н. 3. Моцнае, нястрымнае каханне з перавагай пачуццёвай цягі.

**СТРАФА́**, -ы́. У вершаскладанні — інтанацыйна-сэнсавая еднасць двух ці больш вершаваных радкоў, звязаных рыфмамі або клаўзуламі; адносна закончаная частка вершаванага твора.

**СТРО́І**, -яў. Уборы, убранне.

**СТЫЛІЗА́ЦЫЯ**, -і. Наданне мастацкаму твору характэрных рыс якога-н. пэўнага стылю; падробка пад той ці іншы стыль; аднаўленне каларыту якой-н. эпохі ў вобразах і стылявых асаблівасцях мастацкага твора.

**СТЫЛІ́СТЫКА**, -і. 1. Вучэнне аб стылях мовы. 2. Сукупнасць вобразных сродкаў мастацкага твора, пісьменніка, літаратурнай школы і пад.

**СТЫЛЬ**, -ю. 1. Сукупнасць прыкмет, якія характарызуюць мастацтва пэўнага часу і напрамку з боку ідэйнага зместу і мастацкай формы. 2. Моўныя сродкі, характэрныя для якога-н. пісьменніка або літаратурнага твора, жанру, напрамку; сукупнасць асаблівасцей у пабудове сказаў і словаўжыванні, манера выказвання. 3. Манера паводзіць сябе, гаварыць, адзявацца і пад.

**СТЫ́МУЛ**, -у. Пабуджальная прычына, якая падахвочвае на ажыццяўленне чаго-н.

**СТЭК**, -а. Хлыст, які выкарыстоўваецца пры верхавой яздзе.

**СТЭРЭАТЫ́П**, -а. Нязменны, агульнапрыняты ўзор, якога прытрымліваюцца; шаблон, трафарэт. У тэатры адрозніваюць некалькі стэрэатыпных элементаў: тыпізаваныя дзейныя асобы; трывіяльныя і тыя, што часта паўтараюцца, сітуацыі; слоўныя выразы ў форме клішэ; аднастайная жэстыкуляцыя; драматургічная структура і развіццё дзеяння, якія падпарадкоўваюцца жорсткай схеме.

**СУБ'Е́КТ**, -а. Чалавек як носьбіт якіх-н. уласцівасцей, асоба.

**СУБ'ЕКТЫ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Пазбаўлены аб'ектыўнасці, аднабаковы; уласцівы толькі дадзенай асобе. 2. Які мае адносіны да суб'екта; прадузяты, знарочысты.

**СУБРЭ́ТКА**, -і. Акцёрскае амплуа бойкай, дасціпнай, вынаходлівай, кемлівай служанкі, якая дапамагае сваёй гаспадыні ў яе любоўных інтрыгах. Узнікла амплуа С. у італьянскай камедыі дэль артэ і перайшло затым у французскую камедыю.

**СУГУ́ЧЧА**, -а. Унутраная адпаведнасць, адзінства.

**СУДЖЭ́ННЕ**, -я. Выказванне, меркаванне аб чым-н., погляд на што-н.

**СУЗІРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не цікавіцца тым, што яго акружае; бяздзейны, пасіўны. 2. Схільны да сузірання.

**СУЗІРА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Глядзець, разглядваць, назіраць. 2. Уяўляць у думках што-н., розумам унікаць у што-н.

**СУ́КНІ**, -яў. Сістэма падвясных драпіровак, якія складаюць т. зв. адзенне сцэны. С. навешваюцца зверху ўніз па сістэме куліс па баках сцэны, размяркоўваючыся на асобных яе планах.

**СУЛА́ДДЗЕ**, -я і **СУЛА́ДНАСЦЬ**, -і. Гарманічнасць, згоднасць.

**СУЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Адпаведны чаму-н., згодны з кім-н. 2. Аднадушны; суладжаны, дружны. 3. Стройны, гарманічны.

**СУМ**, -у. 1. Пачуццё смутку, жалю, душэўнай горычы; журба. 2. Душэўная трывога ў спалучэнні са смуткам, маркотай; туга. 3. Пакутлівая маркота; нуда.

**СУМАВА́ЦЬ**, -му́ю, -му́еш, -му́е. 1. Адчуваць сум, смутак; аддавацца душэўнай горычы. 2. Адчуваць душэўную трывогу, маркоту; тужыць па кім-, чым-н. 3. Нудзіцца.

**СУМБУ́Р**, -у. Адсутнасць яснасці, паслядоўнасці, парадку дзе-н., у чым-н.; блытаніна, неразбярыха.

**СУМБУ́РНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены яснасці, паслядоўнасці, парадку; блытаны, хаатычны; поўны мітусні, сумятні.

**СУ́МНА**. Пра пачуццё суму.

**СУМНЕ́ННЕ**, -я. 1. Няўпэўненасць у праўдзівасці, сапраўднасці чаго-н.; меркаванне пра магчымую неадпаведнасць чаго-н. рэчаіснасці. 2. Стан душэўнага разладу, няўпэўненасці, які ўзнікае пры адсутнасці мэтанакіраванасці, ад няяснасці свайго жыццёвага шляху.

**СУ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Які адчувае сум, смутак; маркотны. 2. Бязрадасны, цяжкі; які выклікае нуду; нецікавы.

**СУМЫ́СЛЯ** і **СУМЫ́СНА**. З намерам, знарок, наўмысна.

**СУМЫ́СНЫ**, -ая, -ае. Які робіцца або адбываецца з раней абдуманымі намерамі.

**СУМЯТЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Схільны мітусіцца; залішне мітуслівы. 2. Поўны клопатаў, мітусні.

**СУМЯТНЯ́**, -і́. Бязладная беганіна, мітусня, клопаты; хаос (пра думкі, пачуцці і пад.); паніка, перапалох.

**СУПАКО́ЕНАСЦЬ**, -і. Стан спакою, сцішанасці.

**СУПАКО́ЕНЫ**, -ая, -ае. Які супакоіўся, не адчувае больш непакою, хвалявання.

**СУПАКО́ІЦЦА**, -ко́юся, -ко́ішся, -ко́іцца. 1. Стаць спакойным, перастаць хвалявацца; перастаць шумець, размаўляць, пачаць весці сябе ціха. 2. Стаць пакорным, уціхамірыцца.

**СУПО́ЛЬНА**. Сумесна, разам.

**СУПРАЦЬДЗЕ́ЯННЕ**, -я. Дзеянне, якое перашкаджае другому дзеянню, накіравана супраць яго.

**СУПЯРЭ́ЧНАСЦЬ**, -і. 1. Становішча, пры якім адно (выказванне, думка, учынак) выключае іншае, не сумяшчальнае, не ўзгодненае з ім; неадпаведнасць, няўзгодненасць. 2. Выказванне або ўчынкі, накіраваныя супраць каго-, чаго-н.; супярэчанне, пярэчанне.

**СУР'Ё́ЗНА**. Не жартуючы, без смеху.

**СУРО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Якому не ўласціва паблажлівасць да сябе і інш.; непахісны, цвёрды. 2. Вельмі строгі.

**СУРО́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Пашкодзіць каму-, чаму-н., хвалячы, прадказваючы што-н.

**СУ́ТНАСЦЬ**, -і. Самае істотнае, галоўнае ў чым-н., унутраны змест чаго-н.

**СУТО́ННЕ**, -я. Паўзмрок паміж заходам сонца і надыходам ночы, а таксама паўзмрок перад світаннем.

**СУТЫКНЕ́ННЕ**, -я. Вострая спрэчка, сварка на глебе рознагалосся.

**СУТЫ́ЧКА**, -і. Спрэчка, сварка, лаянка.

**СУФЛЁР**, -а. Супрацоўнік тэатра, які сачыў за ходам рэпетыцый і спектакля па тэксце п'есы (суфлёрскі экземпляр) і падказваў акцёрам, па неабходнасці, тэкст ролі; падказчык.

**СУЦЕ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Спачуваннем, угаворамі аблягчыць чыё-н. гора, перажыванне; прынесці каму-н. палёгку, супакаенне; заспакоіць.

**СУЦІ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. 1. Перастаць хвалявацца, супакоіцца, прыціхнуць, заціхнуць. 2. Прыйсці ў стан нерухомасці, спакою.

**СУЦІ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. 1. Прывесці ў стан спакою, рассеяць хва-

ляванне і пад.; супакоіць; вымусіць спыніць якія-н. дзеянні, учынкі; уціхамірыць каго-н. 2. Паменшыць, змякчыць, зрабіць менш адчувальным; аслабіць або прыглушыць якое-н. пачуццё.

**СХІ́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Здольнасць, цяга, імкненне да якіх-н. заняткаў, дзейнасці.

**СЦІ́ПЛЫ**, -ая, -ае. 1. Які не любіць падкрэсліваць свае заслугі, хваліцца сваімі справамі; пазбаўлены ганарыстасці. 2. Стрыманы ў паводзінах, абыходжанні, словах; прыстойны, не развязны. 3. Які нічым не вылучаецца, просты.

**СЦІ́СЛЫ**, -ая, -ае. Выкладзены коратка, у нямногіх словах; лаканічны.

**СЦІ́ШАНЫ**, -ая, -ае. Які прыйшоў у стан спакою; прыціхлы; супакоены, ціхі.

**СЦІ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. Прыйсці ў стан спакою, перастаць хвалявацца; змоўкнуць; заціхнуць.

**СЦЭ́НА**, -ы. 1. Спецыяльная пляцоўка ў тэатры, на якой адбываюцца спектаклі; тэатральныя падмосткі; тэатр, тэатральная дзейнасць. 2. Асобная частка акта п'есы, спектакля. 3. Асобны эпізод п'есы; невялікі драматургічны твор.

**СЦЭ́НА-АРЭ́НА**. Адкрытая сцэнічная пляцоўка, з трох або з усіх бакоў акружаная месцамі для гледачоў.

**СЦЭ́НА-КАРАБО́К**. Закрытая сцэнічная прастора, аддзеленая ад глядзельнай залы партальнай сцяною.

**СЦЭ́НА** з трохбаковым аглядам — адкрытая сцэнічная пляцоўка, з трох бакоў акружаная месцамі для гледачоў.

**СЦЭ́НА** з трохчасткавым парталам — сцэна, у партальнай сцяне якой выразаны тры партальныя адтуліны.

**СЦЭНАГРА́ФІЯ**, -і. Мастацкае афармленне тэатральнай сцэны для спектакляў, прадстаўленняў.

**СЦЭНА́РЫЙ**, -я. 1. Літаратурны твор, напісаны як аснова для пастаноўкі кіна-, тэлефільма. 2. Сюжэтная схема, план п'есы, оперы, балета.

**СЦЭНІ́ЧНАЯ МО́ВА**. Адзін з асноўных сродкаў тэатральнага ўвасаблення драматургічнага твора. С. м. дае магчымасць акцёру данесці да гледача ідэі, думкі і пачуцці, што закладзены ў тэксце. Валодаючы майстэрствам С. м., акцёр раскрывае ўнутраны свет, выяўляе сацыяльныя, псіхалагічныя, нацыянальныя, бытавыя рысы характару персанажаў. Тэхніка С. м. з'яўляецца істотным элементам акцёрскага майстэрства і звязана з сілай і аб'ёмам голасу, дыхання, выразнасцю маўлення (дыкцыяй). Характар і стыль С. м. мяняліся і развіваліся на працягу ўсёй гісторыі тэатра ў акцёраў розных школ і накірункаў. Асаблівасці пабудовы антычнай драмы, архітэктура тэатральных збудаванняў, уся атмасфера тэатральных прадстаўленняў, якія разыгрываліся пад адкрытым небам, сфармулявалі законы элінскай класічнай дэкламацыі. Яны былі зменены і развіты ў еўрапейскім сцэнічным мастацтве. Высокая культура С. м. у французскім тэатры 17 — 18 ст. звязана з мастацтвам дэкламацыі. Меладычнасць мовы, прамоўніцкі пафас, красамоўства ўласцівы ўсім героям класіцыстычнай драмы. Акцёр выказваў пачуцці герояў пявучаю мовай, рытмічным чытаннем тэксту. У акцёраў рамантычнага тэатра партытура С. м. была звязана з нарастаннем і спадамі пачуццяў, характарызавалася паскарэннямі і запавольваннямі, узмацненнямі і прыцішваннямі голасу, нечаканымі інтанацыямі. У канцы 19 — пачатку 20 ст. шмат у якіх краінах узмацнілася барацьба за рэалістычнае гучанне С. м. Акцёры пачалі сцвярджаць С. м., лагічна звязаную са зместам тэксту. Росквіт рэалістычнага мастацтва С. м. звязаны галоўным чынам з рускім тэатрам, з дзейнасцю Малога тэатра, і ў прыватнасці М. С. Шчэпкіна, які патрабаваў адмовіцца ад напышлівай дэкламацыі, ад размеранага скандзіравання вершаў і заклікаў да натуральнасці, прастаты С. м., набліжэння яе да размоўнасці. На мяжы 19 і 20 ст. новую эру ў гісторыі развіцця С. м. адкрыў К. С. Станіслаўскі, які, працуючы над словам, не пакідаў без увагі як тэкст, так і падтэкст, патрабаваў, каб акцёр бачыў за кожным прамоўленым словам не абстрактныя паняцці, а сапраўднае жыццё, каб ён захапляў, пера-

конваў партнёраў і гледачоў сваімі пачуццямі, бачаннямі, слоўным дзеяннем. І сёння асноўныя палажэнні сістэмы Станіслаўскага з'яўляюцца вызначальнымі ў выпрацоўцы майстэрства С. м.

**СЦЭНІ́ЧНАЕ САМААДЧУВА́ННЕ.** Псіхічны і фізічны стан акцёра на сцэне падчас яго публічнага выступлення.

**СЦЭНІ́ЧНЫ ВО́БРАЗ.** Абагульнены характар, тып, створаны драматургам і ўвасоблены рэжысёрам-пастаноўшчыкам і акцёрам на сцэне.

**СЦЭНІ́ЧНЫ ТА́НЕЦ.** Навучальная дысцыпліна ў тэатральных школах; адзін з асноўных відаў танца (побач з танцам народным, бытавым і бальным).

**СЦЯ́МІЦЬ,** -млю, -міш, -міць. Зразумець, разабрацца ў чым-н., здагадацца, скеміць; абдумаць.

**СЦЯ́ЦЦА,** сатну́ся, сатне́шся, сатне́цца. 1. Сабрацца ў камяк, скурчыцца, сціснуцца. 2. Шчыльна злучыцца (пра губы, пальцы і пад.). 3. Сціснуцца, выклікаўшы цяжкае дыханне.

**СЦЯЦЬ,** сатну́, сатне́ш, сатне́; -нём, -няцé. 1. Абхапіўшы, сціснуць. 2. Сціснуць (грудзі, горла), перашкаджаючы дыхаць; выклікаць адчуванне болю, цяжару (на душы, сэрцы). 3. Шчыльна злучыць (губы, зубы, пальцы і пад.).

**СЧАКА́ЦЦА,** -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Стаміцца, чакаючы.

**СЧАКА́ЦЬ,** -а́ю, -а́еш, -а́е. Пачакаць некаторы час.

**СШЭ́РХЛЫ,** -ая, -ае. Здранцвелы, знямелы, зацёкшы; пасівераны (пра скуру на руках, твары і пад.).

**СШЭ́РХНУЦЬ,** -не. Здранцвець, знямець, зацячы; пасіверасць (пра скуру на руках, на твары і пад.).

**СЫГРА́ЦЬ,** -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Выканаць што-н. на музычным інструменце. 2. Уздзейнічаць на чые-н. пачуцці і пад. для дасягнення пэўных мэт; выкарыстаць чые-н. пачуцці, настрой у сваіх мэтах. 3. Выканаць, паставіць у тэатры п'есу, оперу і пад.; паказаць на сцэне, выканаць якую-н. ролю.

**СЭНС,** -у. Унутраны лагічны змест, які спасцігаецца розумам; значэнне.

**СЭ́НСАВЫ,** -ая, -ае. Звязаны з унутраным зместам, значэннем чаго-н.

**СЮЖЭ́Т,** -а. Сукупнасць звязаных паміж сабой дзеянняў, сітуацый, падзей, у якіх раскрываецца асноўны змест мастацкага твора і характары дзейных асоб.

**СЮСЮ́КАЦЬ,** -аю, -аеш, -ае. 1. Размаўляючы, замяняць шыпячыя гукі свісцячымі. 2. Падрабляцца пад узровень развіцця, склад думак, мову і пад. каго-н. (звычайна дзіцяці); абыходзіцца з кім-н. як з малым дзіцем, няздольным адказаць за свае дзеянні; празмерна апякаць.

**СЯ́БАР,** -бра і **СЯ́БРА,** -а. Той, хто звязаны з кім-н. сяброўствам.

**СЯБЕЛЮ́БСТВА,** -а. Клопаты толькі пра сябе, пра свае інтарэсы; эгаізм.

**СЯБРАВА́ЦЬ,** -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Знаходзіцца ў сяброўстве з кім-н.

**СЯБРО́ЎКА,** -і. Дзяўчынка, дзяўчына або жанчына, якая сябруе з кім-н.; пра каханую жанчыну.

**СЯБРО́ЎСКІ,** -ая, -ае. 1. Які выражае дружбу, прыхільнасць сябра. 2. Які ўмее сябраваць.

**СЯБРО́ЎСТВА,** -а. Адносіны паміж кім-н., якія грунтуюцца на духоўнай блізкасці, агульнасці інтарэсаў, узаемнай прыхільнасці і пад.

**СЯБРЫ́НА,** -ы. Кола, асяроддзе сяброў; сяброўская бяседа, пачастунак.

**СЯДУ́Н,** седуна́. Нерухавы, пасіўны, бяздзейны чалавек; дамасед.

**СЯДУ́РА,** -ы. Нерухавы, пасіўны чалавек; маруда.

**СЯКІ́-ТАКІ́,** сяка́я-така́я, сякóе-такóе. 1. Некаторы. 2. Які папала; нязначны, няважны. 3. Ужываецца замест пераліку якіх-н. ацэначных слоў, характарыстык (звычайна з адмоўным адценнем).

**СЯК-ТАК.** 1. З вялікай цяжкасцю; ледзь-ледзь. 2. Ніштавата; памяркоўна. 3. Цярпіма.

**СЯМЕ́ЙНІК,** -а. Член сям'і.

**ТАГАЧА́СНЫ**, -ая, -ае. 1. Які існаваў у мінулым, у тыя часы, пра якія ідзе гаворка. 2. Які адносіцца да аднаго часу, да адной эпохі з кім-, чым-н.

**ТАЕ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Скрыты, невядомы, непрыкметны для іншых. 2. Загадкавы, невядомы, акружаны тайнаю. 3. Які сведчыць пра наяўнасць тайны.

**ТАІ́ЦЦА**, таюся, то́ішся, то́іцца. 1. Скрываць што-н. ад іншых, не расказваючы, не выказваючы што-н.; праяўляць скрытнасць. 2. Хавацца, скрывацца. 3. Існаваць у скрытым выглядзе; не праяўляцца яўна.

**ТАІ́ЦЬ**, таю́, то́іш, то́іць. Трымаць што-н. у тайне, скрываць ад іншых; захоўваць у сабе, у сваёй душы, не паказваючы перад другімі, хаваючы ад другіх (пачуцці, думкі).

**ТАКСА́МА**. Такім самым, падобным чынам, гэтак жа; у такой жа меры, ступені.

**ТАКТ**, -у. Пачуццё меры, якое падка́звае найбольш правільны падыход, найбольш далікатную лінію паводзін у адносінах да каго-, чаго-н.; захаванне правілаў прыстойнасці, этыкету.

**ТАКТО́ЎНЫ**, -ая, -ае. Які мае такт, які валодае тактам; які выконваецца з тактам.

**ТАЛЕНАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. Які мае талент; які ўласцівы таленту.

**ТАЛКО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Разумны, кемлівы; дзелавіты. 2. Ясны, зразумелы, пераканальны (пра думкі, словы і пад.).

**ТАМІ́ЦЦА**, тамлюся, то́мішся, то́міцца. Мучыцца, пакутаваць; тужыць, перажываць, клапоцячыся аб кім-, чым-н.

**ТАМІ́ЦЬ**, тамлю́, то́міш, то́міць. Прычыняць фізічныя або маральныя пакуты; пакутліва турбаваць, гнясці (пра пачуцці, думкі і пад.).

**ТАРО́ПКІ**, -ая, -ае. Які спяшаецца (часцей пра чалавека); уласцівы таму, хто спяшаецца, робіць што-н. паспешна.

**ТАЯМНІ́ЧАСЦЬ**, -і. Нешта невядомае, незразумелае; загадкавасць.

**ТАЯМНІ́ЧЫ**, -ая, -ае. 1. Поўны таямніцы, загадкава-незразумелы. 2. Недасягальны, незвычайны. 3. Тайны, сакрэтны.

**ТВАР**, -у. 1. Пярэдняя частка галавы чалавека. 2. Індывідуальнае аблічча, выгляд, характэрныя рысы каго-, чаго-н.

**ТВАРЭ́Ц**, -рца́ і **ТВО́РЦА**, -ы. Той, хто ставарае матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці.

**ТЛУМ**, -у. 1. Адурэнне, замарачэнне. 2. Шум, гоман, сумятня.

**ТЛУМА́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. 1. Даваць тлумачэнне чаму-н.; раскрываць сэнс, сутнасць чаго-н. 2. Асвятляць якое-н. пытанне, дапамагаючы засвоіць, зразумець сэнс чаго-н.

**ТЛУМІ́ЦЬ**, тлумлю́, тлу́міш, тлу́міць. Марочыць галаву; празмерна дакучаць гаворкай, шумам.

**ТЛУ́МНЫ**, -ая, -ае. 1. Які прыводзіць да адурэння, пазбаўляе здольнасці ўспрымаць, разумець што-н. 2. Шумны, гаманлівы, неспакойны.

**ТО́ЕСНЫ**, -ая, -ае. Зусім падобны, аднолькавы, такі ж.

**ТРАВЕСЦІ́**. Сцэнічнае амплуа ў драматычным тэатры; актрыса, якая выконвае ролі хлопчыкаў, дзяўчынак і падлеткаў, а таксама ролі, што патрабуюць у пэўныя моманты дзеяння пераапранання ў мужчынскі касцюм.

**ТРАГЕ́ДЫЯ**, -і. Від драмы, заснаваны на глыбокіх, трагічных калізіях, супярэчнасцях, якія развіваюцца ў крайне востры, непрымірымы канфлікт, у бескампрамісна-антаганістычнае сутыкненне моцных характараў, логікай падзей асуджаных на пакуты, значныя страты, часам на безвыходнасць і гібель. Асноўная праблематыка Т. — злачынства і пакаранне, маральная адказнасць, сэнс жыцця, подзвіг у імя высокай ідэі і інш.; цэнтральныя героі — асобы выключныя, характары высакародныя (у старажытных грэкаў — багі і цары).

**ТРАГІ́ЗМ**, -у. 1. Трагічны элемент, трагічны пачатак у драматургічным або музычным творы і яго выкананні. 2. Трагічны, змрочны бок чаго-н.; безвыходнасць.

**ТРА́ГІК**, -а. Акцёр, які выконвае трагічныя ролі.

**ТРАГІКАМЕ́ДЫЯ**, -і. 1. Драматургічны твор з камічнымі і трагічнымі элементамі. 2. Гісторыя, падзея, становішча, у якім да сумнага прымешваецца смешнае.

**ТРАГІ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да трагедыі, уласцівы ёй. 2. Страшны, катастрафічны; поўны гора, няшчасця; які выражае цяжкі душэўны стан, пакуты; які сведчыць аб страшных пакутах. 3. Уласцівы выканаўцам трагедыі, якія здольны перадаваць моцныя пачуцці.

**ТРАКТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Тлумачыць; у літаратуры, мастацтве — разумець, тлумачыць пэўным чынам (сюжэт, тэму, вобраз і пад.).

**ТРА́ПНЫ**, -ая, -ае. Які дакладна і правільна падмячае, схоплівае што-н.; які дакладна і востра выражае, перадае асноўную сутнасць з'явы і пад.

**ТРАПЯТА́ЦЬ**, -пячу́, -пе́чаш, -пе́ча. 1. Быць ахопленым хваляваннем, неспакоем і пад. 2. Моцна баяцца каго-, чаго-н.; быць нясмелым, баязлівым перад кім-, чым-н.

**ТРАПЯТКІ́**, -а́я, -бе. Ахоплены моцным хваляваннем пад уздзеяннем якога-н. пачуцця; усхваляваны.

**ТРУМ**, -а. Памяшканне, якое знаходзіцца пад сцэнай, т. зв. ніжняя сцэна. У труме знаходзяцца механізмы прываду круга, пад'ёмна-апускных пляцовак і інш. абсталявання.

**ТРУНА́**, -ы́. Спецыяльная скрыня, у якой хаваюць памерлага.

**ТРУ́ПА**, -ы. Калектыў артыстаў тэатра, цырка.

**ТРЫАДЗІ́НСТВА ДРАМАТЫ́ЧНАЕ**. Адзінства часу, месца і дзеяння, якое захоўвалася драматургіяй класіцызму.

**ТРЫВІЯ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Пазбаўлены свежасці і арыгінальнасці; звычайны; пошлы, вульгарны.

**ТРЫВО́ГА**, -і. Неспакой, моцнае душэўнае хваляванне, выкліканае страхам, апаскай і пад.

**ТРЫВО́ЖЫЦЦА**, -жуся, -жышся, -жыцца. Прыходзіць у стан трывогі, моцнага душэўнага хвалявання; турбавацца, хвалявацца, непакоіцца.

**ТРЫВО́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. 1. Выклікаць трывогу; прыводзіць у стан неспакою. 2. Парушаць спакой каго-, чаго-н., турбаваць.

**ТРЫ́ЗНА**, -ы. Пахавальны і памінальны абрад, памінкі па нябожчыку.

**ТРЫ́ЗНЕННЕ**, -я. Бяссэнсавая гаворка хворага, які знаходзіцца без памяці; пазбаўленая сэнсу балбатня, бязглуздзіца.

**ТРЫКО́**. Трыкатажнае адзенне, якое шчыльна аблягае цела і выкарыстоўваецца як тэатральны або спартыўны касцюм.

**ТРЫЛО́ГІЯ**, -і. Тры адносна самастойныя творы, якія аб'ядноўваюцца ў адзіны цыкл агульнасцю ідэйнай задумы, галоўных герояў і пераемнасцю сюжэта.

**ТРЫ́ПЦІХ**, -а. У літаратуры — паэтычны твор з трох адносна самастойных вершаў, аб'яднаных агульнай задумай, ідэяй, тэмай, сюжэтам.

**ТРЫЯЛЕ́Т**, -а. Верш з васьмі радкоў, дзе чацвёрты і сёмы паўтараюць першы радок, а восьмы — другі, пры гэтым увесь верш мае дзве рыфмы.

**ТРЭНА́Ж**, -у́. Трэніроўка; комплекс практыкаванняў для трэніроўкі.

**ТРЭ́НІНГ**, -у. Трэніроўка і выкананне спецыяльнага трэніровачнага рэжыму.

**ТУГА́**, -і́. 1. Смутак, маркота, журба. 2. Выказванне душэўнай прыгнечанасці, скрухі, смутку (у музыцы, песні, вершы і пад.).

**ТУЖЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Прасякнуты тугой, поўны тугі.

**ТУЖЫ́ЦЬ**, тужу́, ту́жыш, ту́жыць. 1. Сумаваць, маркоціцца. 2. Нудзіцца, быць ахопленым сумам. 3. Гараваць, знаходзіцца ў стане смутку, перажываць няшчасце.

**ТУЛІ́ЦЦА**, тулю́ся, ту́лішся, ту́ліцца. Гарнуцца, прыціскацца да каго-, чаго-н.; гарнуцца, прыхінацца, кахаючы каго-н.

**ТУЛІ́ЦЬ**, тулю́, ту́ліш, ту́ліць. Прыхіляць, гарнуць да сябе з ласкай, пяшчотай.

**ТУЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. 1. Блукаць, хадзіць без пэўнай мэты;

бадзяцца. 2. Быць бяздомным, беспрытульным.

**ТУНІ́КА**, -і. 1. Старажытнарымскае адзенне накшталт кашулі, якое насілі пад тогай. 2. Верхняя частка двайной жаночай спадніцы. 3. Касцюм танцоўшчыцы ў выглядзе ліфа і доўгай спадніцы з цюлю.

**ТУРБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. 1. Праяўляць клопат, трывожыцца аб кім-, чым-н. 2. Хваляваца, непакоіцца.

**ТУРБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. 1. Парушаць чый-н. спакой, непакоіць каго-н., перашкаджаць каму-н. 2. Пастаянна хваляваць, не даваць спакою.

**ТУРБО́ТА**, -ы. 1. Заклапочанасць чым-н., неадольнае жаданне ажыццявіць што-н.; пастаянная руплівасць; неспакой. 2. *звычайна мн.* (турбо́ты, -аў). Клопаты; прычыненне каму-н. клопату сваім наведваннем, просьбай.

**ТУТЭ́ЙШЫ**, -ая, -ае. Які родам з гэтай мясцовасці, жыве тут, не прыезджы; які дзейнічае, працуе тут; мясцовы.

**ТЫПА́Ж**, -у. Акцёр з яркай характэрнай знешнасцю, які падыходзіць па сваіх даных для пэўнай ролі. Прадугледжвае асаблівую сканцэнтраваную сацыяльна-тыпавую выразнасць знешняга аблічча і манеры ігры.

**ТЫРА́ДА**, -ы. Доўгая фраза, урывак прамовы, асобная шматслоўная рэпліка, якая вымаўляецца звычайна прыўзнятым тонам. Т. часцей сустракаецца ў класічнай драматургіі; яна арганізавана ў ланцуг сказаў, пытанняў, аргументаў, вострых жартаў (напрыклад, Т. пра насы ў «Сірано дэ Бержэрак»).

**ТЫРА́НІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. 1. Праяўляць дэспатызм, жорсткасць у адносінах да каго-н. 2. Здзекавацца з каго-н., мучыць каго-н., прыгнятаць.

**ТЭА́ТР**, -а. 1. Род мастацтва, у якім жыццё адлюстроўваецца праз драматычнае дзеянне, ажыццёўленае акцёрамі перад гледачом. 2. Установа, арганізацыя, якая мае пэўны склад артыстаў і ставіць спектаклі. 3. Будынак са сцэнай і залай для гледачоў, дзе адбываецца тэатральны паказ.

**ТЭАТРАЗНА́ВЕЦ**, -на́ўца. Спецыяліст у галіне тэатразнаўства.

**ТЭАТРАЗНА́ЎСТВА**, -а. Галіна мастацтвазнаўства, якая вывучае тэатр, яго гісторыю і ролю ў грамадскім жыцці, у тым ліку рэжысёрскую і акцёрскую творчасць, драматургію, тэатральную адукацыю, арганізацыю тэатральнай справы і інш.

**ТЭАТРАЗНА́ЎЧЫ**, -ая, -ае. Які мае адносіны да тэатразнаўства.

**ТЭАТРА́Л**, -а. Аматар тэатра; часты наведвальнік тэатра.

**ТЭАТРАЛІЗАВА́НЫ**, -ая, -ае. Прыстасаваны для тэатра, сцэны.

**ТЭАТРА́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да тэатра. 2. Характэрны для тэатра; умоўны, штучны.

**ТЭАТРА́ЛЬНЫ КАСЦЮ́М**. Паняцце ўключае адзенне персанажа, яго грым, прычоску (парык), абутак і аксесуары (парасоны, хусткі, шалікі, партфелі, капелюшы, упрыгожанні і пад.). Мастак, працуючы над касцюмам, распрацоўвае адначасова і ўсе аксесуары для кожнай дзейнай асобы.

**ТЭАТРО́Н**, -а. Месца, адкуль публіка глядзіць спектакль; прастора гледачоў.

**ТЭКСТ РО́ЛІ**. Словы той ці іншай ролі ў п'есе.

**ТЭМБР**, -а. Адна з асноўных якасцей голасу, якая вызначае яго афарбоўку і характар. Дзякуючы Т. гучанне аднаго голасу адрозніваецца ад другога.

**ТЭМП**, -у. Ступень хуткасці і інтэнсіўнасці выканання (пра спектакль, чытанне, мову і пад.).

**ТЭ́МПА-РЫ́ТМ**. Узрастанне або спад, паскарэнне або запаволенне, плаўнае або імклівае развіццё сцэнічнага дзеяння.

**ТЭМПЕРА́МЕНТ**, -у. 1. Характарыстыка індывіда з боку дынамічных асаблівасцей яго псіхічнай дзейнасці (тэмпу, рытму, інтэнсіўнасці псіхічных працэсаў), якія ўтвараюць пэўны псіхалагічны тып (халерык, сангвінік, флегматык, меланхолік). 2. Жыццёвая энергія, здольнасць да ўнутранага ўздыму, страснасць.

**ТЭМПЕРА́МЕНТНЫ**, -ая, -ае. Які вылучаецца жывой, гарачай энергіяй; жвавы, палкі.

**ТЭРМІНО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які пат-

рабуе неадкладнага, хуткага выканання, вырашэння. 2. Абмежаваны пэўным тэрмінам.

**ТЭРЦЫ́НА**, -ы. Вершаваная форма, што складаецца з трохрадковых строф, у якіх сярэдні радок кожнай папярэдняй страфы рыфмуецца з двума крайнімі радкамі наступнай; верш, напісаны ў такой форме.

**ТЭТРАЛО́ГІЯ**, -і. Чатыры літаратурныя або музычна-драматычныя творы, аб'яднаныя агульнай ідэяй і пераемнасцю сюжэта.

**ТЭ́ХНІКА МО́ВЫ**. Сукупнасць прыёмаў, уменняў і навыкаў, якія прымяняюцца ў вуснай мове і акцёрскім мастацтве.

# У

**УБА́ЧАНЫ**, -ая, -ае. Тое, што ўспрынята зрокам.

**УБА́ЧЫЦЦА**, -чуся, -чышся, -чыцца. 1. Сустрэцца з кім-н. асабіста, пабачыцца. 2. Уявіцца, здацца.

**УБА́ЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. 1. Успрыняць зрокам; заўважыць, прыкмеціць. 2. У думках, мроях уявіць сабе каго-, што-н.

**УБЕРАГЧЫ́**, -рагу́, -ражэ́ш, -ражэ́; -ражо́м, -ражаце́, -рагу́ць. Зберагчы, хаваючы, абараняючы ад каго-, чаго-н.; ахаваць.

**УБЕРАГЧЫ́СЯ**, -рагу́ся, -ражэ́шся, -ражэ́цца; -ражо́мся, -ражаце́ся, -рагу́цца. Уберагчы сябе, пазбегнуць чаго-н. (непрыемнага, небяспечнага, непажаданага); унікнуць чаго-н.

**УБО́СТВА**, -а. Крайняя беднасць, галеча, жабрацтва; непрыглядны выгляд.

**УБРА́ННЕ**, -я, і **УБРА́НСТВА**, -а. 1. Адзенне, убор; строі; пра тое, што ўпрыгожвае сабою што-н. 2. Убор, аздабленне чаго-н.

**УБРА́ЦЦА**, убяру́ся, убярэ́шся, убярэ́цца. Набыць прыгожы выгляд, стаць прыгожым; прыгожа адзецца, прыбрацца; выстраіцца.

**УВА́ГА**, -і. 1. Сканцэнтраванасць думак, зроку, слыху на чым-н., накіраванасць думак. 2. Клапатлівыя, чулыя адносіны, прыхільнасць да каго-, чаго-н.; цікавасць, якая праяўляецца да каго-, чаго-н. 3. Засяроджанасць думкі акцёра на якім-н. аб'екце ці партнёру на сцэне або па-за ёю.

**УВА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які адносіцца да чаго-н., робіць што-н. з увагай; які выказвае ўвагу; пільны. 2. Чулы, клапатлівы.

**УВА́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. 1. Аднесціся з увагай да чаго-н., выканаць, здзейсніць што-н. 2. Зрабіць уступку, прыняўшы пад увагу што-н.; уступіць.

**УВАСАБЛЕ́ННЕ**, -я. Ажыццяўленне чаго-н. у рэчаіснасці, праяўленне ў канкрэтным вобразе, канкрэтнай форме.

**УВАСАБЛЯ́ЦЬ**, -я́ю, -я́еш, -я́е. Іграць на сцэне, у спектаклі канкрэтную ролю, персанаж.

**УВАСО́БІЦЬ**, -блю, -біш, -біць. Сыграць канкрэтную ролю ў спектаклі.

**УВІШНЫ́**, -а́я, -о́е. 1. Жывы, спрытны ў рухах, у дзеянні. 2. Вынаходлівы, хітры.

**УВО́ГУЛЕ**. 1. Разглядаючы цалкам, не звяртаючы ўвагі на дробязі, прыватнае. 2. У цэлым, у выніку.

**УВО́Д**, -у. Уключэнне новага выканаўцы ў гатовы спектакль.

**УГЛЕ́ДЗЕЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. 1. Уважліва паглядзець, прыгледзецца, стараючыся разгледзець, убачыць што-н. 2. Не зводзячы вачэй, нерухома глядзець куды-н., на каго-, што-н.; утаропіцца, уставіцца. 3. Убачыцца з кім-н.

**УГЛЕ́ДЗЕЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. 1. Заўважыць, прыкмеціць, згледзець. 2. Паглядзеўшы на каго-, што-н., выявіць, заўважыць, адкрыць для сябе што-н.

**УГНЕ́ВАНЫ**, -ая, -ае. Якога ўвялі ў

гнеў; які выяўляе гнеў.

**УГНЕ́ВАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Увайсці ў вялікі гнеў; раззлавацца.

**УГНЯВІ́ЦЬ**, угняўлю́, угне́віш, угне́віць. Увесці ў гнеў; раззлаваць; пакрыўдзіць.

**УГО́ДКІ**, -дак. Гадавіна з дня смерці, адзначэнне гэтай даты; наогул урачыстасць, прысвечаная гадавіне якой-н. падзеі.

**УГО́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Празмерна паслужлівы, ліслівы.

**УГО́ДНІК**, -а. 1. Той, хто імкнецца дагадзіць каму-н.; угодлівы чалавек. 2. У рэлігійным уяўленні — святы, які дагадзіў Богу сваім бязгрэшным жыццём.

**УГО́ЛАС**. Вымаўляючы гучна, так, каб было чутна ўсім; гучна, моцна, галасна.

**УДАКЛАДНІ́ЦЬ**, -ню́, -ні́ш, -ні́ць. Зрабіць больш дакладным, надаць большую дакладнасць чаму-н.; паясніць, сказаць з большай дакладнасцю.

**УДАСКАНА́ЛЕНЫ**, -ая, -ае. Больш дасканалы, чым раней; добра развіты, востры, вельмі ўспрымальны (пра пачуцці і пад.).

**УДАСКАНА́ЛІЦЦА**, -люся, -лішся, -ліцца. Павысіць, палепшыць сваё ўмельства, майстэрства, авалодаць яго тонкасцямі; развіцца.

**УДАСКАНА́ЛІЦЬ**, -лю, -ліш, -ліць. Зрабіць больш дасканалым; павысіць, палепшыць майстэрства чаго-н.; развіць, зрабіць больш успрымальным, вострым, віртуозным (пра пачуцці і пад., пра выкананне).

**УДЗЯ́ЧНАСЦЬ**, -і. Пачуццё, якое ўзнікае ў адказ на зробленае дабро (увагу, паслугу, дапамогу і пад.).

**УДЗЯ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Які адчувае, выказвае ўдзячнасць; які прасякнуты ўдзячнасцю, выяўляе ўдзячнасць.

**УДУ́МЛІВАСЦЬ**, -і. 1. Здольнасць глыбока мысліць, глыбока ўнікаць у сэнс чаго-н. 2. Задуменнасць.

**УДУ́МЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Здольны глыбока мысліць, глыбока ўнікаць у сэнс чаго-н. 2. Задуменны.

**УДЫ́Х**, -у. Кожны асобны ўпуск паветра ў лёгкія пры дыханні, які чаргуецца з выдыхам.

**УЕ́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Здольны глыбока пранікаць, упівацца ў што-н.; пільны, напружаны, пранізлівы (пра позірк, вочы); пранізлівы, рэзкі (пра гукі, голас). 2. Які ўнікае, умешваецца ва ўсе дробязі; прыдзірлівы. 3. З'едлівы.

**УЕ́СЦІ**, уе́м, уясі́, уе́сць; уядзі́м, уясце́, уяду́ць. З'едліва паддзець, укалоць.

**УЗАЕМААДНО́СІНЫ**, -сін. Узаемныя адносіны паміж кім-, чым-н.

**УЗАЕМАДЗЕ́ЯННЕ**, -я. Узгодненасць дзеянняў акцёраў на сцэне.

**УЗА́ХАПКІ**. Наперабой; адзін перад адным.

**УЗАХЛЁБ**. Захлёбваючыся; таропка, заўзята.

**УЗБАДЗЁРЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Стаць, зрабіцца бадзёрым.

**УЗБАДЗЁРЫЦЬ**, -ру, -рыш, -рыць. Выклікаць бадзёры настрой, прыліў сілы, энергіі.

**УЗБУ́ДЖАНАСЦЬ**, -і. Усхваляванасць, узрушанасць.

**УЗБУ́ДЖАНЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў прыўзнята-нервовым стане; усхваляваны, узрушаны.

**УЗБУДЖЭ́ННЕ**, -я. Стан актыўнай, напружанай нервовай дзейнасці; моцнае хваляванне.

**УЗБУ́ДЛІВАСЦЬ**, -і. Здольнасць рэагаваць на ўздзеянне раздражняльніка.

**УЗБУ́ДЛІВЫ**, -ая, -ае. Здольны хутка адказваць на ўздзеянне раздражняльнікаў.

**УЗВА́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Абдумаць, ацаніць што-н.

**УЗГАДНІ́ЦЬ**, -гадню́, -го́дніш, -го́дніць. Прывесці ў пэўную адпаведнасць з чым-н.

**УЗДЗЕ́ЙНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Рабіць (зрабіць) уплыў на каго-н.

**УЗДЗЕ́ЯННЕ**, -я. Дзеянне, накіраванае на каго-, што-н.; уплыў.

**УЗДРЫГНУ́ЦЬ**, -ну́, -не́ш, -не́. Задрыжаць, затрымцець.

**УЗДЫ́М**, -у. Натхненне, прыліў энергіі.

**УЗІРА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Вельмі ўважліва, напружана глядзець куды-н., на каго-, што-н.; углядацца.

**УЗЛАВА́ЦЦА**, узлую́ся, узлуе́шся, узлуе́цца; узлуёмся, узлуяце́ся. Увайсці

ў злосць; разлавацца; адчуць незадаволенасць кім-, чым-н.

**УЗЛАВА́ЦЬ**, узлу́ю, узлуе́ш, узлуе́; узлуём, узлуяце́. Увесці ў злосць, раззлаваць.

**УЗНЁСЛЫ**, -ая, -ае. 1. Прыўзняты, урачысты. 2. Поўны вялікага значэння, глыбокага зместу, высакародных пачуццяў.

**УЗРА́ДАВАНЫ**, -ая, -ае. Поўны радасці; які выражае радасць.

**УЗРА́ДАВАЦЦА**, -ра́дуюся, -ра́дуешся, -ра́дуецца. Прыйсці ў радасны стан.

**УЗРА́ДАВАЦЬ**, -ра́дую, -ра́дуеш, -ра́дуе. Выклікаць у каго-н. пачуццё радасці.

**УЗРУ́ШАНАСЦЬ**, -і. Усхваляванасць; трывога.

**УЗРУ́ШАНЫ**, -ая, -ае. Вельмі моцна ўсхваляваны; які знаходзіцца ў прыўзнятым стане; узбуджаны.

**УЗРУ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Вельмі моцна ўсхваляваць; устрывожыць.

**УЗРУШЭ́ННЕ**, -я. Душэўны ўздым, хваляванне.

**УЗ'Ю́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Стаць узбуджаным, гуллівым.

**УЗ'Ю́ШАНАСЦЬ**, -і. Стан непамернага гневу, злосці.

**УЗ'Ю́ШАНЫ**, -ая, -ае. Вельмі разгневаны, раззлаваны.

**УЗ'Ю́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. Вельмі разгневацца, раззлавацца.

**УКЛЕ́НЧЫЦЬ**, -чу, -чыш, -чыць. Стаць на калена, на калені.

**УКЛЮЧЫ́ЦЦА**, уключу́ся, уклю́чышся, уклю́чыцца. Стаць актыўным удзельнікам чаго-н., увайсці ў склад, далучыцца да чаго-н.

**УКЛЮЧЫ́ЦЬ**, уключу́, уклю́чыш, уклю́чыць. Увесці, прыняць у склад, лік каго-, чаго-н.

**УКРА́СА**, -ы. Той, хто (тое, што) з'яўляецца гордасцю чаго-н., упрыгожвае што-н.

**УЛАГО́ДЗІЦЬ**, -джу, -дзіш, -дзіць. 1. Дагаджаючы чым-н., задобрыць каго-н. 2. Супакоіць, суцешыць.

**УЛА́ДНЫ**, -ая, -ае. 1. Схільны навязаць сваю волю, загадваць, падначальваць сабе; які выражае ўладу, волю, рашучасць. 2. Неадольны, усемагутны.

**УЛАСЦІ́ВАСЦЬ**, -і. Характэрная асаблівасць, рыса, прыкмета каго-, чаго-н.

**УЛАСЦІ́ВЫ**, -ая, -ае. Які характэрны для каго-, чаго-н., з'яўляецца ўласцівасцю, якасцю каго-, чаго-н.

**УЛА́ШЧАНЫ**, -ая, -ае. Улагоджаны, задобраны.

**УЛА́ШЧЫЦЬ**, -шчу, -шчыш, -шчыць. Улагодзіць, задобрыць каго-н.

**УЛЕ́ГЦЫ**. Без паклажы; паражняком.

**УЛЮБЁНА**. Выражаючы любоў; любоўна.

**УЛЮБЁНАСЦЬ**, -і. Стан улюбёнага.

**УЛЮБЁНЫ**, -ая, -ае. Закаханы ў каго-н.; захоплены кім-, чым-н.

**УМО́ЎНАСЦЬ**, -і. Агульнапрынятая, хоць і непатрэбная, сістэма звычак, нормаў паводзін.

**УМО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Які не існуе на самай справе; які ўяўляецца, дапускаецца ў думках; уяўны. 2. У мастацтве — заснаваны на адмаўленні ад рэалістычнага паказу рэчаіснасці; сімвалічны.

**УНА́ДЗІЦЦА**, -джуся, -дзішся, -дзіцца. Стаць часта рабіць што-н. непажаданае для каго-н.; стаць часта наведваць каго-н.

**УНІЖЭ́ННЕ**, -я. Тое, што прыніжае, зневажае чалавека, яго годнасць.

**УНІКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. 1. Пазбягаць чаго-н., ухіляцца ад чаго-н. 2. Імкнуцца зразумець сутнасць чаго-н.

**УНІ́КЛІВЫ**, -ая, -ае. 1. Які пазбягае прама і адкрыта выказваць свае думкі. 2. Які глыбока ўнікае ў сутнасць справы; дапытлівы.

**УНУ́ТРАНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адносіны да псіхічнай дзейнасці чалавека, адбываецца ў яго псіхіцы. 2, Які ляжыць у аснове чаго-н., з'яўляецца сутнасцю чаго-н.

**УНУША́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Дзейнічаць на псіхіку чалавека з мэтай выклікаць пэўную рэакцыю; прыводзіць у стан гіпнозу.

**УПА́РТАСЦЬ**, -і. Незгаворлівасць, імкненне рабіць што-н. толькі па-свойму, наперакор каму-н.

**УПА́РТЫ**, -ая, -ае. 1. Вельмі настойлівы, паслядоўны ў ажыццяўленні чаго-н. 2. Незгаворлівы, які імкнецца рабіць што-н. толькі па-свойму, наперакор каму-н.

**УПА́РЦІЦЦА**, -рчуся, -рцішся, -рціцца. Праяўляць упартасць, быць упартым.

**УПІКА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Папракаць каго-н., выказваць неадабрэнне, нездавальненне за што-н.

**УПІ́КІ**, -аў. Папрокі, абвінавачанні, выказаныя каму-н.

**УПЛЫВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Рабіць уплыў; уздзейнічаць на каго-, што-н.

**УПЛЫВО́ВЫ**, -ая, -ае. Які робіць уплыў або здольны ўплываць на каго-, што-н.; аўтарытэтны.

**УПО́КАТ**. Адзін пры адным, у беспарадку, як папала (ляжаць, спаць і пад.).

**УПО́ТАЙ**. Непрыкметна для іншых, тайком, цішком.

**УПЭ́ЎНЕНАСЦЬ**, -і. Перакананасць у чым-н.

**УПЭ́ЎНЕНЫ**, -ая, -ае. 1. Які цвёрда верыць у што-н., перакананы ў чым-н.; перакананы ва ўласных сілах, які спадзяецца на сябе. 2. Рашучы, энергічны.

**УПЭ́ЎНІЦЦА**, -нюся, -нішся, -ніцца. Цвёрда паверыць у што-н., пераканацца ў чым-н.

**УРА́ЖАННЕ**, -я. 1. Вобраз, след, які застаецца ў свядомасці чалавека ад убачанага, пачутага, перажытага. 2. Уяўленне, думка пра каго-, што-н.

**УРА́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які лёгка паддаецца ўражанням, вельмі чулы.

**УРА́ЗІЦЬ**, ура́жу, ура́зіш, ура́зіць. 1. Зрабіць вялікае ўражанне, моцна ўсхваляваць, устрывожыць. 2. Балюча закрануць каго-н.

**УРА́ЗЛІВЫ**, -ая, -ае. Здольны жыва адчуваць, успрымаць што-н.; такі, якога лёгка вывесці з раўнавагі.

**УРАЎНАВА́ЖАНАСЦЬ**, -і. Спакой, вытрымка.

**УРАЎНАВА́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Які мае роўны, спакойны, стрыманы характар; які выражае спакой, вытрымку.

**УРАЧЫ́СТАСЦЬ**, -і. Стан прыўзнятасці, натхнення, захаплення.

**УРАЧЫ́СТЫ**, -ая, -ае. 1. Важны, знамянальны. 2. Прыўзняты, патэтычны. 3. Надзвычай сур'ёзны па сваёй важнасці, па сваім змесце.

**УСВЯДО́МІЦЬ**, -млю, -міш, -міць. Поўнасцю, да канца зразумець што-н.

**УСКО́СНЫ**, -ая, -ае. Які не выказваецца, не выяўляецца непасрэдна; пабочны.

**УСЛУ́ЖЛІВЫ**, -ая, -ае. Які ахвотна робіць паслугі каму-н., гатовы ўслужыць.

**УСЛУ́ХАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Уважліва прыслухацца, стараючыся пачуць, зразумець што-н.

**УСЛЫ́Х**. Уголас, каб было чутна іншым.

**УСМА́К**. 1. Са смакам; з апетытам. 2. Да поўнага задавальнення, удосталь.

**УСМІХА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. Выражаць усмешкай радасць, задаволенасць, іронію, пагарду і пад.; усмешкай выражаць свае адносіны да каго-, чаго-н., адказваць на што-н.

**УСПАМІ́Н**, -у. Узнаўленне ў думках таго, што захавалася ў памяці.

**УСПО́МНІЦЬ**, -ню, -ніш, -ніць. Аднавіць у памяці, прыпомніць.

**УСПРЫМА́ННЕ**, -я. 1. Разуменне, засваенне. 2. Адлюстраванне ў свядомасці людзей прадметаў і з'яў рэчаіснасці, якія ўздзейнічаюць на органы нашых па́чуццяў.

**УСПРЫНЯ́ЦЬ**, -прыму́, -пры́меш, -пры́ме. Зразумець, засвоіць; прарэагаваць пэўным чынам на што-н.

**УСТРЫВО́ЖАНЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў стане трывогі, хвалявання; які выражае трывогу, хваляванне.

**УСТРЫВО́ЖЫЦЦА**, -жуся, -жышся, -жыцца. Прыйсці ў стан трывогі; усхвалявацца.

**УСТРЫВО́ЖЫЦЬ**, -жу, -жыш, -жыць. Выклікаць у кім-н. трывогу, страх; парушыць спакой.

**УСТРЫ́МАНЫ**, -ая, -ае. Які абмяжоўвае сябе ў чым-н., пазбягае празмернасцей.

**УСТРЫМА́ЦЦА**, -а́юся, -а́ешся, -а́ецца. 1. Стрымаць сябе ад якіх-н. дзеянняў, адмовіцца ад чаго-н. 2. Ухіліцца, не прыняць удзелу (у размове, абмеркаванні, галасаванні).

**УСТУ́ПЧЫВЫ**, -ая, -ае. Гатовы на ўступкі, згаворлівы, памяркоўны.

**УСТУРБАВА́НАСЦЬ**, -і. Непакой, усхваляванасць.

**УСТУРБАВА́НЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў стане трывогі; усхваляваны, устрывожаны.

**УСТУРБАВА́ЦЦА**, -бу́юся, -бу́ешся, -бу́ецца. Прыйсці ў стан непакою, хвалявання, трывогі.

**УСТУРБАВА́ЦЬ**, -бу́ю, -бу́еш, -бу́е. Прывесці ў стан непакою, усхваляваць, устрывожыць.

**УСХАДЗІ́ЦЦА**, -хаджу́ся, -хо́дзішся, -хо́дзіцца. Дайсці да крайняй ступені праяўлення чаго-н., раз'юшыцца; пачаць дурэць, сваволіць.

**УСХАПІ́ЦЦА**, -хаплю́ся, -хо́пішся, -хо́піцца. Хутка ўстаць; хутка стаць на ногі; рана ўстаць.

**УСХВАЛЯВА́НЫ**, -ая, -ае. Які знаходзіцца ў стане хвалявання; які выражае такі стан.

**УСХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лю́юся, -лю́ешся, -лю́ецца. Прыйсці ў стан хвалявання, непакою; устрывожыцца.

**УСЦЕРАГЧЫ́**, -рагу́, -ражо́ш, -ражо́; -ражо́м, -ражаце́, -рагу́ць. Зберагчы, захаваць у цэласці; засцерагчы ад чаго-н. небяспечнага, непажаданага.

**УСЦЕРАГЧЫ́СЯ**, -рагу́ся, -ражо́шся, -ражо́цца; -ражо́мся, -ражаце́ся, -рагу́цца. Зберагчы, усцерагчы сябе ад чаго-н.

**УСЦЕ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. Знайсці для сябе задаволенне, уцеху ў кім-, чым-н., узрадавацца.

**УСЦЕ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Выклікаць у каго-н. пачуццё задаволенасці, радасці; супакоіць.

**УТАЙМАВА́ЦЬ**, -му́ю, -му́еш, -му́е. 1. Уціхамірыць, супакоіць (непаслухмянага, раззлаванага чалавека). 2. Зменшыць, аслабіць або суцішыць (боль); заглушыць, прыглушыць (якое-н. пачуццё, хваляванне і пад.).

**УТАРО́ПІЦЦА**, -плюся, -пішся, -піцца. Пільна, не зводзячы вачэй, углядзецца на каго-, што-н.; стаць пільным, уважлівым, накіраваным (пра вочы, позірк).

**УТАРО́ПІЦЬ**, -плю, -піш, -піць. Уставіць вочы, позірк на каго-, што-н.

**УТО́РКНУЦЦА**, -нуся, -нешся, -нецца. 1. Уперціся, уткнуцца ў што-н. 2. Не ўзнімаючы вачэй, паглыбіцца ў якую-н. справу.

**УТРАПЁНЫ**, -ая, -ае. Нястрымны ў праяўленні якіх-н. пачуццяў; раз'юшаны; ашалелы.

**УТУЛІ́ЦЦА**, утулю́ся, уту́лішся, уту́ліцца. 1. Уткнуўшыся, прыціснуцца да каго-, чаго-н. 2. Захутацца ў што-н.

**УТУ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. 1. Такі, у якім прыемна знаходзіцца, жыць. 2. Зацішны, укрыты ад каго-, чаго-н.

**УХІЛІ́ЦЦА**, ухілю́ся, ухі́лішся, ухі́ліцца. 1. Адхіліцца ўбок, адхіснуцца. 2. Адмовіцца, устрымацца ад якіх-н. учынкаў, дзеянняў; пазбегнуць прамых, адкрытых выказванняў, меркаванняў.

**УХУ́ТАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Адзецца ў што-н. цёплае, абгарнуцца, захутацца з усіх бакоў.

**УХУ́ТАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Адзець у цёплае, захутаць з усіх бакоў.

**УЦЕ́ХА**, -і. Радасць, забава; задавальненне.

**УЦЕ́ШНА**. Радасна, прыемна.

**УЦЕ́ШНЫ**, -ая, -ае. Які прыносіць уцеху; радасны, прыемны.

**УЦЕ́ШЫЦЦА**, -шуся, -шышся, -шыцца. Перастаць гараваць, супакоіцца; знайсці ў кім-, чым-н. для сябе ўцеху, задавальненне.

**УЦЕ́ШЫЦЬ**, -шу, -шыш, -шыць. Спагадай, спачуваннем палегчыць каму-н. гора, пакуты; парадаваць чым-н.

**УЦЯГНУ́ЦЦА**, уцягну́ся, уця́гнешся, уця́гнецца. 1. Паступова прывыкнуць, прызвычаіцца да чаго-н., асвоіцца з чым-н. 2. Прыахвоціцца да чаго-н.

**УЦЯГНУ́ЦЬ**, уцягну́, уця́гнеш, уця́гне. 1. Утуліць, увабраць унутр (галаву, шчокі, жывот і пад.). 2. Угаварыць, схіліць каго-н. уступіць у што-н., прыняць удзел у чым-н.

**УЦЯ́МІЦЬ**, -млю, -міш, -міць. Зразумець сэнс, змест чаго-н.; поўнасцю, да канца ўсвядоміць што-н.

**УЧЫНІ́ЦЬ**, учыню́, учы́ніш, учы́ніць. 1. Зрабіць, правесці, арганізаваць. 2. Утварыць што-н. нечаканае, непажаданае.

**УШАНАВА́ЦЬ**, -ну́ю, -ну́еш, -ну́е. 1. Выказаць чым-н. пашану, павагу каму-, чаму-н. 2. Урачыста павіншаваць каго-н. у сувязі з чым-н.

**УШЧАМІ́ЦЦА**, ушчамлю́ся, ушчэ́мішся, ушчэ́міцца. 1. Уціснуцца, усунуцца; прымасціцца дзе-н. 2. Апынуцца ў цяжкім становішчы.

**УШЧУВА́ННЕ**, -я. Спагнанне, дакор, папрок.

**УШЧУВА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Уздзейнічаць на каго-н., дакараючы, папракаючы за што-н.

**УШЧЭ́НТ**. Поўнасцю, зусім, дарэшты, датла.

**УЯВІ́ЦЬ**, уяўлю́, уя́віш, уя́віць. У думках скласці вобраз каго-, чаго-н., узнавіць розумам, фантазіяй.

**УЯЎЛЕ́ННЕ**, -я. 1. Стварэнне ў думках вобраза каго-, чаго-н.; узнаўленне ў свядомасці атрыманых раней успрыманняў; канкрэтны вобраз прадмета, з'явы, які раней уздзейнічаў на органы пачуццяў, але ў гэты момант непасрэдна не ўспрымаецца свядомасцю. 2. Псіхічны працэс, які заключаецца ў стварэнні новых вобразаў на аснове ўжо наяўных шляхам іх пераўтварэння; творчая фантазія.

**УЯ́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Які існуе не ў сапраўднасці, а ва ўяўленні. 2. Тэарэтычна мажлівы, патэнцыяльны.

## Ф

**ФА́БУЛА**, -ы. Паслядоўны паказ падзей, здарэнняў і пад. у мастацкім творы; схема развіцця мастацкага твора; кароткі змест, пераказ чаго-н.

**ФАВАРЫ́Т**, -а. Той, каму аддаюць перавагу, кім цікавяцца больш за іншых; улюбёнец каго-н.

**ФАЕ́**. Памяшканне ў тэатры, кіно, канцэртнай зале і пад., прызначанае для адпачынку гледачоў ці слухачоў у час перапынку або да пачатку канцэрта, спектакля.

**ФАКТ СЦЭНІ́ЧНЫ**. Прапануемая абставіна п'есы, частка падзеі. Шэраг здзейсненых фактаў ствараюць падзеі п'есы.

**ФАЛЬШЫ́ВАСЦЬ**, -і. 1. Падман, ашуканства. 2. Прытворства; адсутнасць натуральнасці, адпаведнасці мастацкай праўдзе. 3. Недакладнасць у выкананні, скажэнне (пра ігру акцёраў, спевы, ігру на музычным інструменце).

**ФАМІЛЬЯ́РНАСЦЬ**, -і. Фамільярнае абыходжанне з кім-н.; фамільярныя ўчынкі, паводзіны.

**ФАМІЛЬЯ́РНІЧАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Фамільярна паводзіць сябе.

**ФАМІЛЬЯ́РНЫ**, -ая, -ае. Развязны, бесцырымонны; такі, якому ўласціва развязнае, бесцырымоннае абыходжанне з кім-н.

**ФАНАБЭ́РЛІВЫ** і **ФАНАБЭ́РЫСТЫ**, -ая, -ае. Які любіць фанабэрыцца; схільны да фанабэрыі, з фанабэрыяй.

**ФАНАБЭ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Трымацца з фанабэрыяй; задавацца, празмерна ганарыцца.

**ФАНАБЭ́РЫЯ**, -і. Пыхлівасць, зазнайства, ганарыстасць.

**ФАНТАЗЁР**, -а. Той, хто любіць фантазіраваць.

**ФАНТАЗІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. 1. Аддавацца фантазіі, марыць; выдумляць што-н. непраўдападобнае. 2. Імправізаваць.

**ФАНТА́ЗІЯ**, -і. 1. Творчае ўяўленне; выдумка, вынаходлівасць. 2. Мара.

**ФАРМУЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Дакладна выказваць што-н. (думкі, рашэнні і пад.).

**ФАРС**, -а. 1. Тэатральная п'еса лёгкага, жартаўлівага, часам фрывольнага зместу; манера ігры акцёраў, заснаваная на блазенстве, грубых жартах з мэтай выклікаць смех у гледачоў. 2. Ганебнае, цынічнае відовішча.

**ФАРСІ́РАВАНЫ**, -ая, -ае. Узмоцнены па гучанні, больш гучны, чым звы-

чайна.

**ФАРСІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -рue. Павышаць (павысіць) сілу гучання голасу.

**ФАРСІ́СТЫ**, -ая, -ае і **ФАРСО́ВЫ**, -ая, -ае. Які любіць фарсіць; франтаваты, модны.

**ФАРСІ́ЦЬ**, -ршу́, -рсі́ш, -рсі́ць. Франціць; выхваляцца, выстаўляючы напаказ што-н.

**ФАРСУ́Н**, -а. Той, хто любіць фарсіць.

**ФАРЫСЕ́Й**, -я. Ханжа, крывадушнік.

**ФАТ**, -а. 1. Самазадаволены франт, фарсун, які любіць рысавацца, пазіраваць; пусты, пошлы чалавек. 2. Роля палюбоўніка-пазёра ў тэатральнай п'есе, а таксама акцёр, які іграе гэтую ролю.

**ФАЦЭ́Т**, -а. Камічны, забаўны чалавек; нехта мала знаёмы; хто-н.

**ФАЦЭ́ТНЫ**, -ая, -ае. Камічны, забаўны.

**ФЕЕРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Казачны, чароўны; надзвычайны, дзівосны.

**ФЕЕ́РЫЯ**, -і. 1. Тэатральны спектакль, цыркавы паказ з казачным сюжэтам, раскошнымі дэкарацыямі і рознымі сцэнічнымі эфектамі. 2. Чароўнае, казачнае відовішча.

**ФЕХТАВА́ННЕ**, -я. Від спорту, майстэрства барацьбы на шпагах, рапірах, эспадронах і пад.

**ФЕШЭНЕ́БЕЛЬНЫ**, -ая, -ае. Які адпавядае патрабаванням найлепшага густу і моды; элегантны, вытанчана-прыгожы, раскошны.

**ФІГЛЯ́Р**, -а. 1. Фокуснік, штукар, акрабат. 2. Штукар, крыўляка.

**ФІЗІЯЛАГІ́ЧНЫ ВІД ДЫХА́ННЯ**. Які забяспечвае арганізм кіслародам.

**ФІЛАСО́ФСКАЯ ЛІ́РЫКА**. Жанравая разнавіднасць паэзіі, для якой характэрна інтэлектуальна-эмацыянальнае асваенне рэчаіснасці, пранікненне ў сутнасць такіх катэгорый, як жыццё і смерць, прастора і час, дабро і зло і інш.

**ФІЛАНТРО́ПІЯ**, -і. Дапамога бедным, заступніцтва за бедных; дабрачыннасць; чалавекалюбства.

**ФІЛІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Цягнуць гук, паступова ўзмацняючы яго, а затым аслабляючы, зводзіць на нішто.

**ФІЛІ́СТЭР**, -а. Чалавек з вузкім, абывацельскім, мяшчанскім кругаглядам і ханжаскімі паводзінамі; абывацель.

**ФІЛІ́СТЭРСТВА**, -а. Погляды і паводзіны філістэра; абывацельская коснасць і ханжаства.

**ФЛАНІ́РАВАЦЬ**, -рую, -руеш, -руе. Прагульвацца, хадзіць без мэты, бяздзейнічаць.

**ФЛЕГМАТЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. 1. Які характарызуецца марудлівасцю, спакоем, ураўнаважанасцю, слабым праяўленнем эмоцый. 2. Які выказвае непарушны спакой, раўнадушнасць; апатычны.

**ФЛІРТ**, -у. Какецтва, лёгкае заляцанне.

**ФЛЮІ́ДЫ**, -аў. Паводле ўяўленняў спірытаў — «псіхічныя токі», якія нібыта вылучаюцца чалавечым целам або якім-н. іншым целам, прадметам; тое, што зыходзіць ад каго-, чаго-н.

**ФРАГМЕ́НТ**, -а. Асобная частка, урывак якога-н. кампазіцыйнага цэлага.

**ФРА́ЗА**, -ы. 1. Інтанацыйна аформленае спалучэнне слоў, якое выказвае думку; сказ. 2. Напышлівы выраз, які пазбаўлены ўнутранага зместу або які прыкрывае лжывасць гэтага зместу.

**ФРАНЦІ́ЦЬ**, -нчу́, -нці́ш, -нці́ць. Быць франтам, модна адзявацца; выстаўляць напаказ сваё адзенне, прычоску і пад.; красавацца.

**ФРА́У**. Слова, якое ўжываецца пры ветлівым звароце да замужняй жанчыны, а таксама пры называнні яе імя або прозвішча ў Германіі і некаторых іншых краінах.

**ФРЭ́ЙЛЕН**. Слова, якое ўжываецца пры ветлівым звароце да незамужняй жанчыны, а таксама пры называнні яе імя або прозвішча ў немцаў і некаторых іншых народаў.

**ФРЭ́ЙЛІНА**, -ы. Прыдворнае званне дзяўчыны-дваранкі, якая знаходзіцца пры царыцы, каралеве, прынцэсе і пад.; асоба, якая мае гэтае званне.

**ФРЭ́КЕН**. Слова, якое ўжываецца пры звароце да незамужняй жанчыны, а таксама пры называнні яе імя або прозвішча ў скандынаўскіх краінах.

**ФРЭНЧ**, -а. Прыталеная куртка ваеннага пакрою з чатырма накладнымі кішэнямі і хлясцікам ззаду.

**ФУ́РКА**, -і. Перасовачная пляцоўка на калёсах для перамяшчэння па сцэне дэкарацый, рэквізіту, акцёраў.

**ФУРО́Р**, -у. Шумны публічны поспех; бурнае праяўленне захаплення кім-, чым-н.

**ФУ́РЫЯ**, -і. 1. У старажытнай міфалогіі — адна з трох багінь помсты. 2. Злосная і сварлівая жанчына.

**ФУ́ТРА**, -а. Зімовая вопратка з вырабленых шкур пушнога звера.

**ФУТЭ́РКА**, -а. Кароткае футра.

## Х

**ХАДУ́ЛЬНАСЦЬ**, -і. Ненатуральнасць, неарганічнасць акцёрскай ігры, сцэнічнага выканання.

**ХАДУ́ЛЬНЫ**, -ая, -ае. Ненатуральны, неарганічны, пазбаўлены арыгінальнасці, залішне напышлівы.

**ХАЛЕ́РЫК**, -а. Тэмпераментны, неўраўнаважаны чалавек, які лёгка ўзбуджаецца пад уздзеяннем якіх-н. уражанняў.

**ХАЛЕРЫ́ЧНЫ**, -ая, -ае. Уласцівы халерыку.

**ХАЛУ́Й**, -я́. 1. Назва слугі, лакея. 2. Занадта паслужлівы, угодлівы чалавек; падхалім.

**ХАЛУ́ЙСКІ**, -ая, -ае. Рабалепны, угодлівы.

**ХАЛУ́ЙСТВА**, -а. Угодлівасць, рабалепства, падхалімства.

**ХАМ**, -а. Грубы, нахабны чалавек.

**ХАМЕЛЕО́Н**, -а. Пра чалавека, які часта мяняе свае погляды і думкі ў залежнасці ад абставін.

**ХАМІ́ЦЬ**, -млю́, -мі́ш, -мі́ць. Паводзіць сябе груба і бесцырымонна.

**ХА́МСТВА**, -а. Грубасць, бесцырымоннасць, нахабнасць.

**ХАНДРА́**, -ы́. Маркотны, сумны настрой; туга.

**ХАНДРЫ́ЦЬ**, -ру́, -ры́ш, -ры́ць. Знаходзіцца ў стане хандры; сумаваць, тужыць.

**ХАНЖА́**, -ы́. Прытворна набожны або прытворна дабрадушны чалавек; крывадушнік.

**ХА́НЖАСТВА**, -а. Прытворная, паказная набожнасць, дабрадзейнасць; крывадушша.

**ХАПАТЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. Паспешлівы, таропкі.

**ХАРА́КТАР**, -у. Сукупнасць устойлівых псіхічных уласцівасцей чалавека, яго асабістых рысаў, якія праяўляюцца ў паводзінах і дзейнасці.

**ХАРА́КТАР СЦЭНІ́ЧНЫ**. Сцэнічны тып (вобраз, індывідуальнасць), якія стварае акцёр у спектаклі. Ад звычайнага характару, які сустракаецца ў жыцці, Х. с. адрозніваецца сваімі эстэтычнымі якасцямі. У ім усе элементы ўнутранай і знешняй характарыстыкі падначалены мастацкай задуме, выступаюць у строгім адзінстве. Стварэнне Х. с. — галоўная мэта акцёрскай творчасці.

**ХАРА́КТАРНЫ**, -ая, -ае. Які ўвасабляе пэўны псіхалагічны тып.

**ХАРА́КТАРНЫ АКЦЁР**. Акцёр, які іграе ролі з ярка выражанымі бытавымі, сацыяльнымі, знешнімі своеасаблівасцямі. Станіслаўскі казаў, што характарнасць павінна прысутнічаць у кожным вобразе, у тым ліку героя-любоўніка.

**ХАРАКТАРЫ́СТЫКА**, -і. Апісанне характару, учынкаў і пад., якое даецца дзейнай асобе ў мастацкім творы.

**ХАРАКТЭ́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Які мае адметныя, рэзка выяўленыя своеасаблівыя рысы. 2. Уласцівы пэўнай асобе, прадмету, з'яве.

**ХАРАСТВО́**, -а. Краса, прыгажосць, чароўнасць.

**ХАРУ́ГВА**, -ы. 1. Баявы сцяг войска. 2. Царкоўны сцяг, часцей палотнішча на доўгім дрэўку з вобразамі святых, якое носяць у час рэлігійных святаў.

**ХАРЭ́Й**, -я. Вершаваны памер — двухскладовая стапа з націскам на першым складзе.

**ХАТУЛЁК**, -лька. Невялікі хатуль.

**ХАТУ́ЛЬ**, -я. Вялікі клунак рэчаў, звязаных у хустку, пасцілку і пад., які звычайна носяць за спіной.

**ХАЎРУ́С**, -у. Група людзей, звязаных агульнымі мэтамі, інтарэсамі; садружнасць.

**ХАЎРУСАВА́ЦЬ**, -су́ю, -су́еш, -су́е. Мець з кім-н. хаўрус, быць у хаўрусе з кім-н.

**ХАЎРУ́СНІК**, -а. Саўдзельнік у якой-н. справе; кампаньён; саўдзельнік якіх-н. несумленных спраў, якога-н. злачынства.

**ХАЎТУ́РЫ**, -аў. 1. Абрад провадаў нябожчыка для пахавання. 2. Жалобны стол, абед па нябожчыку.

**ХАЦЕ́ННЕ**, -я. Жаданне; страсная пачуццёвая цяга.

**ХАЦЕ́ЦЦА**, хо́чацца. Адчуваць патрэбу ў чым-н., вельмі жадаць чаго-н.

**ХАЦЕ́ЦЬ**, хачу , хо́чаш, хо́ча. 1. Мець жаданне, ахвоту да чаго-н., адчуваць патрэбу ў кім-н. 2. Імкнуцца да чаго-н.

**ХВАЛА́**, -ы́. 1. Праслаўленне, усхваленне; адабрэнне, добры водзыў, пахвала. 2. Вокліч захаплення, прызнання, удзячнасці каму-, чаму-н.

**ХВАЛЕ́БНЫ**, -ая, -ае. У якім ёсць пахвала.

**ХВАЛЁНЫ**, -ая, -ае. Які атрымаў высокую ацэнку; расхвалены; пра каго-, што-н., што аказалася нявартым пахвалы.

**ХВАЛІ́ЦЦА**, хвалю́ся, хва́лішся, хва́ліцца. Расхвальваць што-н. сваё, свае поспехі, заслугі і пад.; з выхваляннем абяцаць зрабіць што-н.

**ХВАЛЬКО́**, -а. Той, хто любіць хваліцца.

**ХВАЛЮ́ЮЧЫ**, -ая, -ае. Які выклікае хваляванне, трывожыць, непакоіць.

**ХВАЛЯВА́ННЕ**, -я. Нервовае ўзбуджэнне, выкліканае адчуваннем трывогі, радасці, небяспекі і пад.

**ХВАЛЯВА́ЦЦА**, -лю́юся, -лю́ешся, -лю́ецца. 1. Перажываць хваляванне, непакоіцца. 2. Выказваць незадаволенасць чым-н., пратэст супраць чаго-н.

**ХВАЛЯВА́ЦЬ**, -лю́ю, -лю́еш, -лю́е. Прыводзіць у трывожны, узбуджаны стан; непакоіць.

**ХВАРАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. 1. Які часта хварэе; схільны да захворвання. 2. Перабольшаны, празмерны, ненармальны; нездаровы, непажаданы.

**ХВАТ**, -а. Бойкі, спрытны чалавек.

**ХВА́ТКА**, -і. Манера дзейнічання каго-н.; спрыт у чым-н.

**ХВА́ТКІ**, -ая, -ае. Спрытны, кемлівы.

**ХВА́ЦКІ**, -ая, -ае. 1. Удалы, спрытны; маладзецкі. 2. Вельмі добры, слаўны. 3. Спрытны, умелы.

**ХВІЛІ́НА** і **ХВІ́ЛЯ**, -і. Кароткі прамежак часу; момант, імгненне.

**ХІ́БА**, -ы. 1. Памылка, недахоп. 2. Пра фізічны недахоп.

**ХІ́ЖЫ**, -ая, -ае. Які імкнецца да панавання, нажывы; жорсткі (пра чалавека); які выражае прагнасць, сквапнасць, жорсткасць.

**ХІНУ́ЦЦА**, -ну́ся, -не́шся, -не́цца; -нёмся, -няце́ся. 1. Мець ахвоту да чаго-н., захапляцца чым-н. 2. Мець цягу да каго-н., сімпатызаваць каму-н.; шукаць збліжэння з кім-н.

**ХІТРАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Трохі хітры; які выражае пэўную хітрасць або сведчыць пра яе.

**ХІТРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е і **ХІТРЫ́ЦЬ**, -ру́, -ры́ш, -ры́ць. Праяўляць хітрасць.

**ХІ́ТРАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць хітрага. 2. Учынкі, прыёмы, паводзіны, разлічаныя на ўвядзенне каго-н. у зман. 3. Выкрутлівасць, спрытнасць.

**ХІТРУ́ГА**, -і. Вельмі хітры чалавек.

**ХІТРУ́Н**, -а. Хітры чалавек; махляр, круцель.

**ХІТРУ́ХА**, -і. Хітрая жанчына, махлярка.

**ХІ́ТРЫ**, -ая, -ае. 1. Вынаходлівы, умелы, дасціпны; які дзейнічае скрытна, не яўна. 2. Які для дасягнення чаго-н. ідзе падманным шляхам.

**ХІ́ТРЫКІ**, -аў. Хітрыя прыёмы, выверты; круцельства, падман.

**ХІТРЫ́НКА**, -і. Нейкая доля хітрасці.

**ХІТРЭ́Ц**, -раца́. Хітры чалавек; хітрун.

**ХЛАМІ́ДА**, -ы. 1. У старажытных грэкаў і рымлян — прамавугольны плашч з засцежкай на правым плячы або на грудзях. 2. Нязграбная шырокая і доўгая адзежына.

**ХЛАПЕ́Ц**, -пца́. Падлетак мужчынскага полу.

**ХЛАПЧУ́К**, -а. Невялікі хлапец, падлетак.

**ХЛАПЧЫ́НА**, -ы. Малады чалавек, дзяцюк; рослы, плячысты малады чалавек.

**ХЛІ́ПАЦЬ**, -аю, -аеш, -ае. Ціха плакаць; усхліпваць.

**ХЛО́ПЕЦ**, -пца́. Малады чалавек, юнак: нежанаты мужчына.

**ХЛО́ПЧА**. Ужываецца як сяброўскі зварот да каго-н.

**ХЛУС**, -а. Той, хто хлусіць; манюка.

**ХЛУСІ́ЦЬ**, хлушу́, хлу́сіш, хлу́сіць. Гаварыць няпраўду, маніць.

**ХЛУСЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які гаворыць няпраўду, хлусню; які выражае хлусню, няшчыры, прытворны. 2. Фальшывы, прытворны.

**ХЛУСНЯ́**, -і. Мана, няпраўда, наўмыснае скажэнне фактаў.

**ХЛЮСТ**, -а́. Хітры і нахабны чалавек; прайдзісвет; франтаваты, развязны чалавек.

**ХМУРНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Рабіцца, станавіцца хмурным, панурым.

**ХМУ́РНЫ**, -ая, -ае. Сумны, пануры (пра чалавека); які выражае суровасць, панурасць, заклапочанасць.

**ХМУ́РЫЦЦА**, -руся, -рышся, -рыцца. Станавіцца насупленым; моршчыцца, выражаючы неспакой, хваляванне, турботу, злосць (пра лоб, бровы); злавацца на каго-н.

**ХО́РАМ**, -а; *мн.* хо́рамы, -аў. Вялікі жылы будынак; палац.

**ХО́РАША**. Пра пачуццё ўнутранага задавальнення, зведанага кім-н.

**ХРО́НІКА**, -і. Літаратурны твор, у якім паслядоўна выкладаецца гісторыя грамадскіх, палітычных і іншых падзей.

**ХРЫПАВА́ТЫ**, -ая, -ае. Троху, злёгку хрыплы (пра голас, гук і пад.).

**ХРЫПАТА́**, -ы́. Сіпласць, адсутнасць чыстага голасу.

**ХРЫПА́ТЫ**, -ая, -ае. Глухаваты, сіплы, нячыстага тону (пра голас).

**ХРЫПА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Пакутаваць ад хрыпаты, гаварыць хрыпла.

**ХРЫ́ПЛЫ**, -ая, -ае. 1. Нячысты, няясны, з хрыпамі (пра гукі). 2. Які ўтварае сіплыя, нячыстага тону гукі.

**ХУ́СТАЧКА і ХУСЦІ́НКА**, -і. 1. Невялікая хустка. 2. Невялікі кусок тканіны квадратнай формы для выцірання твару, вачэй, носа.

**ХУ́СТКА**, -і. Кусок тканіны ці вязанага палатна, часцей квадратнай формы, які завязваецца на галаву, шыю ці накідваецца на плечы.

**ХЦІ́ВАСЦЬ**, -і. 1. Імкненне задаволіць ненасытнае жаданне чаго-н. 2. Карыслівасць, сквапнасць.

**ХЦІ́ВЕЦ**, хці́ўца. Той, каму ўласціва хцівасць.

**ХЦІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які імкнецца ўзяць сабе, атрымаць, мець у сябе як мага больш чаго-н.; пражэрлівы, ненасытны, прагны. 2. Скупы, карыслівы; заснаваны на карыслівасці, імкненні да асабістай выгады. 3. Пажадлівы.

## Ц

**ЦА́ЦКА**, -і. 1. Прадмет, прызначаны дзецям для гульні ці забавы. Узнаўляючы рэальныя і ўяўныя рэчы і вобразы, дапамагае дзіцяці спасцігаць навакольны свет, служыць мэтам разумовага, маральнага, эстэтычнага і фізічнага выхавання. 2. Той, кім (або тое, чым) распараджаюцца па ўласным жаданні дзеля пацехі.

**ЦА́ЦКАЦЦА**, -аюся, -аешся, -аецца. Гуляць з кім-, чым-н.; забаўляцца; займацца якой-н. клапатной справай; важдацца з чым-н.; многа і доўга займацца

з кім-н.; удзяляць каму-н. шмат часу, увагі; няньчыцца.

**ЦВЯЛІ́ЦЦА**, цвялю́ся, цве́лішся, цве́ліцца. Дражніцца, жартаваць.

**ЦВЯЛІ́ЦЬ**, цвялю́, цве́ліш, цве́ліць. 1. Дражніць, раздражняць; выклікаць зайздрасць; хваляваць, расчульваць. 2. Выклікаць якія-н. пачуцці, надзеі, жаданні.

**ЦЕ́КАННЕ**, -я. Вымаўленне мяккага «ц» на месцы этымалагічна мяккага «т» і на месцы этымалагічна цвёрдага «т» у пазіцыі перад галоснымі пярэдняга рада.

**ЦІКА́ВАСЦЬ**, -і. 1. Павышаная пільная ўвага да каго-, чаго-н. 2. Жаданне даведацца пра каго-, што-н.; цікаўнасць.

**ЦІКАВА́ЦЬ**, -ку́ю, -ку́еш, -ку́е. Глядзець на каго-, што-н. з пэўнай мэтай; сачыць за кім-, чым-н.; выглядаць, падпільноўваць каго-, што-н.

**ЦІКА́ВІЦЦА**, -ка́ўлюся, -ка́вішся, -ка́віцца. 1. Імкнуцца атрымаць звесткі аб кім-, чым-н., даведацца пра каго-, што-н. 2. Захапляцца кім-, чым-н., імкнуцца да каго-, чаго-н.

**ЦІКА́ВІЦЬ**, -ка́ўлю, -ка́віш, -ка́віць. 1. Выклікаць цікавасць, імкненне даведацца пра каго-, што-н.; звяртаць на сябе ўвагу каго-н. 2. Выклікаць захапленне, прыхільнасць да сябе.

**ЦІКА́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які выклікае цікавасць, захапляе. 2. Забаўны; незвычайны. 3. Прыкметны якімі-н. якасцямі. 4. Прыгожы.

**ЦІКА́ЎНАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць цікаўнага. 2. Жаданне, імкненне ўсё ўведаць, убачыць.

**ЦІКА́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Які імкнецца ўсё ўведаць, убачыць ва ўсіх падрабязнасцях. 2. Які пашырае свой кругагляд, веды; дапытлівы.

**ЦІХМА́НЫ** і **ЦІХМЯ́НЫ**, -ая, -ае. Паслухмяны, пакорлівы, лагодны, рахманы.

**ЦІХУ́ТКА**. 1. Вельмі ціха, бясшумна. 2. Паволі, марудна. 3. Употай, цішком.

**ЦІ́ША**, -ы. Адсутнасць гукаў, шуму; спакой, цішыня.

**ЦІШКО́М**. 1. Непрыкметна, употай; крадучыся, крадком. 2. Ціха, нягучна.

**ЦНАТЛІ́ВАСЦЬ**, -і. Уласцівасць цнатлівага.

**ЦНАТЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Маральна чысты; строгі ў маральных адносінах; сарамлівы; далікатны. 2. Які не страціў нявіннасці.

**ЦНО́ТА**, -ы. 1. Маральная чысціня, строгасць у маральных адносінах. 2. Дзявочая нявіннасць.

**ЦУД**, -у і **ЦУ́ДА**, -а. 1. Што-н. нечаканае, незвычайнае. 2. Тое, што выклікае захапленне, здзіўленне сваімі выдатнымі якасцямі, прыгажосцю і пад.; тое, што з'яўляецца ўзорам дасканаласці ў якой-н. галіне.

**ЦУДАДЗЕ́Й**, -я. Вялікі майстар сваёй справы; той, хто ўмела, па-мастацку валодае чым-н.

**ЦУДАДЗЕ́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Незвычайнай сілы ўздзеяння; чарадзейны; жыватворны. 2. Чароўны, вельмі прыгожы.

**ЦУДАТВО́РАЦ**, -рца. 1. Той, хто робіць, творыць цуды. 2. Хто робіць што-н. дзівоснае, незвычайнае.

**ЦУДАТВО́РНЫ**, -ая, -ае. 1. Які творыць цуды. 2. Які робіць што-н. незвычайнае, такое, што выклікае здзіўленне.

**ЦУДО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Вельмі добры; выдатны, адмысловы; які вылучаецца высокім майстэрствам, незвычайным талентам. 2. Незвычайна прыгожы. 3. Небывалы, нябачаны.

**ЦУ́ПКІ**, -ая, -ае. 1. Цвёрды, жорсткі; каляны. 2. Тупкі; не вязкі, не рыхлы.

**ЦЫРУ́ЛЬНЯ**, -і. Спецыяльна абсталяванае памяшканне для галення, стрыжкі, афарбоўкі, прычэсвання валасоў і пад.

**ЦЫ́ТРА**, -ы. Пра расфуфыраную, легкадумную, хітрую жанчыну.

**ЦЭЗУ́РА**, -ы. Паўза ў вершаваным радку, абавязковая для пэўнага вершаванага памеру.

**ЦЮХЦЯ́Й**, -я. Непаваротлівы, няспрытны, абыякавы да ўсяго чалавек; няўклюда.

**ЦЯГАВІ́ТЫ**, -ая, -ае. Здольны многа і цяжка працаваць; працавіты.

**ЦЯ́ГЛІ**, -яў. Паджылкі; каленнае сухажылле.

**ЦЯГЛІ́ЦА**, -ы. Мышца.

**ЦЯ́ЖКАСЦЬ**, -і. 1. Уласцівасць цяжкага. 2. *звычайна мн.* (ця́жкасці, -ей). Тое, што замінае, перашкаджае ў дасяг-

ненні мэты, патрабуе вялікіх намаганняў і сіл; перашкоды, складанасці. 3. Непрыемнае адчуванне чаго-н. цяжкага (у галаве, грудзях); змрочны, непрыемны настрой.

**ЦЯ́МІЦЬ**, -млю, -міш, -міць. Разумець сэнс падзей, гаворкі і пад.; разбірацца, кеміць.

**ЦЯ́МЛІВЫ**, -ая, -ае. Кемлівы, разумны, здагадлівы.

**ЦЯМНІ́ЦЬ**, цямню́, це́мніш, це́мніць. Гаварыць няясна, блытана; скажаць сэнс чаго-н.

**ЦЯНЬКА́МІ**. Напрасткі, нацянькі.

**ЦЯПЕ́Р**. Зараз, у гэты момант.

**ЦЯПЕ́РАШНІ**, -яя, -яе. Які існуе цяпер, мае адносіны да сучаснасці.

## Ч

**ЧАЛАВЕ́ЧА**. Ужываецца як ласкавы зварот да незнаёмага мужчыны.

**ЧАЛО́**, -а́. Лоб; пра твар.

**ЧАПА́ЦЬ**, -а́ю, -а́еш, -а́е. Дакранацца, датыкацца да каго-, чаго-н.; браць што-н., карыстацца чым-н. (звычайна чужым, без дазволу); закранаць, турбаваць каго-н.; крыўдзіць.

**ЧАПЛЯ́ЦЦА**, -я́юся, -я́ешся, -я́ецца. Прыдзірацца да каго-н.; прыставаць да каго-н., назаляць.

**ЧАПУРЫ́СТЫ**, -ая, -ае. Які любіць прыбірацца, чапурыцца.

**ЧАПУРЫ́ЦЦА**, -ру́ся, -ры́шся, -ры́цца. Прыхарошвацца, прыводзіць сябе ў парадак, адмыслова прыбірацца.

**ЧАРАВА́ЦЬ**, -ру́ю, -ру́еш, -ру́е. Вабіць, захапляць; прыносіць асалоду.

**ЧАРАЎНІ́К**, -а. 1. У казках і павер'ях — той, хто можа чараваць, валодае чарамі; вядзьмар. 2. Знахар. 3. Той, хто зачароўвае, захапляе чым-н.

**ЧАРГАВА́ЦЦА**, -гу́юся, -гу́ешся, -гу́ецца. Паслядоўна, па чарзе замяняць адно другім; перыядычна паўтарацца.

**ЧАРГО́ВЫ**, -ая, -ае. 1. Які ідзе, наступае, выходзіць і пад. непасрэдна за папярэднім; бліжэйшы па чарзе. 2. Які адбываецца, праводзіцца рэгулярна, у пэўнай паслядоўнасці.

**ЧАРО́ЎНАСЦЬ**, -і. Прыгажосць, хараство; прывабнасць; тое, што зачароўвае, захапляе.

**ЧАРО́ЎНЫ**, -ая, -ае. 1. Незвычайны, казачны. 2. Незвычайнай, казачнай прыгажосці; які зачароўвае, захапляе.

**ЧА́РЫ**, -аў. 1. Вядзьмарства. 2. Чароўная сіла, прывабнасць, якая захапляе.

**ЧАСТАВА́ННЕ**, -я. Ежа, пітво, якім частуюць.

**ЧАСТАВА́ЦЦА**, -ту́юся, -ту́ешся, -ту́ецца. Піць, есці, курыць тое, чым частуюць; есці, піць кампаніяй; есці з задавальненнем што-н. смачнае.

**ЧАСТАВА́ЦЬ**, -ту́ю, -ту́еш, -ту́е. Даваць або прапаноўваць паесці, папіць, пакурыць; карміць або паіць каго-н., выказваючы ўвагу, гасціннасць; рабіць каму-н. прыемнае; біць таго, хто лезе не ў сваё.

**ЧАСТУ́ШКА**, -і. Кароткая, звычайна чатырохрадковая песня жартаўлівага або сатырычнага зместу; прыпеўка.

**ЧАСЦЮ́ТКА**. Вельмі часта.

**ЧАСЦЯКО́М**. Даволі часта, нярэдка.

**ЧАЎПЦІ́**, -пу́, -пе́ш, -пе́; -пём, -пяце́. 1. Гаварыць недарэчнасці, глупства, бязглуздзіцу. 2. Настойліва даводзіць каму-н. што-н., паўтараць увесь час адно і тое.

**ЧМУРЫ́ЦЬ**, чмуру́, чму́рыш, чму́рыць. 1. Дурыць, адурманьваць, тлуміць. 2. Ашукваць, збіваць з толку.

**ЧУ́БІЦЦА**, чу́блюся, чу́бішся, чу́біцца. Біцца, сварыцца.

**ЧУ́БІЦЬ**, чу́блю, чу́біш, чу́біць. Тузаць каго-н. за валасы; біць, лупцаваць.

**ЧУВА́ЦЬ**. 1. Можна чуць. 2. Ёсць звесткі пра каго-, што-н. 3. Адчуваць, адчувацца; успрымацца.

**ЧУ́ЙНЫ**, -ая, -ае. 1. Здольны востра чуць, тонка адчуваць (органамі пачуццяў або пра органы пачуццяў, звычайна слыху); які хутка адказвае на ўздзеянне,

лёгка адгукаецца. **2.** Які асабліва востра адчувае, перажывае, рэагуе; насцярожаны, асабліва ўважлівы. **3.** Які чуецца, адчуваецца.

**ЧУ́ЛАСЦЬ**, -і. **1.** Здольнасць успрымаць знешнія раздражненні органамі пачуццяў; тонкае, вострае ўспрыманне; адчувальнасць. **2.** Увага да людзей; спагадлівасць, спачувальнасць.

**ЧУЛЛІ́ВЫ**, -ая, -ае. **1.** Здольны ўспрымаць знешнія, фізічныя раздражненні. **2.** Кранальны, сардэчны, здольны выклікаць замілаванне, добрае пачуццё. **3.** Здольны тонка адчуваць, востра рэагаваць.

**ЧУ́ЛЫ**, -ая, -ае. **1.** Уважлівы, спагадлівы; добразычлівы. **2.** Уражлівы. **3.** Які тонка, лёгка ўспрымае што-н. органамі пачуццяў. **4.** Які хутка адзываецца, адказвае на ўздзеянне, раздражненне (гук, дотык і пад.).

**ЧУПРЫ́НА**, -ы. Пасма валасоў, якая спадае на лоб або ўзнімаецца над ілбом (у мужчын); чуб; валасы наогул.

**ЧУ́ТКА**, -і. Вестка, паведамленне; *звычайна мн.* (**чу́ткі**, -так) звесткі (звычайна няпэўныя, недакладныя); пагалоска.

**ЧУ́ТНАСЦЬ**, -і. **1.** Ступень выразнасці гучання. **2.** Магчымасць чуць, слухаць каго-, што-н.

**ЧУ́ТНЫ**, -ая, -ае; чуцён, чутна́. **1.** Даступны слыху; які ўспрымаецца слыхам; вядомы. **2.** Чуецца, гучыць.

**ЧУ́ТЫ**, -ая, -ае. Які ўжо быў пачуты; вядомы.

**ЧУЦЦЁ**, -я. Здольнасць чалавека заўважаць, угадваць, разумець што-н.

**ЧЫ́ННАСЦЬ**, -і. Дзейнасць.

**ЧЫ́ННЫ**, -ая, -ае. **1.** Дзейсны, актыўны; непасрэдны. **2.** Прасякнуты важнасцю, саліднасцю.

**ЧЫРВАНЕ́ЦЬ**, -е́ю, -е́еш, -е́е. Пакрывацца румянцам; бянтэжыцца, саромецца.

**ЧЫСЦЮ́ТКІ**, -ая, -ае. Вельмі чысты.

**ЧЫТА́ЛЬНІК**, -а. Артыст, які распавядае са сцэны творы мастацкай літаратуры.

**ЧЫ́ТКА**, -і. Чытанне акцёрамі п'есы па ролях (від рэпетыцыі); чытанне драматургам ці рэжысёрам новай п'есы трупе тэатра.

**ЧЭ́РСТВЫ**, -ая, -ае. **1.** Які страціў свежасць, мяккасць, стаў цвёрдым, сухім. **2.** Нячулы, бяздушны (пра чалавека).

**ЧЭ́СНАСЦЬ**, -і. **1.** Уласцівасць чэснага. **2.** Чэсныя паводзіны, чэсныя адносіны да каго-, чаго-н. **3.** Строгая маральная чыстата, цнатлівасць.

**ЧЭ́СНЫ**, -ая, -ае. **1.** Праўдзівы, прамы і добрасумленны. **2.** Справядлівы, бездакорны ў маральных адносінах. **3.** Маральна чысты, цнатлівы.

**ЧЭСЦЬ**, -і. **1.** Сукупнасць маральных прынцыпаў, якімі чалавек кіруецца ў сваіх грамадскіх і асабістых паводзінах. **2.** Аўтарытэт, незаплямленая рэпутацыя чалавека, яго чэснае, добрае імя. **3.** Цнота, нявіннасць (пра жанчыну).

## Ш

